А ўстанаўліваючы належна і выдаткі, а таксама падаткі да скарбу паводле здольнасці і меркавання самім мяшчанам пад кіраўніцтвам першага асэсара, з ведама, аднак, мяне, старасты, і майго ўраду. Таксама асцерагаю, каб слабейшыя ад заможнейшых уціснены́мі і ўкрыўджанымі не былі. А ўтрыманне рэестраў і касы, як і выдаткі захоўваю пры першым асэсары. Заплаціўшы прызначаныя паводле люстрацыі 1777 г. ВЯМ пана Антона Урбановіча, скарбніка ашмянскага павету, люстратара мест, падаткі да

скарбу РП ВКЛ, далейшыя выдаткі на патрэбы места класціся павінны не іначай як супольнымі з мяшчанамі нарадамі. А па заканчэнні году з тых жа прыбыткаў і выдаткаў будуць абавязаны ўчыніць рахунак перад асобамі, *[18]* вызначанымі мной з дзісненскіх мяшчан. Што ж да ўтрымання трываючай з даўніх гадоў магдэбургіі, як таксама па яе касацыі з прыбыткаў і выдаткаў, з асоб тым заведваючых рахункі, вызначаю ўжываць да таго асоб з мяшчан. А калі які з уладароў ці іх нашчадкаў прыбыткамі і выдаткамі паспрабуе забараніць чыненне поўнага рахунку асобамі, маючымі ад мяне паўнамоцтвы, будзе пазваны на інстанцыю цэлага места з затрымкай інстыгатарам перад маім старасцінскім судом.

Далей запэўніваю, што жывучыя ў месце Дзісне жыды будуць належаць да суду аднаго ЯМ пана дзісненскага падстарасты.

А гэты мой урадавы старасцінскі ліст на просьбы ўласна мяшчан дзісненскіх, добраахвотна прымаючых тое маё прадпісанне, праву і ўставам краёвым непраціўны, а стасаваны да звычаяў папярэдніх старастаў дзісненскіх, выдаю для бяспекі і пэўнасці таго ўсякага. Так, калі б ён маёй старасцінскай улады, правамі абароненай, таксама выдадзеным для старастаў дзісненскіх прывілеем 12 студзеня 1569 г. прыбыткаў месту Дзісне абароненых і вылучаных, таксама наступнаму паводле патрэбы і акалічнасці з урэгулявання маёй улады ніхто ў наступным часе не абражаў, абараняю як *[18 адв.]* наймацней для мяне. У довад той мой урадавы ліст пры пячатцы падпісваю ўласнай рукой. Пісаны 2 студзеня 1786 г.

У тым урадавым лісце подпіс ВЯМ пана старасты выражаны тымі словамі: Міхал Козел, дзісненскі староста, уласнай рукой, і гербавая пячатка на чырвоным лаку ў таго ліста ўрадавага.

**07.05.1788 — Крэдэнс дзісненскага старасты Міхала Паклеўскага Козела Антону Козелу на ўрад дзісненскага падстарасты.**

*[103]* Aktykacya kredensu na namiesnikowstwo dzisnięskie od w(ielmożneg)*o* j(ego) m(oś)c pana Michała Poklewskiego Kozieła starosty sądowego dzisnięskiego w(ielmożnemu) j(ego) m(oś)c panu Antoniemu Koziełłowi rottm(istru) p(owia)tt*u* Oszmianskiego wydanego.

Roku tysiąc siedemsett osiemdziesiąt osmego miesiąca maia osmego dnia.

Na urzędzie starostwa dzisnięskiego przy obięciu sądow swych namiesniczych wielmożny j(ego) m(oś)c pan Antoni Koziełł rotm(i)str powiatu Oszmianskiego, przed actami y przednami Janem Kłypo Janem Lenartowiczem Antonim Rutkowskim assesorami Kazimierzo*m* Krayskim pisarzem ad w(ielmożneg)*o* j(ego) m(oś)c pana Michała Poklewskiego Kozieła starosty sądowego dzisnięskiego tu w miescię Dzisnie jnstalowanemi urzędnikami jako dn(i)a sądowego przy zasiadaniu sądow swych namiesniczych kredens sobie służący na namiesnikowstwo dzisnięskie od wielm(ożnego) j(ego) m(oś)c pana Michała Poklewskiego Kozieła

starosty sądowego dzisn(ienskiego) ad acta xiąg staroscinskich u sądu podał ktorego tenor seqvitur talis,

Michał Poklewski Koziełł sądowy dzisnięski starosta wszem wobec y kazdemu zosobna komu by o tym wiedziec nalezało *[103 v.]* mianowicię sławetnym y starozakonnym obywatelo*m* miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisny oznaymuię tym moim kredensyonalnym listem i jz przywileiem nayiasnieyszego krola j(ego) m(oś)c Stanisława Augusta pana naszego miłosciwego na starostwo dzisnięskie authoryzowanym zostawszy, z dozwolennia narodowegoW(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litewskiego o starostach pozepisanego prawa uzywac dozwoloney tymże prawem wolnosci, y chcąc miec w pomoc odbywanie prac do urzędu mego stosowanych osobliwe dla rozsądzenia pomiędzy obywatelami miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisny, tak miesczanami i żydami iako też i ustronnemi do przerzeczonych obywatelow pretęsye swe stosuiącemi sporow pomnieyszych, a o zdatnosci sprawowania funkcyi namiesniczey w(ielmożneg)*o* j(ego) m(oś)c pana Antoniego Kozieła rotm(istra) powiatu Oszmienskiego przeswiadczonym i wiadomym zupełnie będąc, za aktualnego przeto namiesnika miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)c(i) Dzisny pomienionego w(ielmożneg)*o* j(ego) m(oś)c pana Antoniego Kozieła rotmistrza Oszmian(skiego) obieram i tym moim kredensyonalnym listem j(ego) m(oś)c(i)ca naznaczam i ogłaszam

ktory to j(ego) m(oś)c pan namiesnik dzisnięski wszelkie sprawy między mieszczanami za naradzeniem się u waznieyszych rzeczach z assesorami sobie do danemi wydarżone a między żydami sam jeden wedle udzielnie, odemnie temusz miastu wydanego pisma załatwiac, nieposłusznych i winnych z mocy prawa przykładnie karac samych assesorow ktoby kolwiek zniemi miał prawo na mieyscu moim rozsądzac jest mocen i powinien będzie odezwu czyli apelacyi do mnie starosty dozwalac jnaczey nie może iak tylo w sprawach sto rubli wartuiących i zgodnie z prawami *[104]* Wielkiego Xięstwa Litewskiego służącemi dochody wszelkie od pieczęci zwyczayne odbierac na się pozwalam ktoremu to wielmożnemu j(ego) m(oś)c panu namiesnikowi, jzby zupełnie obywatele miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisny tak mieszczanie jako y żydzi posłusznemi byli jak nay uroczysciey ostrzegam y zalecam

Bo na tom ten moy kredensyonalny przy wycisniętey herbowey mey pieczęci j(ego) m(oś)ci wydał list podpisem ręki utwierdzaiąc Pisan roku tysiąc siedemsett osiemdziesiąt osmego maia siodmego dnia

U tego listu kredensyonalnego podpis ręki w(ielmożneg)*o* j(ego) m(oś)c pana starosty wyraza się temi słowy Michał Koziełł starosta dzisnięski, ktory takowy list kredensyonalny przy pieczęci herbowey na czerwonym laku wycisnęta przez wyz w(ielmożneg)*o* j(ego) m(oś)ci podany jest przyięty y do xiąg staroscinskich mista j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisny zapisany.

*Ф. 1757. — Воп. 1. — Спр. 12 — Арк. 103–104.*

## Пераклад

*[103]* Актыкацыя крэдэнсу Міхала Паклеўскага Козела, дзісненскага судовага старасты, выдадзены на ўрад намесніка дзісненскага пану Антону Козелу, ротмістру Ашмянскага павета.

1 мая 1788 года.

На ўрадзе дзісненскага староства пры ўступленні на пасаду намесніка суда ВЯМ пан Антон Козел, ротмістр Ашмянскага павету, перад канцылярыяй і перад намі Янам Клыпам, Янам Ленартовічам, Антонам Руткоўскім асэсарамі, Казімірам Крайскім, пісарам, тут у месце Дзісне ўсталяванымі ад ВЯМ пана Міхала Паклеўскага Козела, дзісненскага судовага старасты,ураднікамі, як дня судовага пры засяданні сваіх наменічых судоў, падаў да старасцінскіх кніг у суду служачы сабе крэдэнс на намесніцтва дзісненскае ад ВЯМ пана Міхала Паклеўскага Козела, дзісненскага судовага старасты, якога змест наступны:

Міхал Паклеўскі Козел, дзісненскі судовы староста. Усім увогуле і кожнаму асобна, каму аб тым ведаць належыць, *[103 адв.]* менавіта славетным і старазаконным жыхарам места ЯКМ Дзісны. Знаёмім тым маім крэдэнсыянальным лістом, што стаўшы з аўтарызаваным на староства дзісненскае прывілеем найяснейшага караля ЯМ Станіслава Аўгуста, пана нашага міласцівага, з дазволам дзяржаўнага пісанага права ВКЛ ужываць дазволеныя тым жа правам вольнасці, і жадаючы мець у дапамогу адбывання да ўраду майго ўжываных прац, асабліва для суджэння паміж жыхарамі места ЯКМ Дзісны, як мяшчанамі, так і жыдамі, як таксама і ўстроенымі да згаданых жыхароў для вырашэння прэтэнзій меншых спрэчак, а цалкам будучы дасведчаны і вядомы аб здатнасці спраўвання намесніцкай функцыі ВЯМ пана Антона Козела, ротмістра ашмянскага павету, абіраю і тым маім крэдэнсыянальным лістом ЯМ прызначаю і абвяшчаю за актуальнага намесніка места ЯКМ Дзісны згаданага ВЯМ пана Антона Козела, ротмістра ашмянскага.

Той ЯМ пан намеснік дзісненскі вырашаць усялякія справы паміж мяшчанамі з нарадай аб важнейшых рэчах з сабе дададзенымі ўдалымі асэсарамі, а паміж жыдамі адзін паводле дадзенага ад мяне таму ж месту выдадзенага ліста, узорна караць з моцы і права непаслухмяных і віноўных, саміх асэсараў хто б калі-небудзь з імі меў права на месцы маім судзіць моцны і будзе павінен. Адозву ці апеляцыю да мяне, старасты, дазваляць іначай не можа, як толькі ў справах каштуючых сто рублёў і служачымі згодна з правам *[104]* ВКЛ.

Прыбыткі ўсе ад пячаткі як звычайна ВЯМ пану намесніку дазваляю адбіраць на сябе, каб усе жыхары места ЯКМ Дзісны, як мяшчане, так і жыды былі паслухмянымі, як найурачысцей асцерагаю і даручаю. І на тое выдаў мой крэдэнсыянальны ліст пры выціснутай маёй гербавай пячатцы, сцверджаны подпісам рукі. Пісаны 7 мая 1788 г.

У таго крэдэнсыянальнага лісту подпіс рукі ВЯМ пана старасты выражаецца тымі словамі: Міхал Козел, дзісненскі стараста. Той крэдэнсыянальны ліст пры выціснутай на чырвоным лаку гербавай пячатцы праз ВЯМ пададзены, прыняты і да старасцінскіх кніг места ЯКМ Дзісны запісаны.

**08.08.1786 — Скрыпт дзісненскага старасты Міхала Паклеўскага Козела цэхам Дзісны аб пацвярджэнні іх правоў і дазволе кіравацца вількерамі.**

*[14]* Aktykacya skryptu od wielmoznego j(ego) m(oś)c(i) pana starosty dla cechow miastu j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisnie nadanego,

Roku tysiąc siedemset osiemdziesiątt szostego miesiąca augusta dziesiątego dnia

Przed URZĘDEM Y AKTAMJ[5] staroscinskiemi miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisny comparendo personaliter sławetni panowie dozorcy cechow y całe jch bractwo w cechach zostaiące, a mianowicię roczni cechmistrowie Tomasz Tarnawski Wawrzyniec Taruto maystrowie kunsztu krawieckiego Adam Gratulewicz Dymitry Siatkowski kunsztu tkackiego maystrowie Antoni Szerszen Bazyli Szymanowski kunsztu garbarskiego y szwieckiego Kuryło Jakubowicz Aftanazy Znirkiewicz kunsztu mularskiego y gancarskiego skrypt od wielmoznego j(ego) m(oś)c(i) pana starosty dzisnięskiego na aprobate wszystkich cechow temusz miastu j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisnie wydany ad akta podali ktorego *tenor* seqvitur talis

Michał Poklewski Koziełł *[14 v.]* starosta dzisnięski czynie wiadomą kazdemu a mianowicię sławetnym obywatelom miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisny tym moim na aprobate wszystkich cechow skryptem temusz miastu j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisnie wydanym na to, jz gdy dla porządku wewnętrznego wszystkich rzemiesnikow w miescię j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisnię znayduiących się ieszcze w roku tysiąc szescset trzydziestego wtorego miesiąca februaryi dwadziestego siodmego dnia pozwoloną było onym w kazdym kunscię miec swoię cechi w ktorych znayduiącym się osobom ustanowioną było prawo czyli wielkierz w kilku dziesiąt artykułach zawarty y tenże posledniey od maydeburyi dzisnięskiey za aprobowany przeto zapodaniem na memoryalie prozby od wszystkich rzemiestnikow o utrzymanie, takowego porządku też cechi, y wielkierz zewszystkiemi artykułami w nim wyrazonemi aprobuię y umacniam na mocy ktorey aprobaty wszystkie cechi rzemiestnicze, starszych pomiędzy siebie wybierac a ci spory wszelkie pomnieysze wedle artykułów w tym że wielkierzu opisanych rozsądzac rzemiesnikom na wsi mieszkaiący a do cechu niewpisanym przedawania robionych towarow bronic bez wiadomosci cechow robienia w miescie Dzisnie nie dozwalac y przestępnych karac wolni y mocni będą

[5] выдзелена ў крыніцы.

Na dowod czego takowy skrypt własną podpisuię ręką Pisan roku tysiąc siedemsett osiemdziesiątt szostego m(iesią)ca augusta osmego dnia.

U tego skryptu podpis ręki takowy. Michał Poklewski Koziełł sądowy dzisnięski starosta, ktory takowy skrypt przez wyz pomienionych osob ad acta podany jest przyięty y do xiąg staroscinskich miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci zapisany, Eorunde wypis wydany.

*Ф. 1757. — Воп. 1. — Спр. 12. — Арк. 14–14 адв.*

## Пераклад

*[14]* Актыкацыя скрыпту ад ВЯМ пана старасты для цэхаў месту ЯКМ Дзісне нададзенага.

10 жніўня 1786 года.

Перад урадам і актамі старасцінскімі места ЯКМ Дзісны стаўшы асабіста славетныя паны дазорцы цэхаў і ўсё іх застаючае ў цэхах брацтва, а менавіта: рочныя цэхмістры Томаш Тарнаўскі, Ваўжынец Тарута майстры кравецкага цэху, Адам Гратулевіч, Дымітр Сяткоўскі майстры ткацкага цэху, Антон Шэршань, Базыль Шыманоўскі гарбарскага і шавецкага цэху, Курыла Якубовіч, Афанас Зніркевіч мулярскага і ганчарскага цэху, падалі да канцылярыі выдадзены таму ж месту ЯКМ Дзісне скрыпт ад ВЯМ пана дзісненскага старасты на дазвол усіх цэхаў, якога змест такі:

Міхал Паклеўскі Козел, *[14 адв.]* дзісненскі стараста, паведамляю кожнаму, а менавіта славетным жыхарам места ЯКМ Дзісны выдадзеным тым маім скрыптам на дазвол усіх цэхаў таму ж месту ЯКМ Дзісне на тое, што для парадку ўнутранага ўсіх рамеснікаў у месце ЯКМ Дзісне яшчэ 27 лютага 1632 г. было дазволена права ці вількер у некалькіх дзясятках артыкулах завераны і той жа апошні ад магдэбургіі дзісненскай дазволены, тады паводле пададзенай на памяць просьбы ад усіх рамеснікаў аб утрыманні такога парадку тыя ж цэхі і вількер з усімі артыкуламі ў ім выражанымі дазваляю і мацую. Згодна моцы гэтага дазволу ўсе рамесныя цэхі павінны выбіраць са свайго складу старшых, усялякія спрэчкі судзіць паводле згаданых артыкулаў, апісаных у тым вількеру, на вёсцы жывучым, а да цэху не ўпісаным рамеснікам продаж зробленых тавараў забараняць, без ведама цэхаў выраб у месце Дзісне не дазваляць і злачынцаў караць.

Для чаго такі скрыпт уласнай рукой падпісваю. Пісаны 8 жніўня 1786 г.

У таго скрыпту подпіс рукі такі: Міхал Паклеўскі Козел, судовы дзісненскі стараста. Той скрыпт праз вышэй згаданых асоб да канцылярыі пададзены, прыняты і да кніг старасцінскіх места ЯКМ запісаны. Выпіс выдадзены.

**27.02.1632 — Вількер дзісненскага кравецкага цэху цэхмістрамі Паўлам Шыманоўскім і Лявонам Васілеўскім (унесены ў дзісненскія актавыя кнігі 05.06.1776).**

*[16]* № 11. Roku tysiąc siedemset siedemdziesiąt szostego m(iesią)ca junij piątego dnia

Na urzędzie j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci magdeburij dzisnien(skiey) przed nami burmistrzami raycami y ławnikami miasta j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci Dzisny tego roku dla spraw zasiadaiącemi comparentes personaliter, u sądu stawaiąc słł(awiet)ni Paweł Szymanowski. y Leon Wasilewski cechmistrzowie tego roczni jmieniem całego bractwa cechu krawieckiego, wilkierz porządku cechowego. ad acta xiąg magdebur(ij) dzisn(ięskiey), podali, ktorego tenor seqvitur talis,

Wypis s knih meskich spraw ratusza mesta hospodarskoho disenskaho, leta ot narożenia syna Bożeho tysiecza szest sot trytcat wtoraho, m(e)s(e)ca febrela dwatcat semoho dni, burmistry radcy y ławniki mesta hospodarskoho dysenskoho toho roku tepereszneho tysiecza szest sot trytcat wtoreho, w ratuszu sprawuiuczyie, oznaymuiem y wiedomo czynim kożdomu komu by o tom wiedaty należało jż szto pryszedszy perednas w ratuszu meszczanie mesta tutesznoho dysenskaho osoby remesła kraweckoho menowite, pan Mikołay Chodko radca, Wasiley Chaynocki, Jan Poradnia, Jakim Kotenski, Borys Rosłey, Fiedor Wasilewicz, Fiedor Łatyka, Hrehory Tomilenok, Semen Alexiejewicz Tur, Stefan Narbutowicz, Krysztof Matfieiewicz, Jwan Łamtewicz, Michayła Rosłey, Nestor Hołub, Daniła Szczasnowicz, Alchim Jwanowicz, wnosili do nas prożbu swoiu żadaiuczy pilno o to, abychmo jako wrad dla lepszaho poradku meży nimi w remesle kraweckom własnym jch nakładom y kosztem przykładom mesta Połockoho, bractwo y cech krawecki meti pozwolili y spisawszy wsie po dostatku artykułami jako sie oni meży soboiu w tem swoiem bractwie cechowom *[17]* kraweckom riadyty y sprawowaty sie maiut nam objasniajuczy y ku wiedomosty domosieczy pokładali obecuiuczy y prerekaiuczy wsi odnosteyne wodle tych swoich usich artykułow czule y abole uzhodnom bratolubi na kożdy czas zachowaty, y pełnity, y nam w radowi wo wsem posłusznymi były, jno my wrad meski disenski zachowuiuczy se wodle prawa pospolitaho z saksonu listu trysta wosemdesiatoho hde piszet że remesnicy by podleali włady y reskazaniu burmistrow y rada, y oni powinni mewat meży soboju schacki swoie y zhromażenie w cechoch swoich y tam że o mistrach swoich y jnnych reczach jm potrebnych y też storony sztoby im podano było spolne radyt y wystupnych korat y upominat, bratiu swoiu aby niwczom, w tom sztoby zakazano było ne wystupowali, y jesliby kotory cech listow abo potwerżenia na posrodki swoie potrebował to im ot radec dawany maiut byty preto my widieczy słusznoie toie prożby jch meszczan disenskich adotoho zyczeczy toho aby onyie krawcowe w takom poradnom bratstwie swoiem na dołhi czas zachowuiuczysie kufale Bozoy w cerkwi swietoy swey przymnożali y mestu pocztiwost y posłuhi jako krawcy mesta połockoho połniat czynili, toie bractwo kraweckoie wodle ich samych postanowenia, y artykułow w meste disenskom meti y pażynaty im

pozwolaiem kotoryie krawcowe meszczane mesta disenskoho sami y potomkowe ich maiut mocny y wolny budut w tom bracstwie swoiem cechowom kraweckom zachowuiuczysie na kożdy czas wodle tych artykułow swoich prykładem cechu mesta połockoho na wiecznyie czasy riadyty y sprowowaty y mocno nieotmienno prytom stoiaczy derżaty, w czom im nichto żadnoie pereszkody czynity y trudnosty zadawaty nemaiut y moczy nikoli ne budut wiecznymi czasy, jakoż dla lepszoho y doskonalszoho potwerżeńnia pry takowom pozwołeńju naszom uradowom y tyie artykuły wsi czereznich samych postanowłennyie y nam na pisme pokazowanyie kazali jeśmo słowo w słowo do knih meskich upisat, kotoryie upisuiuczy tak sie w sobie maiut,

Mikołay Chodka radca, Wasiley Chanacki, Jan Poradnia, Jakim Kolenski, Borysy Rosley, Fiedor Wasilewicz, Fiedor Łatyko, Hryhorey Tomilenok, Siemien Alexiejewicz, Stefan Narbutowicz, Krysztof Matwieiewicz, Jwan Łamtewicz, Michayła Resłey, Niestier Hołubowicz, Daniła *[18]* Szczasnowicz, Alchim Jwanowicz, czynimy wiedomo tym naszym zhodliwym odnostaynym postanowenym braterskim listom jż szto maiuczy my nadanoie pozwołenie ot wradu tutosznieho mieskoho disenskoho na bractwo nasze cechowoie kraweckoie, w kotorom tom bractwie naszom chotieczy my aby poradok meży nami, starszymi y mołodszymi prykładom y zwyczaiem bractwa y cechu mesta Połockoho zachowan y derżan był postanowiwszy po dostatku artykuły jakosie w tom bractwie meży soboiu wlubwi braterskoy sprawowaty się y połnity maiem wsie znacznie na pismie wyrazywszy y zawsehdy mocno y neotmienno zażywaiuczy derżaty y mieti na potomnyie czasy choczem,

A mienowitie pierszy artykuł tak postaowiaiem, # Że na kożdy rok po dwa starosty ot nas obranyie byty y zasiedaty maiut, hdeby na wodny towarysz aboli uczen kotory remesła doskonale nauczywszyzię, za brata do bracstwa upisatysię chotieł tot maniet upisnoho dat kop szest hroszey do skrynki bratskoie,

2, schacka braterskaia maiet byt w deń pewny to iest w deń woskresny prez dwie nedeli do kotoroie schacki preszodszy maiem kożdy z nas dował do skrynki po hroszu odnomu a u suchyie dni po try hroszy polskich,

3, a jesliby kotory brat z nedbalstwa do schacki koli ne pryszoł, a boli wymowy słusznoie ne uczynił, za to maiet dat winy połbezmiena wosku,

5, krawczykowie hdeby do toie schacki ot nas postanowlenoie kotory także ne chotiel pryty aboli y pryhodzy do skrynki swoieia po hroszu polskomu ot nas ufalenoho ne dał to maiet winy dat wosku funt odin,

6, winnoho sbrate brata meży soboiu budem karat to iest jeśliby brat nasz komu sukno popsował a tot by sie do nas na takowoho z żałoboju uskarżał, abo brat brata zneważył słowom złym lub też w czom by był starszym naszym y nam samym neposłuszny, a jesli by sie nam w tom buduczy winny osprotywił tohdy winy maiet dat wosku puł bezmiena, a otdawszy winu pred sie maiet nakazu starostinomu dosit czynit,

7, tak tez krawszykow jeslibysie nam ot kotoroho szto złoie dieieło meży soboiu maiem karaty za takiież reczy sztoby byli starszyn posłuszny y po ulicach na wstyd nasz sztoby ne bro[di]li bo hdeby kotoroho z nich postereh brat że to kotory z nich niesłusznie poczynaiet maiet objawit starszomu naszomu, a starszy maiet k sebie brata posłat do starszoho ich towarysza do mowiaiuczy sie na toho *[19]* karania za tuiu ieho zbrodniu, a towarysz yz prydanymi ot nas wsichim dwuch braty dla rozsudku słusznoho maiet towarysza winnoho karat winoiu to iest nech-ay winny dast wosku połbezmiena,

8, a pachole szto sie rozumieiet poł towarysza jesliby nakazanoy winy niemeł zapłatit tohdy na zedel położywszy wina,

9, a szto też kotoryi z nich robit yczaho kolwiek z warstatu im podanoho zhubit, niechay otkupiat, wsie, na roboty do koho kolwiek by y na seło za wiedomostiu starszoho nechay chodiat pod tymiż winami, ato dla toho sztoby ich brat nasz wzapłatie albo jakoiu inszoiu pryczynoiu ne krywdił w czom, a jesliby się ważył iti na robotu bez wiedomosti starszoho bratskoho wina na towarysza y pachole jak wysze napisano iest wsem że parakhrafie,

10, chłopcy też jesli by brat nasz pryniał do nauki nechay jeho u bratstwie zaraz oznaymit, anechay jeho daley czerez dwie nedeli ne umowiwszy y ne wpisawszy do bractwa ne derżyt ato dla toho aby chłopcu roku neprodołżył khdysie ot upi-sania rok poczynaiet, a nechay upisnoho chłopec do skrynki dast hroszey szest, a jeśli by sie w toy recz brat nasz prowił nechay dast wosku funty dwa,

11 zaś khdy chłopec braty naszemu do służyw cnotliwie maiet ieho brat wyzwolit pred bratijeiu u bratstwie, a nechay dast chłopec za wyzwołenije do skrynki hro-szey osm,

12, chłopec khdy prydet do hospody hdesie do schacki zbiraiut, maiet dat ustup-noho za to, że ieho bratia prymuiet za pachole hroszey osmnatcat, a pisar maiet jeho do reiestru bratskaho towaryskoho upisat czyj on jest syn hdesie y ukoho remesła uczył, aon pisaru maiet dat hrosz polski.

13 brat jesliby się w czom prowinił meży nami to iest jesliby jeho obesłano aby był do schacki dla iakoho ważnoho y mudroho rosudku albo namowy a on by nie był niechay nam budet wolno takoho karat to jest nechay dast wosku poł bezmie-na, a hdyby ne [cho]tieł to jeho z słuhoiu wrodowym uprosiwszy słuhi u panow aby wolno było pohrabit, także y towarysza y pachole jak wysze iest wina na nich opisana,

14, Towarysz nasz albo y brat nasz jesli by sie prewinił zakotoroie prowinenje byłby hoden wiezenia to iest jesliby towarysz brata pobił lub tomu podobnoho szto uczynił, a tot brat na neho bysie żałował w bratstwie a on by neperestawał nanaszom rozsudku tedy *[20]* nemaiet daley a polowaty tolko do panow radcow dwuch rocznych kotorych na tot czas do bracstwa dla rozsudku wradowoho u ich miłostey panow budem prosit y jesliby toho winnym byt uznali a panowe radcy że hoden wezenja tahdy winy zapłatywszy za sprotywenstwo wosku poł bezmiena,

a wezenia nechay terpity weży ne daley tolko hodyny dwie a panom radcom nechay sam winny pohodyt za winu a o wezenie także ich miłost panow prosit maiet aby no winnoho ne boronili dla toho abysie złost nemnożyła.

*15* a jesliby się kotoryi lub prychożyj lub tutasznij krawec w miestie Disenskom ważyłsię po podanoy nam mocy od panow sudowych hde robit ot nas brat potaiemne takoho wolno budet z słuhoiu wradowym tuiu jeho robotu pohrabit do bracstwa dla toho iż by nam nepereszkożał y aby z nami wjednoty był chotiaby y pożyta[k] miestu czynił.

16 Jesliby brat nasz u jakuiu winu popał y toieby winy z uporu płatit ne chotieł, tohdy uprosiwszy u panow słuhi wradowoho wolno za tuiu winu pohrabit.

17. Na pohreb brata naszeho maiem sie zbirat za obesłaniem ot starszych naszych. A jesliby kotory z nas wedaiuczy o tom na pohreb ne prydot za to maiet dat winy hrosz odin, także towarysz y pachole tymże sposobom hrosz winy płatyti maiet,

18. Syn brata naszeho jesliby dorozszy let swoich a umieł by remesło ne maiet daty niczoho ukupnoho do bracstwa dla zasłuh otca swoieho tolko poczest u bractwie uczynit,

19 Towarzysz y pachole jesliby podczas schacki dla potreb swoich ne chotieł byt u schadce nechaj pred sia pryszodszy do schacki starszomu oznaymit dla czaho ne maiet byty a starszyj obaczywszy słusznoie wymowy jeho ot toho uwolnit, a jesliby towarysz albo pachole ne mieł czoho dat uschadce że sobie ne zarobił za pilnoiu robotoiu maystrowskoiu to iemu myster na to maiet daty, a jesliby ne zarobit że to roboty nie mieł, maiet iemu byt zfolkhowano y do druhoy albo tretiey schacki a on zarobiwszy maiet dat,

20 a jesliby brat nasz kotoryj nahaniwszy wse bracstwo nasze ot nas spozwołenia wradowoho użałennoie wybiwatsie z bractwa chotieł, to nechay perwey za to bratstwu winy zapłatit kameń wosku, a potom y remesła *[21]* zreczsia takij maiet, ahdeby też jeho bracstwo zostało na potym robieczy robotu kraweckuiu tohdy wolno takoho pohrabit, jako sie napisało u wierszu trynastom, y na panow sudowych zostawuiem winu nechay takiy winny desiet zołotych polskich zapłatyt, a to dla toho że jch miłost dopomohut nam jako starszyie winnoho karaty, a my maiem y winny budem miestu tuiu posłuhu otprawowat jako ludy cechowyie u cechowych miestach otprawuiut, do toho z tych naszych składok bratskich brata naszeho ubohaho maiem darmo khdy umret chowat a ku fale Bożey do cerkwi sweczu stawit, a dla pohrebu y jnnych swaz y sukna maiet miet dla bratiy kraweckoy lub też y chto jnszy nas kto budet zodat, za neho radoiu słusznoiu nie maiem nikumu boronit, a tym brata naszeho utot czas nedostatneho maiem bratskim ratowat,

Kotoryj tot wilkier ot nas uradu meskoho pozwołeny, także y tyie artykułu jch krawcow meszczan disenskich kazali jesmo do knih meskich disenskich zapisat szto iest zapisano, s kotorych y sey wypis pod naszoiu meskoiu ratusznoiu peczatiu y s podpisom własnych ruk naszych, także s podpisem ruki moieie pisarskoie

wyszey menowanym osobam mieszczanom y krawcom disenskim jest wydan Pisan w Disne.

U tego wilkierzu przy pieczęci mieskiey, podpisy rąk tymi słowy, Petr Jhorewicz pisar mesta disenskoho, Albrycht Jesman podstarosci j(ego) k(rólewskiey) m(oś) ci y prezydent dzisnięskiego miasta m(ano) p(roprya) Konstanty Rosicki podstarości y łantwoyt dzisnięski ręką swą. Jan Kozłowski podstarości y łantwoyt dzisnięski ręką swą, dla mieysca j(ego) m(oś)c pana Konstantego Rosickiego podstarosciego y łantwoyta dzisnięskiego, Stefan Suszcz ręką swą, Atrochym Jwan burmistrz disenski rukoju własnoiu, Prochor Fiedorowicz osoba radca disenski rukoiu własnoiu, Radyon Dawidowicz radca disenski własnoiu rukoiu, w roku tysiecza szestsot trytcat tretiaho henwara wtoraho dnia, Peredemnoiu Sobestyanom Druhowinoiu burmistrom tot wilkier ot remiesnikow remesła kraweckaho był pokładany y prosili abym pod tot wilkier ruku podpisat Sebestyan Drahowina rukoju własnoiu, Wasili Melenkowicz burmistr dysenski *[22]* rukoiu własnoiu, Michayła Pawłowicz burmistr, Jan Bobkowicz burmistr, Aro(ku) 1770 oktobra 7 dnia y ja podług podpisu antecessorow moich do tego wilkierza podpisuię się Karol Obrąpalski podstarości y lantwoyt dzisienski, Stefan Kaszyca burmistr rokuk 1662 m(ese)ca henwara trytcatoho dnia sey zhodliwy y braterski list remesła kraweckaho pered nami burmistrami prez krawcow był pokładany Hryhory Jllinicz burmistr disenski, Mikołay Stefanowicz, burmistrz dzisnięski, correcta zaś tymi słowy skorrehował z knihami tudziesz na maryne sie wyrażoną, roku tysiąc sześć set dziwiędziesiąt trzeciego m(iesią)ca junij siedmnastego dnia ten wilkierz we wszytkim confirmowalismy z tym dokładem, że jako drugie cech wszytkie tak y krawcy z przychodow swych w cechu do rozenych: dwie części maią dać do cerkwi, a trzecią część do koscioła pod utraceniem wilkierza, jezeliby się w tym woli naszey magistratowey sprzeciwili, Alexander Nowkunski podstarosci y łantwoyt dzisięski m(ano) p(roprya) Piotr Suszczewicz burmistrz dzisięski m(ano) p(roprya) Jan Fiedorowicz burmistr dzisięski Antoni Suszczewicz rayca dzisnięski, jako od nieumieiętnego pisma pana Amelana Borodulskiego raycy ręke podpisałem, Ludwik Wincenty Bobkowicz pisarz dzisn(ięski), Ludwik Wincenty Bobkowicz pisarz dzisięski m(ano) p(roprya),

Ktory takowy wilkierz, za podaniem ad acta przez wysz pomienienych osob jest do xiąg j(ego) k(rólewskiey) m(oś)ci magdeburskich dzisnięskich zapisany — Wypis wydany.

*Ф. 1757. — Воп. 1. — Спр. 10. — С. 16–22.*

## Пераклад

*[16]* № 11. 5 чэрвеня 1776 году.

На ўрадзе яго каралеўскай мосці дзісненскай магдэбургіі перад намі бурмістрамі, радцамі і лаўнікамі места яго каралеўскай мосці Дзісны,

засядаючымі таго году для спраў, стаўшы асабіста ў суду славетныя Павел Шыманоўскі і Лявон Васілеўскі, цэхмістры рочныя, ад імя ўсяго брацтва кравецкага цэху падалі вількер цэхавага ўкладу да кніг дзісненскай магдэбургіі, якога змест наступны:

Выпіс з мескіх актавых кніг гаспадарскага места Дзісны. Году ад нараджэння сына Божага 1632, месяца лютага 27 дня. Бурмістры, радцы і лаўнікі гаспадарскага места Дзісны, у цяперашнім 1632 г. адпраўляючыя справы ў ратушы, знаёмім і паведамляем кожнаму, каму б аб тым трэба было ведаць, што прыйшоўшы да нас у ратушу мяшчане гэтага места Дзісны, асобы кравецкага рамяства, менавіта пан Мікалай Ходка радца, Васіль Хайноцкі, Ян Парадня, Якім Катэнскі, Барыс Рослы, Фёдар Васілевіч, Фёдар Латыка, Рыгор Тамілёнак, Сямён Аляксеевіч Тур, Стэфан Нарбутовіч, Крыштаф Матвеевіч, Іван Ламтэвіч, Міхайла Рослы, Нестар Голуб, Даніла Шчасновіч, Альхім Іванавіч, уносілі да нас сваю просьбу, тэрмінова жадаючы тое, каб урад для лепшага парадку між імі ў кравецкім рамястве ўласным іх накладам і коштам па прыкладу места Полацку дазволілі мець брацтва і кравецкі цэх і спісаўшы ўсё згодна дастатку артыкуламі, як яны паміж сабой у тым сваім цэхавым кравецкім брацтве *[17]* павінны радзіцца і кіравацца, нам растлумачыўшы і даносячы да ведама, паклалі, абяцаючы і згаджаючыся ўсе аднастайна паводле тых сваіх усіх артыкулаў чулліва і хіба ў згодным браталюббі на любы час захаваць і поўніць, і нам, ураду, ва ўсім былі паслухмянымі. А мы, дзісненскі мескі ўрад, захоўваючыся згодна з народным правам з саксону, лісту 380, дзе пішацца, што рамеснікі падлягаюць уладзе і загадам бурмістраў і рады, а яны павінны нават паміж сабой сходкі свае і зборышчы ў сваіх цэхах і там жа аб сваіх ка́тах і іншых рэчах, патрэбных ім і той жа стараны, каб ім было падана сумесна радзіць і правініўшыхся караць і ўшчуваць, брацццю сваю абы ні ў чым тым, што загадана было, не выступалі і калі які цэх лістоў або пацвярджэння на членаў сваіх патрабаваў, то ім ад радцаў будуць дадзены.

Тады мы, убачыўшы тую просьбу іх мяшчан дзісненскіх слушнай, а да таго зычачы, каб тыя краўцы ў такім цудоўным сваім брацтве на доўгі час захоўваючыся да Божай хвалы ў святой царкве памнажалі і месту пачцівасць і паслухмянасць як краўцы места Полацка чынілі, тое брацтва кравецкае паводле іх саміх пастановы, і артыкулаў у месце Дзісне мець і ўжываць ім дазваляем. Тыя краўцы мяшчане места Дзісны самі і нашчадкі іх будуць моцныя і вольныя ў тым сваім цэхавым кравецкім брацтве захоўваючыся на кожны час паводле тых сваіх артыкулаў па прыкладзе цэху места Полацка на вечныя часы радзіць і кіраваць і моцна неадменна прытым стоячы трымаць, у чым ім ніхто ніякай перашкоды чыніць і цяжкасці задаваць не маюць і магчы ніколі не будуць на вечныя часы. А для лепшага і дасканалага пацвярджэння пры гэтым нашым урадавым дазволе і тыя артыкулы ўсе праз іх саміх устаноўленыя і нам на пісьме паказаныя казалі слова ў слова да кніг мескіх упісаць, якія ўпісваючы такія ў сабе ёсць:

Мікалай Ходка радца, Васіль Ханацкі, Ян Парадня, Якім Каленскі, Барыс Рослы, Фёдар Васілевіч, Фёдар Латыка, Грыгорый Тамілёнак, Сямён Аляксеевіч, Стэфан Нарбутовіч, Крыштаф Матвеевіч, Іван Ламтэвіч, Міхайла Рослы, Несцер Галубовіч, Даніла *[18]* Шчасновіч, Альхім Іванавіч, чынім вядома тым нашым схадлівым аднастайным устаноўленым братэрскім лістом, што маючы мы наданы дазвол ад тутэйшага мескага дзісненскага ўраду на наша цэхавае кравецкае брацтва, у тым нашым брацтве жадаем мы, каб парадак захаваны і падтрымліваемы быў між намі, старшымі і малодшымі, па прыкладзе і звычаю брацтва і цэху места Полацку, пастанавіўшы па дастатку артыкулы як у тым брацтве паміж сабою ў любві братэрскай кіравацца і поўніць маем, усё значнае на пісьмо выразіўшы і завёўшы моцна і неадменна ўжываючы трымаць і мець на будучыя часы хочам.

А менавіта першы артыкул так устанаўліваем: 1, на кожны год па два старасты ад нас маюць быць абраныя і засядаць. Дзе кожны таварыш, а болей вучань, які рамяству дасканала навучыўся, за брата да брацтва хацеў упісацца, той павінен упіснога даць 6 коп грошаў да брацкай скрынкі.

2, сходка братэрская мае быць у вызначаны дзень, дакладней у дзень нядзельны, за два тыдні да той сходкі прыйшоўшы маем кожны з нас даваць да скрынкі па аднаму грошу, а ў сухія дні па тры грошы польскія.

3, а калі які брат з нядбайства да сходкі калі не прыйдзе, а болей слушна не растлумачыць, за тое мае даць штрафу паўбязмена воску.

5, краўчыкі дзе б да той сходкі ад нас устаноўленай, які таксама не хацеў прыйсці, а болей і прыйшоўшы да скрынкі сваёй па грошу польскаму ад нас ухвалена не даў, то мае віны даць воску адзін фунт.

6, вінаватага брата з братам паміж сабой будзем караць, гэта значыць калі б брат наш каму сукно папсаваў, а той бы да нас на такога са скаргаю звярнуўся, або брат брата зняважыў злым словам або таксама ў чым бы быў старшым нашым і нам самім непаслухмяны, а калі б нам у тым будучы вінны супраціўляўся, тады мае даць віны воску паўбязмена, а аддаўшы віну перад сабой мае наказ старасцін чыніць.

7, таксама калі б нам ад якога з краўцоў што злое зрабілася, між сабой маем караць за такія рэчы. Каб былі старшым паслухмяныя і па вуліцах на сорам наш каб не брадзілі, бо дзе б якога з іх падсцеражэ брат, калі які з іх неслушна пачынае, можа аб'явіць нашаму старшаму, а старшы можа ад сябе брата паслаць да старшага іх таварыша, дамаўляючыся на *[19]* пакаранне за тую яго збродню. А таварыш з прыданымі ад нас двума братамі для рассудку слушнага мае таварыша віноўнага караць віной, гэта значыць няхай дасць воску паўбязмена.

8, а пахолкі, што разумеецца паўтаварыша, калі б наказанай віны не маглі заплаціць, на зэдэль палажыўшы віна.

9, а што таксама які з іх робіць і чаго кольвек з варштату ім паданага згубіць, няхай адкупляе ўсё. На работы да каго калі б і на сяло за ведамам старшага няхай ходзяць пад тымі вінамі. А тое для таго, каб брат наш у заплаце або якой іншай прычынай ні ў чым не крыўдзіў. А калі б наважыўся ісці на работу без ведама старшага брацкага — віна на таварыша і пахола як вышэй напісана ў гэтым жа параграфе.

10, хлопцы таксама, калі б брат наш прыняў да навукі, няхай яго ў брацтве зараз азнаёміць, а няхай яго далей як два тыдні не ўмовіўшы і не ўпісаўшы да брацтва не трымае. А тое для таго, каб хлопцу год не працягнуў, калі ад упісання год пачынаецца, а няхай упіснога хлопец дасць да скрынкі 6 грошаў. А калі б у той рэчы брат правініўся, няхай дасць 2 фунты воску.

11, калі хлопец брату нашаму добра даслужыўшы, мае яго брат вызваліць перад браццяй у брацтве. А няхай дасць хлопец за вызваленне да скрынкі 8 грошаў.

12, хлопец, калі прыйдзе да гасподы, дзе да сходкі збіраюцца, мае даць уступнага 18 грошаў за тое, што яго брацця прыйме за пахола. А пісар мае яго да брацкага тварыскага рэестру ўпісаць, чый ён ёсць сын, дзе і ў каго рамяству вучыўся. А ён пісару мае даць польскі грош.

13, калі б у чым правініўся паміж намі брат, гэта значыць калі б яго паклікалі, каб быў на сходцы для якога важнага і мудрага суджэння або перамовы, а ён бы не прыйшоў, няхай нам будзе вольна такога караць, гэта значыць няхай дасць паўбязмена воску. А калі не захоча, то яго, упрасіўшы слугу ў паноў, з слугой урадавым можна будзе парабаваць. Таксама і таварыша і пахола як вышэй ёсць віна на іх апісаная.

14, таварыш наш, або і брат наш, калі б правініўся, за тую правіну быў бы годны зняволення, гэта значыць калі б таварыш брата пабіў або таму падобнае што ўчыніў, а той брат на яго б скардзіўся ў брацтве, а ён бы не стаў на нашым рассуджэнні, тады *[20]* не мае далей апеляваць, толькі да двух рочных паноў радцаў, якіх на той час да брацтва для рассуджэння ўрадавага ў іх міласцей паноў будзем прасіць. І калі б таго вінным прызналі паны радцы, што годны зняволення, тады віны заплаціўшы за супраціўленне паўбязмена воску, зняволення няхай церпіць у вежы не далей, як толькі дзве гадзіны. А панам радцам няхай сам вінны пагодзіцца за віну, а аб зняволенні таксама іх міласцей паноў прасіць мае, абы нявіннага не баранілі для таго, каб злосць не множылася.

15, а калі б які ці прыхожы, ці тутэйшы кравец у месце Дзісне наважыўся па паданай нам моцы ад судовых паноў дзе рабіць ад нас патаемна, такога вольна будзе са слугой урадавым тую яго работу парабаваць да брацтва для таго, каб нам не перашкаджаў і каб з намі заадно быў, хаця б і пажытак месту чыніў.

16, калі брат наш у якую віну патрапіў і той бы віны з упёртасці плаціць не хацеў, тады, упрасіўшы ў паноў урадавага слугі, вольны за тую віну парабаваць.

17, на пагрэб брата нашага маем збірацца згодна з пасланнем ад нашых старшых. А калі б які з нас, ведаючы аб тым, на пагрэб не прыйдзе, за тое мае даць віны адзін грош. Таксама таварыш і пахол тым жа спосабам грош віны мае плаціць.

18, сын нашага брата, калі б даросшы сваіх гадоў умеў рамяство, не мае даваць нічога ўкупнога да брацтва з-за заслуг свайго бацькі, толькі пачастунак у брацтве ўчыніць.

19, таварыш і пахол, калі б падчас сходкі з-за патрэб сваіх не хацеў быць у сходцы, няхай перад ёй прыйшоўшы да сходкі старшаму паведаміць, чаму не можа быць. А старшы ўбачыўшы прычыну яго слушнай, ад сходкі вызваліць. А калі б таварыш або пахол не меў чаго даць у сходку, таму што сабе не зарабіў з-за тэрміновай майстровай работай, то яму майстар на тое мае даць. А калі б не зарабіў з-за таго, што работы не меў, мае яму быць скасавана і да другой або трэцяй сходкі, а ён зарабіўшы мае даць.

20, а калі б брат наш які, наганіўшы ўсё наша брацтва, ад нас з дазволу ўрадавага ускаржаннага выбівацца хацеў з брацтва, тады няхай пярвей за тое брацтву віны заплаціць камень воску, а потым і рамяства *[21]* зрачыся такі мае. А дзе б потым яго брацтва застала робячы работу кравецкую, тады вольна такога парабаваць, як напісана ў вершы 13, і на паноў судовых пакідаем віну, няхай такі вінны 10 польскіх злотых заплаціць. А тое для таго, што іх міласці памогуць нам як старшыя віноўнага караць, а мы маем і будзем павінны месту тую паслугу адпраўляць, як людзі цэхавыя ў цэхавых местах адпраўляюць.

Да таго з тых нашых складак брацкіх брата нашага ўбогага маем дарма, калі памрэ, хаваць, а для хвалы Божай да царквы свечку ставіць, а для пагрэбу і іншага, і сукна маем выдаткаваць для кравецкай брацці. Ці таксама і хто іншы з нас, хто будзе задзеты, за яго радай слушнай не маем нікому бараніць, а тым брата нашага у той час недастатнага маем брацкім ратаваць.

Той вількер ад нас, ураду мескага, дазволены, таксама і тыя артыкулы іх краўцоў мяшчан дзісненскіх казалі да кніг мескіх дзісненскіх запісаць. Што ёсць запісана. З якіх і гэты выпіс пад нашай мескай ратушнай пячаткай і з подпісам уласных рук нашых, таксама з подпісам рукі маёй пісарскай вышэй згаданым асобам мяшчанам і краўцам дзісненскім выданы. Пісаны ў Дзісне.

У тым вількеру пры пячатцы мескай подпісы рук тымі словамі: Пётр Ігаравіч пісар места дзісненскага, Альбрыхт Есман падстараста яго каралеўскай мосці і прэзідэнт дзісненскага места ўласнай рукой, Канстант Расіцкі падстараста і лантвойт дзісненскі сваёй рукой, Ян Казлоўскі падстараста і лантвойт дзісненскі сваёй рукой, для мейсца яго мосць пана Канстанта

Расіцкага падстарасты і лантвойта дзісненскага, Стэфан Сушч рукой сваёй, Атрахім Іван бурмістр дзісненскі рукой уласнай, Прохар Фёдаравіч асоба радца дзісенскі рукой уласнай, Радыён Давідавіч радца дзісенскі ўласнаю рукою. У годзе 1633 студзеня 2 дня. Перада мной Себасцьянам Другавінай бурмістрам той вількер ад рамеснікаў рамяства кравецкага быў пакладзены і прасілі, каб пад той вількер руку падпісаць. Себасцьян Другавіна рукой уласнай, Васіль Меленковіч бурмістр дзісенскі *[22]* рукой уласнай, Міхайла Паўлавіч бурмістр, Ян Бабковіч бурмістр. А 7 кастрычніка 1770 году і я паводле подпісаў продкаў маіх да таго вількера падпісваюся: Караль Абрампальскі падстараста і лантвойт дзісенскі, Стэфан Кашыца бурмістр. 30 студзеня 1662 году гэты схадлівы і братэрскі ліст рамяства кравецкага перад намі бурмістрамі праз краўцоў быў пакладзены: Грыгорый Іллініч бурмістр дзісенскі, Мікалай Стэфанавіч бурмістр дзісненскі. Папраўка тымі словамі паправіў з кнігамі таксама выражана: 17 чэрвеня 1693 году той вількер ва ўсім пацвердзілі з тым дакладам, што як другія ўсе цэхі, так і краўцы з прыбыткаў сваіх у цэху да розных: дзве часткі маюць даць да царквы, а трэцюю частку да касцёла, пад пагрозай страты вількера, калі б спрацівіліся ў тым нашай магістратавай волі. Аляксандр Наўкунскі падстараста і лантвойт дзісненскі ўласнай рукой, Пётр Сушчэвіч райца дзісненскі, як ад непісьменнага пана Амеляна Барадульскага райцы руку падпісаў Людвік Вінцэнт Бабковіч пісар дзісненскі, Людвік Вінцэнт Бабковіч пісар дзісенскі ўласнай рукой.

Гэты вількер пасля падачы да канцылярыі праз вышэй згаданых асоб ёсць да кніг яго каралеўскай мосці магдэбургскіх дзісненскіх запісаны. Выпіс выдадзены.

*А. А. Лашкевіч*

## Чыгуначная жандармерыя ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (па дакументах НГАБ)

У артыкуле зроблена спроба вызначыць асноўныя накірункі дзейнасці жандарскай паліцыі на чыгунках, якія праходзілі праз Беларусь і прылеглыя да яе рэгіёны. Крыніцамі для падрыхтоўкі публікацыі з’явіліся адпаведныя фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі: «Гомельскае аддзяленне Віленскага жандарскага паліцэйскага ўпраўлення чыгунак» (1907–1915 гг.), «Дзвінска-Віцебскае аддзяленне Смаленскага жандарскага паліцэйскага ўпраўлення чыгунак» (1890–1901 гг.), «Мінскае жандарскае паліцэйскае ўпраўленне чыгунак» (1873–1905 гг.) і «Жандарскае паліцэйскае ўпраўленне Мітава-

Рыга-Ялецкай і Маскоўска-Смаленскай чыгунак» (1868–1872 гг.). На жаль, прыведзеныя архіўныя крыніцы налічваюць не вельмі шмат адзінак захоўвання. Найбольш інфарматыўны ў гэтым плане фонд Мінскага ўпраўлення, які налічвае 18 спраў. У астатніх знаходзіцца не болей за адну-дзве адзінкі. Асноўнае месца сярод змешчаных у іх дакументаў займаюць загады начальнікаў упраўленняў, а таксама загады і цыркуляры вышэйшых інстанцый, а менавіта начальніка Асобнага корпуса жандараў і Дэпартамента паліцыі МУС, паслужныя спісы афіцэраў і ўнтэр-афіцэраў і інш.

Жандарскія паліцэйскія ўпраўленні чыгунак існавалі паралельна з тэрытарыяльнымі (губернскімі, а ў шэрагу мясцовасцей і павятовымі) упраўленнямі. У сферу адказнасці першых уваходзіла як непасрэдна сама чыгунка, так і чыгуначная паласа адчужэння. Кожнае такое ўпраўленне займалася аховай парадку на падведамаснай яму адной ці некалькіх чыгунках.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі, як і ў іншых месцах, жандарскія паліцэйскія ўпраўленні чыгунак узнікалі паралельна з развіццём чыгуначнай сеткі. У 60–70-я гады пазамінулага стагоддзя, калі сыходзіць з маючых у нашым распараджэнні дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, тут існавалі адпаведныя ўпраўленні на Мітава-Рыга-Арлоўскай і Маскоўска-Брэсцкай чыгунках. На кастрычнік 1868 г. паліцэйскае ўпраўленне першай складалася з наступных аддзяленняў, якія курыравалі пэўныя ўчасткі дарогі: Мітава-Рыга-Дынабургскі, Дынабургска-Віцебскі, Віцебска-Рослаўскі і Рослаўска-Арлоўскі. Само ўпраўленне месцілася ў Віцебску [1, арк. 1–1адв.].

Па імператарскаму указу ад 15 кастрычніка 1869 г. вышэйзгаданае ўпраўленне пераўтварылася ў жандарскае паліцэйскае ўпраўленне Мітава-Рыга-Ялецкай і Маскоўска-Смаленскай чыгунак. У сувязі з гэтым стварыліся тры новыя аддзяленні: Арлоўска-Ялецкае, Смаленска-Вяземскае і Маскоўска-Вяземскае [1, арк. 46 адв.–47 адв.]. У 1870 г. яго структура была ўдасканалена і складалася з сямі аддзяленняў, якія абслугоўвалі наступныя тэрыторыі: 1-е аддзяленне — ад Мітавы да Дынабурга, 2-е — ад Дынабурга да Віцебска, 3-е — ад Віцебска да Рослава, 4-е — ад Рослава да Оршы, 5-е — ад Оршы да Яльца, 6-е — ад Смаленска да Гжацка, 7-е — ад Масквы да Гжацка [2, арк. 1–1 адв.].

У жніўні 1870 г. жандарскія паліцэйскія аддзяленні на Маскоўска-Смаленскай чыгунцы былі перададзены ў склад жандарскага паліцэйскага ўпраўлення Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, а гэта ўпраўленне пераіменавана ў адпаведнае ўпраўленне Мітава-Рыга-Ялецкай чыгункі. У кастрычніку таго ж года яно пераўтварылася ў жандарскае паліцэйскае ўпраўленне Рыга-Царыцынскай і Волга-Данской чыгунак [2, арк. 29–29 адв., 32 адв.].

У фондах НГАБ захоўваюцца загады начальніка Мінскага жандарскага паліцэйскага ўпраўлення чыгунак, па якіх можна вызначыць структуру і сферу кампетэнцыі гэтай установы. Так, адпаведна загаду № 1 ад 1 мая 1873 г. яна складалася з начальніка і ад'ютанта ўпраўлення, шасці начальнікаў аддзяленняў, 175 унтэр-афіцэраў і двух пісараў. У сферу адказнасці Маскоўскага аддзялення ўваходзіла падтрыманне парадку ў чыгуначнай паласе ад Масквы да Вязьмы, Смаленскага — ад Вязьмы да Оршы, Мінскага — ад Оршы да станцыі Негарэлае, Брэсцкага — ад станцыі Негарэлае да Брэст-Літоўска [3, арк. 1]. Загад № 8 ад 6 чэвеня таго ж года вызначыў тэрыторыю адказнасці Бабруйскага (чыгуначная паласа ад Мінска да Гомеля) і Гомельскага (ад Гомеля да Ромнаў) аддзяленняў [3, арк. 3 адв.]. Крыху пазней у загадзе № 19 ад 30 чэрвеня 1873 г. абвяшчалася зацверджаная штабам Асобнага корпуса жандараў схема адказнасці аддзяленняў Мінскага жандарскага паліцэйскага ўпралення чыгунак. Маскоўскае аддзяленне апекавалася паласою ад Масквы да станцыі Аляксандраўская Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, Смаленскае — ад станцыі Аляксандраўская да станцыі Крупкі той жа чыгункі, Мінскае — ад станцыі Крупкі да Мінска па Маскоўска-Брэсцкай чыгунцы і ад Мінска да Вілейкі па Ландварава-Роменскай (з 1876 г. Лібава-Роменскай) чыгунцы, Брэсцкае — ад Мінска да Брэст-Літоўска па Маскоўска-Брэсцкай чыгунцы, Бабруйскае — ад Мінска да Гомеля па Ландварава-Роменскай чыгунцы, Гомельскае — ад Гомеля да Ромнаў па той жа чыгунцы [3, арк. 5 адв.–6 адв.]. На чыгуначныя станцыі, што знаходзіліся ў межах кампетэнцыі адпаведных аддзяленняў упраўлення, прызначалася пэўная колькасць унтэр-афіцэраў дзеля непасрэднага забеспячэння парадку на дадзеных аб'ектах.

У 1882 г. на Мінскае жандарскае паліцэйскае ўпраўленне чыгунак быў ускладзены нагляд за Жабінкаўска-Пінскай чыгункай, якая тады яшчэ будавалася. З гэтай мэтай начальнік упраўлення выдаў 30 лістапада адпаведны загад № 87 наконт стварэння новага аддзялення [4, арк. 23 адв.].

Загадам па вайсковаму ведамству 27 сакавіка 1887 г. у сувязі з імператарскім распараджэннем ад 19 лютага Мінскае жандарскае паліцэйскае ўпраўленне чыгунак, у ліку іншых устаноў таго ж кшталту, скасоўвалася і праводзілася пераразмеркаванне чыгуначных шляхоў паміж наноў створанымі ўпраўленнямі, у прыватнасці Маскоўска-Брэсцкім упраўленнем з яго размяшчэннем у Маскве. Пад апеку апошняга пераходзіла і Маскоўска-Брэсцкая чыгунка. Ёю павінны былі займацца Маскоўскае, Смаленскае, Мінскае і Брэсцкае аддзяленні наноў створанага ўпраўлення [5, арк. 1–1адв.].

Крыху пазней межы адказнасці аддзяленняў былі ўдакладнены. Маскоўкае аддзяленне кантралявала тэрыторыю ад Масквы да станцыі

Серга-Іванаўская, Смаленскае — ад станцыі Серга-Іванаўская да станцыі Асіпаўка, Мінскае — ад станцыі Асіпаўка да станцыі Стаўбцы, Брэсцкае — ад станцыі Стаўбцы да Брэст-Літоўска [5, арк. 17–17адв.]. На Маскоўскае ўпраўленне ўскладаўся абавязак забяспечваць парадак і на Арлоўска-Віцебскай чыгунцы, для гэтага на ёй былі створаны два аддзяленні: Арлоўскае і Рослаўска-Віцебскае (месцілася ў Смаленску) [5, арк. 13–13 адв.].

З 1895 г. па дакументах архіўных фондаў НГАБ зноў праходзіць Мінскае жандарскае паліцэйскае ўпраўленне чыгунак з цэнтрам у Мінску. Колькасць яго аддзяленняў у гэты час налічвала адзінаццаць: Бабруйскае, Баранавіцка-Беластоцкае, Бранскае, Вілейска-Мінскае, Гомельскае, Лібаўскае, Лідскае, Мазырскае, Пінскае, Ровенскае, Шавельскае [6, с. 2].

У маі 1905 г. цэнтр Мінскага жандарскга паліцэскага ўпраўлення чыгунак быў перанесены ў Вільню, у сувязі з гэтым з чэрвеня 1905 г. яно пераіменавана ў Віленскае жандарскае паліцэйскае ўпраўленне чыгунак. Больш дакладныя звесткі наконт узнікнення Мінскага і Віленскага ўпраўленняў у архіўных фондах адсутнічаюць.

архіва Беларусі (НГАБ), дзе прадстаўлена 20 гаспадарчых апісанняў за 1586–1881 гг. [6]. Аб'ектам увагі ў даследаванні абраны інвентар маёнтка Святы Двор, уласнасці Міхала Казіміра Радзівіла па мянушцы Рыбанька, за снежань 1756 г., вытрымкі з якога апублікаваны ў дадатку [8]. Інвентар складаецца: з апісання двара Святы Двор [8, арк. 2–5], касцёла і капліцы [8, арк. 5–6], корчмаў у Магільне, Касцяшах [4], Літве [5] і Пасадскіх [6] [8, арк. 6–7], млыноў у Касцяшах, Дварцы [7], Яршах [8] [8, арк. 7–8], фальваркаў Лабоцкія [9] і Літва [8, арк. 9], агародаў у фальварках Лабоцкія і Яршы [8, арк. 10–14]; пераліку двароў мястэчка Магільна з азначэннем падаткаў і павіннасцей жыхароў [8, арк. 15–21], двароў Касцяшы, Яршэвічы [10], Замосце [11], Лунін [12] і Галавачы [13] з пазначэннем падаткаў і павіннасцей жыхароў [8, арк. 22–31], двароў засценкаў Луцэвічы [14], Падсадскія, Андрушы [15], Язвіны [16], Стальбоўшчына [17] з пазначэннем падаткаў і павіннасцей жыхароў [8, арк. 32–33], паказчыкаў штогадовага жытняга і ярыннага засеву ў маёнтку, пераліку палёў і сенажацяў [8, арк. 33–34], генеральнага сумарыуша аб даходнасці гаспадаркі [8, арк. 35].

Апісанне касцёльных пабудоў і корчмаў дазваляе высветліць умовы царкоўнага жыцця і асаблівасці правядзення вольнага часу для жыхароў маёнтка Святы Двор Навагрудскага ваяводства ў другой палове XVIII ст.

Адной з найбольш інфарматыўных частак інвентароў, што змяшчае звесткі па гісторыі штодзённасці, з'яўляюцца ўставы аб павіннасцях жыхароў, якія маюць выгляд унармаванай інструкцыі для местачкоўцаў, сялян і зямян адносна гаспадарчых аспектаў іх жыццядзейнасці.

---

[4] Касцяшы — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[5] Літва — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[6] Маюцца на ўвазе Падсадскія — в. Сямёнавіцкага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[7] Цяпер не існуе.

[8] Яршы — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[9] Лабоцкія — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[10] Магчыма, маюцца на ўвазе сучасныя Яршы — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[11] Замосце — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[12] Маецца на ўвазе Луніна — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[13] Галавачы — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[14] Цяпер не існуе. У першай палове XIX ст. засценак Луцэвічы меў назву Лазараўшчына. Яго месца знаходжання лакалізуецца на паўночным захадзе ад в. Літва Уздзенскага р-на.

[15] Андрушы — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[16] Язвіны — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

[17] Стальбоўшчына — в. Нёманскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

Традыцыйная ўстава складаецца з вызначэння: колькасці падатку з валокі, што выплочваўся жыхарамі маёнтку ў пэўны дзень; умоў адпрацоўкі паншчыны і выплаты чыншу і дзяклы; выканання гвалтаў, згонаў, талок і іншых павіннасцей; працы над узвядзеннем мастоў і грэбляў, пабудовай млыноў; асаблівасцей пчалаводства.

У дадатку прадстаўлены тры ўставы для местачкоўцаў (у крыніцы — мяшчан), сялян (у тым ліку баяр) і зямян маёнтку Святы Двор, складзеныя ў сціслай форме з кароткім пералікам усіх вышэй згаданых пазіцый і тлумачэннем іх сутнасці для названай мясцовасці.

Уставы аб павіннасцях жыхароў маёнтку сведчаць аб дакладнай рэгламентацыі гаспадарчых паводзін яго жыхароў. Выплата чыншу местачкоўцамі, чыншу і дзяклы сялянамі, лаконшчыны зямянамі праводзілася ранкам напярэдадні свята Раства Хрыстова.

Жыхарамі мястэчка гадавая выплата грашовага падатку ажыццяўлялася ў агульным памеры 79 грошаў, сялянамі — 88, баярамі з Галавачоў — 80, баярамі з Луніна — 64. Павіннасцямі для мяшчан былі — падводная, дарожная, талочная, праца ў Альбенскім звярынцы [18] пад Нясвіжам («пракладка вуліц і прасёлкаў звярыных»), пчалярства і рыбалоўства. Сяляне выконвалі вартаўнічую павіннасць, хадзілі на гвалты, займаліся пчалярствам. Баяры-чыншавікі — пчалярствам і працай у Альбенскім звярынцы. Зямяне пастаўлялі са сваіх гаспадарак для вайсковых патрэб па адным кані, да судовай юрысдыкцыі радзівілаўскай адміністрацыі яны не належалі.

З усяго сказанага можна зрабіць выснову аб значнай інфарматыўнасці ўстаў аб павіннасцях сялянскага насельніцтва аднаго асобна ўзятага прыватнаўласніцкага маёнтку Наваградскага ваяводства. Даследаванне штодзённага жыцця асобных катэгорый сялянства дазваляе вызначыць іх побытавыя адрозненні, падзел працы, узровень прадукцыйніх сіл, уплыў на развіццё сістэмы мясцовага гаспадарання і сельскагаспадарчых працэсаў.

Варта падкрэсліць, што працоўная дзейнасць адкладвала пэўны адбітак на светаўспрыманне чалавека, фарміравала кола вызначаных навыкаў і ўменняў. Асаблівасцю насельніцтва маёнтку Святы Двор з’яўлялася значная занятасць у добраўпарадкаванні Альбенскага лясніцтва і пчалярстве.

---

[18] Альбенскі звярынец — лясны масіў у Нясвіжскім княстве Радзівілаў, які быў прыстасаваны да развядзення жывёлы і палявання. Атрымаў назву ад паселішча Альба каля Нясвіжу.

## Крыніцы і літаратура

1. Акты Виленской археографической комиссии (АВАК). — Т. 14. — С. 435–444.
2. Голубеў, В. Ф. Паганскія і хрысціянскія традыцыі ў паўсядзённым (сямейным) жыцці сялян Беларусі ў XVI–XVIII стст. / В. Ф. Голубеў // Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць : зборнік матэрыялаў Рэспубліканскай навукова-творчай канферэнцыі, 19 сакавіка 2009 г. — Мінск, 2009. — Т. 2. — С. 50.
3. Голубеў, В. Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. — Мінск : Беларуская навука, 2008.
4. Гурын, М. Радзівіл Мікалай Крыштоф // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя. — Т. 2: К–Я. — Мінск, 2006. — С. 494–495.
5. Кром, М. М. История повседневности: сборник научных работ ; вып. 3. — СПб., 2003. — С. 8.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — КМФ 5. — Воп. 1. — Спр. 2482–2502.
7. НГАБ. — КМФ 5. — Воп. 1. — Спр. 2484.
8. НГАБ. — КМФ 5. — Воп. 1. — Спр. 2492–2.
9. Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Уздзенскага р-на. — Мінск, 2003. — С. 634.
10. Полное собрание русских летописей. — Т. 32: Хроники: Литовская и Жомойтская, и Быховца. — М., 1975. — С. 25, 132; Т. 35: Летописи белорусско-литовские. — М., 1980. — С. 217–218.
11. Archiwum Glówny Akt Dawnych (AGAD). Archiw Radziwiłłów (AR). — Dz. XXIII. — Nr. 97.
12. AGAD. AR. — Dz. XXV. — Nr. 2483.
13. Mikulski, W., Zawadzki, J. Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. — Warszawa, 1999. — S. 53–55.

## Дадатак

Палітарнае транскрыбіраванне дакументаў было выканана з захаваннем тагачасных асаблівасцей польскамоўнага арыгінала. Пры публікацыі дакументаў выкарыстаны наступныя правілы: існуючыя скарачэнні раскрываюцца ў простых дужках; нумар аркуша актавай кнігі пазначаецца ў дакуменце ў квадратных дужках курсівам; літары “ż, ę, ą, ł, ń, ś, ć, ó” транскрыбіраваны, як у арыгінале, таксама як і вялікія літары напачатку слоў; знак пераносу (–) у канцы радкоў апушчаны; прапушчаныя літары змешчаны ў цвёрдых дужках; нерасчытаныя словы адзначаны трохкропьем; пачатак радка адзначаны прамой рыскай; зроблены пераклад на сучасную беларускую мову.

## Дакумент 1

**1756.12.? — Устава павіннасцей жыхароў мястэчка Магільна.**

*[21]* Powinność miasteczka Mohylny.

Mieszczanie Czynsz swoy podlug tego Inwętarza wczesnie przed Bożym | narodzeniem do Swiętego Dworu oddawać powińni, to iest z placu osia | dlego tak Rynkowego jako y ulicznego po Tynfowi, iednemu, z Placu | Przyiemnego po Tynfowi iednemu, z Płacu podłużnego po Tynfowi Żadne | mu, z placu Zaś podłuznego pustego po dwa Szostaki bite z placu Gumen | nego po Groszy dziesięć sprzętu ogrodowego po groszu iednym z | Włoki Polowey Mieyskiey p[o] złł(otych) pięć. Przeroby zas poniewaz się w Lasach | naydują, z ktorych do tąd odsyp do Swiętego Dworu dawali na węgły | Zaczym na Wiosne wymiar ma być tych rozrobow dla wiadomości wiele ma | być z nich płaty. Przytym ciż mieszczanie Mohilenscy Czasu zniwa | T[o]łokę do Żniwa po trzy dni w tygodniu poiednemu z chaty aż do sprzą | tnienia zboza pełnie moją. Do pędzenia Tura na rzece Niem | nie dla Łowienia Ryby i Le tego potrzeba będzie | Ciż mieszczanie sie powinni, czasa zaś Zimny Zbo | ze z Folwarku Litwy do Swiętego dworu zwozie | mają o *z[w]ozię* podwody za mil pięć Lub sześć iść | powinni, Miod połowiczny od Pszczoł Miey | skich na Dwor iść ma, a podbieranie onych | przy widzu Dwornym być powinne | do Sypania Grobel do robienia Młynow | iść maią. Tudziesz Przęsła tak | Zwierzynac albienskim Jako y | y Inne ulice y Przęsła Zwie | rzynne Stawia y … [19].

*НГАБ. — КМФ 5. — Воп. 1. — Спр. 2492. — Арк. 21.*

## Пераклад

*[21]* Павіннасці мястэчка Магільна

Мяшчане свой чынш паводле таго інвентара ранкам напярэдадні Божага Нараджэння да Святога Двара аддаваць павінны, то бок з аседлага пляцу, як рынкавага, так і вулічнага пад адным тынфу; з пляцу прыемнага па адным тынфу; з пляцу прадаўгаватага па тынфу ніякаму; з пляцу жа прадаўгаватага пустога па два шастакі бітыя; з пляцу гуменнага па дзесяць грошаў; з рыштунку агароднага па грошы адным; з паловы валокі мейскай па злотых пяць. З тых апрацаваных ўчасткаў, якія дагэтуль у лясах знаходзяцца, мусяць аддаваць да Святога Двара частку вырашчанага; затым па вясне правесці вымярэнне тых надзелаў для агульнай ведамасці і вызначыць памер платы з іх. Прытым тыя ж мяшчане магілянскія, па аднаму з хаты, талакі па тры дні штогод праводзіць мусяць: для поўнага збору жыта ў час жніва, для пагнання

[19] Слова зацемнена.

тура, для лоўлі рыбы на рацэ Нёман і для таго, для чаго патрэба будзе. Тыя ж мяшчане павінны ў зімні час збожжа з фальварку Літва да Святога Двара на падводах адвозіць, на адлегласць у пяць або шэсць міль. Мёд палавічны * ад пчол мясцовых у Двор павінен паступаць, а падбіранне пчол пры відзу ** дворным мае ажыццяўляцца. Да сыпання грэбляў і стварэння млыноў ісці маюць абавязак. Разам з тым павінны вуліцы і прасёлкі звярыныя ў Альбенскім звярынцы пракладваць і … .

* мёд палавічны — палова ад сабранага мёду.

** відз — наглядчык дворны.

Дакумент 2

**1756.12.? — Устава павіннасцей жыхароў вёсак Касцяшы, Яршэвічы, Замосце, Лунін і Галавачы.**

*[31]* Powinność Wsiow Kośćiaszow, Jarszewiczow, Zamoscia, Łunina y Hołowaczow

Czynsze y Dziakła podług tego Inwentarza należące wcześnie przed Bożym na| rodzeniem do Swiętego Dworu oddawać moją Dziakła Zaś Żytne Czasu | Siewby Żytney przystawić powińni jako to z Wloki Ciagłey Czynszu Zlo | tych Cztyry, Dziakła zaś z Wloki Ciagłey Żyta Korcy dwa, miary Prowę | towey Nieświskey Owsa Korcy dwa, Gęś iednę Lub za Gęś Groszy Dwadzieścia | Korow dwoie, Lub za Kurą po Groszy dziesięć, Jaiec dwadzieścia Lub za Jaice | po Szelągu Jednym Plici Kręwnych niewodowych Funtow Cztyry, z Dymu Zaś | cięgłego po Taler Cztery, z Lnu Dwornego z przęć moją z Wloki przyiemney Czyn | szu po złotych dziesięć, płacić powińni. Tudziesz od Pszczoł miodu połowa na | Dwor iść ma, a podbieranie Pszczoł przy widzu Dwornym być powinne. Robo | cizna zaś Ciągłych Ludzi takowa: z Cwierci ciągłey po trzy dni Co tydzien | Latem y Zimą z Czym Dwor Każe zarobić powinni. Oraz Gwałtow sześć. | Latem z Całą Siemią wiele jest w Chacie zostawiwszy tylko jedną dla bes | pieczestwa ognia osobr, w chacie, Ludzie Ciągli pełnie będą. Strożę Ty | godniową y wartę nocną po Dwoch Koleyno służyć mając A Bojaro | wie w Holowaczach mieszkające z Wloki iedney po Złotych Dwadzieścia | Czynszu placić powińni. Także z Włoki iedney dwa dni za Żąć y dwa | dni za Orać. Oraz miodu połowę od Pszczoł swoich do Dworu oddać maję | we Wsi Luninie Czynszom podług zapisania w Linii Czynszu z Włoki | po Złotych Szesnaście placić mają. Do Sypanka zaś Grobel Tudzieś | do stawienia Przęseł. W Zwierzyńcu Albieńskim y Innych grodzenia Ulic | y Przęseł Zwierzynnych wszyscy tak ciągli iako y Czynszom Bojarami | iść powinni.

*НГАБ. — КМФ 5. — Воп. 1. — Спр. 2492. — Арк. 31.*

## Пераклад

*[31]* Павіннасці вёсак Касцяшы, Яршэвічы, Замосце, Лунін і Галавачы

Чынш і дзяклу паводле таго інвентара належыць ранкам напярэдадні Божага Нараджэння да Святога Двара аддаваць. Дзяклу таксама ў жытні час сяўбы павінны з валокі цяглай прадстаўляць, чыншу чатыры злотых выплочваць. Дзяклы жа з валокі цяглай мусіць прадстаўляцца ў памеры: двух карцоў жыта, двух карцоў аўса з ураджайнай нясвіжскай меры, аднаго гуся або дваццаці грошаў замест яго, дзвюх курэй або дзесяці грошаў за адну курыцу, дваццаці яек або аднаго шэлега за адно яйка, чатырох фунтаў плецяў куставых невадовых. З дыму жа цяглага па чатыры талеры абавязаны прадстаўляць, ільну дворнага — прадзь. З валокі прыемнай чыншу па дзесяць злотых плаціць павінны. Разам з гэтым ад пчол палова мёду на Двор паступаць мае патрэбу, а падбіранне пчол пры відзу дворным павінна ажыццяўляцца. Аплата жа для цяглых людзей такая: з чвэрці цяглай па тры дні кожны тыдзень летам і зімой займацца ў Двары вызначанай працай з вызначаным інвентаром. Мусяць выконваць шэсць гвалтаў. Летам з усёй сям'ёй, пакінуўшы ў хаце некага аднаго для аховы яе ад пажару, павінны выходзіць на працу. Стражу штотыднёвую і варту начную абавязаны адбываць паслядоўна па два чалавекі. Баяры, якія ў Галавачах пражываюць, з адной валокі па 20 злотых чыншу плаціць павінны. Таксама за карыстанне адной валокай павінны ў маёнтку два дні жаць і два дні араць. А таксама палова мёду ад пчол сваіх да Двора ім належыць аддаць. У вёсцы Луніне, паводле запісанага, чыншу з адной валокі па 16 злотых маюць плаціць. Да насыпання грэбляў маюць абавязак ісці, як і да стварэння прасёлкаў. У Звярынцу Альбенскім і іншых звярынцах абавязаны займацца пракладкай вуліц і прасёлкаў звярыных.

## Дакумент 3

**1756.12.? — Устава павіннасцей зямян.**

*[33]* Powinność tych ziemian

Łokonszczyzna ci Ziemianie podług tego inwętarza wcześnie przed Bożym | narodzeniem do Swiętego Dworu oddawać mają do innych zaś żadnych po | winności pociągani nie będą oprocz stawienia konia z uslugi woienney | tak jako w Całym Xięstwie Nieświskim. Oraz ciz ziemianie da sę | dzenia się w sprawach swoich nie do Dworu S(węteg0) Dworskiego Lecz do Sędow Ordynackich | X(ęstwa) Nieswiskiego nałeżać będą.

*НГАБ. — КМФ 5. — Воп. 1. — Спр. 2492. — Арк. 33.*

## Пераклад

*[33]* Павіннасці тых зямян

Лаконшчыну * гэтыя зямяне паводле таго інвентара ранкам напярэдадні Божага Нараджэння да Святога Двара аддаваць маюць. Да выканання іншых павіннасцей прыцягнуты не будуць, акрамя пастаўкі каня для вайсковай паслугі, так як і ва ўсім княстве Нясвіжскім. Такжа гэтыя зямяне ў справах сваіх судовых да Двора Свята-Дворскага або да судоў ардынацкіх княства Нясвіжскага належыць не будуць.

* сутнасць тэрміна на сённяшні момант не высветлена. Магчыма, маецца на ўвазе нейкая мясцовая традыцыйная павіннасць.

# Крыніцазнаўства

*В. П. Гарматны*

## Матэрыялы фонду Палескай акруговай зямельнай управы па правядзенні камасацыі на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1921–1933 гг. (па дакументах ДАБВ) [1]

На падставе распараджэння Савета Міністраў ІІ Рэчы Паспалітай ад 23 сакавіка 1921 г. з мэтаю ажыццяўлення зямельнай палітыкі і правядзення аграрнай рэформы на новадалучаных тэрыторыях былі створаны наступныя зямельныя дэлегатуры (аддзяленні): Валынская з цэнтрам у г. Луцк, Навагрудская — у г. Навагрудак і Палеская — у г. Пінск [5, s. 391–392].

Дзейнасць Навагрудскай акруговай дэлегатуры распаўсюджвалася на Баранавіцкі, Валожынскі, Вілейскі, Дзісненскі, Дунілавіцкі, Лідскі, Навагрудскі, Нясвіжскі, Слонімскі і Стаўбцоўскі паветы Навагрудскага, Ваўкавыскі і Гродзенскі паветы Беластоцкага ваяводстваў; Палескай — на Брэст-Бужскі, Драгічынскі, Камень-Кашырскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі і Сарненскі паветы Палескага, Белавежскі павет Беластоцкага ваяводстваў [1, арк. 2].

Палеская акруговая дэлегатура ажыццяўляла нагляд за стварэннем на тэрыторыі Палескага ваяводства зямельнага фонду аграрнай рэформы, кіравала правядзеннем парцэляцыі, узбуйненнем сялянскіх надзелаў і камасацыяй (хутарызацыяй), ліквідацыяй сервітутаў, займалася продажам і перадачай зямель і маёмасці вайсковым і цывільным асаднікам, аказвала садзейнічанне пры меліярацыйных работах і г. д.

Узначальваў акруговую дэлегатуру старшыня (Delegat), які прызначаўся Галоўнай управай зямельнай (GUZ, ГУЗ) ІІ Рэчы

---

[1] Артыкул выкананы ў рамках гранта Музея Гісторыі Польшчы (Muzeum Historii Polski, Варшава, чэрвень 2010 г.). Аўтар выказвае шчырую падзяку супрацоўнікам Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці за дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула.

Паспалітай. У падпарадкаванні дэлегатуры знаходзіліся павятовыя зямельныя камісарыяты, паўнамоцтвы якіх ахоплівалі адзін або некалькі паветаў. Дзейнасцю Палескай акруговай зямельнай дэлегатуры кіравала ГЗУ.

Пры акруговай дэлегатуры функцыянавала акруговая зямельная камісія, у склад якой уваходзілі прадстаўнікі ГУЗ, акруговай дэлегатуры, землеўласнікаў і суддзя акруговага суда. Акруговая зямельная камісія вырашала справы аб прымусовым выкупе зямель, вызначаных для ажыццяўлення парцэляцыі, праводзіла іх ацэнку, а таксама разглядала іншыя спрэчныя пытанні, якія ўзнікалі пад час правядзення зямельнай рэформы [3, s. 143; 4, s. 4].

На падставе распараджэння Савета Міністраў II Рэчы Паспалітай ад 20 сакавіка 1922 г. акруговыя дэлегатуры ліквідаваліся, а замест іх ствараліся акруговыя зямельныя ўправы: Валынская (з цэнтрам у г. Луцк), Навагрудская (г. Гродна) — распаўсюджвала сваю дзейнасць на Баранавіцкі, Валожынскі, Вілейскі, Дзісненскі, Дунілавіцкі, Лідскі, Навагрудскі, Нясвіжскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі паветы Навагрудскага і Ваўкавыскі і Гродзенскі паветы Беластоцкага ваяводстваў, і Палеская Акруговая Управа Зямельная (POUZ, ПАУЗ, г. Пінск) — на Брэст-Бужскі, Драгічынскі, Камень-Кашырскі, Кобрынскі, Касаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі і Сарненскі паветы Палескага і Белавежскі павет Беластоцкага ваяводстваў [6, s. 636; 14, s. 51]. На чале ПАУЗ стаяў старшыня (Prezes), які адначасова з’яўляўся старшынёю акруговай зямельнай камісіі.

Усе павятовыя зямельныя камісарыяты былі пераўтвораны ў павятовыя зямельныя ўправы, на чале якіх стаяў зямельны камісар. Па распараджэнні ГУЗ ад 10 ліпеня 1922 г. на тэрыторыі Палескага ваяводства былі створаны наступныя павятовыя зямельныя ўправы: Брэст-Бужская, Драгічынская, Камень-Кашырская, Кобрынская, Касаўская, Лунінецкая, Пінская, Пружанская і Сарненская.

У функцыі павятовых зямельных упраў уваходзілі:

- правядзенне хутарызацыі;
- ліквідацыя сервітутаў;
- надзяленне зямлёю асаднікаў і выдача ім пазык на сельскагаспадарчыя работы;
- правядзенне парцэляцыі часткі дзяржаўных і памешчыцкіх зямель, а таксама зямель бежанцаў, якія не вярнуліся на радзіму і г. д.

Структурнага падзелу павятовыя зямельныя ўправы не мелі.

У адпаведнасці з распараджэннем Савета Міністраў II Рэчы Паспалітай ад 11 студзеня 1923 г. ствіралася Віленская акруговая зямельная ўправа з цэнтрам у г. Вільна, якая распаўсюджвала сваю дзейнасць на Ашмянскі, Браслаўскі, Вільна-Трокскі, Віленскі і Свянцянскі паветы Віленскага ваяводства. Вілейскі, Дзісненскі і Дунілавіцкі паветы былі

выключаны з кампетэнцыі Навагрудскай зямельнай управы і перададзены Віленскай [7, s. 71].

Згодна з распараджэннем Савета Міністраў ІІ Рэчы Паспалітай ад 11 жніўня 1923 г. акруговыя зямельныя ўправы сталі падпарадкоўвацца Міністэрству зямельных рэформ і з гэтага часу ў склад акруговай зямельнай камісіі ўваходзіў ваявода альбо адзін з ваяводскіх чыноўнікаў [8, s. 1032].

ПАУЗ меў наступныя аддзелы: адміністратыўны, тэхнічны, землеўпарадкавання і бюро акруговай зямельнай камісіі. На працягу ўсяго перыяду існавання зямельнай управы (1921–1933 гг.) яе структура не змянялася, толькі ў 1932 г. былі створаны аддзел меліярацыі і будаўніцтва, бухгалтэрыя.

У функцыі адміністратыўнага аддзела ўваходзілі арганізацыя дзейнасці зямельнай управы, кіраўніцтва і кантроль за работаю мясцовых павятовых зямельных упраў, камплектаванне адміністратыўнага штату ўправы і падначаленых устаноў.

Аддзел землеўпарадкавання афармляў акты куплі-продажу зямельных надзелаў, займаўся правядзеннем парцэляцыі дзяржаўных і прыватных зямельных уладанняў, ажыццяўляў нагляд за перадачаю зямельных надзелаў вайсковым і грамадзянскім асаднікам.

Тэхнічны аддзел кантраляваў правядзенне землеўпарадкавальных работ на тэрыторыі ваяводства. Бюро акруговай зямельнай камісіі разглядала справы аб усталяванні правоў уласнасці на зямлю і нерухомую маёмасць [1, арк. 4].

Распараджэннем Савета Міністраў ІІ Рэчы Паспалітай ад 17 верасня 1924 г. цэнтр ПАУЗ перанесены ў г. Брэст-над-Бугам (адміністрацыйны цэнтр Палескага ваяводства) [9, s. 1290]. На падставе распараджэння міністра зямельных рэформ Вітольда Станевіча ад 28 сакавіка 1927 г. стваралася Столінская павятовая зямельная ўправа [10, s. 392]. 29 лістапада 1930 г. Сарненскі павет быў выключаны са складу Палескага ваяводства і перададзены ў Валынскае, і адпаведна перайшоў у кампетэнцыю Віленскай акруговай зямельнай управы.

Паводле распараджэння Прэзідэнта ІІ Рэчы Паспалітай Ігнацы Масціцкага ад 21 мая 1932 г. Міністэрства сельскай гаспадаркі і дзяржаўных маёмасцей і Міністэрства зямельных рэформ былі аб'яднаны ў Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформ [2, с. 61, 72; 11, s. 869] — з гэтага часу ПАУЗ падпарадкоўвалася азначанаму міністэрству пры захаванні папярэдніх функцый кіравання і кантролю. У 1932 г. на тэрыторыі Палескага ваяводства дзейнічалі наступныя павятовыя зямельныя ўправы: Брэст-Бужская, Драгічынская, Камень-Каўшырская, Кобрынская, Косаўская, Лунінецкая, Пінская, Пружанская і Столінская [12, s. 87–90].

Згодна з распараджэннем Прэзідэнта ІІ Рэчы Паспалітай Ігнацыя Масціцкага ад 27 кастрычніка 1933 г. ПАУЗ спыніла сваё існаванне. Яе функцыі перадаваліся аддзелу сельскай гаспадаркі Палескай ваяводскай управы [13, s. 1623–1625]. Функцыі ліквідаваных павятовых зямельных упраў перадаваліся зямельным аддзелам павятовых старостаў.

У выніку дзейнасці ПАУЗ па правядзенні камасацыі на тэрыторыі Палескага ваяводства захаваліся наступныя дакументы: распараджэнні Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформ ІІ Рэчы Паспалітай і распараджэнні ПАУЗ аб хутарызацыі сялянскіх гаспадарак (Спр. 104, 189); планы хутарызацыі; справы аб узбуйненні асабістых сялянскіх зямельных надзелаў і аб усталяванні іх межаў (Спр. 892–893, 895, 913, 922, 965–967, 970–972, 974–977, 992, 998–1004 і г. д.); дамовы з землямерамі (Спр. 163); справаздачы і звесткі Палескай ваяводскай управы і ПАУЗ аб плошчы хутарызаваных зямель, колькасці створаных хутароў, аплаце хутарызацыі і выдачы банкаўскіх крэдытаў мясцовым сялянам, аб запазычанасці па выдадзеным крэдытам і продажы за запазычанасць сялянскай маёмасці (Спр. 101, 1138, 1439); спісы камасаваных вёсак і гаспадарак (Спр. 995); скаргі сялян на атрыманне пасля хутарызацыі няўжыткаў і памяншэнні надзелаў; планы хутарызаваных зямель (Спр. 1152); службовыя дзённікі землямераў (Спр. 41, 42, 883, 934–935, 945–947, 955 і г. д.), журналы ўліку праведзеных землеўпарадчыкамі работ (Спр. 1037), службовыя рапарты землямераў (Спр. 399, 428, 1018), іх характарыстыкі (Спр. 348) і г. д. У загалоўках спраў фонда польскія імёны пададзены ў рускай транскрыпцыі.

Дакументы фондастваральніка трапілі на захоўванне ў Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці восенню 1939 г. Пад час гітлераўскай акупацыі (1941–1944 гг.) дакументы фонду не былі эвакуіраваны, знаходзіліся ў падвальным памяшканні будынку архіва і былі пераблытаны з іншымі архіўнымі дакументамі.

У 1944–1949 гг. супрацоўнікамі ДАБВ была праведзена карпатлівая работа па сістэматызацыі дакументаў польскіх установ па фондавай прыналежнасці. Пасля яе завяршэння фонд ПАУЗ атрымаў нумар 60 і ўключаў 2162 адзінкі захоўвання за 1921–1934 гг. Вопісаў і іншага навукова-даведачнага апарата на справы фонду не было, абгорткі спраў не былі аформлены, рамонт спраў, падшыўка і нумарацыя аркушаў не праводзіліся.

У 1952 г. дакументы фонду былі навукова-тэхнічна апрацаваны: яны былі сістэматызаваны, падшыты, пранумараваны, аформлены абгорткі, вынесены крайнія даты стварэння, удакладнены загалоўкі спраў і іх структурная прыналежнасць. На дакументы фонду складзены чатыры вопісы і кароткая гісторыка-архіўная даведка. У выніку праведзенай

экспертызы з фонду было вылучана для знішчэння 623 справы, складзены адборачны спіс №1. Паводле пастановы знішчаліся наступныя віды дакументаў: прыходна-расходныя фінансавыя дакументы (рахункі, квітанцыі) на набыццё мерных інструментаў і канцылярскіх прылад, копіі абвестак аб выкліку грамадзян у акруговую зямельную камісію для вырашэння спрэчных пытанняў, інвентарныя кнігі зямельнай управы, журналы рэгістрацыі ўваходзячых і выходзячых дакументаў, кнігі ўліку тэлефонных перамоў, заявы грамадзян аб выдачы планаў зямельных надзелаў і іншыя за 1924–1933 гг.

Паводле загаду Архіўнага ўпраўлення МУС БССР у лістападзе–снежні 1956 г. дакументы фонду № 60, якія мелі грыф «сакрэтна», цалкам рассакрэчаны. У 1975 г. вопісы фонду ПАУЗ у аб'ёме 1473 справы дадаткова апрацаваны супрацоўнікамі ДАБВ, у выніку чаго былі адрэдагаваны загалоўкі спраў, аддрукаваны вопісы і складзены тытульныя аркушы, кароткая прадмова і геаграфічны паказальнік.

У 2007–2008 гг. аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм ДАБВ займаўся ўдасканальваннем і перапрацоўкаю вопісаў фонду Палескай акруговай зямельнай управы: былі уніфікаваны загалоўкі спраў, удакладнены пераклад з польскай мовы назваў польскіх дзяржаўных устаноў і мясцовых населеных пунктаў, удакладнены крайнія даты стварэння дакументаў, знішчаны дубліраваныя экзэмпляры цыркуляраў і распараджэнняў Міністэрства сельскай гаспадаркі, Міністэрства зямельных рэформ і ПАУЗ у колькасці адной справы і 490 аркушаў.

На сённяшні дзень фонд № 60 (Палескай акруговай зямельнай управы) налічвае 1472 справы, уключаных у вопіс № 1. Структурная, храналагічная і намінальная прыкметы не вытрыманы, бо перасістэматызацыя спраў па гэтых прыкметах патрабавала б перашыфроўкі спраў вопісу. Навукова-даведачны апарат фонду складаецца з тытульнага аркуша, зместу да вопісу № 1, гісторыка-архіўнай даведкі, паказчыка відаў дакументаў, геаграфічнага паказчыка, ліста скарачэнняў [1, арк. 5–6]. Тэматычна дакументы Палескай акруговай зямельнай управы распрацаваны часткова. Па картатэцы ўліку каталагізацыі дакументаў тэматычна распрацаванымі з'яўляюцца 780 спраў фонду № 60, паводле якіх складзена 3 545 тэматычных картак.

Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што дакументы фонду № 60 (Палеская акруговая зямельная ўправа Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформ ІІ Рэчы Паспалітай) утрымліваюць каштоўную інфармацыю па правядзенні на тэрыторыі Палескага ваяводства польскімі ўладамі зямельнай рэформы (і ў прыватнасці камасацыі) у 1921–1933 гг. і шырока выкарыстоўваюцца айчыннымі і замежнымі даследчыкамі, студэнтамі гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна пры напісанні навуковых,

курсавых і дыпломных работ, дыссертацый, пры падрыхтоўцы падборак, аглядаў, зборнікаў дакументаў і ў даведачных мэтах.

## Крыніцы і літаратура


1. Перегуд, Н. В. Историко-архивная справка к фонду Полесского окружного земельного управления Министерства сельского хозяйства и земельных реформ Польши / Н. В. Перегуд // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 60. — Воп. 1. — Арк. 2–7.
2. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. — Минск : Наука и техника, 1968. — 204 с.
3. Galka, B. W. Ziemianie i ich organizacje w Polsce lat 1918-1939 / B. W. Galka. — Torun, Adam Marszalek, 1999. — 214 s.
4. Giliczynski, B. Prace Urzedow Ziemskich / B. Giliczynski. — Warszawa, Sklad Glowny w Ksiegarni Gebethnera i Wolfa, 1920. — 176 s.
5. Rozporzadzenie Rady Ministrow z dnia 23 marca 1921 roku w predmiocie rozciagnenia rozporzadzenia tymczasowego Rady Ministrow z dnia 1 wrzesnia 1919 r., normujacego przenoszenie wlasnosci nieruchomosci ziemskich na ziemie przylaczone do Rzeczypospolitej na podstawie umowy o preliminaryjnym pokoju i rozejmie, podpisanej w Rydze dnia 12-go pazdziernika 1920 r. // Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej (DURP). — 1921. — № 30. — Poz. 178. — S. 391–392.
6. Rozporzadzenie Rady Ministrow z dnia 20 marca 1922 r. w predmiocie utworzenia okregowych i powiatowych urzedow ziemskich na obszarze wojewodztw: nowogrodzkiego, poleskiego i wolynskiego, oraz powiatow: bialoweskiego, grodzienskiego i wolkowyskiego, wojewodztwa bialostockiego // DURP. — 1922. — № 41. — Poz. 345. — S. 636.
7. Rozporzadzenie Rady Ministrow z dnia 11 stycznia 1923 r. w predmiocie rozciagnenia na ziemie Wilenska mocy obowiazujacej ustawy z dnia 6 lipca 1920 roku o organizacji urzedow ziemskich i ustawy z dnia 10 kwetnia 1921 r. w predmiocie utworzenia Panstwowego Banku Rolnego // DURP. — 1923. — № 6. — Poz. 37. — S. 71–72.
8. Ustawa z dnia 11 sierpnia 1923 r. o zakresie dzialania Ministra Reform Rolnych i organizacji urzedow i komisji ziemskich // DURP. — 1923. — № 90. — Poz. 706. — S. 1032–1037.
9. Rozporzadzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 17 wrzesnia 1924 r. w sprawie ustalenia siedziby Poleskiego Okregowego Urzedu Ziemskiego // DURP. — 1924. — № 84. — Poz. 805. — S. 1290.
10. Rozporzadzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 28 marca 1927 r. w sprawie utworzenia Powiatowego Urzedu Ziemskiego w Stoline // DURP. — 1927. — № 31. — Poz. 284. — S. 392.
11. Rozporzadzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 15 stycznia 1931 r. o ustaleniu siedzib i wlasciwosci terytorjalnej powiatowych urzedow ziemskich // DURP. — 1931. — № 8. — Poz. 43. — S. 87–90.

12. Rozporzadzenie Presydenta Rzeczypospolitej z dnia 21 maja 1932 r. o ustanowieniu urzedu Ministra Rolnictwa i Reform Rolnych // DURP. — 1932. — № 51. — Poz. 480. — S. 869.
13. Rozporzadzenie Presydenta Rzeczypospolitej z dnia 27 pazdziernika 1933 r. o zespoleniu urzedow ziemskich z wladzami administracji ogolnej i organizacji komisji ziemskich // DURP. — 1933. — № 85. — Poz. 635. — S. 1623–1625.
14. Klusek, M. Zespol akt Okregowego Urzedu Ziemskiego w Krakowie / M. Klusek // Journal of Agribusiness and Rural Development. — 2008. — № 2(8). — S. 49–56.

*А. Л. Грывянёў*

## Цэрквы Віцебскага Траецкага Маркава манастыра

Дакладна невядома, калі быў заснаваны Віцебскі Траецкі Маркаў манастыр — адзін з найстаражытнейшых манастыроў Беларусі. Паводле яго кліравых ведамасцей за канец XIX – пачатак XX ст., ён быў заснаваны не пазней XV ст. манахам Маркай недалёка ад горада Віцебска [7, арк. 33; 8, арк. 1; 10, арк. 1] [1]. У НГАБ захоўваецца фонд манастыра (№ 2548), вопісы якога прайшлі перапрацоўку ў 2001 г.

Чатыры царквы манастыра маюць не менш цікавую і багатую гісторыю, чым ён сам. Траецкая саборная і Пакроўская знаходзіліся на яго тэрыторыі. Мікалаеўская могілкавая — недалёка ад манастырскай агароджы звонку. Параскеўская царква была на дачы Шыдлоўшчына. Паблізу ад манастыра знаходзілася часоўня Святога Мікалая [1, арк. 76; 2, арк. 16–166; 5, арк. 1–2 адв.; 9, арк. 2].

Малая Траецкая царква ўпершыню была пабудавана з дрэва ў 1638–1642 гг. (па іншых дадзеных — у 1649 г.) на сродкі князя Льва-Самуіла Багданавіча Агінскага. У 1690 г. знішчана пажарам, падчас якога згарэў і архіў манастыра. У 1690–1691 гг. сынам папярэдняга князем Сымонам Агінскім замест яе пабудавана новая вялікая драўляная царква з мураваным падмуркам, самай старажытнай архітэктуры, па плану крыжападобная (яна працягвала існаваць і на момант 1910 г.). Была абшыта дошкамі, дзядзінец (па-руску «паперць») падтрымліваўся разнымі калонкамі. Царкву атачала драўляная і крытая жалезам галерэя. Алтаром царква была звернута на ўсход. Пяць жалезных купалоў з жалезнымі рашотчатымі вызалачанымі крыжамі, што знаходзіліся над імі, узвышаліся над гонтавым дахам. Гонтавае пакрыццё мелі і самі

---

[1] Падрабязней гл.: Грывянёў, А. Л. Віцебскі Траецкі Маркаў манастыр // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 4. — Мінск, 2006. — С. 102–111.

купалы. У 1910 г. дах і сцены яе былі пакрыты звонку алейнай фарбай, а ўнутры — алейным сцянным жывапісам старадаўняга пісьма.

Прастол мела адзін — у імя Святой Тройцы. Першапачаткова ён быў асвячаны 31 мая 1691 г., пасля яе другога будаўніцтва, па благаславенні трымальніка Кіеўскай мітраполіі чарнігаўскага епіскапа Лазара Барановіча ігуменам Феафанам Івановічам. Другі раз асвячэнне прайшло 14 жніўня 1839 г. Гэта адбылося пасля рамонта і новага роспісу сцен і купалоў алтара і аднаўлення такога роспісу ў самой царкве. Асвячалі прастол епіскап полацкі і віцебскі Ісідор і былы ўніяцкі епіскап аршанскі Васіль.

У пачатку XX ст. іканастас у царкве быў чатырох’ярусны, разны, пазалочаны, старадаўняга пісьма. У паўднёвым прыдзеле знаходзілася рызніца, у паўночным — дзякоўня. Каля ўвахода ў храм, з заходняга боку, былі драўляныя хоры, прайсці на якія можна было праз драўляныя ўсходы ўнутры царквы. Улетку ў ёй знаходзіліся дзве іконы, што мелі шанаванне. Адну з іх, Маці Божай Казанскай, ахвяраваў манастыру ў 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч па благаславенні патрыярха Нікана. Другой была ікона Святой пакутніцы Параскевы. Узімку іх пераносілі ў манастырскую цёплую Пакроўскую царкву [2, арк. 16, 24, 152; 4, арк. 1; 5, арк. 1–2 адв.; 6, арк. 5; 9, арк. 2].

Роспісам Траецкай царквы прысвечаны артыкул Н. Я. Трыфанавай [14, с. 203–209]. Першыя вядомыя згадкі аб гэтых роспісах належаць да 1818 г., але ўжо да 1839 г. яны былі абноўлены, чым быў зменены іх склад. У канцы XX ст. выявы ў пяці купалах Траецкай царквы падрабязна апісаў сакратар Віцебскага статыстычнага камітэта А. М. Семянтоўскі. Храмы Віцебска і Полацка, у тым ліку Маркава манастыра, вывучаліся ў ходзе падрыхтоўкі да дзявятага археалагічнага з’езда, які адбываўся ў Вільні ў 1893 г., членам камісіі па захаванні старажытных помнікаў пры Маскоўскім археалагічным таварыстве А. М. Паўлінавым. Матэрыялы гэтых даследаванняў былі апублікаваны ў артыкуле «Старажытныя храмы Віцебска і Полацка». Пры апісанні інтэр’ера Траецкай царквы Маркава манастыра даследчык заўважае, што ўнутры яна была распісана па дошках і таму не ўяўляе ніякага навуковага інтарэса. Падобная негатыўная ацэнка тлумачыцца не толькі суб’ектыўнымі поглядамі аўтара, але і пазнейшымі аднаўленнямі роспісаў. У адрозненні ад А. М. Паўлінава, выключную каштоўнасць роспісаў даводзіў П. М. Красавіцкі. Прысвячэнне манастырскай святыні святу Тройцы, якое падзялялася на два — Тройцы і Зыходы Святога Духа, у многім вызначыла тэматыку роспісаў купалоў. Сценапіс Траецкай царквы Маркава манастыра ўражвае тэматычнай шыратой і арыгінальнасцю трактоўкі сюжэтаў, з’яўляецца адзіным вядомым прыкладам роспісу пяцікупальнага храма ў Беларусі XVII –

пачатку XVIII ст. Падрабязная ўвага на роспісах акцэнтуецца ў вышэйзгаданым артыкуле.

Траецкая царква была знесена ў 1920-я гады [14, с. 204, 207–208].

Мураваная Пакроўская царква, што знаходзілася ўнутры манастырскай агароджы, была пабудавана ў 1763 г. (па іншых дадзеных — у 1784) ігуменамі Іакінфам і Сазонтам (Сезонтам). Адна з крыніц гаворыць аб яе будаўніцтве ігуменам Іакінфам у 1760–1763 гг. на месцы драўлянай, што мела тое ж імя. Гэта драўляная царква згарэла ў 1690 г. Новую царкву асвяцілі пасля ўзвядзення пры ігумене Сезонце ў 1775 г. Яна мела два прастолы, першы з якіх размяшчаўся ў вялікай летняй халоднай царкве ў імя Пакрова Багародзіцы. Яго асвяціў архіепіскап полацкі і віцебскі Васіль 12 мая 1847 г. пасля вонкавага і ўнутранага рамонта, падчас якога быў пазалотай адноўлены іканастас і зроблены роспіс скляпенняў (столі), купала і сцен. Рамонт быў праведзены архімандрытам Паўлам. Другі прастол, у цёплым прыдзеле (ацепленай прыбудове ў паўночным або паўднёвым баку храма), насіў імя Свяціцеля Хрыстова Мітрафана, епіскапа варонежскага (да гэтага — Святых апосталаў Пятра і Паўла). Ён быў асвячаны тым жа архіепіскапам 2 лістапада 1847 г., таксама пасля агульнай унутраннай аздобы, дапаўнення і аднаўлення іканастаса пазалотай, роспіса столі [2, арк. 17, 61, 145; 4, арк. 1–1 адв.; 5, арк. 1 адв.].

Пакроўская царква з 1840 г. не дзейнічала ў сувязі з правядзеннем яе вонкавага і ўнутранага рамонту. Галоўнай справай было аднаўленне іканастаса. У пачатку 1847 г. царква ўжо была падрыхтавана для асвячэння [3, арк. 57–57 адв.]. У 1883 г. быў праведзены вонкавы рамонт храма і яго прыдзела. У 1887 г. ігуменам архімандрытам Іанікіем царква зроблена цёплай (ацепленай). У ёй былі ўладкаваны дзве печы (адна кафляная, другая, у алтары, жалезная) і шэсць новых аконных рамаў. На той жа час царква мела толькі адзін прастол, асвячаны 12 мая 1847 г. у імя Пакрова Багародзіцы [5, арк. 1 адв.– 2; 9, арк. 1–1 адв.].

Прыдзельная цёплая царква, ці прыдзел, што знаходзілася пры Пакроўскай царкве, была пабудавана адначасова з адбудаваннем асноўнай царквы ў 1760–1763 гг. Асвячона ў імя Святых апосталаў Пятра і Паўла, паміж 24 ліпеня і 7 кастрычніка 1777 г. Роўна праз семдзясят год, пасля аднаўлення прыдзела, архімандрытам Паўлам царкве нададзена новае імя. Так, 2 лістапада 1847 г. яна была асвечона ім у імя Свяціцеля Хрыстова Мітрафана Варонежскага Цудатворца. Пасля аднаўлення, 4 лістапада 1868 г. прыдзел асвячоны епіскапам полацкім і віцебскім Савай [5, арк. 1 адв.; 11, арк. 3 адв.].

У 1889–1890 гг. да галоўнага вялікага купала Пакроўскай царквы былі дададзены чатыры невялікіх купалы, пакрытыя жалезам і размешчаныя вакол яго. З паўднёвага і паўночнага бакоў да яе былі зроблены дзве мураваныя прыбудовы — пад дзякоўню і царкву Святога апостала

і евангеліста Марка. У заходняй частцы зроблены схілападобныя столі, хоры і ўсходы на іх і памяшканне для рызніцы і бібліятэкі. Трапезная частка выкладзена мураванай кладкай. Пасля гэтага знешні выгляд царквы змяніўся — яна набыла крыжападобную форму. На рамонт архімандрытам Іларыёнам былі выкарыстаны з яго сродкаў больш 12 000 руб. з невялікім дадаткам манастырскай сумы. У 1901 г. у царкве быў «прамыты жывапіс» (верагодна, мелася на ўвазе змыццё наслаенняў копаці), адноўлена падлога і зроблена кафляная печ.

У 1903 г. Пакроўская царква заставалася двухпрастольнай. Галоўны прастол меў тую ж назву — у імя Пакрова Божай Маці. Другі, у паўднёвым прыдзеле, — у памяць Святога апостала і евангеліста Марка. Апошні асвячоны 8 ліпеня 1895 г. епіскапам полацкім і віцебскім Аляксандрам. Царкоўны алтар быў звернуты на ўсход, пасярэдзіне меўся вялікі купал, чатыры малыя купалы, абшытыя жалезам, былі ў выглядзе вежак. Гэтыя купалы знаходзіліся па яго баках: на паўночны ўсход, паўднёвы ўсход, паўднёвы захад і паўночны захад. Царква была пакрыта жалезам і пафарбавана алейнай фарбай. Пазалочаныя крыжы, на момант 1903 г., мелі патрэбу ў аднаўленні. Іканастас быў двух’ярусны, разны і пазалочаны. Унутры царква была пафарбавана алейнай фарбай і размалявана «іконна» (пад дадзеным азначэннем разумеецца роспіс выявамі, якія малююць на абразах) [8, арк. 1 адв.–2; 9, арк. 1–1 адв.].

Могілкавая Мікалаеўская царква насіла імя Свяціцеля Мікалая, архіепіскапа мірлікійскага. Будынак яе быў драўляным, але знаходзіўся на мураваным фундаменце. Месцілася па-за манастырскай агароджай на ўездзе ў манастыр, па левым баку, алтаром на ўсход. Была пабудавана ў 1730 г. без прытвора (прыбудовы ў заходнім баку храма) ігуменам Мяфодзем Аляшкевічам (магчыма, Аляшковічам). Прастол мела адзін — у імя Свяціцеля і Цудатворца Мікалая.

Пасля таго як царква састарэла яе адбудавалі на тым жа месцы ў 1853–1856 гг. падчас знаходжання на пасадзе ігумена архімандрыта Паўла. Памер новага будынка быў нашмат большым і вызначаўся ўласным прытворам. Два купалы над ім (маленькі і вялікі) былі пакрыты жалезам, алтар і прытвор — гонтамі. Тады ж царква была абшыта дошкамі з фарбаваннем даху яр’ю або мядзянкай (фарбай зялёнага колеру). Вокны ў ёй былі з жалезнымі кратамі. Пасля ўнутранага роспісу сцен, купалоў і скляпенняў, дапаўнення разьбой і аднаўлення пазалоты іканастаса гэта аднапрастольная царква была асвечана архіепіскапам полацкім і віцебскім Васілём 3 чэрвеня 1856 г., у дзень Пяцідзясятніцы [2, арк. 17; 4, арк. 1 адв.; 5, арк. 2; 8, арк. 2; 9, арк. 1 адв.].

Ёсць таксама звесткі аб перабудове могілкавай састарэлай Мікалаеўскай царквы ў 1848–1849 гг. У траўні 1847 г. архімандрыт манастыра Павел прадставіў епархіяльнаму архірэю Васілю Лужынскаму

праект перабудовы могільнікавай Мікалаеўскай драўлянай царквы, што знаходзілася за манастырскай агароджай. У сакавіку 1848 г. ужо ішлі работы па перабудове гэтай царквы. У выніку будаўнічых работ 1848–1849 гг. вялікі і маленькі купалы былі пакрыты жалезам, алтар і прытвор — гонтамі. Царква была абшыта дошкамі [2, арк. 159 адв.; 12, арк. 1–2 адв.].

У 1878 г. вонкавыя сцены царквы пафарбаваны алейнымі фарбамі «дзікага» колеру. У 1882 г. гонтавае пакрыццё на прытворы і алтары заменена жалезным, пафарбаваным мядзянкай [5, арк. 2]. У 1901 г. быў рэстаўраваны насценны і іканастасны жывапіс царквы, пафарбаваны сцены і дах, папраўлены драўляныя часткі [8, арк. 2]. Іканастас храма быў трох'ярусны, разны, пазалочаны [9, арк. 1 адв.].

Чацвёртай з цэркваў, што належалі манастыру, была драўляная Параскеўская. Яна знаходзілася за некалькі вёрст ад манастыра на манастырскай дачы (фальварку) Шыдлаўшчына або Шчыглаўшчына. Была пабудавана ў 1730 г. невядомым будаўнікам пры ігумене Мяфодзіі Аляшкевічы. У 1810 г. пры архімандрыце Іосіфе яе перабудавалі. У 1841–1842 гг. (па іншым дадзеным — у 1840 г.) зноў перабудавана архімандрытам Паўлам на мураваным фундаменце, пры наяўнасці дзядзінца. Пры апошняй перабудове іканастас быў адноўлены. Царкву пакрылі гонтамі, купалы над яе сярэдзінай і алтаром аздобілі жалезам, дзядзінец абгарадзілі дошкамі. Прастол у ёй быў адзін — у імя Св. Вялікапакутніцы Параскевы. Ён быў асвечаны пасля гэтай перабудовы архіепіскапам полацкім і віцебскім Васілём 25 кастрычніка 1842 г. Да 1910 г. дахі і сцены яе былі пафарбаваны алейнай фарбай, унутры іконна. Іканастас быў трох'ярусны, месцамі пазалочаны [2, арк. 17, 101, 136 адв., 145 адв.; 4, арк. 1 адв.–2; 5, арк. 2–2 адв.; 8, арк. 2; 9, арк. 1 адв.; 10, арк. 2].

Дакументы першага дзесяцігоддзя XX ст. сведчаць аб крыніцы, якая знаходзілася паблізу царквы пад балдахінам (навесам). У гэтым месцы, штогод у пятніцу, перад святам Святых апосталаў Пятра і Паўла адбываўся водасвятны малебен з хросным ходам пасля літургіі [9, арк. 2; 10, арк. 2].

З паўднёвага боку была манастырская брама, якая вяла на бераг Дзвіны. Праз яе можна было праехаць у сад. Над брамай знаходзілася каменная трох'ярусная званіца гатычнай архітэктуры. Дакладны час яе будаўніцтва невядомы. Яна была пакрыта жалезам, пафарбаваным мядзянкай. У апісанні манастыра за 1800 г. гаворыцца аб двухпавярховай мураванай званіцы, з уяздной брамай. Пры гэтым званіца з часткай агароджы выходзіла на манастырскія могілкі. У 1877 г. яна была перафарбавана. У 1878 г. перароблены яе лесвіцы і памосты, званы перавешаны на верхні ярус, у выкарыстанне ўведзены святочны звон вагой у

122 пуды 29,5 фунтаў. Ён быў адліты ў тым жа годзе з пакінутага без выкарыстання і трэснутага звана, часоў архімандрыта Паўла. У 1884 г. адноўлена фарба на купале званіцы і папраўлена састарэлая месцамі тынкоўка. Усіх званоў на ёй было сем (віселі на другім ярусе). Чатыры з іх, узамен трох разбітых, былі набыты архімандрытам Іанікіем на заводзе Лаўрова ў Гатчыне. На святочным звоне адліта лічба «1744». Гэта дата была адліта на адным са званоў у 70 пудоў, які быў разбіты. Пашкоджаныя званы былі выкарыстаны, як адзначана ў апісанні манастыра, на зліццё святочнага звана. Трэба меркаваць, званіца была пабудавана не пазней за гэты час, а менавіта 1744 г. [1, арк. 76; 4, арк. 2; 5, арк. 2 адв.; 8, арк. 2–2 адв.; 9, арк. 1 адв.; 10, арк. 2].

У першым дзесяцігоддзі XX ст. паблізу манастыра, на правым беразе Дзвіны, знаходзілася невялікая, крытая жалезам, драўляная капліца. Яе вокны змяшчаліся за жалезнымі кратамі. Унутры і звонку капліца была пафарбавана алеем. Унутры яе, на пярэдняй сцяне, знаходзілася вялікая ікона Свяціцеля Мікалая, архіепіскапа мірлікійскага, з выявай яго цудаў. У кліравых ведамасцях манастыра за XIX ст. інфармацыя аб ёй адсутнічала. Штогод, 9 мая, сюды пасля літургіі з Мікалаеўскай царквы накіроўваўся хросны ход і служыўся малебен Св. Мікалаю [2; 4; 5; 8, арк. 2 адв.; 9, арк. 2; 10, арк. 2].

На момант 1829 г. прыпісной і дамавой цэркваў у манастыра не было. На гэты час да прыхода манастыра належалі сяляне, якія пражывалі ў манастырскай вёсцы Слабодка і ў двух дзясятках малых паселішчаў побач. Усяго — 93 двары, у якіх налічвалася 409 мужчын і 434 жанчыны [2, арк. 16, 22 адв.].

Дакументы, што тычацца Віцебскага Маркава манастыра і яго храмаў, захоўваюцца не толькі ў НГАБ. Так, у Вільні сярод буйнога збору старажытных рукапісаў знаходзяцца і помнікі рэлігійнай музыкі Беларусі. У аддзеле рэдкай кнігі і рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, у фондзе № 19, ёсць «Нотныя ірмалогіі».

Ірмалоі (ірмалагіёны) — гэта багаслужэбныя пеўчыя рукапісы. Беларускія ірмалоі былі шматжанравымі зборнікамі, якія ўключалі спевы з розных богаслужбовых кніг візантыйскага абраду. Гімнаграфічныя творы запісваліся на царкоўнаславянскай мове. Частка ірмалояў беларускага кнігазбору фонда № 19 мае відавочнае ўніяцкае паходжанне. Пеўчыя зборнікі сведчаць пра царкоўнае ўшанаванне на беларускіх землях рымска-каталіцкіх святых [13, с. 217–218].

Ірмалой трэцяй чвэрці XVII ст. з дадзенага фонда (справа № 117) прадстаўляе асаблівую цікавасць [13, с. 218, 222]. Гэты рукапіс быў перададзены ў 1866 г. у Віленскую публічную бібліятэку А. В. Рачынскім, якім кніга была знойдзена ў Віцебскім Маркавым манастыры. У пеўчым зборніку адсутнічаюць запісы пра месца яго напісання, імёны

перапісчыкаў і іх канфесійную прыналежнасць (падрабязна «Ірмалой» апісаны ў дадзеным артыкуле І. І. Смыкоўскай) [13, с. 218, 219, 222].

Набыццё Маркавым манастыром пеўчых зборнікаў сведчыць пра патрэбу ў натаванай літаратуры і высокі ўзровень музычнага афармлення службаў. Дадзены рукапіс выкарыстоўваўся ў багаслужэннях праваслаўнага манастыра, але быў створаны, верагодна, грэка-католікамі. Адзінства канона пеўчага мастацтва ў праваслаўнай і грэка-каталіцкай цэрквах ВКЛ і ўзаемадзеянне ў гэтай сферы богаслужэння было абумоўлена адзінай культурнай прасторай і грэка-візантыйскай традыцыяй [13, с. 221–222].

Вышэй былі апісаны дакументы Віцебскага Маркава манастыра, якія захоўваюцца ў Мінску і Вільні. Верагодна, дакументы згаданай установы зберагаюцца таксама ў іншых архівах, а таму іх выяўленне і апрацоўка з'яўляюцца справай часу.

## Крыніцы і літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 2548 (Віцебскі мужчынскі Траецкі манастыр). — Воп. 1. — Спр. 22.
2. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1. — Спр. 46.
3. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 138.
4. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 228.
5. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 281.
6. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 357.
7. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 637.
8. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 921.
9. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 951.
10. НГАБ. — Ф. 2548. — Воп. 1.. — Спр. 983.
11. НГАБ. — Ф. 2694 (Благачынны манастыроў Полацкай епархіі). — Воп. 1. — Спр. 210.
12. НГАБ. — Ф. 2694. — Воп. 1. — Спр. 260.
13. Смыкоўская, І. І. Пеўчы зборнік з Віцебскага Свята-Траецкага Маркава манастыра : праблемы атрыбуцыі // Віцебскія старажытнасці (Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага). — Мінск, 2010. — С. 217–222.
14. Трифонова, Н. Я. Троицкая церковь Маркова монастыря и ее росписи // Там жа. — С. 203–209.

*А. А. Лашкевіч*

# Некаторыя старонкі дзейнасці вайсковай контрразведкі Віленскай ваеннай акругі напярэдадні і ў час Першай сусветнай вайны (па дакументах НГАБ)

Артыкул падрыхтаваны на падставе даследавання спраў архіўнага фонду «Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне». Вопіс № 3 уключае дакументы аб функцыянаванні вайсковай контрразведкі. Да 1972 г. дакументальныя матэрыялы контрразведвальнага аддзялення штаба Віленскай ваеннай акругі складалі як асобны архіўны фонд, так і ўваходзілі ў азначаны фонд жандарскага ўпраўлення. Менавіта з нагоды ўдакладнення архіўных спраў у 1972 г. раней існаваўшы фонд быў ліквідаваны, а справы далучаны да фонду «Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне», дзе стварылі асобны вопіс. На вялікі жаль, у выніку рознага кшталту ўзрушэнняў і катаклізмаў захавалася вельмі няшмат спраў, што маюць дачыненне да дзейнасці вайсковай контрразведкі — усяго толькі 12 архіўных адзінак. У абсалютнай сваёй большасці гэта так званыя алфавіты — спісы тых, хто па рознай прычыне трапіў у поле зроку супрацоўнікаў контрразведкі, а таксама агентурныя справаздачы па выніках назірання за падазронымі асобамі. Неабходна адзначыць, вышэйзгаданыя данясенні вельмі цяжка паддаюцца навукова-аналітычнай апрацоўцы пры адсутнасці дадатковай інфармацыі. Справа ў тым, што ў іх амаль заўсёды апісваюцца толькі вонкавыя дзеянні аб’ектаў назірання. З падобных дакументаў мы не зможам даведацца нават аб імёнах і прозвішчах назіраемых, не кажучы ўжо пра род іх заняткаў і сацыяльны статус, паколькі ў большасці выпадкаў агенты выкарыстоўвалі спецыяльныя мянушкі дзеля пазначэння сваіх падапечных. У тэрытарыяльным плане прыведзеныя вышэй архіўныя справы ў асноўным прывязаны да Віцебскай губерні.

Мэта дадзенага артыкула — вызначыць некаторыя накірункі дзейнасці контрразведвальнай службы Віленскай ваеннай акругі, арэал якой ахопліваў тэрыторыю сучаснай беларускай дзяржавы і прылеглых да яе рэгіёнаў. Аўтар невыпадкова ўжыў выраз «паспрабаваць вызначыць некаторыя накірункі», бо, як ужо раней адзначалася, нешматлікасць і недастатковая інфарматыўнасць вывучаных архіўных спраў пакуль што не дазваляе зрабіць больш грунтоўныя навуковыя высновы па акрэсленай праблематыцы.

Пытаннямі барацьбы са шпіянажам у Віленскай ваеннай акрузе займалася адмысловае аддзяленне яе штаба, што месцілася ў Вільні і распаўсюджвала сваю дзейнасць на ўсе губерніі тагачаснага Паўночна-Заходняга краю, у тым ліку і на этнічна беларускія землі. Яно

ажыццяўляла вышук і назіранне за асобамі, што падазраваліся «ў ваенным шпіёнстве». У жніўні 1914 г. з пачаткам Першай сусветнай вайны рэарганізавана ў контрразведвальнае аддзяленне штаба 1-й дзеючай арміі. Узначальваў аддзяленне ротмістр (пазней — падпалкоўнік) асобнага корпуса жандараў Уладзімір Васільевіч Белаводскі. З-за недахопу звестак немагчыма дакладней вызначыць структурны і колькасны склад аддзялення. Дакладна вядома, што туды ўваходзілі як кадравыя вайскоўцы, так і цывільныя службоўцы ваеннага ведамства. Акрамя таго, меліся сакрэтныя супрацоўнікі-агенты, якія вялі вонкавае назіранне за падазронымі асобамі.

У студзені-лютым 1912 г. адпаведна запыту кіраўніка контрразведкі Віленскай ваеннай акругі супрацоўнікі памочніка начальніка Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў Дзвінскім, Рэжыцкім, Себежскім і Люцынскім паветах займаліся праверкаю пэўнага кола жыхароў г. Дзвінска, вызначэннем роду іх заняткаў і г. д. У гэта кола трапілі, у прыватнасці, Мендэль Глікман, купец другой гільдыі і домаўладальнік, Абрам Крызоўскі, жыхар дома М. Глікмана, без пэўных заняткаў, земляроб (адпаведна намінальнаму саслоўнаму статусу), Юдэль Рапапорт, таксама без пэўных заняткаў. Два апошнія раней жылі ў Вільні, адкуль іх выслалі за арганізацыю нелегальнага пераводу эмігрантаў за мяжу. З пералічаных асоб Юдэль Рапапорт падазраваўся ў супрацоўніцтве з замежнай разведкай [1, арк. 17–21].

Пацвярджэннем таму, што нейкі жыхар Дзвінска па прозвішчы Рапапорт падтрымліваў сувязь з германскай разведкай, з'явілася і паведамленне сакрэтнага супрацоўніка контрразведкі «Паголенага» (у дакуменце «Брытага». — *А. Л.*) ад 5 кастрычніка 1912 г. Апошні інфармаваў, што Ф. Браўнштэйна, які, хутчэй за ўсё, выконваў функцыі прадстаўніка нямецкай спецслужбы ў Эйдкунэне (памежны населены пункт ва Усходняй Прусіі на тагачаснай германа-расійскай мяжы) 29 верасня наведаў жыд з Дзвінска па прозвішчы Рапапорт. Гэты Рапапорт перасёк мяжу з дакументам на іншае прозвішча. На думку «Паголенага», госць Ф. Браўнштэйна бясспрэчна займаўся «ваенным шпіёнствам» [1, арк. 23 адв.].

У 1912–1913 гг. супрацоўнікі вайсковай контрразведкі і памочніка начальніка Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў Дзвінскім, Себежскім, Люцынскім і Рэжыцкім паветах правяралі сапраўднасць інфармацыі, што была выкладзена ў лісце нейкага Давіда Гантварга, накіраваным на імя ваеннага міністра. У ім першы паведамляў, што, знаходзячыся за мяжой, ён выпадкова даведаўся аб продажы жыхарамі Дзвінска З. Бруднэрам, канторшчыкам запалкавай фабрыкі Закса, і Я. Фрыдландам, бацька якога ў свой час з'яўляўся падрадчыкам на будаўніцтве Дзвінскай і Рыжскай фартэцый, фартэцыйных

планаў і іншых сакрэтных звестак агентам замежных дзяржаў [1, арк. 26 адв.–27].

Праверка, арганізаваная памочнікам начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім і іншых паветах ротмістрам Б. І. Качаноўскім у снежні 1912 – студзені 1913 гг., дазволіла выявіць наступныя звесткі, што датычыліся асобаў з прозвішчамі Бруднэр і Фрыдланд.

У часы будаўніцтва Дынабургскай (пазней — Дзвінскай) фартэцыі сярод падрадчыкаў быў ганаровы грамадзянін Меер Файвішавіч Фрыдланд. Апошні памёр за восем гадоў да апісваемых падзей, пакінуўшы трох сыноў: Мордуха (70 гадоў), Вульфа (60 гадоў) і Файвеля-Паўла (50 гадоў). З іх усіх толькі старэйшы брат Мордух часам пражываў у Дзвінску, дзе знаходзіўся яго ўласны дом [3, арк. 12–12 адв.].

Сярод жыхароў Дзвінска чалавека з прозвішчам Бруднэр не было знойдзена, аднак выяўлены смаргонскі мешчанін Залман Шлёмавіч Брудны, які служыў на запалкавай фабрыцы братоў Лур’е (былой Закса) і адначасова наглядаў за дамамі спадчыннікаў М. Фрыдланда. За дваццаць гадоў да гэтага ён працаваў у апошняга, калі той займаўся пастаўкамі розных будаўнічых матэрыялаў у фартэцыю [3, арк. 13–13 адв.].

У сувязі з атрыманай інфармацыяй ротмістр Б. І. Качаноўскі правёў у ноч з 4 на 5 лютага 1913 г. вобыск на кватэры З. Бруднага. У ёй былі знойдзены планы збудаванняў Дзвінскай фартэцыі, зброя (рэвальвер з патронамі), каля двух дзясяткаў экзэмпляраў брашур палітычнага зместу («Ассимиляция и еврейский рабочий»), пячаткі, якія мелі, хутчэй за ўсё дачыненне да палітычнай арганізацыі сацыялістаў-сіяністаў. Пасля вобыску Залмана Бруднага арыштавалі [3, арк. 17–18 адв.]. 25 лютага таго ж года адпаведна з пастановай пракурора Віцебскага акруговага суда матэрыялы па справе З. Бруднага былі перададзены памочнікам начальніка ўпраўлення па Дзвінскаму і іншых паветах судоваму следчаму 2-га ўчастка г. Дзвінска для далейшага расследавання [3, арк. 29]. Іншых звестак па судовай справе пакуль што не выяўлена.

У верасні 1913 г. вялося вонкавае назіранне ў Віцебску і Смаленску за асобаю, што была пазначана ў агентурных зводках як «Віцебскі». Чалавек з такім празваннем наведваў у абодвух гарадах рознага кшталту ўстановы, як дзяржаўныя, так і прыватныя. Згодна з данясеннямі агентаў-назіральнікаў «Віцебскі» займаўся продажам геаграфічных картаў [2, арк. 10–24]. Як высветлілася ў выніку далейшага вывучэння спраў фонду мянушкай «Віцебскі» надзяляўся вышкаўскі мешчанін, жыхар Дзвінскага павета, Янкель Рафаілавіч-Іцкавіч Фрыдланд (ён жа Фрыдлянд), раней жыхар Дзвінска. Назіранне за ім ажыццяўлялася мясцовай контрразведкай у сувязі з запытам пецярбургскіх калегаў, у прыватнасці ротмістра Сасноўскага. Ён паведаміў, што ў адпаведнасці з агентурнай інфармацыяй, Я. Фрыдлянд у сярэдзіне студзеня 1913 г.

нібыта прапаноўваў шведскаму генеральнаму штабу набыць планы Кранштадскай фартэцыі і берагавых умацаванняў у Фінляндыі. Дадатковаю нагодаю для таго, каб ён звярнуў на сябе ўвагу контрразведкі, з’явіліся яго спробы змяніць веравызнанне. Спачатку ў канцы мая 1913 г. Я. Фрыдланд прасіў пастара адной з евангелічна-лютэранскіх парафій Гельсінгфорса (зараз Хельсінкі. — *А. Л.*) аб дазволе далучыцца да гэтай канфесіі, але чамусьці яму было адмоўлена. Тады Янкель Фрыдланд хрысціўся па праваслаўнаму абраду ва Успенскім саборы Гельсінгфорса і набыў пасля хрышчэння імя Мікалай [3, арк. 37, 45, 49–50, 64, 69–69 адв.].

У маі 1914 г. падпалкоўнік У. В. Белаводскі атрымаў копію пастановы ад 16 красавіка таго ж года за подпісам палкоўніка Размарыцы з жандарскага ўпраўлення г. Адэса па справе Фелікса Вундэра і Мікалая-Янкеля Фрыдланда. З пастановы відаць, што фігуранты зараблялі сабе на жыццё гандлем геаграфічнымі картамі. З гэтай нагоды яны абыходзілі розныя прыватныя і дзяржаўныя ўстановы, у тым ліку і вайсковыя. Супрацоўнікі Адэскага жандарскага ўпраўлення і контрразведкі зафіксавалі іх кантакты з асобамі, якія былі асуджаны за шпіянаж на карысць Германскай, Аўстра-Венгерскай і Асманскай імперый альбо падазраваліся ў гэтым. Падчас вобыскаў у Ф. Вундэра і М.-Я. Фрыдланда знайшлі падпісныя бланкі германскіх фірмаў, што гандлявалі картаграфічнай прадукцыяй. На бланках былі адбіткі пячатак розных вайсковых установаў і злучэнняў, а таксама подпісы іх начальнікаў і камандзіраў. Маючы пэўныя падставы палкоўнік Размарыца хадайнічаў перад начальнікам упраўлення аб высылцы Фелікса Вундэра і Мікалая-Янкеля Фрыдланда ў азіяцкую Расію тэрмінам на пяць гадоў пад галосны паліцэйскі нагляд [6, арк. 1–7].

У апошнія перадваенныя гады вайсковая контрразведка і жандармерыя ўзмацнілі кантроль за паводзінамі замежных падданых, асабліва тых, якія знаходзіліся на сталым ці часовым жыхарстве ў памежных губернях, у тым ліку і ў Паўночна-Заходнім краі. Так, з 17 па 24 кастрычніка 1912 г. агенты контрразведкі вялі назіранне за кітайскім грамадзянінам Масумам Рузаевым, хутчэй за ўсё уйгурам па этнічнай прыналежнасці, і яго спадарожнікам калежскім рэгістратарам Іванам Панагам. Падазроныя асобы пражывалі ў гасцініцы «Брысталь». У агентурных зводках яны праходзілі як «Салдат» ці «Салдацкі» і «Памочнік» ці «Сакратар». Адпаведна сваім дакументам М. Рузаеў меў від на жыхарства ў Санкт-Пецярбургу і з’яўляўся ўпаўнаважаным С.-Пецярбугскага таварыства папячэння аб жаўнерах, калеках і кінутых дзецях. 18 кастрычніка 1912 г. па дадзеных назірання пасля ад’езду М. Рузаева ў Санкт-Пецярбург І. Панага займаўся зборам ахвяраванняў для таварыства [2, арк. 1–9]. Верагодна, супрацоўнікаў контрразведкі цікавіла, ці не служыць дабрачынная дзейнасць прадстаўніка такой далёкай і экзатычнай краіны і яго

расійскага памагатага прыкрыццём для разведвальнай дзейнасці на карысць замежнай дзяржавы.

У студзені-лютым 1913 г. контрразведка збірала інфармацыю аб германскім падданым Отта Буле, які разам з жонкаю і дачкою жыў у маёнтку Сцярняны Сцярнянскай воласці Рэжыцкага павета Віцебскай губерні з верасня 1912 г. па студзень 1913 г. Падазрэнні контрразведчыкаў ён выклікаў тым, што падчас свайго знаходжання ў маёнтку не меў пэўных заняткаў. Акрамя таго, сваё беспрацоўе О. Буль матываваў неабходнасцю лячэння нярвовай хваробы, але за дапамогаю да лекараў не звяртаўся. У дадатак да ўсяго ён праз Рыгу атрымліваў лісты з Германіі [4, арк. 9–17].

Пад увагу вайсковай контрразведкі трапіў і шведскі грамадзянін Эрнст фон Сегебадэн. 3 лютага 1913 г. ён быў арыштаваны падчас фатаграфавання Дзвінскай фартэцыі. Нягледзячы на тое, што арыштаваны адмаўляў сваё дачыненне да разведвальнай дзейнасці, а здымкі тлумачыў цікаўнасцю турыста, у контрразведчыкаў меліся падставы меркаваць, што ён з’яўляецца супрацоўнікам германскага разведвальнага бюро ў Штэціне [4, арк. 18–56].

Падчас далейшага расследавання інфармацыя аб тым, што Э. фон Сегебадэн — агент нямецкай разведкі не пацвердзілася, тым не менш, апошняга занеслі ў спіс асобаў, якія падазраваліся ў шпіянажы на карысць Германіі і падлягалі часоваму арышту з наступнаю высылкаю ва ўнутраныя губерні альбо за мяжу з пачаткам перадмабілізацыйнага перыяду. Акрамя яго, у гэты спіс трапілі ўжо знаёмыя нам жыхары Дзвінска Залман Брудны, Мендэль Глікман і Юдэль Рапапорт [4, арк. 57–58].

Напярэдадні Першай сусветнай вайны супрацоўнікі контрразведвальнага аддзялення штаба Віленскай ваеннай акругі наведвалі населеныя пункты памежных губерняў, каб даведацца, ці пражываюць тут замежныя падданыя, іх колькасць, заняткі і паводзіны. З падобнай мэтай губернскі сакратар Дзехцераў пабываў з 22 чэрвеня па 1 ліпеня 1914 г. у Гародні, Аўгустове, Сувалках, Алітах, Кібартах, Вяржболаве і Коўне [5, арк. 150–150 адв.].

З пачаткам ваенных дзеянняў контрразведка адсочвала наяўнасць падданых варожых дзяржаў на падведамаснай ёй тэрыторыі. Так, 23 сакавіка 1915 г. было атрымана паведамленне сакрэтнага супрацоўніка «Служывага» аб тым, што ў маёнтку Дзякавічы Мазырскага павета Мінскай губерні знаходзяцца чацвёра германскіх грамадзян. Гэты ж агент адначасова інфармаваў, што пры станцыі Капцэвічы на заводзе абшарніка Клісневіча жывуць нямецкі падданы Тэльбах і аўстрыйскі грамадзянін. Аб усіх гэтых іншаземцах было вядома прыставу 4-га стана Мазырскага павета, але ён чамусьці не высяляў іх. З мэтаю прыняцця неабходных захадаў падпалкоўнік У. В. Белаводскі, ужо як начальнік контрразведкі

1-й арміі, 24 сакавіка адправіў начальніку контрразведвальнага аддзялення пры штабе Мінскай ваеннай акругі на тэатры вайны ротмістру асобнага корпуса жандараў Навуменку адпаведны інфармацыйны ліст [7, арк. 1–2].

Контрразведчыкаў цікавілі і расійскія падданыя нямецкага паходжання. Правяраліся ўсялякага кшталту заявы наконт сапраўднай альбо ўяўнай падазронай дзейнасці ці нават германафільскіх выказванняў і гутарак. Напрыклад, на ўладальніка маёнтка Тэкленвіль Полацкага павета Віцебскай губерні Карла фон Фальціна яны звярнулі ўвагу таму, што атрымалі паведамленні аб наведванні маёнтка нейкімі падазронымі людзьмі. Апошнія быццам выдавалі сябе за землямераў. На думку ж інфарматара, яны з’яўляліся германскімі разведчыкамі, што займаліся картаграфаваннем мясцовасцей. Аднак праведзеная ў лістападзе–снежні 1916 г. праверка гэтых звестак не пацвердзіла [9, арк. 76–80, 102–103 адв., 107–110 адв.]. Шчыльнаму кантролю падлягалі тыя расійскія грамадзяне нямецкай нацыянальнасці, якія раней знаходзіліся ў германскім падданстве альбо мелі сваякоў — вайскоўцаў германскіх ці аўстра-венгерскіх узброенных сіл [8].

На вялікі жаль, адсутнасць, як ужо адзначалася вышэй, неабходных крыніц не дазваляе раскрыць і прааналізаваць дзейнасць контрразведкі па барацьбе са шпіянажам непасрэдна ў вайсковых злучэннях і ўстановах. Тыя звесткі, што ўтрымліваюцца ў архіўных справах фонду, датычацца толькі цывільных асоб: як расійскіх, так і замежных грамадзян. Застаецца толькі спадзявацца, што далейшыя даследаванні дазволяць запоўніць гэты прагал.

## Дадатак

**1912 г. кастрычніка 8. — Зводка начальніка контрразведкі Віленскай ваеннай акругі ротмістра У. В. Белаводскага ў Галоўнае ўпраўленне Генеральнага штаба аб дзейнасці германскай разведкі за кастрычнік 1912 г.**

*[23]*

Совершенно секретно.

**СВОДКА**
агентурных сведений по контрразведке

За октябрь месяц 1912 года.

Составлена при Виленском контрразведывательном отделении.

Розыском в районе заведует
ротмистр Беловодский.

№ 1368.

Октября «8 » дня 1912 г.
г. Вильна [1].

**В Главное Управление**
ГЕНЕРАЛЬНОГО ШТАБА.
*[23 об.]*

| №№ по порядку. | Число получения сведений. | Краткое содержание сведений. | Разработка сведений. |
|---|---|---|---|
| 1 | [1]912 г. Окт. 5. – | СОТРУДНИК «БРИТЫЙ». Капитану ФЛЕКУ [11**] из Берлина предписано отправить своих агентов в Россию, чтобы узнать: какаво настроение сейчас у нас ввиду осложнений на Балканах, не было ли передвижений войск из Виленского в Киевский и Одесский округа, и узнать: не готовится ли Россия к войне, агенты эти посланы и в другие округа. | |
| 2 | | 29 минувшего сентября у Фишке БРАУНШТЕЙНА в Эйдкунене был еврей из Двинска по фамилии РАПОПОРТ; проехал он границу по чужому легитимационному виду.<br>РАПОПОРТ безусловно занимается военным шпионством.<br>Приметы его: лет 38–40; среднего роста, брюнет, чёрная борода, стриженая полукругом.<br>Верно:<br>Ротмистр Беловодский | Сведения о БРАУНШТЕЙНЕ были уже представлены.<br>Предложено сотруднику выяснить имя и отчество РАПОПОРТА, так как в Двинске есть много с этой фамилией. По выяснению за РАПОПОРТОМ и его перепиской будет установлено наблюдение на предмет выяснения его деятельности и связей.<br>Копия этих сведений представлена генерал-квартимейстеру Штаба Виленского военного округа за № 1369. |

[1] Ніжэй маецца паметка алоўкам: «Д[ело] № 12 ч[асть] 8.».

[24]

Совершенно секретно.
Генерал-квартирмейстеру Штаба Виленского военного округа.

Верно:
Начальник Виленского
контрразведывательного
отделения, Ротмистр Беловодский

№ 1369.
Октября «8» дня 1912 года.
Гор. Вильна.

*НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 1. — Арк. 23–24. Машынапісны. На бланку.*

## Крыніцы


1. НГАБ. — Ф. 2499 (Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне). — Воп. 3. — Спр. 1.
2. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 2.
3. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 3.
4. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 4.
5. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 5.
6. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 6.
7. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 7.
8. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 11.
9. НГАБ. — Ф. 2499. — Воп. 3. — Спр. 12.


*А. Н. Можейко*

# Ян де Крайно Краинский, Карл II и английская помощь протестантам Великого Княжества Литовского

В белорусской историографии проблема отношений между Великим Княжеством Литовским и Англией в раннее Новое время [1], изучен недостаточно. Однако, несмотря на незначительное внимание к данному вопросу, сохранилось относительно большое число источников, которые подтверждают, что между этими государствами

[1] За основу взята западноевропейская периодизация, где раннее Новое время охватывает период с конца XV до конца XVIII в.

существовали достаточно прочные связи различного характера, в том числе религиозные. Следует отметить, что огромное количество информации, освещающей разнообразные аспекты жизни в ВКЛ, содержится в иностранных источниках. В данной статье основное внимание сосредоточено на двух англоязычных изданиях 1661 г. [1; 3], которые, являясь свидетельством конфессиональных связей между двумя государствами, непосредственно касаются истории ВКЛ, но практически не изучены отечественными исследователями.

Упоминания о ВКЛ в английских источниках XVI в. сделаны главным образом иезуитами и связаны с деятельностью представителей католической церкви на данной территории. Уже с начала XVII в. в поле зрения английских авторов попали и другие религиозные течения, в частности протестантизм. Начал меняться характер информации: от редких отдельных фактов, относящихся к ВКЛ, до подробного описания событий, происходивших в княжестве в середине XVII в. Например, в 1641 г. шотландский проповедник в Кейданах Елизар Гилберт, который также являлся пастором при Януше Радзивилле, в своем очерке под названием «Новости из Польши» отметил факт «жестокой практики католического духовенства в отношении протестантов» [2].

Пожалуй, самым подробным описанием религиозной ситуации в ВКЛ в середине XVII в. является брошюра Яна де Крайно Краинского, опубликованная в Лондоне в 1661 г. под названием «Реляция о бедственном положении Церкви Христовой, признающая протестантскую религию в Великом Княжестве Литовском, представленная к вниманию всех сострадательных христиан» [3]. Автор брошюры Ян де Крайно Краинский был сыном чешского священника, иммигрировавшего из Богемии. Он учился в Голландии, в 50-е годы XVII в. преподавал в Новой Кальвинистской школе в Заблудово, а в 1658 г. назначен священником в Кейданах. Он являлся придворным проповедником Богуслава Радзивилла. В августе 1660 г. Кейданский конвент отправил Краинского в Англию для поиска материальной помощи литовской кальвинистской конгрегации. С собой Краинский вез рекомендательное письмо от Богуслава Радзивилла и официальное прошение Карлу II [6, s. 91–92].

В упомянутой брошюре Краинский описывал состояние протестантской церкви в ВКЛ. Сам факт ее написания на английском языке свидетельствует о том, что основной целью издания являлось распространение информации о бедственном положении протестантской церкви ВКЛ среди англоязычного населения. Краинский подробно изложил, как события середины XVII в., непосредственным свидетелем которых он являлся, повлияли на положение протестантов. С первых строк автор указывает, что все, происходившее в ВКЛ, являлось продолжением той «роковой и кровавой трагедии, бушевавшей в Европе в первой половине

семнадцатого века» [3, A2r]. По словам Краинского, население ВКЛ различного вероисповедания, за исключением православных, подвергалось фактическому уничтожению еще во время Казацко-крестьянской войны (1648–1651 гг.). Автор показывает особую жестокость, проявленную со стороны казаков: «Одним сдирали кожу с ушей. Другим отрезали конечности, вынимали у живых кишки, лили на раны расплавленный свинец, вырывали глаза. Множество было повешено. Огромной милостью считалось обезглавливание или отправка в пожизненное рабство к туркам» [3, A2v]. Резня продолжилась с приходом армии Московского государства, т. е. с началом русско-польской войны. Для подтверждения автор приводит конкретные примеры: Адриан Хилинский был схвачен в своем доме, связан по рукам и ногам, а затем заживо сожжен. Отец и сын Смольские, священники протестантской церкви под Вильно, были обезглавлены посредством серпа. Еще одного священника из села Головчин по фамилии Славинский разрезали живьем на куски. Многих других раздевали и выгоняли на мороз. Всего на протяжении зимы погибло приблизительно полторы тысячи человек. В связи с такими событиями огромное количество протестантских священников вынуждены были покинуть свои места обитания; еще около сорока человек пропали без вести (их Краинский причислил к мертвым). Уничтожению подвергалось имущество протестантов. Большинство протестантских церквей было сожжено, почти все колокола в ВКЛ сняты — в итоге осталось всего несколько. Поля опустошались, жилые дома сжигались. С приходом в 1655 г. армии Карла Х Густава, исповедующего лютеранство, ситуация в ВКЛ не просто не улучшилась, а, наоборот, население получило новых врагов в лице шведов, целью которых было освобождение территории Курляндии и Ливонии от России и установление контроля над балтийскими владениями Речи Посполитой. Поэтому проявление религиозной терпимости отошло на второй план. Результатом так называемого «шведского потопа» стало еще большее усугубление положения протестантской церкви в ВКЛ. В связи с тем, что шведы являлись протестантами, усилилось недовольство католической церкви, что еще ухудшило существующее положение дел. К армии всех перечисленных врагов добавились «варварские народы» из Венгрии, Трансильвании, Молдавии и Валахии [3, A3v]. Грабежи, убийства людей и уничтожение церковного имущества продолжились. Следует отметить, что в своей работе Краинский одинаково негативно оценивает действия иностранцев на территории ВКЛ независимо от их вероисповедания.

2 декабря 1661 г. Джон Уортингтон, являвшийся преподавателем колледжа Иисуса Кембриджского университета с 1650 по 1660 г., а в 1661 г. дьяком церкви в Лондоне, в своем письме Самуэлю Гартлибу, выступающему за объединение протестантских церквей, интересовался

Яном де Крайно Краинским. По словам Уортингтона, Краинский ходатайствовал об облегчении участи протестантов ВКЛ и пытался собрать деньги для публикации Библии на их родном языке. В ответном письме от 7 декабря 1661 г. Гартлиб уточняет, что Краинский получил разрешение от короля (Карла II) на сбор денег в помощь протестантам ВКЛ, и вспоминает, что однажды встречался с ним, но никаких подробностей или своего мнения насчет него в письме не высказал.

Особое беспокойство у Гартлиба вызывал перевод Библии на литовский язык в связи с тем, что «литовский язык не сильно распространен в ВКЛ в отличие от польского, на котором разговаривают представители «лучшего сорта» – землевладельцы, купцы, шляхта и магнаты» [5, p. 85–86]. Гартлиб подчеркивает, что за опубликование Библии больше ратует не Краинский, а Самуэль Богуслав Хилинский, «признанный литовец», упоминание которого в данной корреспонденции неслучайно, так как в Лондоне судьбы двух выходцев из ВКЛ, Краинского и Хилинского, переплелись. Вполне понятно, почему Хилинский был наиболее активен в вопросе перевода и публикации Библии. В 1657 г. он прибыл в Англию, в Оксфорд, где занялся переводом. В 1660 г. в Эдинбурге Эван Тайлер начал издание данного перевода, но, судя по всему, для этого не было достаточных материальных средств.

При чтении корреспонденции Уортингтона возникает вопрос: какой именно язык подразумевался под понятием «литовский»? Интересный факт, что редактор издания дневников и корреспонденции Уортингтона 1885 г. Джеймс Кросли, английский библиофил и литературный ученый, в одной из ссылок уточняет, что литовский язык, о котором ведет речь Гартлиб, являлся «диалектом, который не имел литературных примеров, за исключением статута или сборника законов Литвы, опубликованного в XVI в., и официальных документов страны до середины XVII в., когда он был вытеснен польским» [5, p. 85]. Кросли отмечает, что «литовский отличается от современного русского, являясь его диалектом, и обычно считается языком Белой Руси» [5, p. 85]. Таким образом, исходя из комментария Кросли, можно сделать вывод, что Хилинский переводил Библию на старобелорусский язык. Однако неполный экземпляр переведенной Библии был обнаружен в библиотеке Санкт-Петербургской православной духовной академии лишь в 1887 г., т. е. через два года после опубликования дневников и корреспонденции Уортингтона. В 1888 г. в Берлине нашли еще одну часть Библии — так называемый «Щецинский» фрагмент, а в 1893 г. в Британском музее найден лондонский экземпляр, в два с лишним раза меньший по объему, чем оба предыдущих. В 1932 г. рукописный отдел Британского музея приобрел автограф сделанного Хилинским перевода Нового Завета. Поскольку принадлежность этого перевода Хилинскому была установлена польским историком С. Котом,

Польше было предоставлено право издания этого памятника [9, с. 115]. Наконец, в 1958 г. текст был опубликован в Познани. В результате изучения сохранившихся фрагментов у исследователей не осталось сомнений, что свой перевод Хилинский делал именно на литовский язык, а не на старобелорусский, как ошибочно указал Кросли. На сегодняшний день сохранился лишь фрагмент Библии, Новый Завет, с установленной подписью Хилинского, находящийся в Британской библиотеке. Судьба двух других фрагментов, найденных в конце XIX в., на данный момент неизвестна. В настоящее время исследователи из Литвы не подвергают сомнению, на какой язык была переведена Библия Хилинским, а концентрируют свое внимание на области распространения собственно литовского языка в границах ВКЛ («в Литовском государстве и в соседних краях: в Ливонии, на Курше, в Черной Руси, Восточной Пруссии, у границы с Москвой» [8, с. 108]). Несмотря на подробное изучение сохранившихся переводов, до сих пор встречаются ошибочные утверждения, что Хилинский делал перевод именно на старобелорусский язык [10].

Королевское разрешение, которое получил от английского короля Краинский в 1661 г. и о котором ведет речь Гартлиб в ответном письме Уортингтону, заслуживает особого внимания. В связи с тем, что издание «Реляции» Краинского и получение им разрешения на осуществление сбора денег произошло в один год, то, судя по всему, брошюра являлась средством распространения информации о бедственном положении протестантов в ВКЛ, возможно, с целью эмоционального воздействия для увеличения сборов в стране. В статье «Уцёкі мазгоў», ці Лёсы пратэстантаў Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVII ст.» Андрей Котлярчук утверждает, что Краинский лично встречался с королем Англии [7, с. 73]. Поскольку Краинский имел при себе письма, предназначенные для официальных лиц Англии, то кажется вполне вероятным, что он сам и предоставил их королю. Во всяком случае, помощь не заставила себя долго ждать, и 12 июля 1661 г. король Карл II выдал королевский патент, позволяющий Краинскому осуществлять сбор средств в приходах Англии и Уэльса в пользу протестантской церкви ВКЛ, подавляемой «беспощадными солдатами, такими, как московиты, татары, казаки, шведы и другие» [1]. Под руководством представителя Королевского совета баронета Ричарда Брауна за счет королевской казны были напечатаны соответствующие патенту инструкции, которые были разосланы по всем церквям и часовням.

Королевский патент полностью описывал всю процедуру сбора пожертвований и предполагал назначение лиц, ответственных за тот или иной этап. Сбор средств, который официально начался 27 августа 1661 г., осуществлялся церковными старостами во время служб; в будние дни им позволялось собирать деньги по домам. Количество их

должно было быть записано на обратной стороне копии королевского патента, а затем через шерифов графств все собранные средства поступали в казначейство Управления военно-морского флота на улице Лиденхолл в Лондоне к Эдварду и Джону Феннам, которые, в свою очередь, одну часть денег отправляли в ВКЛ, другую отдавали на издание перевода Библии, еще часть выплачивалась в качестве денежного пособия Краинскому или любому другому делегату от протестантской церкви ВКЛ [1]. Все собранные суммы фиксировались в приходских книгах графств Англии и Уэльса, изучение которых впоследствии может свидетельствовать, насколько охотно население королевства спонсировало литовских протестантов.

Сам факт появления данного патента является крайне необычным, даже исключительным явлением для того времени. Предположительно патент был выдан, чтобы снять беспокойство, возникшее в английском обществе после Реставрации, в особенности после событий мая 1661 г., когда публично был сожжен Ковенант (англо-шотландский договор). Следует отметить, что в регистрационной книге Королевского совета 28 августа 1661 г. записано, что данные действия английских властей не следовало рассматривать в качестве прецедента в случаях каких-либо будущих сборов материальной помощи [4, p. 58]. Помимо уникальности королевского патента как средства помощи протестантскому населению ВКЛ, он интересен также содержащейся в нем информацией: видимо, английский король был в достаточной степени информирован о состоянии зарубежных протестантских церквей, так как в данном документе содержались подробности, не указанные в брошюре Краинского. В королевском патенте, в отличие от нее, даны определенные количественные данные. Например, подчеркивалось, что «много тысяч протестантов вместе со своими пасторами и священниками были жестоко ограблены и перебиты, либо подвергались гонениям врагами протестантской религии», а «множество из существовавших ста церквей подвергались разрушению со стороны беспощадных солдат, москвичей, татар, казаков и шведов» [1]. Можно предположить, что, если личная встреча Краинского и Карла II все же состоялась, Краинский мог сообщить определенные факты, касающиеся состояния протестантизма в Литве. Однако более вероятно, что хорошая информированность английского короля о бедственном положении протестантской церкви в ВКЛ явилась следствием того, что власти Англии по собственной инициативе достаточно пристально следили за судьбой протестантов за рубежом.

Уже упоминалось, что согласно патенту часть собранных денег должна была пойти на оплату затрат по переводу и изданию Библии. При этом в документе указывалось, что половина этой работы уже была сделана. Последнее свидетельствует о влиянии на короля Самуэля

Богуслава Хилинского, который, по словам Гартлиба, являлся «основным действующим лицом» в деле перевода и публикации литовского варианта Библии и даже показал королю часть опубликованного к тому времени материала [5, s. 86]. Патент Карла II предполагал издание Библии в переводе Хилинского, т. е. не на языке официального делопроизводства ВКЛ. Остается загадкой, почему не предполагалось сделать перевод для той части населения, которая проживала на территории современной Беларуси и говорила на старобелорусском. Так или иначе, но исходя из тех сумм, которые получили и Краинский, и Хилинский в феврале 1662 г. [4, p. 60], сбор денег прошел достаточно успешно, хотя уже тогда возникли разногласия между этими двумя представителями ВКЛ, и работа по изданию Библии на литовском языке была остановлена [4, p. 61].

Таким образом, 1661 год стал, пожалуй, одним из самых плодотворных в отношении сотрудничества английских и литовских протестантов на самом высоком уровне. В целом можно отметить, что миссия Краинского прошла успешно: было получено королевское разрешение на сбор в Англии и Уэльсе необходимых для протестантской церкви ВКЛ средств. Кроме того, крайне важным является то, что сохранилось определенное количество письменных свидетельств, которые, однако, пока не были в достаточной степени использованы в качестве источниковой базы. Их исследование может позволить более глубоко проникнуть в религиозный аспект отношений между Англией и ВКЛ в раннее Новое время, что, в свою очередь, дает возможность лучше понять особенности развития международных отношений в тот период.

## Источники и литература

1. Charles the Second, by the grace of God, of England, Scotland, France and Ireland King, defender of the faith, &c. To all and singular archbishops, bishops, arch-deacons, deanes, and their officials; ... Whereas John de Kraino Krainsky, minister of Gods word, deputy of the national synod of the Protestant churches in the great dukedom of Lithuania. — London : John Bill and Christopher Barker, 1661: Wing/C3610B:C6.
2. Gilbert, El. Nevves from Poland. — London : E.P. for Nathanael Butter, 1641.
3. Krainski, J. de Kraino, Relation of the distressed state of the church of Christ professing the protestant religion in the great dukedom of Lithuania, presented to the view of all compassionate Christians. — London, 1661.
4. Steele, R. Materials for the History // The Library. A Quarterly Review of Bibliography and Library Lore. — 1907, Vol. VIII. — S. 57–62.
5. The Diary and Correspondence of Dr. John Worthington / Ed. by Crossley J., Esq., F.S.A. — Chethan Society, 1885, — XXXVI, Vol. II, Part I.

6. Tworek, S. Kraiński Jan Krzysztof // Polski Slownik Biograficzny. — Krakow : Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności, 1970. — T. XV. — S. 91–92.
7. Катлярчук, А. «Уцёкі мазгоў», ці Лёсы пратэстантаў Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVII ст. // Спадчына. — 2006. — № 1. — С. 65–78.
8. Куолис, Д. Понятие «литовец» и «Литва» в литовской письменности XVI–XVII веков // Мартинас Мажвидас и духовная культура Великого княжества Литовского XVI века. — Вильнюс ; Москва : Baltos lankos, 1999. — С. 100–115.
9. Топоров, В. Н. Две публикации старых балтийских текстов // Вопросы языкознания. — М. : АН СССР, 1962. — Вып. 11. — № 2 (март–апрель). — С. 114–116.
10. Швэдзюк, М. Збор грошай у Англіі на выданьне Бібліі па-беларуску // Беларус. — 2009. — № 556. — Травень. — С. 14.

*Н. М. Палтаржыцкая*

## Да пытання аб лёсе актавых кніг Менскага магістрата XVII ст.

Пры даследаванні гісторыі Менска (Мінска) XVII ст. важнай крыніцай з’яўляюцца кнігі канцылярыі магістрата горада. Самыя раннія актавыя кнігі згаданага інстытута самакіравання Менска, якія захаваліся да сённяшняга часу, адносяцца да другой паловы XVII ст. і знаходзяцца ў фондзе 1816 «Менскі магістрат» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ). Гэта архіўныя справы № 1 (кніга «спраў вячыстых» за 1663–1677 гг.), 33 (кніга актавых пратаколаў за 1674–1680 гг.) і 54 (кніга «спраў вячыстых» за 1677–1680 гг.).

Мэта дадзенай працы — вызначыць ступень захаванасці актавых кніг, якія былі створаны ў канцылярыі Менскага магістрата ў другой палове XVII ст.

Для даследчыкаў асаблівую цікавасць прадстаўляе кніга актавых пратаколаў за 1674–1680 гг., куды ўносіліся сціслыя запісы ўсіх пытанняў, што разглядаліся на пасяджэннях магістрата [2]. Яе матэрыялы даволі featureless разнабаковага характару і патрабуюць дэталёвага аналізу, бо адлюстроўваюць сацыяльна-эканамічную і грамадска-палітычную гісторыю горада, дазваляюць рэканструяваць агульную карціну жыцця Менска 70-х гадоў XVII ст. У кнігу на 156 аркушах ўнесены запісы за 7 красавіка 1674 – 17 чэрвеня 1680 гг. Пагінацыя захавана старая, сучаснымі архівістамі пранумараваны толькі адвароты старонак. Кніга

знаходзіцца ў выдатным стане, рэстаўрацыя не праводзілася. Вокладка яе кардонная, на карэнчыку наклеены ярлык з друкаваным надпісам «Минского городского магистрата 1674–1681 гг. № 36. Протокол актовый» (пазначэнне даты «1681» спраўлена чарнілам на «1680»). Такую назву кніга, хутчэй за ўсё, атрымала ў Віленскім цэнтральным архіве, дзе мела № 12307 (алоўкам падпісаны яшчэ «№ 12296» на карэньчыку знізу і сінім алоўкам збоку). Акрамя гэтага, на вокладцы па цэнтры змешчаны надпіс па-польску: «Księga 2 ga. Protokoł przyznań y róznych tranzaktów poczynaiący od roku 1674 jun. 5 d. Kączy się roku 1680 męca juny 15. Kart 156» (як бачна, гэта датаванне крыху розніцца з тымі запісамі, якія прысутнічаюць у кнізе на сённяшні дзень).

Уяўляе цікавасць запіс з левага боку на палях на першым аркушы кнігі актавых пратаколаў таксама па-польску: «Ta xięga bardzo jest zbawienna dla miasta Minska Pro (верагодна, скарот ад слова «przeciwko» — супраць) xx (скарот ад слова «xsiężat») Bazylianów». Слова «zbawienna» перапраўлена пісарам са слова «potrzebna». Такім чынам, запісы кнігі з'яўляюцца пацвярджэннем правоў гарадскога магістрата на нерухомасць, на якую прэтэндавалі манахі-базыльяне.

Увогуле, запісы спраў у кнізе даволі сціслыя, часта аддзяляюцца адзін ад аднаго невялікімі прабеламі ці рысамі ў 1–1,5 см і пачынаюцца часцей з выразаў «rzekł», «donosił», «skarzył» і г. д. У тэксце шмат закрэсленняў і выпраўленняў, трапляюцца пакінутыя пустыя месцы для дапісак, почыркі перыядычна мяняюцца і чытаюцца ў некаторых месцах з цяжкасцю. Сярэдні памер аркушаў 37,5×19,5. Усе яны раней былі звязаныя шнуром, замацаваным чырвонай сургучнай пячаткай менскага гарадавога магістрата XIX ст. з выявай двухгаловага арла, якая добра захавалася. Шнур абарваны і знаходзіцца на адваротным боку ніжняй вокладкі кнігі. На ёй таксама зроблены запіс архіварыуса XIX ст. за подпісамі бурмістра і ратманаў: «В сей книге переномерованных и перепечатанных сто пятьдесят шесть полулистов».

У сваю чаргу архіўныя справы № 1 і 54 з'яўляюцца часткамі кнігі «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг., якая была штучна падзелена ў канцы 1960-х гг. Дзевяць яе дакументаў за 1677 г. былі выключаны і памылкова падшыты да вопіса № 1 справы № 2 тома № 3 фонду 1706 «Бельскі гродскі суд» НГАБ. У той жа справе згаданага фонду да 1977 г. знаходзілася таксама і частка кнігі за 1677–1680 гг., якая складала том № 4.

У архіўнай справе № 1 актыкаваны дакументы за 1663–1677 гг. Акрамя гэтага, у яе падшыты шэсць дакументаў за 4–9 сакавіка 1642 г. з кнігі Менскага гродскага суда і адзін дакумент з канцылярыі Менскага магістрата за 26 мая 1683 г. У архіўную справу № 54 унесены дакументы за 1677–1680 гг. У абедзвюх кнігах паўторна запісаны «старое права»

на нерухомасць і тэстаменты за 1611, 1623, 1625, 1629, 1634, 1635, 1652, 1653, 1655, 1657 гг., сустракаюцца актыкацыі выпісаў з магістрацкіх кніг Ружан, Наваградка, Заблудава і Нясвіжа, кніг Галоўнага Трыбунала, а таксама дакументы, складзеныя ў Круляўцы, Волпе і Міры. У канцылярыі магістрата справаводства ў гэты час вялося трыма «мейскімі» пісарамі. З 1663 г. пісарам быў Базыль Уладзімір Стэфановіч, якога ў канцы 60-х гг. змяніў Табіяш Кромер, а яго ў 1679 г. — Себасцьян Сасноўскі, сын бурмістра. Здараліся выпадкі, калі пры тэрміновым ад'ездзе пісара яго замяшчаў іншы пісьменны прысяжны ўраднік «на месце пісарскім» (часцей лаўнік ці райца), аб чым папярэдне абавязкова паведамлялася на пасяджэнні.

У справе № 1 актыкавана каля 416 дакументаў на 935 аркушах (прапушчаныя аркушы №№ 178, 324, 531, 743, 823, 861; № 911 падшыты пасля № 921) [1]. У кнігу ўнесены прадажныя, застаўныя (запіс аб перадачы маёмасці ў часовае ўладанне), дзельчыя, дароўныя, арэндныя, уліўковыя (запіс аб перадачы маёмасці ва ўплату пазыкі) і квітацыйныя лісты, тэстаменты, пратэстацыі (скаргі), рэляцыі (справаздачы) ўраднікаў, рэестры (спісы), аблігі (даўгавыя распіскі), інтрамісіі (запіс аб увядзенні ва ўладанне маёмасцю), інвентары маёмасці памерлых, каралеўскія прывілеі і інш.

Па каталогу М. І. Гарбачэўскага справа значылася пад № 12330. Кніга рукапісная, яе новая вокладка папяровая, шэрага колеру. Аркушы памерам у сярэднім 19×30 захаваліся добра, аднак у некаторых месцах абрэзаныя рэстаўратарамі, што часам ускладняе прачытанне. Сустракаюцца часткова або цалкам незапоўненыя старонкі, перакрэсленыя і размаляваныя пісарам для прадухілення пазнейшых дапісак і фальсіфікацыі дакументаў. Аркушы пранумараваны тройчы, прысутнічае таксама старая нумарацыя старонак (kart) другой паловы XVII ст., якая ўзнаўлялася з першага нумару ад пачатку кожнага года. Яна змешчана ў верхнім вугле з правага боку, дзе знаходзяцца яшчэ дзве пагінацыі членаў губернскіх камісій 1839 г. і 1851 г. Разыходжанні паміж імі невялікія, аднак з аркуша пад № 315 да іх дадаецца яшчэ адна нумарацыя (аркуш № 314 быў пранумараваны двойчы, пасля чаго членамі камісіі ўносіліся выпраўленні). Так, калі ўзяць адвольную старонку, атрымаецца такая чарга нумарацыі: 501–497–495–502 (№ 502 — сучасная). Загалоўкі да дакументаў не маюць агульнай сістэмы і часта не перадаюць галоўнага зместу запісу. За імі пісарам літарамі пазначалася дата актыкацыі, якая часта дубліруецца лічбамі ў левым верхнім вугле першага аркуша дакумента. Папера з living рознымі вадзянымі знакамі, нелінаваная, пячаткі адсутнічаюць. Сістэма пісьма — скорапіс з невялікай колькасцю вынасных надрадковых літар і скарачэннямі пэўных слоў. Мова актыкацыі — сярэднепольская, трапляюцца тры дакументы на лацінскай і сем на старабеларускай мовах.

Акрамя гэтага, ёсць выпадкі, калі подпіс пячатарамі (сведкамі) ставіўся на старабеларускай мове.

У 1977 г. у фонд «Менскі магістрат» перайшла адна адзінка захавання з фонду «Бельскі гродскі суд» НГАБ за 1677–1680 гг. (Ф. 1706. Воп. 1. Спр. 2. Т. 4), дзе актыкавана каля 125 дакументаў на 284 аркушах (сучасная сігнатура — Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 54). Кніга рукапісная, у добрым стане, мікрафільміравана ў 1971 г. Вокладка справы карычневага колеру ў цвёрдым пераплёце, лісты падшыты дабротна, што выратоўвае кнігу ад россыпу і пашкоджанняў. Памер вокладкі — 24,6×33,4, унізе 24,8×33, таўшчыня — 6 см. На карэньчыку наклеена паперка з пазначэннем «Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 54». Памер аркушаў 18,5×30,2. Як і ў першай частцы, тут зроблены чатыры нумарацыі старонак. Сучасная пачынаецца з № 832, таму што раней справа з'яўлялася працягам трэцяга тома да справы 2 з фонду 1706. Пагінацыя XVII ст. пачынаецца са старонкі № 24. У некаторых месцах сучасная нумарацыя старонак парушана, часам выявіць працяг справы магчыма толькі па старой нумарацыі і парадкаваму нумару дакумента, прапушчаны аркуш № 1111. Частка апошніх (ніжніх) аркушаў мае пашкоджанні ў левым верхнім вугле, ёсць сляды вадзяных разводаў. Мова справаводства — сярэднепольская, шэсць дакументаў актыкавана на старабеларускай мове. Характар запісаў, разнавіднасці дакументаў, сістэма пісьма і нумарацыя дакументаў падобныя да папярэдне апісанай кнігі запісаў.

Тры апошнія аркушы справы займаюць справаздачы членаў губернскіх камісій XIX ст. аб праверцы дакументаў кнігі [3, арк. 1114–1116]. Справаздача за 1839 г. даволі сціслая. Там указваецца колькасць аркушаў кнігі (1240), якія былі на той час замацаваны аборкай, заверaны подпісамі правяраючых і трыма сургучнымі пячаткамі чырвонага колеру. Пячаткі памерам 3,5×2,5 на сённяшні дзень дрэнна захаваліся. У справаздачы за 1851 г. праводзіцца кароткае апісанне нумарацыі аркушаў кнігі «спраў вячыстых» за 1663–1680 гг., аборак, якія замацоўвалі дакументы, пячатак, а таксама дакументаў, якія на думку членаў камісіі з'яўляліся падробкамі (на гэтым запіс абрываецца).

Што да пытання аб наяўнасці ў канцылярыі Менскага магістрата кніг «спраў паточных» (туды ўносіліся прызнанні і данясенні возных, інтрамісіі і г. д.) за другую палову XVII ст., то ў дакументах першай часткі кнігі «спраў вячыстых» сустракаецца запіс ад 1663 г. аб актыкацыі тэксту ўгодлівага ліста яўрэя Танхека Міхалевіча пану Лазару Кузменскаму ў кнізе «спраў паточных» [1, арк. 36 адв.].

Акрамя гэтага, у другой палове XVII ст. у канцылярыі магістрата вяліся дэкрэтавыя кнігі, куды актыкаваліся судовыя рашэнні. Так, аб існаванні дзвюх пераплеценых дэкрэтавых кніг за 1663–1726 гг. паведамляецца ў адным з дакументаў за 24 верасня 1781 г. кнігі Менскага

земскага суда, дзе запісана, што з 6 на 7 чэрвеня 1762 г. у двары менскага бурмістра Яна Давіда Шэйбы па неасцярожнасці яго чаляндіка ўзнік пажар. Полымя ахапіла стайню, куды быў занесены агонь, перакінулася на камяніцу і распаўсюдзілася далей. У выніку згарэла ледзь не палова горада. Пазней, ужо 24 верасня 1781 г. у менскім земскім судзе была прадстаўлена для запісу ў актавыя кнігі «спецыфікацыя ці рэестр» папер менскага бурмістра, каралеўскага сакратара і менскага поштмайстра Я. Д. Шэйбы [4, с. 96]. Рэестр уключаў у сябе спіс папер, якія былі знішчаны ў пажары. Сярод загінуўшых дакументаў былі і дзве пераплеценыя кнігі «спраў вячыстых» за 1681–1700 гг.; дзве пераплеценыя кнігі з судовымі дэкрэтамі магістрата за 1663–1726 гг.; збор арыгіналаў дакументаў гарадскіх улад па ўвядзенні ва ўладанне гарадскімі дамамі, пляцамі, крамамі, землямі; два стосы розных дакументаў (як арыгіналаў, так і копій), якія былі выдадзены гораду і розным мяшчанам; адзін стос ад 1548–1656 гг. «у рускім языку і характару», другі стос з гэтага перыяду да 1700 г. у «польскім пісьме» [4, с. 97].

Звесткі аб магістрацкіх кнігах за ранейшы перыяд, якія былі згублены ці пагарэлі ў час вайны 1654–1667 гг., сустракаюцца ў дакументах кніг «спраў вячыстых» за другую палову XVII ст. Так, у паўторнай актыкацыі тэстамента татарына Байраша Казаковіча ў 1677 г. пісарам пазначаецца, што татарын Хасень Аліманович Канавал прынёс выпіс завяшчання для паўторнай актыкацыі, бо старыя магістрацкія кнігі былі знішчаны пры аблозе горада. У сваю чаргу ўраднікі згадзіліся ўнесці гэты дакумент у актавыя кнігі, бо ўбачылі на ім пячатку горада [3, арк. 847]. Аб страчаных актавых кнігах паведамляецца і пры паўторнай актыкацыі ў 1670 г. «старога права» за 1623 г. на рынкавы пляц у галоўным радзе «славетнай» пані Аўдоцці Дзяментавічавай пры продажы яго «абшчыннаму мужу» Аляксандру Алісеевічу. Пані Аўдоцця разам з сазнаннем на продаж пляца зямлі падала «старое права» на яго ўладанне, спасылаючыся на тое, што старыя кнігі былі знішчаныя ў час вайны [1, арк. 620]. Акрамя гэтага, у 1677 г. пры актыкацыі прадажнага ліста за 1653 г. на краму каля хлебных ятак (лавак) у саляным радзе ад «учцівай» пані Дароты Масяжнікавай «учціваму» пану Матвею Рыгоравічу менскі мешчанін і пан Анісім Чараповіч прасіў, каб яго «старое права» на пляц было ўнесена ў новыя магістрацкія актавыя кнігі, таму што старыя не захаваліся [3, арк. 871]. Вядома таксама, што ў 1640 г. горад моцна пацярпеў ад пажару: згарэў рынак з крамамі і ратуша, а разам з ёй усе магістрацкія кнігі.

Наяўнасць выпісаў з магістрацкіх актавых кніг забяспечвала іх гаспадарам пэўную бяспеку на выпадак, калі самі кнігі будуць знішчаны. Яны таксама з'яўляліся важкім аргументам, напрыклад, у судовых установах, калі патрэбна было прадставіць права на ўладанне маёмасцю. Таму

нядзіўна, што ў выпадку іх страты да ўраднікаў паступалі пратэстацыі (скаргі) ад менскіх мяшчан, якія намагаліся, каб ім выдалі новыя копіі згубленых дакументаў. Да іх, напрыклад, адносіцца пратэстацыя слясарскага цэхмайстра Матэвуша Халецкага аб страчаных у ліпені 1655 г. паперах, калі ён разам з іншымі мяшчанамі выязджаў з Менска перад надыходам маскоўскага войска [1, арк. 117 адв.]. Акрамя гэтага, актыкавана скарга ад 1664 г. аб знікненні абліга (распіскі на грошы) мешчаніна Матэвуша Быхаўца пану Прушкоўскаму, калі ў апошняга была скрадзена шкатула з асабістымі дакументамі і каштоўнымі рэчамі [3, арк. 116]. У экстракце пана Якуба Рудашанскага і яго жонкі Алены паведамлялася аб страце імі ў час вайны папер на куплю нерухомай маёмасці [1, арк. 159 адв.].

Нягледзячы на ўзрост цікавасці да мінулага сталіцы, пастаяннае з'яўленне артыкулаў і даследаванняў, а таксама правядзенне канферэнцый, прысвечаных мінуламу Менска, шэраг пытанняў па яго гісторыі XVII ст. застаецца недастаткова асветленым. На сённяшні дзень захаваліся толькі тры справы за другую палову XVII ст., якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для даследчыкаў за гэты перыяд. Яны выкарыстоўваліся для напісання артыкулаў, навуковых прац (па гісторыі аховы здароўя ў перыяд феадалізму, рэгенерацыі гістарычнага цэнтра, помніках гісторыі і культуры горада, архітэктурнай забудове, гісторыі Менска і менскіх цэхаў), праглядаліся для выяўлення дакументаў у зборнікі. На дадзены момант абедзве кнігі «спраў вячыстых» распрацоўваюцца ў аддзеле старажытных актаў НГАБ, дзе да іх складаецца навукова-даведачны апарат і ўнутраны вопіс, што значна палегчыць працу для гісторыкаў і краязнаўцаў, а таксама будзе карысным для папулярызацыі некаторых цікавых дакументаў. У сваю чаргу кніга актавых пратаколаў, якая насычана рознабаковай інфармацыяй па гісторыі Менска і яго штодзённасці, заслугоўвае археаграфічнай публікацыі.

## Крыніцы і літаратура


1. НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 1.
2. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 33.
3. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 54.
4. Доўнар, А. Б. Рэестр дакументаў мінскага бурмістра Яна Давіда Шэйбы / А. Б. Доўнар // Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 7–9 верасня 2007 г.). — Мінск, 2008.

*М. Савіцкі*

## Артылерыя і смаленскі цэйхгаўз (1654 г.)

Смаленская фартэцыя была вельмі важным элементам у лініі абарончых збудаванняў Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVII ст. Смаленск у азначаны час з’яўляўся прадметам пастаяннага літоўска-маскоўскага суперніцтва, будучы, з аднаго боку, спецыфічнымі варотамі ў Літву, з другога — у абшары панавання цароў. Узяцце яго дапамагло б войску праціўніка прайсці ў глыб тэрыторыі варожай дзяржавы. У 1654 г. падзенне Смаленска спрыяла пераходу ў рукі Аляксея Міхайлавіча тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага на ўсход ад Бярэзіны. Горад знаходзіўся на левым, высокім беразе Дняпра, абнесеным мурам з вежамі. Некаторыя з 36 веж былі пабудаваны ў форме чатырохвугольніка і ўсталяваны на адлегласці 150–300 метраў адна ад адной. З усходу і захаду горад абараняў шырокі роў, праз які працякаў невялікі ручай, на якім у сваю чаргу былі пабудаваны плаціны, што дадаткова перашкаджалі аблозе. Умацаванні горада ўзводзіліся ў часы праўлення Фёдара Іванавіча і Барыса Гадунова. Яны складаліся з невысокіх сцен 10–15 метраў вышынёй і пяць-шэсць метраў таўшчынёй з акружнасцю каля 6 500 метраў. На два метры ад зямлі ў вышыню яны будаваліся з белага каменю, вышэй — з чырвонай цэглы. Правядзенню падкопных работ таксама перашкаджаў падмурак глыбінёй каля чатырох і таўшчынёй у шэсць з паловай метраў [1, s. 65; 7, s. 898]. Цікавай была таксама абарончая сістэма горада. Сутнасць яе ў тым, каб выкарыстаць пры асадзе паспалітае рушанне, а менавіта гарнізон Смаленскай крэпасці. Гэта суправаджалася пашырэннем паўнамоцтваў смаленскага ваяводы па яго арганізацыі. Магчыма, арганізацыя адбывалася шляхам увядзення сістэматычнага вайсковага асадніцтва жаўнераў у Смаленскім ваяводстве ў 1649–1654 гг. з патрабаваннем да іх аднаго — абароны фартэцыі ўзамен за надзяленне зямлёй [2, s. 133]. Такая сістэма, аднак, не лічылася вельмі эфектыўнай.

Дакументы, на якіх заснаваны наш аналіз артылерыі і смаленскага цэйхгаўза ў 1654 г., знаходяцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ў Вільні (фонд 9, нумар 360). У дадатак да звестак пра артылерыю і цэйхгаўз там прыведзены таксама інвентар Смаленскага замка, а пры ім пералік некаторых заможных жыхароў Смаленскага ваяводства з апісаннем шляхецкай уласнасці і пералічэннем вёсак. Тут можна знайсці і падрабязныя спісы людзей, якія знаходзіліся ў крэпасці і абаранялі горад ў 1655 г. З іх вынікае, што шляхцічаў, якія прыбылі на абарону горада і займалі муры, было 349 (з улікам іх «почтаў» — атрадаў). Атрады шляхцічаў, якія ў замку не знаходзіліся, складалі 507 чалавек.

Месцічаў-гаспадароў налічвалася 122 чалавекі. У суме — 978 абаронцаў. Гэты пералік быў падрыхтаваны смаленскім падсудкам Станіславам Уніхоўскім і смаленскім земскім пісарам Аляксандрам Парчэўскім. Вядома, што азначаны дакумент са спісамі абаронцаў з'яўляецца копіяй XIX ст. [3, k. 186–204].

Стваральнік інвентара смаленскай артылерыі і цэйхгаўза, на жаль, пакінуў аб сабе толькі прозвішча Савіцкі. Ён занатаваў прадстаўленыя ніжэй дадзеныя ў студзені 1654 г. і перадаў іх новаму смаленскаму ваяводзе Піліпу Казіміру Абуховічу, які атрымаў згаданую пасаду не без пэўных цяжкасцей. Смаленскае ваяводства вызвалілася ў выніку прызначэння на Жмудскае староства Юрыя Караля Глябовіча, прыхільніка Януша Радзівіла. Аб вызваленні пасады смаленскага ваяводы хадайнічаў прысяжны надворнага суда Павел Ян Сапега, які і атрымаў адпаведнае каралеўскае прызначэнне ў жніўні 1653 г. Піліп Казімір Абуховіч павінен быў атрымаць Віцебскае ваяводства, якое вызваліў бы Сапега. Павел Ян адмовіўся ад атрыманага ваяводства без тлумачэння прычыны напачатку верасня 1653 г., што кароль Ян Казімір прыняў з вялікай пагардай. Можна толькі здагадвацца аб матывах такога рашэння, з якіх на першы план выступае верагоднасць вайны з Масквой. Нарэшце, манарх вырашыў 23 верасня 1653 г. перадаць Смаленскае ваяводства Піліпу Казіміру Абуховічу, што выклікала пратэсты ў Сенаце Януша Радзівіла. Прыхільнік і ўдзельнік біржанскай групоўкі Радзівіла мсціслаўскі падкаморы Пётр Казімір Вяжэвіч распачаў нават дыскрэдытацыю новага стаўленіка ў асяроддзі смаленскай шляхты, пагражаючы зачыніць перад Абуховічам гарадскую браму. Аднак дамагчыся жаданага выніку Вяжэвіч і яго хаўруснікі не здолелі, і ў снежні 1653 г. Піліп Казімір заняў сваё месца ваяводы, хоць і не без пэўных клопатаў, звязаных з перадачай яму сцяга ваяводства. Да выканання паўнамоцтваў Абуховіч афіцыйна прыступіў у студзені 1654 г. [4, s. 108; 6, s. 108–110]. Як ваявода ён быў абавязаны забяспечыць абарону замка, аднак меры, якія прымаліся ім для гэтага, аказаліся не да спадобы мясцоваму паспольству. Акрамя таго, кароль даслаў яму спецыяльную пракламацыю ад 8 чэрвеня 1654 г., паводле якой ваявода прызначаўся камандаваць войскам і мясцовай шляхтай, што ў суме фарміравалі агульны гарнізон фартэцыі [4, s. 109].

Пра аблогу і падзенне смаленскай фартэцыі, якая, нягледзячы на асабістыя сеймавыя канстытуцыі, не была належным чынам падрыхтавана да асады, шмат напісана ў літаратуры, таму мы лічым непатрэбным паўтараць тую інфармацыю. Важна толькі тое, што смаленскага ваяводу прывялі да капітуляцыі прычыны як эмацыянальнага, так і рацыянальнага характару, але гэта не зменшыла негатыўнага рэзанансу падзеі ў Рэчы Паспалітай. У сувязі з гэтым самога Абуховіча чакала мноства непрыемнасцей. У 1655 г. на скарочаным сейме была прынята

канстытуцыя «Справа Смаленская» і толькі з-за адсутнасці часу было адкладзена вынясенне прысуду ваяводзе і камандуючым замежнай пяхотай Вільгельму Корфу і Мікалаю Тызенгаўзу да наступнага сейма. Судовы разбор аднавіўся на першым сейме аб шведскім «патопе» ў 1658 г., дзе праводзіўся завочны разгляд справы на той момант ужо нябожчыка Абуховіча (памёр 6 верасня 1656 г.) і іншых асоб, вінаватых у здачы фартэцыі. Ад адказнасці за дзеянні ў вайне 1654 г. былы ваявода быў вызвалены пасмяротна каралеўскім дэкрэтам, выдадзеным па гэтай справе 10 чэрвеня 1658 г. [1, s. 71–82; 4, s. 109–119; 5, s. 36–37, 47, 159–160, 187, 217–218].

Пераходзячы да асноўнай часткі артыкула, ніжэй у таблічнай форме прывядзем пералік гармат, якімі валодала смаленская фартэцыя ў 1654 г., а таксама ўзбраення, што знаходзілася ў цэйхгаўзе.

Табліца 1.
Спіс гармат на сценах горада

| **Род гармат і месца ўсталявання** | **Вага кулі ў фунтах** | **Колькасць** | **Асаблівасці вытворчасці гарматы** |
|---|---|---|---|
| Гармата на Каралеўскай браме | 6 | 1 | Без надпісаў |
| Гармата на Кастыроскай браме | 6 | 1 | Без надпісаў |
| Гармата на Крылажанскай вежы | 6 | 1 | Надпіс караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на Лючынскай вежы | 6 | 1 | Надпіс маскоўскі |
| Гармата на Весялужскай вежы | 10 | 1 | Гармата названа «Мядзведзь» |
| Гармата на Абрамаўскай браме | 2 | 1 | Без надпісаў |
| Гармата на Залатарнай (?) браме | 4 | 1 | Надпіс караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на Залатарнай (?) браме | 6 | 1 | Надпіс караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на Даўгурчэўскай вежы | 6 | 1 | Надпіс маскоўскі |
| Гармата на Еленскай браме | 4 | 1 | Надпіс маскоўскі |
| На Антыапійскай вежы | 1 | 1 | Надпіс караля ЯМ Жыгімонта III |

| **Род гармат і месца ўсталявання** | **Вага кулі ў фунтах** | **Коль-касць** | **Асаблівасці вытворчасці гарматы** |
|---|---|---|---|
| На Антыапійскай вежы | 4 | 1 | Гармата названа «Сокал» з надпісам Мальхера Будзееўскага |
| Гармата на малым валу | 3 | 2 | Без надпісу. Гармата прыкрыта дошкамі |
| Гармата на малым валу | «палова трэцяй» | 1 | Гармата прыкрыта дошкамі, без надпісаў |
| Гармата на малым валу | 1,5 | 1 | Гармата прыкрыта дошкамі, без надпісаў |
| Гарматы насупраць малога вала | 55 | 2 | Гармата адна на зямлі на колах, другая гармата ляжыць голая. Адна з надпісам караля ЯМ Стэфана і названа «Васіліск». Другая без назвы і надпісу. |
| Гарматы насупраць малога вала | 40 | 1 | Гармата з надпісам «Вітольт» |
| Гармата на Малахаўскай браме | 6 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата на Малахаўскай браме | 5 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата насупраць Малахаўскай брамы | 35 | 1 | Гармата з назвай «Панна» |
| Гармата на Казадалаўскай вежы | Адна шасціфунтавая, дзве іншыя нявызначанай вагі | 3 | Гармата шасціфунтавая мела надпіс нямецкі караля ЯМ Жыгімонта III, а таксама назву «Гермес» |

| **Род гармат і месца ўсталявання** | **Вага кулі ў фунтах** | **Коль-касць** | **Асаблівасці вытворчасці гарматы** |
|---|---|---|---|
| Гармата на Казадалаўскай вежы | 6 | 1 | Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на Казадалаўскай вежы | 4 | 1 | Гармата названа «Сокал» |
| Гармата на Тупінскай вежы | 6 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата на Капыцінскай браме | 5 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата на вялікім валу [1], які ішоў ад мура ў левы бок | 12 | 1 | Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на вялікім валу, які ішоў з мура ў левы бок | 6 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата на вялікім валу, які ішоў з мура ў левы бок | 4 | 1 | Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III |
| Мартыра на вялікім валу, якая ішла з мура ў левы бок | Няма звестак | 1 | Мартыра з надпісам маскоўскім |
| Гармата на другой чвэрці вала | 12 | 1 | Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на другой чвэрці вала | 4 | 1 | Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на другой чвэрці вала | 4 | 1 | Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III |
| Гармата на трэцяй чвэрці вала | 13 | 1 | Гармата з назвай «Левек» з надпісам маскоўскім |

[1] Вялікі вал пад назвай «Жыгімонтава ўмацаванне» забяспечваў Смаленск ад пагрозы з захаду, робячы замак пяцібастыёнавай цытадэллю [1, s. 66].

| **Род гармат і месца ўсталявання** | **Вага кулі ў фунтах** | **Коль-касць** | **Асаблівасці вытворчасці гарматы** |
|---|---|---|---|
| Гармата на трэцяй чвэрці вала | 30 | 1 | Гармата з назвай «Брат». Штурмавік з надпісам маскоўскім |
| Гармата на Шэйкаўскай вежы | 4 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата на Багуслаўскай вежы | 7 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата на Мікульскай вежы | 6 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата на Кастыраўскай вежы | Няма звестак | 1 | Няма з прычыненай шкоды (?) |
| Гармата на Сямёнаўскай вежы | 6 | 1 | Гармата з надпісам маскоўскім |
| Гармата ў Радгістэра [2] | 6 | 1 | Гармата «недаробленая» |
| Гармата на Блоні | 4 | 1 | Гармата з назвай «Брат» |
| Гармата з брамы вялікага вала | 15 | 1 | Гармата з назвай (аўтарам не пазначана. — *М. С.*) |

*Крыніца:* LMAB. — Fond 9. — Nr 360. K. 112 v.–114.

### Табліца 2. Гарматы, якія знаходзяцца ў цэйхгаўзе

| **Характэрныя пазнакі гарматы** | **Вага кулі ў фунтах** | **Колькасць** |
|---|---|---|
| Гармата, названая «Брат» | 6 | 1 |
| Гармата з надпісам маскоўскім | 6 | 1 |
| Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III | 1,5 | 1 |
| Гармата з надпісам нямецкім | 1,5 | 1 |

[2] Напэўна, размова ідзе аб мясцовым «людвісары» (ліцейшчыку).

| **Характэрныя пазнакі гарматы** | **Вага кулі ў фунтах** | **Колькасць** |
|---|---|---|
| Гармата з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III | 3 | 1 |
| Гармата без характэрных пазнак | 1,5 | 1 |
| Гармата, названая «Яшчурка» з надпісам караля ЯМ Жыгімонта III | 1,5 | 1 |
| Гармата без надпісаў і характэрных пазнак | 1,5 | 1 |
| Гармата з надпісам маскоўскім | 1 | 1 |
| Гарматы з надпісамі маскоўскімі | 5 | 6 |

*Крыніца:* LMAB. — Fond 9. — Nr 360. — K. 112 v.–114.

Аўтар прыведзенага інвентара адзначыў таксама, што спачатку ўсіх гармат у смаленскай крэпасці было 56. Паводле параўнання з дадзенымі табліцы, на мурах, у брамах і цэйхгаўзе іх 61, а значыць, той, хто запісваў тыя дадзеныя, не змог сумленна скончыць падлік цэлага. Не ўлічыў ён такім чынам шэсць мартыраў: тры на лафетах і добра напраўленых колах, тры голыя, якія знаходзіліся ў цэйхгаўзе, а пералічаны ў іншым месцы інвентара. Варта ўзгадаць і тое, што дадаткова ўлічыў ён таксама дзве гарматы скураныя, адзначаючы, што тыя былі старымі, спарахнелымі і пацёртымі [3, k. 112 v.–117]. Гэтая колькасць не малая нават у параўнанні з прыватнай крэпасцю Сапегаў Ляхавічамі, якая на момант 26 лютага 1658 г. мела ў распараджэнні 31 гармату [3, k. 240–244 v.]. Можа здзівіць толькі факт, што гарматы Смаленска, горада, які быў так важны для ВКЛ, як і для ўсёй Рэчы Паспалітай, былі ў большасці старыя і малога калібру. Спарадычна можна натрапіць на дзесяціфунтавую артылерыю. Згаданы арсенал складаўся ў значнай большасці з маскоўскіх гармат, напэўна, здабытых у часы панавання Уладзіслава IV, а нават і ранейшых, часоў яго бацькі Жыгімонта III.

Непазначаны па імені Савіцкі перапісаў таксама начынне цэйхгаўза смаленскай крэпасці, зазначаючы, што ён новы пасля рамонту, мае дзверы на двайных завесах з замкамі на іх, формы пры сценах для куляў і цвікі для мушкетаў на сценах [3, k. 114 v.–117]. Астатняя частка інвентара, якая тычыцца смаленскага збройнага рыштунка, прыведзена ў наступнай табліцы.

### Табліца 3. «Перапіс цэйхгаўза» смаленскага ў 1654 г.

| **Рыштунак артылерыйскі і мінёрскі** | **Колькасць** |
|---|---|
| Штурмакі — 3 на лафетах і добра напраўленых колах, а 5 голых у карытах | 8 |
| Серпантынаў [3] — голых без лафетаў | 15 |
| Гакаўніцы, паміж якімі 31 напраўленая, а 13 старых разарваных, ні на што не годных | 44 |
| У склепе ў браме, ідучы ад вялікага вала па левай руцэ пораху маскоўскага бочак вялікіх і малых 77, рэдка якая з іх поўная | 77 |
| Порах гданьскі і віленскі. Вымагаў ён пераробкі, бо дзве салянкі былі напалову перамешаныя з зямлёй | 8 салянак [4] |
| Порах дарагабужскі | 11 бочак, прытым тры рассыпаныя |
| Сера | адна ў штуках паласа і адна салянка |
| Цёртая сера | 5 салянак |
| Салетры неачышчанай | Паўсалянкі |
| У другім склепе ў браме вялікіх жалезных куль змешаная колькасць | 4 300 |
| Куль сярэдніх і малых | 11 300 |
| Волава маскоўскае падоўжанае | 2717 штук |
| Волава гмолінскае | 190 штук вялікіх квадратных |
| Куль алавяных мушкетавых немалая колькасць у адным куце закладзена дошкамі | 7 бочак меры смаленскай |
| Петарды | 7 акутых, 10 не акутых |

---

[3] Серпантын — гармата 24 фунтовага калібру (Xięga rzeczy polskich. 1896. S. 406).
[4] Салянка — адзінка вымярэння солі, роўная 0,6 частцы бочкі (Старабеларускі лексікон. 1997. № 4851).

| **Рыштунак артылерыйскі і мінёрскі** | **Колькасць** |
|---|---|
| Гранаты бронзавыя | 86 штук, без тапарышчаў 130 штук |
| Стомпараў бронзавых для вырабу гароху | 3 |
| Форм бронзавых для ліцця мушкетавых куль | 2 |
| Шуфляў медных для набою вялікіх і малых гармат, новыя і старыя | 40 |
| Шаля акутая для ўзважвання на прутах жалезных | 1 |
| Гівіхтаў бронзавых для шалі | 5 і жалезных 1 |
| Штэмпкаў жалезных | 7 |
| Свёрдлаў для вырабу гармат | 3 |
| Бляхі жалезныя радгісэрскія немалой колькасці, заламаныя на адзін канец | Няма канкрэтных звестак |
| Начынне бронзавае для свідравання гармат | 3 |
| Жалезныя бляхі | 6 |
| Жалезныя вілы для петардаў | 3 |
| Крук для пад’ёму жалезных гармат | 3 |
| Шротаў для набойкі гармат у бляхах | 19 |
| На тупінскай вежы кнотаў у пяці формах, на ярусе чатыры формы трохі няпоўныя, на пятай большая палова кнотаў | вазоў каля пяці |
| На той самай вежы кноты пад перакрыццямі | можа быць два вазы |
| У спіхлеру [5] скарбовым вялікіх і малых агнястрэльных куль | 104 |
| «Стрэлаў агністых» [6] | 10, якіх было напраўлена 314 |
| Сгвалоў для агнястрэльнай зброі разарваных | 140 |

[5] Спіхлер — гумно.

[6] Пад «стрэламі агністымі», верагодна, маюцца на ўвазе агнястрэльныя кулі.

| **Рыштунак артылерыйскі і мінёрскі** | **Колькасць** |
|---|---|
| Калоў жалезных цэлых, вялікіх і малых | 8 |
| Калоў жалезных зламаных | 16 |
| Ланцугоў жалезных вялікіх | 2 |
| Ланцугоў для кадак | 3 |
| Свёрдлаў стабаватых вялікіх і малых | 5 |
| Вілы жалезныя насаджаныя | 1 |
| Цэлых сякер | 20 |
| Мех | 1 |
| Вялікі рашпель | 1 |
| Клешчы | 1 |
| Кавальскае начынне: молатаў вялікіх і малых | 18 |
| Ствол для восі | 23 |
| Рыдлёвак насаджаных | 20 |
| Рыдлёвак плоскіх неасаджаных | 50 |
| Рыдлёвак зламаных | 12 |
| Долаты | 2 |
| Сталі маскоўскай случак | 100 |
| Мадрэль для петард | 15 |
| Вілаў і крукоў жалезных неасаджаных | 313 |
| Жалеза амаль для двух гарматных лафетаў | Недахоп звестак |
| Калоў акутых | 8 |
| Дамкратаў вялікіх і малых папсаваных | 7 |
| Сякер зламаных | 26 |
| Шпагаў зламаных з фардыментамі [7], мала на што годных колькасць немалая | 30 |

[7] Fordyment — чашка ў шпагі.

| **Рыштунак артылерыйскі і мінёрскі** | **Колькасць** |
|---|---|
| Лараў жалезных для перабору куль | 9 |
| Задняя бляха | 1 |
| Шышакоў заржавелых і папсаваных | 17 |
| Каганцы | 9 |
| Блях ад зброі пярэдніх | 6 |
| Гімкры для муру | 2 |
| Жалеза для шаляў | 2 |
| Казлы ваенныя | 2 |
| Быкоў | 30 |
| Матык | 10 |
| Срубштак [8] вялікі | 1 |
| Жалезны ліфт для гармат | 1 |
| Сякер для волава | 2 |
| Палатка ЯКМ зялёным сукном крытая, зусім спарахнелая | 1 |
| Спісаў з наканечнікамі | 120 |
| У браме Капыцінскай воз фурманскі, пад тым возам два заднія колы каваныя і з воссю карэта новая; толькі сам воз неабшыты без восі і без куль | |
| Абоймаў [9] жалезных для гарматных куль | 3 |
| Бендалетаў з патронамі | 220 |
| Таксама маскоўскіх надкусаных куль нямала | Няма звестак |
| Дышлі акутыя з восямі без куль для караў [10] | 2 |
| Трос для гарматы | 1 |

[8] Srubsztak — ціскі з вінтамі.
[9] Refa, ryfa, refka — абруч, абойма, насадка (для кола).
[10] Kary — двухколавая каляска, тачанка.

| **Рыштунак артылерыйскі і мінёрскі** | **Колькасць** |
|---|---|
| Кола для вырабу пораху адно, жалеза на ім (рэшты) 4 і соплаў 2 | 1 |
| Гарматных куль старых каваных | 6 |
| Лафеты, зробленыя з адной воссю, колы перад ім абшытыя, не цалкам акутыя | 1 |
| Варштат для вырабу тросаў акуты 1, другі не акуты | 2 |
| Вагаў для розных кар, але не на ўсіх жалеза | 50 |
| Спісаў без вастрыёў | 40 |

*Крыніца:* LMAB. — Fond 9. — Nr 360. — K. 114 v.–117.

Як паказвае прыведзеная табліца, цэйхгаўз смаленскай крэпасці быў адносна нядрэнна забяспечаны рознага віду прыстасаваннямі, прыдатнымі ў ходзе аблогі. Меў дадатковыя запасы матэрыялаў, з якіх можна было вырабіць порах. Можа здзівіць толькі малая колькасць прыдатнага для ўжывання пораху, часткова нават неачышчанага, таксама поўны хаос у размяшчэнні гарматных куль, што магло пры аблозе прынесці шмат клопату з іх падборам для адпаведнага калібру гарматы. У забеспячэнні арсеналу таксама адчуваліся недахоп жалеза, важнай сыравіны ў ходзе аблогі, і адсутнасць ваеннага рыштунку для абаронцаў. Урэшце, аўтар інвентара цэйхгаўза зусім не пералічвае якой-небудзь ручной агнястрэльнай зброі. Да параўнання можна сказаць, што на аналагічны перыяд ужо згаданая вышэй ляхавіцкая крэпасць мела вялікія запасы жалеза, а што найважней — мушкеты. Таксама кулі былі ўпарадкаваныя з пункту гледжання велічыні, што і тут паказвае адрозненне ад смаленскай крэпасці.

Прааналізаваўшы вышэй згаданае, можна сцвярджаць, што смаленская крэпасць была даволі добра абсталявана гарматамі рознага калібру. Фактам з’яўляецца тое, што, як правіла, гэта былі гарматы маскоўскага паходжання, напэўна, тыя, якія выкарыстоўваліся яшчэ ў часы Уладзіслава IV, а можа і Жыгімонта III Вазаў. Увогуле гарматы былі жалезнымі, а аб іншых матэрыялах, напрыклад бронзе, згадкі адсутнічаюць. Назіраецца поўная адсутнасць новага артылерыйскага абсталявання, што, напэўна, заўважана складальнікам інвентара. Аднак нам падаецца, што цэйхгаўз быў адносна добра абсталяваны асабліва амуніцыяй, якая была, аднак, хаатычна складзена, што мусіла мець уплыў на мабільнасць артылерыйскай абароны. У цэйхгаўзе знаходзілася параўнальна шмат волава, але мала пораху, які ў дадатак

быў часткова змешаны з зямлёй, а значыць, непрыдатны для артылерыі. Не хапала ў ім таксама неабходнай колькасці гранат. Не зважаючы, такім чынам, на пэўныя недахопы ў забеспячэнні, можна заключыць, што смаленская крэпасць была адносна добра абсталявана гарматамі і з пазіцыі артылерыі гатова да абароны, чаго нельга сказаць пра стан саміх умацаванняў.

Крыніцы і літаратура

1. Bobiatyński, K. Od Smoleńska do Wilna : wojna Rzeczypospolitej z Moskwą 1654–1655. — Zabrze, 2004.
2. Dybaś, B. Fortece Rzeczypospolitej : studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku. — Toruń, 1998.
3. LMAB (Бібліятэка Акадэміі навук Літвы ў Вільні). — F. 9. — Nr. 360.
4. Pamiętniki Filipa, Michała i Teodora Obuchowiczów (1630–1707) / pod red. A. Rachuby. — Warszawa, 2003.
5. Patrz Volumina Legum T. IV / wyd. J. Ohryzko. — Petersburg, 1859.
6. Sawicki, M. Stronnictwo dworskie w Wielkim Księstwie Litewskim w latach 1648–1655. — Opole, 2010.
7. Słownik Geograficzny Królestwa Polskiego. T. X / oprac. B. Chlebowski, W. Walewski. — Warszawa, 1889.

*А. К. Цітоў*

## Магілёўскія цэхі ў XVI–XVIII стст.

Гісторыя беларускіх гарадскіх цэхаў не прыцягвала дастатковай увагі даследчыкаў. Як правіла, дзейнасць рамесных цэхаў разглядалася цалкам або як ілюстрацыйны матэрыял, які дапамагае асвятліць альбо адцяніць тыя ці іншыя падзеі ў гарадской гісторыі, або ўвага акцэнтоўвалася на пэўныя яе старонкі. Адной з першых спроб даследавання ў гістарыяграфіі згаданай тэматыкі з’яўляецца праца П. В. Кліменкі «Заходнерускія цэхі ў XVI–XVIII стст.» (1914) [11]. У артыкуле А. К. Цітова «Цэхавая геральдыка Беларусі» (1987) разгледжаны цэхавыя сімвалы, значная колькасць якіх належала магілёўскім цэхам [25]. Праблема цэхаў часткова закранаецца ў працы І. А. Марзалюка «Магілёў у XII–XVIII стст.» (1998) [12]. У кнізе А. К. Цітова «Менск — места майстроў» (2002) зроблена спроба асвятліць дзейнасць цэхавых устаноў на прыкладзе асобна ўзятага горада [24].

На нашу думку, гісторыя дзейнасці гэтых установ заслугоўвае больш уважлівага стаўлення, глыбокага і пільнага разгляду. Далёка не ўсе гарады з магдэбургскім правам мелі рамесныя суполкі. На тэрыторыі сучаснай Беларусі дзейнічала амаль паўтары сотні прафесійных аб'яднанняў мяшчан. У розных гарадах налічвалася ад дзвюх адзінак да паўтара дзясяткаў рамесных аб'яднанняў, т. зв. брацтваў, за якімі пазней замацавалася найменне «цэхі».

У гэтым плане Магілёў значна вылучаецца сярод іншых гарадоў нашай краіны. У сучасных межах Беларусі ён займае па колькасці рамесных цэхаў ганаровае другое месца. За перыяд XVI–XVIII стст. тут існавала, па нашых падліках, 19 цэхаў (болей выяўлена намі толькі ў Слуцку — 21). Далёка ззаду засталіся такія гарады, як Бярэсце — 15, Менск — 12, Гародня і Полацк — 9, Нясвіж і Шклоў — 7, Віцебск — 6, Орша — 3 цэхі.

Безумоўна, прыведзеныя лічбы неканчатковыя, у некаторых выпадках яны могуць змяніцца, але, сумнеўна тое, што «слаўнае места Магілёўскае» можа быць пасунута на больш нізкія пазіцыі.

Першыя дакументальныя згадкі пра існаванне ў месце брацтваў тычацца другой паловы XVI ст.

Заснаванне цэхавых устаноў у Магілёве суправаджалася выдачай гарадскімі ўладамі цэхавага статута, дакумента, які рэгламентаваў як унутраныя, так і знешнія бакі ўзаемаадносін паміж прадстаўнікамі адной спецыяльнасці і спажыўцамі іх прадукцыі. Як правіла, наданню яму сілы акта папярэднічала ініцыятыва групы мяшчан, аб'яднаных агульнымі прафесійнымі інтарэсамі, якія звярталіся ў магістрат з адпаведным прашэннем. Акрамя магістрацкага зацвярджэння гэты дакумент атрымліваў пацвярджэнне — канфірмацыю (прывілей) ад караля і вялікага князя.

Статут асвятляў розныя бакі функцыянавання прафесійнага аб'яднання ў сістэме дзейнасці ўсяго гарадскога арганізма. Асноўная частка змяшчала ў сабе правы і абавязкі сяброў цэха, правілы ўступлення, адносіны са знешнімі структурамі, напрыклад з царквой, т. зв. «алтарныя абавязкі». Яны заключаліся ў тым, што той ці іншы цэх мусіў пастаўляць пэўную колькасць воску або гатовых свечак у акрэсленыя статутам царкву ці касцёл, а часцей у два згаданыя месцы. У некаторых выпадках цэхі атрымлівалі і канкрэтны алтар у храме. Часта братчыкі абавязваліся пабудаваць яго сваім коштам і потым штоквартальна спраўляць у ім іншыя набажэнствы і імшы. Так, згодна з прывілеем, свой галоўны алтар, што быў прысвечаны Іаану Хрысціцелю, магілёўскія алейнікі мелі ў Багаяўленскай царкве.

Магілёўскія братчыкі, якія займаліся канкрэтнай вытворчасцю і жыць імкнуліся недалёка адзін ад аднаго, у адным раёне (канцы) места,

на вызначаных вуліцах і ў завулках, часцей названых паводле прафесій рамеснікаў (напрыклад, вуліцы Алейная, завулак Рэзніцкі і г. д.).

Больш падрабязна звернемся да гісторыі магілёўскіх цэхаў.

**1. Аб'яднаны металаапрацоўчы цэх.** Пастанова аб актыкацыі цэхавага статута была ўнесена ў актавыя кнігі Магілёўскага магістрата 16 кастрычніка 1615 г., пасля хадайніцтва дванаццаці мяшчан аб стварэнні цэха. У актыкацыі ўдзельнічалі — мечнікі, кавалі, слесары і кацельнікі [5, с. 330–334]. Гэта пастанова была зацверджана 17 снежня 1633 г. каралём Уладзіславам IV канфірмацыйным прывілеям цэху, дзе гербам была прызначана «Пагоня», якую дазвалялася мець на цэхавай харугві і пячатцы. Акрамя герба рамеснікі атрымалі дазвол на штогадовае двухразовае сычэнне (настойку) дзесяці пудоў мёду на Новы год і на Узнясенне Гасподняе [17, арк. 643–653]. Пацвярджальны прывілей ад 3 чэрвеня 1634 г. Уладзіслава IV дазваляў ім шынкаваць для ўласных патрэб. Рамеснікі маглі гнаць гарэлку на хрысціны, вяселле і на пахаванне «братоў», але ў тэксце дакумента было агаворана, што гэтыя працэдуры не маглі працягвацца больш за тры дні [5, с. 456–469]. Амаль праз год, дакладней 8 кастрычніка 1634 г., сорак тры братчыкі (мечнікі, слесары і кавалі) падалі на актыкацыю ў мясцовы магістрат ліст аб вызначэнні царквы для выканання сумесных набажэнстваў, яны «постановили … одностайне олтар для хвалы божое и молитвы товарысва цэху … в церкви упривилиеваной братской Богоявления Господня собе мети», куды «мы сами и потомки наши» наведвацца будуць [5, с. 509–511]. Наступны факт з гісторыі цэха звязаны са скаргай, якая паступіла ў Магілёўскі магістрат 14 студзеня 1758 г. ад цэхавых братоў на Базыля Гаховіча. Апошні спрабаваў несумленнымі дзеяннямі заняць месца старшыні на элекцыіі цэхавага ўраду замест законна абранага Максіма Андрэевіча [9, с. 218–226]. Па прыгавору магістрата ад 1 лютага 1758 г. Гаховіч мусіў адсядзець у вежы шэсць тыдняў, а яго памагатыя («партызаны») Лук'ян Нажэўнік і Караль Цыганок, якія праводзілі «злыя акцыі» (вырвалі з цэхавых рэестраў аркушы пратакола абрання Максіма Андрэевіча), як бунтаўшчыкі прыгаворваліся да дванаццаці тыдняў сядзення ў турме і пакарання бізунамі [9, с. 227–228].

**2. Алейніцкі цэх.** Актыкацыя заявы алейнікаў аб утварэнні іх «вытворчай» суполкі датуецца ў кнігах Магілёўскага магістрата 26 студзеня 1583 г. Гэтым жа самым дакументам са згоды рамесных братоў цэхмістрам быў абраны алейніцкі староста Ізоцка Андросавіч, які «мает тое староство олейницкое держать поты, поки самъ захочет». Далей у дакуменце быў даволі падрабязна зафіксаваны рэгламент іх дзейнасці. У прыватнасці, там было падкрэслена, што «продавать олею гостю» можна з ведама іх старасты «толко пять гляков … але мескому человеку волно будет колко хотя олею продать … а гляки на проданье олею

мают быти ровныя цэхованые (кляймёныя. — *А. Ц.*) мают быти кварты ровныя» [4, с. 340–342]. Актыкацыя цэхавага статута адбылася ў Магілёўскім магістраце 22 сакавіка 1636 г. у прысутнасці васьмі мяшчан-алейнікаў. Адпаведна са статутам цэхмістр перадаваў свае паўнамоцтвы на дзень св. Мікалая. Алейнікі сачылі за тым, каб не было канкурэнцыі з боку няцэхавых рамеснікаў. Гандаль уласнай прадукцыяй (ва ўсе дні акрамя кірмашовых) без ведама іх цэхмістра караўся штрафам у «дзве капы грошай на карысць брацкай скрынкі і дзве капы на мескі ўрад». Братчыкі мелі свой алтар, прысвечаны Іаану Хрысціцелю ў Магілёўскай Багаяўленскай царкве. Яны таксама атрымалі дазвол не больш тыдня на Вялікдзень і на св. Мікалая, паводле «рускага каляндара», сыціць мёд, а палову воску ад сычэння аддаваць фарнаму касцёлу і брацкай Багаяўленскай царкве. У якасці аздобы цэха і для абароны Магілёва брацтва мела ўласную харугву, бубен, ручніцы (стрэльбы), шаблі і іншы збройны рыштунак. Тут жа падкрэслівалася, што браты цэха бяруць на сябе абавязак «не мець тайных рад супраць магістрата». Гэты дакумент быў канфірмаваны 29 красавіка 1636 г. каралём Уладзіславам IV [6, с. 227–233, 264–270]. Цікавы факт з гісторыі цэха прыпадае на 5 траўня 1668 г., калі ўсе браты цэха былі абвінавачаны ў тым, што прадаюць алей няправільнай мерай, «збанам несправедлівым і фальшывым». На гэта яны заявілі, што атрымалі яе ад адпаведных асоб з тутэйшага магістрата, «за пячаткай меской» яшчэ 19 гадоў таму. Перамерванне паказала, што «гляк, то есть мера алейная, ёсць скупы на паўтары чверкі». Крыху больш чым праз тыдзень у магістраце была праведзена наступная, афіцыйная «перамерка», на якой «гляк медзяны алейніцкі гарнцам меским вадой змерылі» і «на поўкварты гляк меньшым аказаўся». Магістрацкі суд прыняў рашэнне: «… гляк мерай цяперашняй у дзесяць кварт і пры мескай пячаці ім у рукі аддаць» і загадаць, «каб толькі ім алей прадавалі» [7, с. 347–350].

**3. Гарбарскі цэх.** Створаны ў адпаведнасці з ініцыятывай мяшчан і «кгарбароў места его каралеўскае миласти Могилевского, которые робять скоры дубленые, также скоры дубленыя жолтые и чырвоные и чорные». Іх статут быў актыкаваны 19 снежня 1625 г. у гарадскім магістраце. У адным з артыкулаў было падкрэслена, што забараняецца майстрам і таварышам цэха «куповати в день недельный до полудня … скор воловых, коньских, козловых, бараних и телячих, так теж попелов, дубу и фарбу ремеслу належачых». Вінаватыя ў гэтым парушэнні мусілі заплаціць на карысць лентвойта дзесяць польскіх злотых і столькі ж да скрынкі брацкай. Адпаведна з пастановай братчыкі абіралі сабе цэхмістра і двух старшых (старастаў або шафараў). Цэх меў сваю пячатку, пры дапамозе якой цэхмістр меў права завяраць дакументы, што ствараліся ім, «а если бы цехмистр не умел писать, то печатю своею

мает прыпечатовать пры братской печати» [5, с. 407–413]. Гэты статут быў канфірмаваны 17 снежня 1633 г. каралём Уладзіславам IV падчас цэхмістраўства Гаўрылы Хамініча. Адпаведна за герб гэтаму цэху кароль надаў «Панну Найсветнейшую … і ў працэсіях і іншых аказіях за герб вобраз Панны Найсветнейшай на харугві цэхавай меці і ўжываці». Галоўная генеральная сходка мусіла адбывацца кожныя шэсць тыдняў. Той, хто прапусціў яе без важкай на тое прычыны, мусіў заплаціць у цэхавую скрынку фунт воску, хто ж упарта не наведваўся — павінен «даць до скрынкі фунт воску і ў калодзе сядзець». Акрамя зацвярджэння артыкулаў статута, кароль таксама дазволіў братам двойчы на год сыціць па дзесяць пудоў мёду — на святы св. Троіцы і св. Мікалая. Воск ішоў на «хвалу Богу» ў царкву. Таксама, паводле каралеўскага дазволу, гарбарам можна было на дні вяселля, хрысцінаў і пахавання выганяць мёд і гарэлку, але не болей чым на тры дні [5, с. 469–477]. 2 траўня 1640 г. гарбарскія старасты актыкавалі ў магістраце сваю скаргу-пастанову, якую прынялі 29 красавіка таго ж года аб тым, што госці-купцы, прыезджыя з розных паселішч, прадаюць скуры мяшчанам і прасолам (вандроўным купцам, што не мелі трывалага месца для торгу. — *Рэд.*). Апошнія збываюць неапрацаваныя скуры па дарагім кошце. Гарбары запатрабавалі ад мескіх улад, каб тыя пільна сачылі за выкананнем каралеўскага прывілея, дарагавізны ў горадзе не было і ніводны з мяшчан, перакупшчыкаў і прасолаў неапрацаваныя скуры да адзінаццатай гадзіны не перакупліваў, а ад гасцей патрабавалі, каб апошнія гандлявалі скурамі толькі гуртам у гасцінным двары і па пятніцах [6, с. 386–387].

**4. Замшаніцкі або беласкурніцкі цэх.** Замшавым або замешніцкімі, называўся шэраг рамесніцкіх спецыяльнасцей, прадстаўнікі якіх займаліся сваімі промысламі на аснове замшы (апрацаванай скуры, вынікам працы кушняроў і гарбароў). Пастанова аб стварэнні гэтага брацтва была занесена ў кнігі Магілёўскага магістрата 21 ліпеня 1594 г. На актыкацыі прысутнічала дванаццаць магілёўскіх замшанікаў, якія прасілі магістрат зацвердзіць «порадок і постановене для разможенья ремесла нашого замшеницкого», што і было занатавана ў актавых кнігах [5, с. 224–227]. Аднак па нейкай прычыне іх цэхавая арганізацыя праіснавала нядоўга. Так, у каралеўскай канфірмацыі статута ад 3 чэрвеня 1634 г. рымарам і сядлярам фігуруюць і спецыялісты некаторых роднасных ім прафесій, у т. л. замшаніцкіх (беласкурнікі, мяхоўнікі, гольнікі) [5, с. 484]. Але такая сітуацыя працягвала існаваць даволі кароткі час. Ужо 20 студзеня 1635 г. дванаццаць майстроў-замшанікаў, якіх узначальваў трынаццаты, цэхмістр Восіп Іванавіч, актыкавалі ў мескіх кнігах свой асобны статут, у якім налічваўся трыццаць адзін артыкул. Сярод спецыялістаў у цэх уваходзілі рукавічнікі, мяхоўнікі і гольнікі (выраблялі іголкі). Як і ў іншых цэхах, адпаведна з артыкулам

чатырнаццатым, браты мелі ўласную харугву і збройны рыштунак. Паміж іншымі атрыбутамі самастойнасці гэтаму цэху быў нададзены і герб. На жаль, інфармацыя аб ім пададзена коратка і цьмяна. Браты цэха мусілі штогод набываць для мескага арсеналу па два мушкеты і стрэльбы. Адну палову воску ад мядовых складак братчыкі аддавалі ў касцёл св. Троіцы, а другую — у Багаяўленскую царкву [6, с. 195–205]. Гэты статут быў зацверджаны 13 сакавіка 1635 г. каралём Уладзіславам IV [18, арк. 375 адв.–382 адв.]. Пазней у скарочаным паўсядзённым ужытку гэтае брацтва часта называецца «мяхоўніча-кажамяцкім». Такі тэрмін, напрыклад, сустракаецца ў скарзе епіскапа-каад'ютара магілёўскага Яна Змальскага на мескія цэхі, якіх ён звінавачваў у невыкананні павіннасцей на карысць Фарнага касцёла (1645). У судовых матэрыялах згадваюцца і іншыя прывілеі. Першым фігуруе каралеўскі прывілей ад 17 снежня 1633 г. «мяхоўнічаму» цэху. Адпаведна з ім браты мусілі даваць «мяды разсычоныя да царквы Багаяўлення». Наступны прывілей цэху датаваны 30 сакавіка 1635 г. Урэшце дэкрэт каралеўскага задворнага асэсарскага суда 1645 г. падкрэслівае «цэху мяхоўнічаму і кажамяцкаму … даваць воск да касцёла Фарнага і да царквы магілёўскай» [23, арк. 743–744 адв.]. Першая палова XVIII ст. (снежань 1729 г.) прадстаўлена скаргай бурмістра і купца Стафана Карабанькі на замшанікаў Андрэя Князіковіча і яго сыноў Антона і Германа, якія, узяўшы матэрыял і грошы за працу, не выканалі існуючую дамоўленасць з працадаўцам, а менавіта не даставілі ў тэрмін гатовую прадукцыю, чым нанеслі не толькі маёмасную шкоду, але і дыскрэдытавалі бурмістра перад прускімі купцамі [3, с. 302–303].

**5. Злотніцкі цэх.** Створаны адпаведна з ініцыятывай «дванаццаці людзей рамяства злотнічага», якія звярнуліся ў мескую ратушу з прашэннем зацвердзіць іх статут. 20 верасня 1629 г. магістрат актыкаваў «артыкулы парадку залатнічага» [5, с. 426–431]. Паводле запісаў у Метрыцы ВКЛ актыкацыя была зроблена 12 кастрычніка 1639 г., а прывілей з канфірмацыяй кароль падпісаў 12 чэрвеня 1634 г. З гэтага відаць апіска метрыкальнага пісара, асабліва ў першай даце [18, арк. 51–56 адв.]. 22 чэрвеня 1634 г. кароль Уладзіслаў IV выдаў «ліст-прывілей», які налічваў 24 артыкулы і паўтараў дакумент ад 20 верасня 1629 г. Уласна ад каралеўскай улады быў нададзены цэхавы герб «леў за кратамі», якім магілёўскія злотнікі права «маюць адзначаць свае вырабы і на харугвах меці». Тым жа прывілеем кароль дазволіў злотнікам «хвале Богу» двойчы на год сыціць па дванаццаць пудоў мёду — першы раз на свята Трох Каралёў, другі на св. Пятра [5, с. 494–502]. Праз год пасля канфірмацыі цэха, а менавіта 15 кастрычніка 1635 г., да злотнікаў далучыліся канвісары (валавяншчыкі) і масяжнікі (меднікі). Яны тлумачылі сваю ініцыятыву тым, што «… для … недостатков … цеху своего особливого

меті не могучы приступили есмо вси згодне и одностайне до цеху злотницкого», а таксама прынялі на сябе абязацельствы «послушенство давати цехмистром обраным» да таго часу, пакуль не створаць свой уласны цэх [5, с. 218]. Гэты факт стаў штуршком, для таго каб узнікла спрэчка паміж злотнікамі і рымарска-сядлярскім цэхам. Апошні, імкнучыся павялічыць колькасць і адпаведна паступленні ў скрынку, пачаў дамагацца выканання павіннасцей з боку магілёўскіх бляхараў, масяжнікаў, канвісараў на карысць свайго цэха. Справу разглядаў спачатку мескі магістрацкі суд, а затым каралеўскі суд, які ў 1636 г. пацвердзіў рашэнне тутэйшага суда і сваім дэкрэтам «узмацніў і замацаваў новадалучаных да злотніцкага цэху» [22, арк. 13].

**6. Канвісарскі цэх.** Актыкацыя пастановы мяшчан-канвісараў аб стварэнні свайго ўласнага цэха была ўнесена ў магістрацкія кнігі 21 кастрычніка 1650 г. З ёй звярнуліся да гарадскіх улад восем тутэйшых мяшчан. Братам цэха мог стаць кожны жадаючы. Для гэтага патрабавалася толькі быць «добра аселым у месце Магілёве». Брацтва аб'ядноўвала канвісараў (валавяншчыкаў), людвісараў (ліцейшчыкаў), масяжнікаў (меднікаў) і бляхоўнікаў (жасцяншчыкаў). Тых, хто не далучыўся да цэха, а рабіў рамяство «пакутне» (падпольна), чакаў штраф, памерам у пяць коп грошай на карысць цэхавай скрынкі. На ўрад мескі такі «пакутнік» мусіў заплаціць «шмат» грыўняў. Пасля ўплаты гэтых штрафаў ён ужо ніколі не меў права ажыццяўляць тое рамяство ў горадзе. Штотыднёва кожны майстар ці брат уносілі ў агульную цэхавую скарбонку па аднаму грошу літоўскаму. Цэхмістры карысталіся сваімі паўнамоцтвамі на працягу года і дапускаліся да іх выканання толькі пасля прынясення прысягі магістрату [7, с. 237–241].

**7. Кравецкі цэх.** Краўцамі здаўна называліся майстры па пашыву верхняй вопраткі з палатна і сукна. Пастанова аб утварэнні цэха была актыкавана 17 кастрычніка 1609 г. Ініцыятарамі былі адзінаццаць мясцовых мяшчан-краўцоў, якія прасілі мескія ўлады, каб «пастанова іх праз пісьмо ўрадавае была зацверджана і ўзмоцнена на вечныя часы». На кравецкае цэхмістраўства быў абраны Філон Якаўлевіч. Цэхавыя складкі браты мусілі плаціць два разы ў год па «поўгрошыку польскаму»: на святы Боскага Нараджэння і Уваскрэсення. Пастанова была зацверджана 15 снежня 1609 г. каралём Жыгімонтам III Вазай [5, с. 291–294]. праўда, каралеўскае зацвярджэнне прадставілі ў магістрат для актыкацыі толькі 13 красавіка 1620 г. [5, с. 351–358]. Дадатковы прывілей ад 1 лютага 1634 г. быў нададзены каралём Уладзіславам IV. Паводле яго, акрамя пацвярджэння ва ўсіх артыкулах і кандыцыях папярэдніх прывілеяў, да цэха далучаліся яшчэ і чапнікі (спецыялісты па вырабу галаўных убораў «чапак»), якім у адрозненне ад краўцоў дазвалялася падшываць свае вырабы футрам. Таксама кароль надаў брацтву «харугву, на якой за герб —

залаты крыж і кравецкія нажніцы ў белым полі» і дазволіў братчыкам двойчы на год сыціць мёд (на Божае Нараджэнне і на Вялікдзень) не для шынку, а для асабістых патрэбаў цэхавых братоў. Воск, які застанецца пасля сычэння, цэхавыя браты мусілі аддаваць на свечкі — палову ў касцёл і палову ў Васкрасенскую царкву. Акрамя таго, «дом брацкі» быў вызвалены ад пастояў і кароль забараніў прыцягваць цэхмістраў да выканання грамадскіх абавязкаў мескіх дзясятнікаў альбо сотнікаў [5, с. 445–447].

**8. Крашаніцкі цэх.** У некаторых гарадах ён называўся яшчэ фарберскім. Заснаванне цэха актыкавана па ініцыятыве васьмі тутэйшых мяшчан 23 снежня 1647 г. У парадку рамяства крашаніцкага было падкрэслена: «абы до крашаніны кожны … добрай, а не подлай і фальшывай фарбы ўжываў …». Пакараннем за гэта было спагнанне пяці коп грошай — паловы на мескі ўрад, а другой паловы да скрынкі брацкай. Кожны «прыбылец», які жадаў заняцца гэтым рамяствам, мусіў заплаціць у цэхавую скарбонку «колькі браты положат …» [7, с. 234–237].

**9. Кушняроўска-балтушніцкі цэх.** Кушнярамі называліся майстры, якія займаліся апрацоўкай аўчын і скурак пушных звяроў з наступным пашывам адзення. Роля балтушнікаў у гэтым цэху, верагодна, зводзілася да першаснай апрацоўкі скурак, калі іх замочвалі ў спецыяльных бочках і боўталі там з дубільнымі рэчывамі [24, с. 85]. Яшчэ 31 траўня 1581 г. у мясцовым магістраце быў актыкаваны запіс кушняроў аб абранні сваім старастай Ждана Багданавіча, дзе было сказана: «вольно ему на том старостве быть, поки сам захочет». Далей фармуляваліся асноўныя правілы дзейнасці мяцовых рамеснікаў. У прыватнасці тут агаворваўся трохгадовы тэрмін навучання спецыяльнасці хлопцаў і было падкрэслена, што кожны майстар не мог «учня албо пахолка, будь тубыльца албо приходня без ведама старосты прымовать» [4, с. 325–328]. Наступным разам тутэйшы мешчанін-кушнер Анціпа Хількавіч звярнуўся 23 красавіка 1589 г. да мясцовых улад ад імя сваіх калегаў з прашэннем аб актыкацыі пастановы аб стварэнні брацтва. У яе тэксце было сказана: «… мед на свои склады купуючы на свята врочыстыя сытити и продавати по тры дни той мед сходычысе выпивати и з пенези прадавати а воск од тых медов на свечы до церкви …». Братчыкі купілі сумеснымі намаганнямі ў магілёўскага бурмістра Міцькі Міхайлавіча Васілевіча дом з плацам, «под которым (домом. — *А. Ц.*) двадцаць прутов». Гэта пастанова была пацверджана 26 красавіка 1589 г. каралём Жыгімонтам III. У ёй падкрэслівалася, што ў тым доме «кождый посполитый чоловекъ, мещане места могилевского ... того ремесла кушнерского ... о потребах цеховых … и шпитальных намовы свои мовети (будут. — *А. Ц.*)». Ім таксама дазвалялася «мед накладом своим купуючы на свята врочистые сытити

и по три дни ходечи … тот мед выпивати». Далей дакумент утрымлівае асноўныя палажэнні і прынцыпы дзейнасці брацтва [15, арк. 9–11]. Другі раз гэты прывілей на дом рамеснікам-кушнярам быў пацверджаны 12 жніўня 1595 г. [14, арк. 564 адв.–565]. Гістарычныя абставіны склаліся так, што магілёўскія кушняры былі вымушаны менш чым праз год прасіць караля аб пацвярджэнні гэтага дакумента. Падчас нападу на горад атрадаў С. Налівайкі кушняроўскі цэх, як і многія іншыя, моцна пацярпеў ад «людей свовольных казаков». Гэты прывілей і, магчыма, іншыя цэхавыя дакументы загінулі. Тутэйшыя кушняры накіравалі да караля свайго прадстаўніка Анціпу Хількавіча, пры спрыянні якога цэху быў нададзены паўторны прывілей ад 24 красавіка 1596 г., што пацвярджаў папярэдні. У ім кароль дадаткова ўдакладніў галоўныя для кушняроў святы. Так, «на день Св. Троицы, други на день Св. Миколы, а трети на свято урочистое рожество Христово руское» дазвалялася сыціць па пятнаццаць пудоў мёду і «за трыдцать золотых польских горелки мають и оное от куль хотечи набывати и посполу» і тры дні яго ўжываць [16, арк. 39–40]. Цэхавы статут у чарговы раз быў зацверджаны 12 ліпеня 1636 г. каралём Уладзіславам IV. Асобным пунктам падкрэслівалася, што для цэха «харугву, бубен, рушніцы, шаблі, дарды і ўсялякі рыштунак» браты мусяць набыць з прыходаў скрынкі. Мядовыя складкі братчыкі мелі двойчы на год: «на святых Барыса і Глеба і на святога Юр’я па рымскаму каляндару». Воск, які заставаўся пасля сычэння мёду, братчыкі мусілі перадаваць у Фарны касцёл, а другую палову ў «царкву святога Спаса» [18, арк. 633 адв.–666 адв.]. Літаральна праз некалькі месяцаў пасля гэтай падзеі ўзнікла спрэчка паміж балтушнікамі і кушнярамі. Першыя падалі скаргу на кушняроўскага цэхмістра Юрку Харашаўку, які настойваў на тым, што балтушнікі мусяць падпарадкоўвацца кушняроўскаму цэху. У сваёй пратэстацыі балтушнікі падкрэслілі, што «рамяство наша з імі кушнярамі далёка розніцца». Задоўга да згаданай падзеі 31 верасня 1631 г. яны падалі да актыкацыі ў мескія кнігі сваё адрачэнне ад парадкаў кушняроўскіх і былі Магілёўскім магістратам «навечна вызвалены і вылучаны» з цэха [6, с. 256–261]. Нечакана ў гэтым «сепаратызме» балтушнікаў падтрымаў кушнер Багдан Шаўля, які таксама выступіў з пратэстацыяй на таго ж Юрку Харашаўку і прадставіў «стары прывілей» ад 23 красавіка 1589 г., заявіўшы, што довады Харашаўкі негрунтоўныя. Гэтымі пярэчаннямі і скарысталіся балтушнікі, заявіўшы, што, паколькі паміж самімі кушнярамі няма згоды, трэба перадаць справу на разгляд каралеўскага суда [6, с. 261–264]. Але поўнага расколу паміж імі не адбылося. Так, 19 сакавіка 1663 г. кушняроўскі цэхмістр Фёдар Яцкавіч Безмянкоў і балтушніцкі цэхмістр Панфіл Амяльянавіч выступаюць разам супраць кравецкага цэхмістра Рыгора Тарасавіча, па мянушцы Грак,

і ўсіх братоў гэтага цэха. Яны абвінавачвалі краўцоў у тым, што тыя насуперак каралеўскаму прывілею робяць рамяство кушняроўскае — падшываюць футрам не толькі шапкі, але і «сукны розныя» (адзенне мужчынскае і жаночае), якімі гандлююць у крамах, лаўках і дамах. Калі краўцам «добрым прыяцельскім спосабам» нагадалі аб гэтым, у адказ кушняры атрымалі «словы, якія сорамна казаць». Магілёўскі магістрат, разгледзеўшы справу, у красавіку таго ж 1663 г. пастанавіў, што, паколькі краўцы перашкаджаюць рамяству кушняроўскаму і нанеслі шкоду, то павінны заплаціць на карысць кушняроўскага цэха 3 тыс. злотых, а за словы «ушчыплівыя» і нешанаванне каралеўскіх прывілеяў пасадзіць Грака на шэсць тыдняў у вязніцу і даць яму штраф у 100 грыўняў (палова ад сумы — у скарб магістрата, а другая палова — на карысць кушняроўскага цэха) [7, с. 317–321]. Спрэчка на гэтым не скончылася, і праз некалькі дзён у магістрат паступіла яшчэ некалькі скаргаў з абодвух бакоў. У выніку апошні вынес рашэнне аб перадачы справы на разгляд каралеўскага суда [7, с. 330–337].

**10. Пастрыгацкі цэх.** Заснаваны паводле прывілею караля Стэфана Баторыя, аднак дакладная дата гэтай падзеі не ўстаноўлена. У дакуменце сказана: «чинечы порадок в том месте межы пострыгачми надаем им брацство пострыгацкое с певными варунками …». Пацвярджэнне гэтага дакумента было зроблена 24 лютага 1595 г. каралём Жыгімонтам III Вазай па прашэнні магілёўскага мешчаніна-братчыка Канюты Марцінавіча. У прывілеі падкрэслена, што брацкі дом вызваляецца ад усялякіх падаткаў, а самі братчыкі — ад падаткаў і пастояў. Цэхавым братам дазваляецца «вольно для себе мед пиво и горелку для себе самих по три дни мевати и сходити ее пити и там в Брацтве продовати ...» на свята «Трех королей, а други на день светое Троицы свят рымских водлуг нового календара». Прыбытак ад гэтага ішоў на ўтрыманне дому і іншыя брацкія патрэбы [14, арк. 485–486].

**11. Пякарскі цэх.** Заснаваны пасля звароту амаль пяцідзесяці магілёўцаў у тутэйшы магістрат, на пасяджэнні якога быў зацверджаны іх статут. Гэтая падзея адбылася 14 сакавіка 1591 г. Старастай абралі Саву Кандратавіча. У брацтва аб’ядноўваліся магілёўцы, «калачнікі і хлебнікі …, якія пеклі і гандлявалі пірагамі, жытнім, сітным і грэчаным хлебам». Паводле пастановы, «у святую нядзелю братчыкі не маглі пячы хлеб і пірагі і гарачымі насіць іх на рынак», парушальніка гэтага артыкула чакаў штраф у 12 грошаў на карысць войтаўскага ўрада і столькі ж ён мусіў заплаціць у цэхавую скрынку. Царкоўныя павіннасці рамеснікі гэтых спецыяльнасцей адпраўлялі ў Фарным касцёле і Васкрасенскай царкве. Статут быў зацверджаны 12 траўня 1634 г. каралём Уладзіславам IV [18, арк. 35–38]. Вірлівыя падзеі наступнага трыццацігоддзя (войны 1648–1651, 1654–1667 гг.) не спрыялі захаванасці гэтага дакумента, як

і іншых. Калі ў Магілёве змянілася ўлада, магілёўскія пекары стварылі свой новы статут. Гэта адбылося 10 сакавіка 1656 г. Мусіць, з прычыны ваеннага становішча пекары запісалі ў свой статут наступны параграф: «… водлуг цены збожа, каждый брат цеху нашого пекарского, так хлеб ситный, яко теж и вшелякий белый, слушною, водлуг часу, ценою, хлеб, пироги, обаранки, без укрывженя мещан печи и продавати мает … а еслибы который брат наш скупый не ведлуг слушное цены … печь и продавати важыл», такі мусіў заплаціць у брацкую скрынку адну грыўну, а «хлеб альбо пироги … до шпиталев отданый быти мает». Гэты дакумент быў актыкаваны ў магістраце 21 кастрычніка 1660 г. Праўда, праз некалькі месяцаў улада ў горадзе ізноў змянілася [7, с. 295–301]. Паўторны прывілей на заснаванне брацтва быў падпісаны 19 красавіка 1664 г. каралём Янам Казімірам пры наступных умовах: «супликовали нам мещане … пекаре, абысмы, порядок цэху пекарского, который они съ консенсом и апробатиею майстрату намовили, повагою нашею кролевскою ствердили». Адпаведна з дакументам кожны, хто жадаў быць пекарам, мусіў запісацца да цэхавага рэестра і толькі потым пячы пірагі, абаранкі, хлеб. Той, хто аслухаўся, мусіў заплаціць штраф у памеры трох грыўнаў на карысць магістрата, а да братэрскай скрынкі — дзве. Прыезджыя госці-купцы мелі права гадляваць у горадзе збожжавымі ці пшанічнымі прадуктамі толькі ў сераду і пятніцу. У гэтыя дні гасцям дазвалялася гандляваць пірагамі, сітным хлебам і г. д., але толькі з ведама старшых цэха і заплаціўшы ў цэхавую скрынку два грошы. Братчыкі карысталіся правам двойчы на год сыціць мёд для сваіх патрэб — на дзень Божага Нараджэння і да свята св. Міхаіла. Адну палову воску, што заставаўся, аддавалі ў Фарны касцёл, другую — у Спаскую царкву [7, с. 340–347; 9, с. 413–421]. Пазней пад уплывам росту дарагавізны ў горадзе 23 сакавіка 1679 г. братчыкі прынялі пастанову, паводле якой пекарам прадпісвалася самім пячы пірагі і гандляваць імі без пасрэднікаў. Таксама забаранялася «перакупам» гандляваць да дванаццатай гадзіны [7, с. 362].

**12. Рыбніцкі цэх.** Унясенне ў актавыя кнігі Магілёўскага магістрата «парадку» адзначанага аб’яднання адбылося 13 лістапада 1623 г. Па настойлівым патрабаванні цэха «вси рыбаки места Могилевского, которые рыбами звыкли гандель свой мети …». Яны матывавалі неабходнасць афіцыйнай фіксацыі іх статута тым, што купцы з іншых гарадоў неабгрунтавана падвышаюць кошт на гэты прадукт «на крывду убогим людям». У тым жа дакуменце былі зафіксаваны і рыбніцкія старасты — Кузьма Іванавіч, Фёдар Селядзеўскі, Іван Сцяфанавіч і Мануйла Нікіпаравіч [5, с. 396–397].

**13. Рымарска-сядлярскі цэх.** Рымары займаліся пашывам раменнай вупражы, а сядляры — сёдлаў для верхавой язды на кані. Пастанова

аб стварэнні цэха была ўнесена ў актавыя кнігі Магілёўскага магістрата 2 верасня 1632 г., адпаведна з ініцыятывай майстроў «ремесла римарского и седлярского, не з жадного примушеня, але сами, по своей доброй воли, от себе сами и именем всее брати свое» [5, с. 437–441]. Статут цэха быў канфірмаваны 30 верасня 1633 г. каралём Уладзіславам IV. Да гэтага ж цэха былі далучаны мяхоўнікі, а таксама майстры па вырабу чахлоў, кабуры і інш. Адпаведна з дадаткам да канфірмацыі братам цэха дазвалялася сыціць дзесяць пудоў мёду на дзень Нараджэння Маці Божай і на Божае Нараджэнне. Адну палову воску яны мусілі аддаваць у Фарны касцёл, а другую — у магілёўскія цэрквы. На час хрысцінаў, вяселля і пахавання братам дазвалялася мець на ўласныя патрэбы неабходную колькасць гарэлкі, «але не болей чым на тры дні». Прывілей караля Уладзіслава IV прызначыў за герб «Грыфа на харугве і пячатцы цэхавай» [5, с. 477–483]. Канчатковая актыкацыя ў кнігах Магілёўскага магістрата цэхавага статута адбылася 3 чэрвеня 1634 г. Адпаведна ёй, да рымарскага і сядлярскага рамёстваў былі далучаны спецыялісты роднасных прафесій: беласкурнікі, мяхоўнікі, гольнікі, паснікі (выраблялі паясы і рамні), нагайнікі (выраблялі раменныя плеценыя бізуны — нагайкі) [5, с. 483–494]. Праўда, ужо ў студзені 1635 г. трынаццаць майстроў названых спецыяльнасцей актыкавалі ў магістраце свой асобны статут і вылучыліся з цэха [6, с. 195–205]. Рымарскія цэхмістры паспрабавалі папоўніць страту і павялічыць колькасць братоў цэха за кошт далучэння да яго бляхоўнікаў, канвісараў і масяжнікаў. Гэтыя дзеянні выклікалі пярэчанні з боку апошніх і прывялі да судовых працэсаў спачатку ў магілёўскай ратушы, а потым і ў вышэйшай інстанцыі. Каралеўскі суд падтрымаў рашэнне тутэйшага магістрата і адхіліў прэтэнзіі рымарскага і сядлярскага цэхмістра Яна Любчынскага. У дэкрэце ад 1636 г. было падкрэслена, што мясцовыя бляхоўнікі, канвісары і масяжнікі «самі дабравольна да цэху злотнічага далучыліся і на гэты час з ім» [22, арк. 11–12].

**14. Рэзніцкі цэх.** Гандаль мяснымі прадуктамі — вельмі важны аспект функцыянавання кожнага горада. Небяспечнасць узнікнення захворванняў ці нават эпідэмій у выніку рэалізацыі сапсаваных прадуктаў вымушала ўлады пільна сачыць за гэтым відам дзейнасці. Як сведчаць дакументы, у 1578 г. Магілёўскі магістрат у сваім «выраку» (прыгаворы) прызначыў мешчаніну Грыгорку Васілевічу жорсткае пакаранне за гандаль мясам хворай каровы. «Прадпрымальнага» гандляра прысудзілі «яко фальшэра у дыбы выхвостат и з места прочь … выслати», а «фальшывае» мяса «перед всим народом в месте на рынку спалить», што і было зроблена — «мясо спалено и того фальшера мётлами выхвоставши от места проч ити и больш в месте быт ани быват росказано…» [10, с. 134–137]. Спробы ўпарадкаваць гандаль мяснымі

прадуктамі прадпрымаліся магілёўцамі і пазней. Так, у 1621 г. была пададзена для запісу ў магістрацкія актавыя кнігі пастанова мяшчан-рэзнікаў, якія жылі пад магдэбургскай і замкавай юрысдыкцыяй, аб змяшчэнні з пасады былога рэзніцкага старасты Рамана Пятровіча, пры якім «порадку слушного небыло», і абранні замест яго Цімкі (або Цішкі) Кузьмініча. У дапамогу яму абралі чатырох таварышаў — трох з юрысдыкцыі магістрата і аднаго з юрысдыкцыі замкавага суда [5, с. 370–373]. У пастанове тутэйшых мяшчан фармуляваліся асноўныя палажэнні наступнага каралеўскага прывілея, які 18 красавіка 1664 г. падпісаў кароль Ян Казімір падчас знаходжання ў Оршы. Адпаведна з дакументам, усім, акрамя цэхавых рэзнікаў, забаранялася займацца продажам мяса па кавалках, а можна было рэалізоўваць прадукцыю толькі штукай. Выключэнне рабілася па аўторках, калі кожны, але за «вядомасцю старшых цэхмістраў … каб мяса было здаровага быдла» мог «вольна шынкаваць». У той жа час магілёўскім яўрэям нельга было мець уласныя мясныя яткі (лаўкі) і дазвалялася гандляваць толькі «мясам свайго рэзання на сваім звычайным месцы, даўнім сваім отрубе пры школе (яўрэйскай. — *А. Ц.*)». Усім рэзнікам забараняўся ўсялякі гандаль мяснымі прадуктамі падчас пастоў «рымскага і рускага», але засталася магчымасць прадаваць рыбу. Падчас вялікіх святаў — Нараджэння Маці Божай і Трох Каралёў (згодна старога календара) — рамеснікам дазвалялася сыціць для сваіх патрэб па трыццаць пудоў мёду без уплаты капшчызны. Воск, які вырабляўся шляхам сычэння, дзяліўся на дзве часткі. Адна ішла для патрэб Магілёўскага касцёла, другая — Брацкай царквы [19, арк. 335–337]. У 1680 г. паміж рэзнікамі была прынята сумесная пастанова з мэтай збіць цэны, паводле якой прадпісвалася не купляць быдла ў прасолаў у Чэрыкаве, Чавусах, Выховічах (магчыма, маецца на ўвазе сучасны Вішаў. — *Рэд.*), Быхаве і Шчэгліцы, а толькі ў мяшчан гэтых паселішчаў. У выпадку парушэння спаганяўся штраф у памеры 200 грыўняў (сто ішлі на ўрад магдэбургскі і столькі ж на цэх) [7, с. 366–367]. Наступная канфірмацыя прывілея брацтву адбылася 11 траўня 1710 г. [21, арк. 182 адв.–186]. Гэтыя прывілеі і правы 11 жніўня 1720 г. былі пацверджаны і пашыраны праз дадатковыя ільготы, нададзеныя каралём Аўгустам II. Магілёўскім рэзнікам дазвалялася свабодна купляць быдла ў акрузе 24 міляў вакол места, уладам забаранялася браць падаткі з рэзнікаў-пакупнікоў (падаткамі абкладаліся толькі прадаўцы). Яўрэям-рэзнікам забаранялася мець свае мясныя яткі не толькі ў месце ці замку, але і ў гарадскіх прадмесцях і юрысдыках. Для гандлю ім пакідалася старое месца каля іх школы [8, с. 272–277].

**15. Саладоўнічы цэх.** Першая спроба ўтварэння брацтва, упарадкавання дзейнасці і «памнажэння рамяства саладоўнічага» была прадпры-

нята ва «Уфале саладоўнікаў», актыкаванай у мескіх кнігах 18 ліпеня 1591 г. Гэта быў папярэдні праект статута. Адпаведна з ухвалай абралі і першага старасту цэха, якім стаў Стахор Міцькавіч, той самы, што ў 1606–1610 гг. узначаліў магілёўскую апазіцыю супраць старой мескай рады [4, с. 508–510]. Канчаткова брацтва было заснавана адпаведна з пастановай дванаццаці тутэйшых саладоўнікаў, якія 5 чэрвеня 1597 г. звярнуліся з гэтай мэтай у мескі магістрат. Саладоўнікі маглі заключаць гандлёвыя здзелкі па продажу соладу прыезджым купцам толькі з ведама сваіх старшых [5, с. 234–236]. Амаль праз месяц, 2 ліпеня 1597 г., шэсць саладоўнікаў, якіх узначальваў саладоўнічы стараста Яцка Пашкавіч, ізноў звярнуліся ў магістрат з аналагічнай пастановай аб стварэнні цэха. Такое становішча можна растлумачыць нарастаннем супярэчнасцей і канкурэнтнай барацьбы паміж дзвюма групамі саладоўнікаў. Аб няпэўнасці згаданай сітуацыі сведчыць факт таго, што двое з падпісантаў першай пастановы фігуруюць у другой [5, с. 319–320]. Вартым згадкі з’яўляецца факт выдання ў 1633 г. Уладзіславам IV забароны магілёўцам будаваць у гарадскіх межах лазні і піваварні па прычыне пажарнай небяспекі [1, с. 10]. Наступная статутавая пастанова была запісана ў актавыя кнігі Магілёўскага магістрата 7 верасня 1646 г. Яна змяшчала ў сабе больш структурыраваны цэхавы статут, які верагодна быў распрацаваны з улікам мясцовых рэаліяў. Ён меў дваццаць дзевяць артыкулаў. Найбольшыя спрэчкі і рэзананс выклікаў шаснаццаты. У гэтым артыкуле зазначалася, што яўрэі, якія давалі саладоўнікам крэдыт пад вялікую суму, прымалі ад іх у якасці выплаты солад, затым прадавалі яго, што наносіла шкоду ўсяму брацтву. Каб прадухіліць падобную сітуацыю, братам цэха забаранялася разлічвацца са сваімі крэдыторамі як сыравінай, так і гатовай прадукцыяй. Штраф за парушэнне складаў пяць коп грошай на карысць мескага ўраду і столькі ж мусіла паступіць на цэхавую скрынку. Гэты артыкул, як і ўсе іншыя, быў канфірмаваны 15 лістапада 1646 г. прывілеем Уладзіслава IV [6, с. 533–544]. Літаральна праз некалькі тыдняў (5 снежня 1646 г.) перад магдэбургскім урадам выступілі магілёўскія яўрэі са сваёй скаргай на тое, што цэхмістр Мікіта Стахоравіч і іншыя саладоўнікі, атрымаўшы такі прывілей, нанеслі ім за некалькі тыдняў шкоды ў «гандлях і шынках» на суму ў 10 тыс. злотых [6, с. 544–546]. Узаемаабмен скаргамі адбываўся на працягу ўсяго года, пакуль магістрат не перадаў справу на разгляд караля [7, с. 210–214].

**16. Цясельскі цэх.** Пастанова або «уфала дойлідавая» была прынята на пасяджэнні магістрата 1 лютага 1590 г. Па прашэнні тутэйшых мяшчан «для памнажэння рамяства дойлідскага» ў магістрацкія кнігі ўнеслі пункты рамеснага парадку і актыкавалі факт абрання дойлідскім старастай Харко Несцеравіча [4, с. 482–485].

**17. Шавецкі цэх.** Прывілей на заснаванне цэха быў нададзены 8 верасня 1609 г. каралём Жыгімонтам III Вазай па прашэнні дванаццаці магілёўскіх шаўцоў, якія на чале з цэхмістрам Жданам Восіпавічам звярнуліся да яго ў Воршы. Ужо 5 кастрычніка таго ж года гэты дакумент унеслі ў актавыя кнігі Магілёўскага магістрата. У адпаведнасці са статутам вучань, які скончыў курс навучання, мусіў тры гады адпрацаваць у майстра. Толькі пасля гэтага пры наяўнасці жадання самастойна працаваць ён рабіў адпаведную заяву перад старшымі цэха. З іх дазволу жадаючы запісваўся ў цэх і ўносіў у цэхавую скарбонку 10 злотых [5, с. 286–290]. Канфірмацыю прывілея 10 снежня 1633 г. зацвердзіў кароль Уладзіслаў IV «у абозе за Смаленскам на Багданавай слабадзе» на падставе прашэння цэхмістра Няфёда Гарасімавіча і трох старшых. У гэтым дакуменце былі пацверджаны артыкулы папярэдняга прывілея і дададзены яшчэ некаторыя. У прыватнасці, дазвол братчыкам два разы на год сыціць мёд без выплаты падаткаў, а воск дзяліць пароўну паміж магілёўскім Фарным касцёлам і царквой Казьмы і Дзям'яна [5, с. 449–455].

**18. Купецкае брацтва.** З глыбокай даўніны гандаль быў адной з вельмі важных крыніц даходу тутэйшых жыхароў. Яшчэ ў сярэдзіне XVI ст. магілёўскія купцы атрымалі ад каралевы Боны ліст, які яна непасрэдна адрасавала да дзяржаўцы рагачоўскага Мацея Вайцяховіча, аб тым, што ён і яго папярэднік Багдан Долмат у парушэнне старадаўняга звычая пачалі браць падвойнае мыта ў Рагачове з магілёўскіх купцоў, калі апошнія плылі па Дняпры на сваіх «комягах, поромах і чолнах». Абодва дзяржаўцы патрабавалі мыта за праход, калі купцы ішлі «на ніз» і вярталіся дамоў. У лісце было падкрэслена, што пры вяртанні купцоў назад пошліну з іх браць нельга [13, арк. 61–61 адв.]. Актыкацыя пастановы аб стварэнні купецкага брацтва ў магістрацкіх кнігах адбылася 23 сакавіка 1623 г., але гэты дакумент яшчэ цяжка назваць паўнавартасным статутам, хутчэй лістом мытных падаткаў, якія мусілі плаціць як магілёўцы, так і прыезджыя госці-купцы. Яны матывавалі стварэнне дакумента «… за тым, абы ку знищеню альбо убоству люди убогие купъцы мещане могилевские не прышли, а скарб его кор(олевское. — *А. Ц.*) милости шкоды не поносил» [5, с. 376–379]. Сапраўдны цэхавы статут (альбо «Парадкі купецкія») зацвердзілі на ўрадзе магілёўскім 12 чэрвеня 1636 г. Як пазначана ў прэамбуле дадзенага дакумента, за ўзор былі прыняты парадкі купцоў Вільні. Магчыма, менавіта таму купецкае брацтва і абрала сваёй пячаткай сімвал віленскага самакіравання — выяву св. Хрыстафора, які з немаўляткам Ісусам пераходзіць праз бурлівы вадзяны струмень. Ад сябе зазначым, што віленскія купцы мелі тады пячатку з выявай св. Юрыя, якую атрымалі 30 студзеня 1630 г. Усяго статут утрымліваў дваццаць пяць артыкулаў, якімі рэгламентаваліся амаль

усе бакі жыццядзейнасці гэтай прафесійнай супольнасці. Напрыклад, у апошнім артыкуле падкрэслівалася, што купецкім дзецям забараняецца мець у сваёй вопратцы лісінае футра, насіць сабалёвыя і кунічныя шапкі, шоўкавыя паясы з залатымі ці срэбнымі ўпрыгожаннямі і г. д. [2, с. 344; 6, с. 235–253]. Новая канфірмацыя прывілея была зроблена 4 лютага 1654 г. каралём Янам Казімірам. Статут складаўся толькі з 15 артыкулаў. Адпаведна з імі ў брацтве, акрамя старастаў, была ўведзена пасада інстыгатара, на якую пажыццёва абіраўся «чалавек добрай славы і сумлення». Ён абавязаўся пільна назіраць за выканнем статута і за тым, каб не было ніякіх уціскаў у справы братчыкаў з боку як цэхавых, так і іншых улад. Пасада цэхавага пісара таксама з'яўлялася пажыццёвай і прысяглай. Прысягу прыносілі і брацкія «шпегуны», якія мусілі сачыць у горадзе за тым, каб ніхто не парушаў правілаў гандлю, як тутэйшыя, так і прыезджыя купцы. Дзясятым артыкулам статута надаваўся новы герб брацтву, на якім змяшчалася стаячая выява анёла з вагамі і крыжам [7, с. 273–281]. Той жа кароль сваім універсалам 9 траўня 1663 г. пацвердзіў усе ранейшыя прывілеі купецкаму брацтву, пачынаючы з ардананса (загад) 1617 г. Акрамя гэтага, магілёўскіх купцоў, купчыкаў і прасолаў кароль вызваліў ад усялякіх падаткаў у радыусе дваццаць чатыры мілі вакол горада. Той жа, хто наважваўся спаганяць з іх падаткі, павінен быў заплаціць штраф у памеры дзесяці тысяч грошаў літоўскіх [7, с. 338–340]. Прывілей пацвердзіў 20 сакавіка 1679 г. кароль Ян Сабескі, актыкавалі 8 траўня таго ж года [7, с. 362–364]. Пазней, 30 верасня 1698 г., кароль Аўгуст II Моцны сваім прывілеем канфірмаваў ардананс аб вызваленні магілёўскіх купцоў ад выплаты жытнага старарускага мыта [20, арк. 67–67 адв.]. Менш чым праз год, 12 красавіка 1699 г., ён жа пацвердзіў прывілеі сваіх папярэднікаў магілёўскім мяшчанам, купцам, купчыкам і прасолам аб вольнай закупцы быдла ў 24-мільнай акрузе вакол горада і дазволіў ім беспадатковае сычэнне мёду два разы на год — на «рымскае» свята Божага Цела і на «рускае» свята Боскага Нараджэння. Гэтым жа дакументам прасолам, па прыкладу іншых магілёўскіх цэхаў, дазвалялася без выплаты падаткаў збудаваць і мець свой «дом прасольскі», вольны ад пастояў [20, арк. 95–95 адв.].

**19. Жабрацкае брацтва.** Актыкаванне парадку брацтва адбылося 21 красавіка 1621 г. У гэты дзень у магістрат звярнуліся мясцовыя жыхары, якія падалі скаргу «от убогих, хромых, слепых и уломных хорых». Яны прасілі магістрацкі ўрад прыняць іх пастанову, матывуючы яе тым, што «… старые, яко и молодики, жонки, дети, меские и иншие, дорослые и недорослые, выростки и девки, не маючы в собе жадное хоробы а ни уломности … удалися в непотребне в убоство, просечы не слушне» міластыню (т. зв. ялмужнае), «иж один другому з рук убогого ялмужную вырываючы збытки чынят». З вышэй прыведзенага вынікае аб значных

шкодах, якія цярпелі сапраўдныя ўбогія — калекі. Каб пазбегнуць падобнай сітуацыі надалей, магілёўскія жабракі прасілі ўлады прызначыць над імі чатырох старастаў калецкіх і дазорцу над усім брацтвам, абавязкі якога мусіў выконваць слуга мескі прысяглы Марцін Аксёнавіч [5, с. 367–369].

## Крыніцы і літаратура

1. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа. — Том. 2. — Вильня, 1867.
2. Белоруссия в эпоху феодализма: сборник документов и материалов. — Т.1. — Мінск : изд-во АН БССР, 1959.
3. Белоруссия в эпоху феодализма: сборник документов и материалов. — Т. 2. — Мінск : изд-во АН БССР, 1960.
4. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской (ИЮМ) / Под ред. Д. И. Довгялло. — Витебск, 1876. — Вып. 7.
5. ИЮМ. — Витебск, 1877. — Вып. 8.
6. ИЮМ. — Витебск, 1878. — Вып. 9.
7. ИЮМ. — Витебск, 1879. — Вып. 10.
8. ИЮМ. — Витебск, 1881. — Вып. 12.
9. ИЮМ. — Витебск, 1886. — Вып. 16.
10. ИЮМ. — Витебск, 1892. — Вып. 32.
11. Клименко, Ф. В. Западнорусские цехи в 16–18 вв. — Киев, 1914.
12. Марзалюк, І. А. Магілёў у XII –XVIII ст. — Мінск, 1998.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — КМФ 18. — Спр. 36.
14. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 76.
15. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 77.
16. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 83.
17. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 106.
18. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 111.
19. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 132.
20. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 148.
21. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 155.
22. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 316.
23. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 320.
24. Цітоў, А. Менск — места майстроў. — Мінск, 2002.
25. Цітоў, А. Цэхавая геральдыка Беларусі // Мастацтва Беларусі. — 1987. — № 6. – С. 65–67.

*Ф. В. Чарняўскі*

## Да жыццяпісу Марціна Казіміра Валадковіча, пісара земскага менскага ў 1689–1701 гг.

Марцін Казімір Валадковіч нарадзіўся да 1630 г. у сям'і Пятра Валадковіча, суддзі земскага менскага, і Ганны Камаеўскай. Для таго каб атрымаць уяўленне аб асяроддзі, у якім вырас будучы пісар земскі менскі, неабходна сказаць некалькі слоў пра яго бацькоў.

У двух шлюбах дзеда будучага пісара, таксама Марціна Валадковіча, суддзі земскага менскага, акрамя Пятра, нарадзіліся яшчэ некалькі сыноў і дачок. Зусім верагодна, што дзяцей у суддзі земскага нарадзілася болей, чым нам паведамляюць гістарычныя дакументы. У першым шлюбе суддзі земскага яшчэ да 1600 г. нарадзіўся Крыштоф Валадковіч, каралеўскі дваранін, пісар земскі менскі, які ўдзельнічаў у многіх ваенных паходах каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх Жыгімонта III і Уладзіслава IV. У 1658 г. пасля смерці Пятра Вяжэвіча Крыштоф атрымаў каралеўскі прывілей на ваяводства Навагародскае. На працягу ўсяго свайго жыцця ваявода навагародскі аказваў падтрымку свайму пляменніку Марціну Казіміру і садзейнічаў яго ўзвышэнню. Добра вядомы гісторыкам і Тэадор Аляксандр Валадковіч, які нарадзіўся ў другім шлюбе Марціна Валадковіча з Даротай Манівід-Дарагастайскай, ваеводзянкай смаленскай, спачатку войскі і суддзя гродскі менскі, а потым, на працягу амаль дваццаці пяці гадоў, пісар земскі Менскага ваяводства. Вельмі мала звестак захавалася пра яшчэ аднаго сына суддзі земскага менскага і пані Дароты Дарагастайскай, а менавіта пра Геляша Аляксандра Валадковіча, апошнія гады свайго жыцця менаваўшага сябе зямянінам Мсціслаўскага ваяводства. Памёр Геляш Валадковіч, судзіч земскі менскі, пасля 1649 г. Даследчыкі мінулага ўпамінаюць і аб існаванні трох дачок суддзі земскага менскага Евы, Барбары і Рэгіны [1, s. 5].

Жонка Пятра Валадковіча і маці Марціна Казіміра Ганна Камаеўская нарадзілася ў сям'і Юр'я Камаеўскага, падкаморыя вількамірскага, і пані Слупецкай, кашталянкі любельскай [2, s. 353]. Падкаморы вількамірскі і кашталянка любельская ўступілі ў шлюб пасля 1592 г. У гэтым шлюбе акрамя Ганны, як сведчыць А. Банецкі, нарадзіліся яшчэ адна дачка, што выйшла замуж за Крыштофа Друцкага-Сакалінскага, кашталяна полацкага, і два сыны Аляксандр і Феліцыян. Адам Банецкі, на нашу думку, памылкова сцвярджае, што Ганна Камаеўская пасля смерці Адама Юдыцкага ўступіла ў шлюб з Крыштофам Валадковічам. Як вядома, пасля смерці першай жонкі Крыштоф Валадковіч, яшчэ

каралеўскі дваранін, каля 1630 г. уступіў у шлюб з Ганнай Аконаўнай, якая памерла каля 1640 г. Добра вядома, што пані Ганна Камаеўская жыла яшчэ ў 1654 г. Менавіта 23 сакавіка гэтага года яна, мянуючы сябе Пятровай Валадковічавай, падпісвае дакумент на 100 коп грошай сваім сынам, народжаным у другім шлюбе, Міхалу Станіславу і Марціну Казіміру Валадковічам [3, арк. 88]. Аб уступленні Ганны Камаеўскай, падкамаранкі Вількамірскага павета, у шлюб з Пятром Валадковічам, менавіта судзічам земскім менскім, сведчаць і два дакументы, якія маюцца на захаванні ў бібліятэках Вільнюса. Першы з іх складзены 28 мая 1629 г., а другі — 17 чэрвеня 1634 г. [4, k. 128, 578].

Адам Юдыцкі, першы муж Ганны Камаеўскай, нарадзіўся ў сям'і Аляксандра Юдыцкага, які займаў напачатку XVII ст. пасаду падсудка Рэчыцкага павета. У падсудка земскага рэчыцкага нарадзіліся трынаццаць сыноў, з якіх самым малодшым быў Адам. Найбольш значныя земскія пасады ў павеце ў XVII ст. займалі прадстаўнікі гэтага сямейнага клана. У канцы 20-х гг. XVII ст. маршалкам Рэчыцкага павета быў Рыгор, пасаду падкаморыя займаў Геранім, пісарства земскае спраўляў Багдан, павятовым харужым з'яўляўся Мікалай. Адзін з братоў Юдыцкіх, а менавіта Ян, у пачатку XVII ст. працаваў «слугой канцылярыйскім» у канцылярыі княства, пад непасрэдным кіраўніцтвам канцлера Льва Сапегі. Як сведчаць каралеўскія прывілеі на наданне Яну Юдыцкаму земляў у розных паветах і ваяводствах ВКЛ — ён карыстаўся поўным даверам канцлера ВКЛ і атрымліваў розныя маёмасці па яго асабістай пратэкцыі.

Асноўныя зямельныя добры Адама Юдыцкага, якія перайшлі ў яго валоданне пасля шлюбу з Ганнай Камаеўскай, знаходзіліся ў межах Вількамірскага павета. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III і каралевіч Уладзіслаў шчодра ўзнагародзілі вопытнага ваяра Юдыцкага леннымі добрамі ў межах Браслаўскага, Ковенскага і Лідскага паветаў. У той жа час нам невядома пра перадзел добраў, што знаходзіліся ў карыстанні Адама Юдыцкага і размяшчаліся ў межах Рэчыцкага павета, пасля яго смерці. Магчыма спадчынныя зямельныя валоданні Аляксандра Юдыцкага, падсудка Рэчыцкага павета, па дамоўленасці яго сыноў яшчэ пры жыцці Адама большай часткай трапілі ў рукі старэйшых братоў. Што ж датычыцца размеркавання паміж сынамі Ганны Камаеўскай, падкамаранкі вількамірскай, яе зямельных добраў, то на нашу думку большая частка ўладанняў трапіла ў рукі старэйшага сына Станіслава Юдыцкага. Звесткі пра валоданне землямі ў межах Вількамірскага і Ковенскага паветаў дзецьмі Камаеўскай, народжанымі ў яе шлюбе з Пятром Валадковічам, адсутнічаюць.

Адам Юдыцкі непрацяглы час, а менавіта ў 1617 г., займаў пасаду падстарасты судовага гродскага Вількамірскага павета [5, № 3497,

s. 463]. На нашу думку, ён як вопытны ваяр, адмовіўся ад пасады падстарасты з прычыны ўдзелу ў мяркуемай ваеннай экспедыцыі Уладзіслава IV у межы Маскоўскай дзяржавы. У 1617–1618 гг. літоўскія і каронныя войскі пад кіраўніцтвам каралевіча польскага, у складзе якіх пад харугвай маршалка ВКЛ знаходзіўся і почт самога Адама Юдыцкага, беспаспяхова спрабавалі авалодаць Масквой [6, с. 577]. Адвага і здольнасці, праяўленыя Юдыцкім у гэтай ваеннай экспедыцыі, былі заўважаны і добра ацэнены Уладзіславам IV. 15 сакавіка 1623 г. Адаму Юдыцкаму, «які добра праявіў сябе ў нядаўняй маскоўскай кампаніі», надаюцца 60 валок ворнага грунту ў Беразнянскай воласці Смаленскага ваяводства [7, арк. 540]. Заўчасная смерць Адама Юдыцкага ў 1627 г., на нашу думку, тлумачыцца наяўнасцю шматлікіх ран, атрыманых у многіх ваенных паходах.

Першы вядомы нам каралеўскі прывілей на разбор добраў спачылага Адама Юдыцкага ўнесены ў кнігі Літоўскай метрыкі 1 лістапада 1627 г. Ленныя правы на перавоз праз Нёман пад Коўна, які раней знаходзіўся ў яго пажыццёвым карыстанні, перадаваліся брату Рыгору Юдыцкаму, маршалку Рэчыцкага павета, «удзельніку інфлянцкай і маскоўскай ваенных экспедыцый, які почт немалы ставіў» [7, арк. 206 адв.]. Намі заўважана, што справы па пераразмеркаванні ленных добраў нябожчыкаў вырашаліся ў ВКЛ вельмі хутка, на працягу аднаго-двух месяцаў пасля смерці асобы. Хутчэй за ўсё памёр Адам Юдыцкі ў кастрычніку гэтага ж 1627 г.

На нашу думку, у шлюб Пётр Валадковіч, судзіч земскі Менскага ваяводства, гербу «Радван», і Ганна Камаеўская, падкамаранка Вількамірскага павета, уступілі не пазней чэрвеня–ліпеня 1628 г. У новы шлюб можна было ўступіць толькі праз паўгады жалобы па памерламу. Аб гэтым жа сведчыць і каралеўскі дазвол на «куратэлію» (апякунства) над непаўналетнім Станіславам, «спладжоным (народжаным. — *Ф. Ч.*) у шлюбе Адама Юдыцкага і Ганны Камаеўскай», яго стрыю (роднаму дзядзьку) Гераніму Юдыцкаму, падкаморыю Рэчыцкага павета [7, арк. 311]. Каралеўскі дазвол на апеку над Станіславам, якому па нашых падліках на гэты час было не болей за шэсць гадоў ад нараджэння, унесены ў кнігі Метрыкі 3 красавіка 1629 г. У каралеўскім «кансэнсу» (дазволе), як гэта звычайна рабілася ў такіх выпадках, вызначаліся правы і абавязкі апекуна. Геранім Юдыцкі абавязаны «учціва хаваць добры і выхоўваць Станіслава Юдыцкага». Пры звычайных абставінах апекуны над жонкай і дзецьмі вызначаліся ў тастаменце самім паміраючым. Аднак у каралеўскай «куратэліі» не згадваецца сама Ганна Камаеўская. Гэта магло быць толькі ў выпадку яе паўторнага шлюбу. Удава нябожчыка магла ўступіць у новы шлюб толькі з дазволу сваіх апекуноў. У дадзеным выпадку дазвол ад крэўных нябожчыка Адама Юдыцкага на новы шлюб яго жонкі быў атрыманы значна раней, ды і само

вяселле было ўжо ў мінулым. Заставалася забяспечыць маёмасныя правы Станіслава, яшчэ не маючага «гадоў зупольных» (не дасягнуўшага паўналецця). У ВКЛ нярэдкімі былі выпадкі судовага пераследа айчыма і маці пасербамі (пасынкамі) па дасягненні імі сталасці. Атрымаўшы магчымасць карыстацца спадчыннымі землямі і грашыма, пакінутымі згодна тэстаменту бацькі, дзеці часта не далічваліся некаторай часткі бацькоўскай маёмасці.

Станіслаў Міхал Юдыцкі ў пачатку 1642 г. дасягнуў сталасці і атрымаў правы на карыстанне бацькоўскімі і некаторымі мацярынскімі землямі. 30 сакавіка гэтага года Ганна Камаеўская Пятровая Валадковічавая, падчашына ковенская, перадала старэйшаму сыну ўсю спадчыну па бацьку [8, арк. 427]. Пасля 1650 г. Станіслаў Юдыцкі прыняў актыўны ўдзел у вайне з маскоўскімі войскамі. Дзякуючы таму, што ў шляхецкіх сем'ях падрыхтоўку хлапчукоў да вайсковай службы пачыналі з самага дзяцінства, вайсковыя адзінкі княства прымалі ў свае шэрагі добра падрыхтаваных і дысцыплінаваных, узброеных за свой кошт ваяроў. Удзел у войнах «з праціўнікамі крыжа святога» татарамі і Атаманскай Портай карыстаўся вялізнай папулярнасцю ў шляхецкім асяроддзі. Згодна з даследаваннямі А. Банецкага, Станіслаў Юдыцкі ў 1661 г. з'яўляўся войскім рэчыцкім, у 1671 г. — харужым, а з 1688 г. — падкаморым Рэчыцкага павета. Памёр у 1701 г., крыху не дасягнуўшы васьмідзесяцігадовага ўзросту [9, s. 99].

Пётр Валадковіч, сын і ўнук суддзяў земскіх Менскага ваяводства, па прывілею ад 25 лістапада 1635 г. атрымаў ад Уладзіслава IV тытул падчашага Ковенскага павета, «упершыню ўведзены для адзначэння рыцарства шляхты» [10, арк. 438]. Валадковічы герба «Радван», абывацелі (шляхцічы) Менскага павета, не мелі ў сваім распараджэнні добраў у межах Ковенскага павета і Пётр Валадковіч, судзіч земскі менскі, змог прэтэндаваць на атрыманне гэтага ганаровага тытула па згаданай тэрытарыяльнай адзінцы толькі дзякуючы наяўнасці ў сваім пажыццёвым валоданні земляў, перададзеных яму жонкай пры ўступленні ў шлюб. Праз пяць дзён па атрыманні прывілея, а менавіта 30 лістапада гэтага ж года, Пятру Валадковічу, «удзельніку многіх ваенных экспедыцый», надаецца «кадуковым правам» (валоданне маёмасцю шляхціча, памерлага без нашчадкаў) уласнасць Марціна Ракіцкага, зямяніна Ковенскага павета [10, арк. 474]. Дарэчы Пётр Валадковіч, падчашы ковенскі, хутчэй за ўсё памёр летам 1637 г., бо ўжо 26 жніўня таго ж года падчаства ковенскае «па Пятру Валадковічу перайшло да Рафала Жыгімонта Скарульскага» [11, арк. 82]. Тытулы, як і пасады ў ВКЛ, надаваліся пажыццёва або да атрымання новага больш высокага ўрада.

У той жа час гістарычныя крыніцы згадваюць пра існаванне яшчэ аднаго Пятра Валадковіча, які жыў у сярэдзіне 40-х гг. XVII ст.

Вядома, што ў лютым 1645 г. вакол Тэадора і Казіміра Нарбутаў і параднёнага з імі Мікалая Булгака аб’ядналася тая частка менскай павятовай шляхты, якая была незадаволена ўзмацненнем Валадковічаў. Нашчадкі Адама Валадковіча, судзіча земскага і гараднічага менскага, прэтэндавалі на атрыманне пасад у судах Менскага павета. Падчас паездкі Пятра Валадковіча і Мікалая Богуша, харужага мазырскага, на менскі грамнічны соймік змоўшчыкі напалі на іх у час начлегу і жорстка збілі [12, арк. 595–604]. У выніку атрыманых у бойцы цяжкіх «зраненняў» Мікалай Богуш памёр да 1650 г., а Пётр Валадковіч зышоў з гэтага свету каля 1652 г. На жаль, мы не ведаем імён ўсіх дзяцей братоў Адама, Марціна, Рыгора і Яраша Валадковічаў, судзічаў земскіх Менскага ваяводства. Браты ўступалі па два разы ў шлюб і ў кожным з іх нараджаліся дзеці. Магчыма, што ў гэтым дакуменце размова ішла пра сына Адама Валадковіча, судзіча земскага і гараднічага менскага.

Міхал Станіслаў Валадковіч, старэйшы брат Марціна Казіміра, значны час правёў на вайсковай службе, прымаў удзел ва ўсіх бітвах, якія адбываліся на тэрыторыі ВКЛ у 1657–1663 гг. Як паручнік (намеснік камандзіра) пасля 1660 г. узначальваў казацкую харугву свайго стрыя (дзядзькі па бацькавай лініі) Крыштофа Валадковіча, ваяводы навагародскага. Уступіў у шлюб з Іааннай Вадбрацкай, чашнікаўнай Ковенскага павета [13, s. 15]. Пасля пераходу краіны да аднаўлення разбуранай гаспадаркі займаў пасаду падсудка, а потым і суддзі земскага Менскага ваяводства. Памёр Міхал Станіслаў Валадковіч у канцы 1691 – пачатку 1692 г. Яго тэстамент унесены ў актавыя кнігі навагародскага земскага суда 4 кастрычніка 1695 г. [14, арк. 283].

Як сведчаць каралеўскія прывілеі на наданні ленных зямельных добраў, Марцін Валадковіч, як і яго старэйшы брат, удзельнічаў ва ўсіх ваенных сутычках перыяду гэтай вялікай вайны, пачынаючы з 1647 г. і па 1663 г. Ян Казімір 15 сакавіка 1658 г. падпісвае яму прывілей на атрыманне ўрада гараднічага менскага [15, арк. 242]. У прывілеі даецца высокая ацэнка дзейнасці Валадковіча за ўвесь час вайны з казакамі і маскоўскімі войскамі. Ён уступіў у войска якраз у самым пачатку «казацкай рэбеліі», як тады менавалі паўстанне запарожскіх казакаў. З гэтага часу, на працягу больш чым пятнаццаці гадоў Валадковіч знаходзіўся пры сваёй харугве. У каралеўскім прывілеі на ўрад гарадніцтва менскага адзначаецца, што Валадковіч сваім коштам паставіў у войска два почты добра ўзброеных ваяроў. Гусарскую харугву, у якой у якасці таварыша (ніжэйшае вайсковае званне) служыў Валадковіч, сфарміраваў за свой кошт яго дзядзька Крыштоф. Дарэчы гэта першы дакумент, у якім жонкай Марціна Казіміра Валадковіча называецца Гелена з Кастравіцкіх. На нашу думку, шлюб Марціна Валадковіча і Гелены з Кастравіцкіх,

дачкі Стэфана Кастравіцкага, скарбніка Мсціслаўскага ваяводства, адбыўся задоўга да 1658 г.

Пасля завяршэння ваенных дзеянняў на тэрыторыі ВКЛ і пераносу вайны на землі праціўніка перад войскам узнікла неабходнасць дабіцца нарэшце аплаты за ўсе гады сваёй крывавай працы. Пакуль цягнуліся ваенныя дзеянні на тэрыторыі княства, войска не ставіла востра гэтае пытанне, а вось у пачатку 60-х гг. XVII ст. стала патрабаваць аплаты. Аднак у скарбе як ВКЛ, так і Польшчы грошай не было. Не было грошай і ў магнатаў — уладальнікаў вялікіх зямельных абшараў на тэрыторыі княства, якія за свой кошт ставілі харугвы ў войска. Ні аднаго злотага не заплацілі ваярам прыватнай харугвы кашталяна віленскага яго нашчадкі, спасылаючыся на поўнае спусташэнне іх добраў. Летам 1661 г. войска ВКЛ адмовілася ад удзелу ў ваенных дзеяннях і стварыла «братэрскі хаўрус», які выйшаў з падпарадкавання сваім камандзірам. Былі абраны новыя кіраўнікі войска, сярод якіх у званні вайсковага абознага аказаўся і МарцінВаладковіч. Як заўважае Пачобут-Адляніцкі, асаблівага аўтарытэта сярод вайскоўцаў Марцін Казімір Валадковіч не меў і ніхто з ваяроў не падпарадкоўваўся яму. Валадковіч не прымаў удзелу і ў забойстве Гасеўскага, ваяводы навагародскага, гетмана ВКЛ, абвінавачанага ваярамі ў здрадзе агульнай справе. Менавіта таму пасля прывядзення войска да паслухмянасці яго не прысудзілі да пакарання [16, s. 49].

Пасля вяртання да мірнага ладу жыцця Валадковіч хутка аказаўся адным з найбуйнейшых ліхвяроў павета. Значная колькасць пазык вярталася ў яго рукі без спазнення. Аднак былі выпадкі, калі даўжнікі па нейкіх прычынах не жадалі развітвацца з чужымі грашыма. У пачатку 1661 г. такая справа разглядалася ў каралеўскім задворным асэсарскім судзе ў Варшаве. Аляксандр Пілецкі пазычыў на вельмі невялікі час каля паўтары тысячы злотых і ў якасці забеспячэння пазычанай сумы прадставіў дакументы на сваю частку маетнасці Хожаўскай. Час прайшоў, а ў небаракі не аказалася патрэбнай сумы ў наяўнасці. Прэтэнзіі Валадковіча да Пілецкага разглядаліся ў гродскім судзе Менскага ваяводства. Апошнім гэтую справу прыняў да разгляду каралеўскі задворны суд. Верагодна, у Пілецкага былі надзеі на атрыманне судовага рашэння на сваю карысць. Суд пастанавіў аплаціць не толькі пазыку Валадковічу, але і ўсклаў на Пілецкага выплату судовых накладаў, што аўтаматычна павялічыла першапачатковую суму ў некалькі разоў [17, арк. 44].

16 лютага 1661 г. Ян Казімір дае дазвол зямянам Ваўкавыскага павета Тамашу Клімашэўскаму і яго жонцы Леаноры з Панцаржынскіх на перадачу «дажыватных» (пажыццёвых) правоў на дзяржаўную маетнасць Леванавічы гараднічаму менскаму Валадковічу і яго жонцы

Гелене з Кастравіцкіх [14, арк. 109]. Зразумела, што дзяржаўная маетнасць пераходзіла ў рукі Марціна Казіміра не дарма. Акрамя таго, што прыйшлося заплаціць самому Клімашэўскаму за згоду на развітанне з пажыццёвым карыстаннем маёнтка, немалыя грошы адлічыў Валадковіч і службоўцам дзяржаўнай канцылярыі і скарбу. Ніводная справа не магла быць вырашана без выплаты значнага хабару суддзям, якія прымалі рашэнні, і тым канцылярскім слугам, якія мелі да іх доступ. Верагодна, што ўсе перамовы былі скончаны да 20 сакавіка гэтага года. Менавіта ў гэты дзень Ян Казімір падпісвае, у дадатак да дакумента ад 16 лютага, «кансэнс» (дазвол) на пераход пажыццёвых правоў на карыстанне Левановічамі, з выплатай неабходных пабораў у скарб дзяржавы, Марціну Казіміру Валадковічу [14, арк. 130]. Жадаючых атрымаць у пажыццёвае карыстанне Левановічы было шмат, але асабліва настойлівым аказаўся Стэфан Каманяка, які паходзіў з зямян Мазырскага павета. Некалькі наездаў гэтага шляхціча прывялі маетнасць да поўнага спусташэння [17, арк. 207].

20 сакавіка 1662 г. Марцін Казімір Валадковіч атрымлівае каралеўскае рашэнне па ўласнай скарзе на некаторыя непаразуменні з выплатай падаткаў, што ўзніклі пасля ранейшага вызвалення яго добраў у Навагародку ад пабораў у скарб княства. Кароль дае пацвярджэнне на вызваленне леннай, пажыццёвай маетнасці Левановічы Ваўкавыскага павета ад некаторых пабораў [14, арк. 130]. Вызваленне дзяржаўных маёнткаў, якія знаходзіліся ў пажыццёвым (ленным) карыстанні, ад розных пабораў, сапраўды цяжкіх для гаспадаркі, было звычайнай справай у ВКЛ. Такая практыка была характэрна не толькі для часоў Яна Казіміра. Гэтак жа змяншалі паступленні ў скарб княства і яго наступнікі. 10 ліпеня 1672 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Міхал Вішнявецкі пацвердзілі правы Валадковіча на Левановічы, уключаючы і вызваленне маёнтка ад некаторых падаткаў [14, арк. 107]. Спробы скарбу ВКЛ павялічыць паступленні з Левановіч не мелі поспеху. Аднак пэўныя непаразуменні з ім прысутнічалі ўвесь час гаспадарання Валадковічаў у Левановічах. Пасля 1701 г. Стэфан Валадковіч, атрымаўшы бацькоўскую спадчыну, адмовіўся ад сваіх пажыццёвых правоў на падданых і землі ў Левановічах.

З цягам часу да голасу Валадковіча пачалі прыслухоўвацца ў павеце. 12 ліпеня 1663 г. Марцін Валадковіч, гараднічы і падстараста судовы гродскі менскі, засядае ў вышэйшай судовай установе княства — Галоўным Трыбунале. На гэты час маршалкам Трыбунала дэпутаты абралі пасла ад Віцебскага ваяводства Яна Корсака, кашталяна віцебскага [18, арк. 319]. Яшчэ адно пасяджэнне Трыбунала з удзелам гараднічага менскага занатавана ў дакументах ад 14 кастрычніка таго ж года [19, арк. 342]. Гэта было неапошняе абранне Валадковіча ў склад

вышэйшай судовай установы княства. 26 кастрычніка 1667 г. Марцін Казімір Валадковіч ізноў засядае на Менскай кадэнцыі (пасяджэнні) Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Паколькі сам маршалак трыбунальскі Крыштоф Завіша адсутнічаў, то па яго даручэнні Марцін Валадковіч кіраваў пасяджэннем у якасці дырэктара Трыбунальскага кола [20, арк. 19, 22]. Згодна з законамі княства на ўдзел у працы Трыбунала нельга было прэтэндаваць штогод. Толькі праз некалькі гадоў на грамнічным (лютаўскім) ваяводскім сойміку можна было дабівацца новага абрання на вельмі ганаровую пасаду трыбунальскага дэпутата. Так, 5 чэрвеня 1671 г. сярод дэпутатаў (суддзяў) Галоўнага Трыбунала, які працаваў пад маршалкоўствам Яна Ежы Агінскага, маршалка Браслаўскага павета, ізноў прысутнічае Марцін Валадковіч, гараднічы і падстараста судовы гродскі менскі [21, арк. 49]. Абіраўся Марцін Казімір Валадковіч дэпутатам Галоўнага Трыбунала ВКЛ і ў 1677 і 1687 гг. [22, s. 334, 368]. Да характарыстыкі ўплыву Валадковічаў у Менскім павеце неабходна дадаць, што на працягу амаль трыццаці гадоў з 1663 г., моманту ўзнаўлення працы Галоўнага Трыбунала ВКЛ пасля вызвалення краіны ад іншаземных войскаў, і да 1693 г. прадстаўнікі роду Валадковічаў выбіраліся дэпутатамі (суддзямі) згаданага вышэйшага апеляцыйнага суда ВКЛ 15 разоў. Прычым у 1669 і 1674–1675 гг. выбары суддзяў не праводзіліся з прычыны наступлення міжкаралеўя.

На працягу двух з паловай стагоддзяў існавання Менскага павета ў яго палітычным жыцці дамінавалі Валадковічы. Такое становішча было характэрна не толькі для гэтай адміністрацыйнай адзінкі. У Рэчыцкім павеце асноўныя земскія пасады і тытулы трымалі Юдыцкія, у XVI–XVII стст. Мірскія і Стэцковічы вызначалі ход падзей у Браслаўскім павеце, Падбярэзскія і Лукомскія — у Аршанскім, а Ельскія і Тарлецкія — у Пінскім. На нашу думку, такі высокі ўзровень уплыву Валадковічаў у Менскім павеце тлумачыцца не толькі якасцямі саміх Валадковічаў і атрыманай імі адукацыяй але і ў значнай ступені наяўнасцю роднасных повязей з найбольш уплывовымі магнацкімі родамі ВКЛ. З цягам часу ў многіх паветах княства адбылася паступовая змена лідараў, аднак у Менскім павеце Валадковічы захавалі дамінуючыя пазіцыі яшчэ і ў пачатку XIX ст.

У другой палове XVII ст. вырашаючую ролю ў Менскім павеце адыгрывалі родныя браты Міхал Станіслаў і Марцін Казімір Валадковічы. Верагодна, што малодшы брат карыстаўся большай вядомасцю і аўтарытэтам сярод абывацеляў (шляхты) павета, чым Міхал Станіслаў.

Значны след у гісторыі Рэчы Паспалітай пакінула справа аб зрыве працы Варшаўскага сойма, учыненая ў сакавіку 1665 г. Марцінам Казімірам Валадковічам, гараднічым менскім, і Фёдарам Лукомскім.

У пачатку гэтага года Валадковіч і Лукомскі выбіраюцца дэпутатамі на сойм ад шляхты Менскага павета. Каралеўская адміністрацыя прадугледжавала прыняцце на гэтым сойме некаторых рашэнняў, не маючых падтрымкі сярод абывацеляў (шляхты) ВКЛ. Толькі што скончылася шматгадовая, крывавая вайна, якая прывяла да поўнага разбурэння гаспадаркі краіны. Большасць гарадоў і мястэчак княства ляжала ў руінах, іх насельніцтва зменшылася ў два разы. Патрабавалася шмат грошай не толькі для аднаўлення гаспадаркі княства, але і для штодзённых выдаткаў. Войска, якое так і не атрымала належнай яму аплаты за гады мінулай вайны, сілай захоплівала некаторыя дзяржаўныя маёнткі і вынішчала іх цалкам.

У абмеркаванні спраў, унесеных на разгляд сойму, прынялі актыўны ўдзел і дэпутаты ад Менскага павета. Аднак іх прапановы прыняты пад увагу не былі. У абмеркаванні некаторых пытанняў Валадковіч і Лукомскі адмовіліся прыняць удзел, спаслаўшыся на тое, што не атрымалі належных інструкцый ад шляхты свайго павета. Пасяджэнне сойма было сарвана, а важныя рашэнні па выхаду краіны з эканамічнага крызісу не прыняты.

Нам сустрэліся дзве трактоўкі згаданай падзеі. Паводле першай, канцлер ВКЛ Крыштоф Пац, гетман ВКЛ Мікалай Пац і біскуп луцкі, канцлер каронны Рэчы Паспалітай Мікалай Пражмоўскі ўнеслі пратэст на дзеянні дэпутатаў, абвінавачваючы іх у тым, што на пасяджэнні тыя выказваліся ад свайго імя, не ўлічваючы думкі абывацеляў княства, засведчанай імі ў інструкцыях паслам на сойм. Як пісалі ў сваёй пратэстацыі высокія ўраднікі ВКЛ і Кароны польскай, яны «будучы пасламі спрабавалі занесці згубу на ВКЛ». Прычым, згодна іх думцы, абодва паслы кіраваліся не інтарэсамі краіны, а жаданнем дабіцца здзяйснення асабістых інтарэсаў [23, с. 342]. У пратэсце адзначалася, што Марцін Валадковіч учыніў гэты крок з надзеяй перашкодзіць годнаму чалавеку, свайму дзядзьку Тэадору Валадковічу, заняць пасаду пісара земскага Менскага ваяводства, на якую нібыта сам меў немалыя надзеі. Што ж датычыцца Фёдара Лукомскага, то гэты «вечны баніта хацеў свой гонар рэпараваць (рэабілітавацца. — *Ф. Ч.*)». Яго ўдзел у зрыве працы сойма тлумачылі надзеяй на істотнае паляпшэнне сваёй рэпутацыі, верагодна, моцна пацярпелай у мінулым.

Зусім аб іншым гаворыцца ў маніфесце паслоў ад Менскага павета Марціна Казіміра Валадковіча і Фёдара Лукомскага, унесенага імі 8 красавіка 1665 г. пры вяртанні ў межы ВКЛ у акты Слонімскага гродскага суда. На думку дэпутатаў, на сойме не вырашаліся сапраўды балючыя для княства справы. Усе рашэнні, прынятыя там, дыктаваліся толькі інтарэсамі Кароны, якая зусім не дбала аб інтарэсах ВКЛ. Не дзейнічалі ў інтарэсах княства і вышэйшыя яго ўраднікі. Згодна сведчанню паслоў,

«канцлер збіраў патаемна» дэпутатаў ад ВКЛ і намаўляў іх галасаваць у адпаведнасці з прапановамі каронных ураднікаў. На сойме не быў дадзены адказ на тры пытанні, маючыя вельмі важкае значэнне для будучыні княства. Не было вырашана, якія меры павінны быць прыняты для забеспячэння абароны ВКЛ ад войскаў Масквы. Вясной гэтага ж года чакалася ўступленне войскаў Маскоўскага княства ў межы краіны. Невядомым застаўся лёс войска, якому за службу так і не выплацілі належнае. Дарэчы, не атрымалі заслужанае за больш чым дзесяцігадовую вайсковую службу і самі маніфестанты. Валадковіч і Лукомскі з самага пачатку вайны не пакідалі свайго месца ў радах войска ВКЛ. Далей дэпутаты сойма ад шляхты Менскага павета сцвярджалі, што на ВКЛ робіцца вялікі націск з мэтай прымусіць княства да ўвядзення ва ўжыванне жалезнай манеты. Марцін Валадковіч і Фёдар Лукомскі папярэджвалі шляхецкую супольнасць краіны, што здзяйсненне гэтых намераў прывядзе да далейшага, яшчэ больш цяжкага, разбурэння гаспадаркі княства [23, с. 342].

Здаецца, што гэта быў адзіны дэмарш Валадковіча перад урадавымі коламі княства. У гэтым жа годзе Андрэй Завіша, стараста судовы менскі, адпраўляе Пятра Капашчэўскага, падстолія і падстарасту судовага гродскага менскага, у адстаўку з пасады кіраўніка гродскага суда, а вакантнае месца пажыццёва, або да атрымання іншага, больш высокага прызначэння, надае Марціну Казіміру Валадковічу. Тая частка шляхецкага асяроддзя, якая вынесла на сваіх плячах увесь цяжар шматгадовай вайны з захопнікамі, не разумела, чаму Пятру Капашчэўскаму, які здрадзіў краіне і прыняў крыжацалаванне на вернасць Аляксею Міхайлавічу, цару маскоўскаму, вярнулі не толькі яго маёмасць і тытул падстолія, але і пасаду кіраўніка гродскага суда ў ваяводстве. Зразумела, што наданне Валадковічу падстароства судовага гродскага Менскага ваяводства прывяло да некаторага заспакаення шляхты.

Між іншым намі не зафіксавана існаванне супярэчнасцей паміж Тэадорам Валадковічам, войскім і суддзёй гродскім, а потым і пісарам земскім менскім, і яго пляменнікам Марцінам Казімірам Валадковічам, гараднічым і падстарастам судовым гродскім менскім. 5 чэрвеня 1676 г. Тэадор Валадковіч, ужо пісар земскі менскі, і Марцін Казімір Валадковіч, прызначаныя па тэстаменту памерлага Аляксандра Драбышэўскага, зямяніна Менскага павета, апекунамі яго жонкі Ганны і дзяцей, выклікалі ў Менскі гродскі суд Яна, брата нябожчыка, і Уладзіслава Крыштофа Драбышэўскіх, якія спрабавалі пакінуць сям'ю Аляксандра без грошай [24, арк. 864].

Што ж датычыцца магчымых прэтэнзій Марціна Казіміра Валадковіча на атрыманне пасады пісара земскага Менскага ваяводства, то здзейсніліся яны толькі праз чвэрць веку пасля смерці Тэадора Валадковіча ў 1689 г.

Марцін Казімір Валадковіч за час свайго жыцця ў некалькі разоў павялічыў памеры сваіх земляў. Да 25 мая 1674 г. у рукі Валадковіча перайшлі Уша і Гайкаўшчына, аддзеленыя іх уладальнікам Міхалам Геранімам Іваноўскім, войскім Менскага ваяводства, ад Дзякшнян [25, арк. 112]. Маетнасць і двор перадаваліся Валадковічу часова, да вяртання буйной пазыкі, атрыманай войскім менскім. Аднак пазыка не была вернута, і таму згаданыя землі, разам з падданымі, упамінаюцца ў дакументах дзяцей і ўнукаў пісара земскага як іх дзедзічнае (спадчыннае) ўладанне.

У 1679 г. Міхал Казімір Пац, ваявода віленскі, гетман ВКЛ, дае дазвол Марціну Валадковічу на вызваленне Левановічаў ад пастояў жаўнераў літоўскага войска. Наданне ахоўнай граматы тлумачылася вялікімі стратамі, панесенымі гараднічым менскім у мінулай вайне і яго асабістымі заслугамі ў справе абароны краіны ад ворагаў. Гетман прадпісваў «усім чынам і рыцарам войскаў ВКЛ, абы добры ленныя Левановічы ў павеце Ваўкавыскім у асаблівым рэшпекце маючы, Валадковічу, гараднічаму менскаму, прызначаныя, былі вызвалены ад усялякіх жаўнерскіх паслуг» [14, арк. 102]. Зразумела, пасля пастояў сваіх абаронцаў ад гаспадаркі заставаліся руіны. Але ж і абараняць краіну было неабходна. Да таго ж, войска карысталася пэўнай самастойнасцю і пры малейшай спробе абмежаваць яго правы і вольнасці магло сканфедэравацца і аб'явіць аб спыненні выканання вайсковых абавязкаў. А паколькі, як на аплату яго патрэбаў у скарбе заўсёды не хапала грошай, то харугвам прыходзілася займацца звычайным рабаваннем маёнткаў, не робячы розніцы паміж дзяржаўнымі, асабістымі або нават царкоўнымі добрамі. Марціну-Казіміру Валадковічу давялося выдаткаваць значную суму і на аплату згоды самога канцлера ВКЛ, бо такія рашэнні каштавалі вельмі дорага. У выніку такой аперацыі ў выйгрышу засталіся Марцін Валадковіч і канцлер ВКЛ. У пройгрышу аказаўся скарб дзяржавы, дзе і раней не хапала грошай не толькі на аплату войска, але і на шмат што іншае, неабходнае для дзяржавы. Паколькі такія дазволы на лібертацыю (вызваленне) дамоў і маёнткаў ад пастояў ў ВКЛ атрымліваў не толькі Марцін Валадковіч, але і іншыя асобы, то зразумела, што грошай у скарбе станавілася ўсё менш і менш. На нашу думку, да гэтага часу канцлер ВКЛ і ваявода віленскі паспеў забыцца аб падзеях 1665 г., калі Валадковіч і Лукомскі сарвалі працу сойма Рэчы Паспалітай.

У 1673–1675 гг. у перыяд міжкаралеўя з нагоды смерці Міхала Вішнявецкага, караля польскага і вялікага князя літоўскага, Марціна Валадковіча абіраюць у склад каптуровага суда Менскага ваяводства ў якасці яго дырэктара [26, арк. 221]. У час міжкаралеўя земскія і гродскія суды паветаў і ваяводстваў княства прыпынялі сваю дзейнасць

да абрання новага караля і шляхта выбірала каптуровы суд, часовы ваяводскі (павятовы) суд на час безкаралеўя.

Да 12 студзеня 1667 г. гараднічы і падстараста судовы гродскі менскі Марцін Казімір Валадковіч за 50 000 злотых набывае ў Крыстыны Тышкевічаўны, ваевадзянкі менскай, удавы па Вацлаву Горскаму, харужычу віленскаму, і яе трох дачок частку маетнасці Новы Двор, былой уласнасці Пятра Дарагастайскага, ваяводы смаленскага [14, арк. 125–127], а потым і Марціна Валадковіча, суддзі земскага менскага, дзеда Марціна Казіміра. Да Валадковічаў маетнасць трапіла як пасаг Дароты Дарагастайскай, ваевадзянкі смаленскай, бабулі гараднічага менскага, і праз некаторы час перайшла да іншых уладальнікаў.

Вельмі вострым было пытанне ў ВКЛ аб вяртанні збеглых. За часы вайны шмат сялян было выведзена ў якасці палона ў межы маскоўскай дзяржавы. Значная колькасць іх прыняла ўдзел і загінула ў паўстанні Багдана Хмяльніцкага і ва ўнутранай грамадзянскай вайне ў ВКЛ. Тая ж частка сялян, якая засталася на месцы, не хацела ізноў трапіць пад уладу сваіх былых гаспадароў і актыўна шукала выйсця. Аднавіць разбуранае можна было толькі шляхам жорсткай эксплуатацыі сялян, якіх проста не хапала для здзяйснення ўсіх патрэб паноў. Пакідаючы сваіх гаспадароў, сяляне імкнуліся ўладкавацца на пастаяннае жыхарства ў тыя месцы, дзе ім маглі даць на некаторы час палёгку ад выплаты розных падаткаў. Марцін Валадковіч не даваў спачыну сваім сялянам, патрабуючы ад іх працы ў значна большым памеры, чым гэта было прынята раней. Зразумела, што ад яго сяляне спрабавалі ўцякаць часцей, чым ад многіх іншых гаспадароў. 7 лютага 1661 г. у Менскім гродскім судзе слухалася справа па скарзе Валадковіча на Яна Агінскага, пісара польнага ВКЛ, маршалка ваўкавыскага, аб вяртанні збеглых з Новага Двара, якія знайшлі прытулак у маетнасцях пісара [24, арк. 525–526]. Паводле судовых нормаў ВКЛ, самому судоваму ўрадніку не дазвалялася прымаць удзел у працы суда пры разглядзе тых спраў, якія мелі дачыненне асабіста да яго. Часова на месца падстарасты судовага «быў высажаны (засядаў. — *Ф. Ч.*)» Габрыел Праўдзіч. Абарону правоў падстарасты судовага менскага праводзіў Ян Манчак, мастаўнічы менскі, адзін з найбольш выдатных юрыстаў таго часу ў Менскім ваяводстве. Судовае рашэнне было прынята на карысць Марціна Валадковіча. Толькі невядома, ці пагадзіўся сам пісар польны ВКЛ з гэтым дэкрэтам. Магчымасці ў Яна Агінскага для дасягнення перагляду судовай пастановы былі дастатковыя.

Як гараднічы менскі Марцін Казімір Валадковіч меў адносіны і да кіравання жыццём горада — павятовага і ваяводскага цэнтра. Аднак дакументы, якія б сведчылі пра яго ўдзел у будаўніцтве і добраўпарадкаванні Менска, не захаваліся. 30 жніўня 1680 г. ён уносіць у акты Менскай

магдэбургіі паведамленне пра вялікі пажар, які знішчыў больш чым 200 дамоў [27, арк. 760].

Дзякуючы роднасным повязям з самымі вядомымі магнацкімі родамі ў ВКЛ, Марцін Валадковіч мог дабівацца неабходнага для яго рашэння ў судах розных узроўняў. Яго стрыечныя сёстры выйшлі замуж за прадстаўнікоў такіх родаў, як Палубінскія, Кіршэнстайны, Падбярэзскія, Дзерналовічы. Зося Канстанцыя Валадковічаўна, якая нарадзілася, на нашу думку, у шлюбе Крыштофа Валадковіча, яшчэ пісара земскага менскага, з Гальшкай Аконаўнай, уступіла ў шлюб з Аляксандрам Гілярыем з Лубна Палубінскім, маршалкам і пісарам польным ВКЛ. Яшчэ адна дачка Крыштофа Валадковіча, ужо ваяводы навагародскага, народжаная ў шлюбе з Гальшкай Масальскай, ваевадзянкай менскай, уступіла ў шлюб з Марцінам Крыспінам Кіршэнстайнам, старастам аршанскім, кашталянам трокскім, сынам Героніма, падскарбія ВКЛ. Ганна Марыя, дачка Зосі Канстанцыі Валадковічаўны Аляксандравай з Лубна Палубінскай, ваевадзянкі навагародскай, маршалковай вялікай ВКЛ, уступіла ў шлюб з князем Дамінікам Мікалаем Радзівілам, канцлерам ВКЛ з 1690 г. Яшчэ адна яе дачка, а менавіта, Ізабэла Гелена выйшла замуж за амбітнага Ежы Станіслава Сапегу, стольніка ВКЛ, старэйшага сына Казіміра Яна Сапегі, ваяводы віленскага, гетмана ВКЛ [28, арк. 1–2]. У Марціна Казіміра Валадковіча захоўваліся самыя цёплыя адносіны з Завішамі. Марцін Казімір Валадковіч на працягу многіх гадоў знаходзіўся ў вельмі прыязных адносінах з Крыштофам Станіславам Завішам, старастам судовым менскім, малодшым братам, заўчасна памерлага Яна Міхала, таксама старасты судовага менскага, уступіўшага ў шлюб з Петранэлай, дачкой Тэадора Валадковіча, пісара земскага менскага. Сучаснікі гэтых падзей сцвярджалі, што Марцін Казімір Валадковіч на працягу многіх гадоў з'яўляўся дарадчыкам старасты менскага.

Паколькі ўсім прадстаўнікам гэтых магнацкіх сямей пастаянна патрабаваліся грошы, якія яны атрымлівалі ў пісара земскага менскага, то ў рукі Валадковіча пераходзілі многія землі, якія з'яўляліся дзедзічнай уласнасцю гэтых родаў на працягу значнага часу. Толькі ад Ежы Сапегі, стольніка віленскага, і яго жонкі Ізабэлы Палубінскай у рукі Марціна Казіміра Валадковіча пасля 1693 г. перайшла маетнасць Гуя, вылучаная магнатам з Заслаўскага староства. Гэтыя землі першапачаткова былі ў заставе Тэадора Антонія Ваньковіча, стольніка і падстарасты судовага менскага [28, арк. 1–2]. Пасля шлюбу Францыска Валадковіча, пісарэвіча земскага менскага, з дачкой стольніка менскага Гуя ў якасці пасагу з дазволу стольніка віленскага спачатку часова, а потым і назаўсёды перайшла ў валоданне нашчадкаў Марціна Казіміра Валадковіча. Спадчыннікі стольніка віленскага спрабавалі сілай выбіць

Валадковічаў з трымання Гуі, але беспаспяхова. Нам невядома аб спробах Сапегаў мірным шляхам урэгуляваць пытанне: вярнуць пазыку і атрымаць у сваё валоданне гэтыя землі.

У сакавіку 1680 г. Марцін Валадковіч атрымлівае асабістае пісьмо ад караля Рэчы Паспалітай Яна III Сабескага, дзе звяртаецца ўвага гараднічага і падстарасты судовага гродскага менскага на няслушнае (не адпавядаючае праву ВКЛ) рашэнне Менскага гродскага суда [29, арк. 1007]. Справа была настолькі непрыемнай для падстарасты гродскага менскага, што ён забараніў менскім месцічам праводзіць актыкацыю каралеўскага пісьма ў актах гродскага суда. Такое рашэнне было ў цэлым недапушчальным у адносінах да каралеўскай асобы, і нам не прыходзілася сустракацца з аналагічнай з’явай. Менчукі не разгубіліся і правялі натарыяльнае сведчанне дакумента ў менскай магдэбургіі. Справу яшчэ ў мінулым годзе пачаў месціч Яўмен Пятровіч Астроўскі, лаўнік магдэбургіі менскай, і ў дадатак фактар (давераная асоба) самога караля польскага і вялікага князя літоўскага, выклікаўшы ў суд свайго былога зяця Міхала Рыгоравіча Алісіевіча. Дачка лаўніка памерла, не пакінушы дзяцей, і ў руках Алісіевіча засталася маёмасць, атрыманая некалі ў якасці пасагу. Асабліва хацелася менскаму месцічу вярнуць у сваё карыстанне дом на адной з цэнтральных вуліц Менска «коштам у некалькі тысяч пенязяў». Меў сваё меркаванне аб выкарыстанні жончынай уласнасці і Міхал Алісіевіч. Нягледзячы на вялікі кошт дома, на яго хутка знайшоўся пакупнік і справа залежала толькі ад вынікаў разгляду яе ў Менскім гродскім судзе. Ускладняла справу тое, што пакупнік не меў права набываць і валодаць маёмасцю ў межах Менска. Як заўважаецца ў каралеўскім пісьме, «ураднікі, шляхта і няверныя жыды непавінны набываць пляцы гарадскія, або дамы, праз што крыўда месцічам робіцца». На нашу думку, Міхал Алісіевіч знайшоў падыход да Валадковіча і яшчэ да пачатку разгляду справы забяспечыў атрыманне выгаднага для сябе рашэння. Верагодна, удзячнасць Алісіевіча была дастатковай, каб Валадковіч не пабаяўся выступіць супраць інтарэсаў каралеўскага фактара. Да ўсяго гэтага дадавалася і жаданне самога Марціна Казіміра Валадковіча аб набыцці дома з прылеглым пляцам у асабістую ўласнасць. Сапраўды, на судовым пасяджэнні Менскага гродскага суда Марцін Казімір Валадковіч, як піша кароль, «засудзіў» Астроўскага і пакінуў дом Алісіевічу.

Непрыемнасці не пакідалі Марціна Валадковіча і ў пачатку 1681 г. 7 лютага гэтага года кароль надае сублевацыю (прыпыненне судовага праследу) віленскім езуітам у асобе іх старэйшага Станіслава Рыбскага супраць баніцыі (судовага пакарання пазбаўленнем грамадзянскіх правоў), атрыманай ад Валадковіча [30, арк. 135]. Гэта было зроблена, нягледзячы на тое што пасля працяглых судовых спрэчак у судовых

установах княства віна віленскіх езуітаў ужо не магла быць аспрэчана. Трэба ж мець на ўвазе, што для атрымання такіх рашэнняў Марціну Валадковічу давялося выдаткаваць вельмі значную суму грошай на подкуп судовыхураднікаў і нават іх слуг.

Шмат часу адымалі ў гараднічага і падстарасты судовага гродскага менскага судовыя справы з Ганнай з Багушэвічаў Мінькоўскіх Ежынай Стэцкевічавай, харужынай менскай. Ежы Стэцкевіч, харужы менскі, і яго жонка Ганна Багушэвічаўна Міньковская мелі значныя клопаты па справе валодання Прылукамі Менскага павета з пляменнікам харужынай менскай Стэфанам Багушэвічам Міньковскім, падчашым Аршанскага павета. Дэкрэтамі Галоўнага Трыбунала ВКЛ і каралеўскага задворнага асэсарскага суда Стэцкевічы былі прысуджаны да выплаты значных сум за забойства бацькі Стэфана, якое здзейсніў брат харужага менскага. Неабходныя для правядзення судоў грашовыя сумы Стэцкевічы атрымалі ў гараднічага менскага, аддаўшы яму пад заставу маёнтак Чаркасы Менскага павета. Грошы былі выдаткаваны цалкам, але дамагчыся з іх дапамогай чаканай мэты Стэцкевічы не змаглі. У той жа час зніклі і надзеі на знаходжанне патрэбнай сумы для выкупа маетнасці з заставы. Разгляд скаргі Валадковіча на Стэцкевічаў, якія гвалтам дамагаліся вяртання сваёй уласнасці, у судах княства пачаўся задоўга да 1684 г., але асноўныя, вядомыя нам падзеі разгарнуліся менавіта ў перыяд 1684–1685 гг.

У 1685 г., ужо пасля смерці мужа, Ганна Багушэвічаўна зрабіла добра арганізаваны рэйд на Чаркасы і выбіла Марціна Валадковіча з карыстання маёнткам, не вярнуўшы пазычаных раней грошай. У канцы 1685 г. на міхайлаўскіх рочках (пасяджэннях) земскі суд Менскага ваяводства прыняў рашэнне аб безумоўнай перадачы Чаркас у карыстанне Валадковіча, да моманту вяртання пазычаных грошай і кампенсацыі панесеных ім страт [31, арк. 17]. 19 снежня 1685 г. Галоўны Трыбунал ВКЛ, а праз дзесяць дзён і каралеўскі асэсарскі суд вынеслі па скарзе Марціна Казіміра Валадковіча рашэнне аб баніцыі і вываланні (выгнанні за межы краіны) на Ганну Ежыную Стэцкевічавую, харужыну менскую. Намаганні пані харужынай менскай, прадпрынятыя ў адказ на адпаведны дэкрэт Галоўнага Трыбунала ў пачатку наступнага 1686 г., дазволілі ёй атрымаць сублевацыю (адтэрміноўку) на выкананне судовага прысуду на тэрмін у шэсць месяцаў [30, арк. 271]. 2 верасня 1686 г. працягваўся разгляд судовай справы па прыналежнасці грунтоў [32, арк. 116]. Прычым поспех у судовых справах як на вагах схіляўся то ў бок Валадковіча, то ў бок харужынай менскай. На нашу думку, судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага, некалі самая прагрэсіўная і дэмакратычная ў Еўропе, на гэты час ужо не была прыстасавана да справядлівага вырашэння спраў. Дзякуючы сістэматычнаму подкупу судовых ураднікаў гэтая спрэчка паміж Валадковічам і Стэцкевічавай,

харужынай менскай, доўжылася да пачатку XVIII ст. і спынілася толькі пасля смерці абодвух яе ўдзельнікаў.

Пасля смерці Тэадора Валадковіча, якая адбылася да 28 ліпеня 1689 г., пасада пісара земскага менскага перайшла да Марціна Казіміра Валадковіча. Пры Яне Міхалу Нарбуце, суддзі земскім Лідскага павета, трыбунальскім маршалку, на пасяджэнні Галоўнага Трыбунала 8 ліпеня 1689 г. у Менску Марцін Казімір Валадковіч, як пісар земскі і яшчэ гараднічы менскі, упершыню выконваў абавязкі трыбунальскага пісара [19, арк. 306]. На нашу думку, на элекцыйным сойміку, скліканым ваяводам менскім для абрання электаў (кандыдатаў на вакантную пасаду), у яго не было канкурэнтаў.

У адпаведнасці са Статутам ВКЛ Валадковіч адмовіўся ад тых земскіх урадаў і пасад, якія трымаў пачынаючы з 1658 г. Пасада падстарасты судовага гродскага менскага перайшла да Тэадора Антонія Ваньковіча, стольніка Менскага ваяводства. Хутчэй за ўсё крэдэнс (ліст аб прызначэнні) Крыштофам Станіславам Завішай, старастай судовым гарадавым менскім, у абавязкі якога ўваходзіла кіраўніцтва працай гродскага суда, на згаданую пасаду Ваньковіча нададзены па цэсіі (згодзе) самога Марціна Валадковіча. На такі крок Марціна Валадковіча паўплывалі яго роднасныя повязі з Ваньковічам. Другі сын былога гараднічага і падстарасты судовага гродскага менскага Францыск прыкладна ў гэты час уступіў у шлюб з Зосяй Ваньковічаўнай, дачкой стольніка менскага. Абавязкі падстарасты судовага гродскага менскага Тэадор Антоні Ваньковіч выконваў ужо на 15 сакавіка 1689 г. [33, арк. 296, 313, 315].

Прывілей на ўрад гараднічага менскага атрымаў Стэфан, старэйшы сын Марціна Казіміра Валадковіча, які ўпамінаецца як трымальнік тытула ў 1691 г. [34, арк. 312].

Цяжкія часы для краіны насталі ў канцы 90-х гадоў XVII ст. Грамадзянская вайна ў ВКЛ не абмінула ніводнага двара. Асабліва вялікія страты адчулі людзі, якія мелі цесныя повязі з Сапегамі і падтрымлівалі іх. Пасля таго як Сапегі і іх прыхільнікі вымушаны былі пакінуць краіну і схавацца ў Круляўцы, шляхта, якая перамагла ў супрацьстаянні і менавала сябе рэспубліканцамі, падвергла канфіскацыі іх маёмасць і зямельныя добры. На землі Сапегаў не прэтэндаваў толькі самы лянівы. Каб выратаваць сваю ўласнасць ад грабяжу і разбору, Сапегі і іх прыхільнікі перадавалі свае землі ў фіктыўную заставу. За кошт грашовых сродкаў з арэнды зямель, якія Сапегі атрымлівалі з ВКЛ, фінансавалася не толькі арганізацыя партызанскіх дзеянняў унутры краіны, але і забяспечваўся прымальны ўзровень іх жыцця ў Круляўцы. Асноўную ролю ў забеспячэнні грашовымі сродкамі выгнаннікаў адыгрываў да моманту атрымання каралеўскага прывілея аб амністыі Сапегам і іх

прыхільнікам у 1713 г. Мікалай Хмара, палкоўнік сапежынскіх войскаў, абаронца Быхава [35, арк. 4]. Прыхільнікаў ваяводы віленскага і гетмана ВКЛ рэспубліканцы пазбаўлялі пасад і тытулаў. Пагражала гэта і Марціну Валадковічу. У канцы 1700 г. (актыкацыя дакумента адбылася 29.01.1701) Марцін Казімір Валадковіч выракаецца ад патрымкі Сапегаў і прыносіць прысягу на вернасць рэспубліцы і Аўгусту II. Такі крок захаваў за Валадковічам пасаду пісара земскага, але даверу да яго ў рэспубліканцаў не было. Яго і не без падстаў працягвалі падазраваць у грашовай падтрымцы сапежынцаў і пільна сачылі за ім. У гэты цяжкі момант Валадковічы знаходзілі падтрымку ў Радзівілаў. На ўсе маетнасці пісара земскага і яго дзяцей былі атрыманы адпаведныя ахоўныя граматы для недапушчэння іх рабавання харугвамі, якія падтрымлівалі рэспубліканцаў. На нашу думку, пераслед з боку рэспубліканцаў пісара земскага, які дасягнуў сямідзесяцігадовага ўзросту, моцна паўплываў на яго здароўе і паспрыяў хуткай смерці.

У самы разгар міжусобнай барацьбы, а менавіта ў 1700 г., да Марціна Казіміра Валадковіча перайшла частка Буцавічаў. 20 красавіка гэтага года возны менскі Андрэй Аляхновіч па даручэнні ўладальніка Буцавічаў Стэфана Антонія Храпавіцкага, ваяводы віцебскага, правёў інтрамісію (увядзенне ў валоданне) Марціна Казіміра Валадковіча. Ваявода віцебскі пазычыў у пісара земскага менскага значную суму грошай. Грошы пазычаліся на некаторы тэрмін і не былі вернуты ні самім Храпавіцкім, ні яго нашчадкамі, і Буцавічы назаўсёды засталіся ў валоданні Валадковічаў [36, арк. 860]. Верагодна, гэта была апошняя маёмасць, набытая Марцінам Казімірам Валадковічам.

У Марціна Казіміра Валадковіча, пісара земскага менскага, нарадзілася шмат дзяцей. Толькі сыноў да сталасці дажыло сем чалавек. Амаль усе яны правялі большую частку свайго жыцця ў межах Менскага павета і аказалі вялікі ўплыў на развіццё далейшых падзей у жыцці павета. Самы старэйшы з усіх сыноў несумненна Стэфан Аляксандр, з 1689 г., пасля пераходу бацькі на пасаду пісара земскага Менскага ваяводства, гараднічы, а з 12 студзеня 1696 г. [14, арк. 85], па смерці Яна Рафала Кастравіцкага, і да канца свайго жыцця — падсудак суда земскага Менскага ваяводства. Двойчы ўступаў у шлюбныя адносіны. Першай яго жонкай, да 1692 г., стала Зося з Абрынскіх, зямянка Навагародскага ваяводства, па першым шлюбе Давыдавая Баканоўская, скарбнікавая ваўкавыская. Пасля смерці Зосі Абрынскай Стэфан Валадковіч 23 лютага 1704 г. уступае ў шлюб з Розай са Слізняў, дачкой рэферэндара ВКЛ [37, арк. 74–79]. Свой тэстамент Стэфан Валадковіч склаў 2 кастрычніка 1724 г. Пасля смерці падсудка земскага крэўныя нябожчыка перадалі 4 красавіка 1725 г. дакумент з яго апошняй воляй у Менскі гродскі суд для яго актыкацыі [38, арк. 1145–1157].

Вялікім аўтарытэтам карыстаўся ў Менскім павеце і яшчэ адзін сын Марціна Валадковіча, а менавіта Дамінік Алойзы, падстолі з 1697 г. [39, арк. 121] і стольнік менскі з 21 лістапада 1716 г. [40, арк. 883]. Дамінік Валадковіч неаднаразова выбіраўся ў склад Галоўнага Трыбунала ВКЛ, на працягу значнага часу займаў пасаду адміністратара Менскага павета па збору падаткаў. Да 1700 г. уступіў у шлюб з Тэрэзай, дачкой Адама Янішэўскага, падстолія смаленскага, які на працягу многіх гадоў выконваў абавязкі пісара гродскага Менскага ваяводства. Памёр Дамінік Алойзы Валадковіч, стольнік Менскага ваяводства, 11 жніўня 1731 г. [37, арк. 459–461].

Наступныя па ўзросце Андрэй і Якуб абралі для сябе шлях служэння богу. Андрэй Валадковіч, канонік віленскі на 10 мая 1717 г. [38, арк. 958–959], займаў пасаду плябана менскага на 31 кастрычніка 1740 г. [39, арк. 106]. Ён згадваецца ў судовых справах аб крадзяжы 15 кастрычніка 1734 г. з яго віленскай сядзібы расійскімі вайскоўцамі значнай колькасці хатніх рэчаў і каштоўнасцей [37, арк. 621] і нападзе 31 кастрычніка 1740 г. менскіх магістрацкіхураднікаў на Менскую плябанію [41, арк. 101, 106].

Якуб Валадковіч некаторы час узначальваў Полацкі езуіцкі калегіум. Апошні раз ён называецца рэктарам Полацкага калегіума ў дакуменце, складзеным 10 мая 1717 г. [38, арк. 958–959]. Пасля смерці былога рэктара Менскага калегіума Антонія Бжастоўскага Якуба Валадковіча накіроўваюць у Менск. Яшчэ 21 мая 1717 г. пасаду рэктара менскага калегіума займаў Антоні Бжастоўскі [38, арк. 963], а з пачатку 1718 г. у дакументах пачынае сустракацца імя Якуба Валадковіча як рэктара гэтай вучэльні [42, арк. 20]. Якуб Валадковіч займаў гэтую пасаду не вельмі кароткі час. Так, 17 лістапада 1725 г. пасаду рэктара Менскага калегіума займаў ужо Ян Навасельскі [43, арк. 963].

Значным уплывам сярод шляхты павета карыстаўся яшчэ адзін сын пісара земскага, а менавіта Францыск Валадковіч, які паступова набіраў палітычную вагу, уздымаючыся ўсё вышэй па лесвіцы тытулаў і пасад. З 1696 г. і па 1713 г. ён займаў пасаду гараднічага менскага. Пасля смерці Пятра Пратасовіча 11 студзеня 1713 г. атрымаў каралеўскі прывілей на тытул войскага менскага [44, арк. 564], якім карыстаўся да моманту сваёй смерці. Ёсць звесткі аб атрыманні Францыскам Валадковічам намінацыі на менскую кашталянію. Аднак каралеўскі дакумент з наданнем гэтай пасады Валадковічу нам не сустракаўся. Двойчы ўступаў у шлюб. Першы раз заключыў шлюб каля 1690 г. з вышэй згаданай Зосяй Ваньковічаўнай, дачкой Тэадора Антонія Ваньковіча і Ганны Войшнараўны. Каля 1734 г. Зося Ваньковічаўна памерла і войскі менскі ажаніўся на Петранэле Завішанцы, дачцэ ваяводы менскага Крыштофа Станіслава Завішы і Тэрэзы Розы Тышкевічаўны, крайчанкі ВКЛ

[1, s. 7]. Войскі менскі склаў тэстамент 21 красавіка 1737 г. , а выпіс з яго выдадзены сынам ужо 9 мая гэтага ж года [37, арк. 1029–1030]. Літаральна на наступны дзень пасля смерці бацькі сыны Францыска Валадковіча Міхал, стараста гаенскі, і Каспр, стараста краснасельскі, пачалі патрабаваць ад мачыхі вяртання ўсіх бацькоўскіх маёнткаў і грашовых сум, некалі перададзеных іх бацькам у карыстанне Петранэле з Завішаў.

Самы малады з сыноў пісара земскага менскага Пётр Казімір Валадковіч карыстаўся тытулам падчашага мельніцкага. Дарэчы, у многіх дакументах нават таго часу Пятра Валадковіча памылкова мянуюць падчашым Менскага ваяводства. Здаецца, пісарэвіч земскі менскі не крыўдзіўся на такую памылку і ахвотна ўжываў неналежны тытул. Да 1705 г. падчашы Мельніцкага павета ўступіў у шлюб з Феліцыянай Пацаўнай, дачкой Міхала Казіміра, на 1717 г. кашталяна Полацкага ваяводства, і Тэрэзы Баліцкай [44, арк. 106]. Як для Пятра Казіміра Валадковіча, так і для пані Феліцыяны Пацаўны гэта быў другі шлюб. Прозвішча першай жонкі падчашага мельніцкага намі не ўстаноўлена. Што ж датычыцца кашталянкі полацкай, то яна нязначны час пражыла ў шлюбе з Паўлам Міхалам Свідэрскім, стольнікам Навагародскага ваяводства [45, k. 977].

Прозвішча падчашага мельніцкага ўпамінацца ў судовых дакументах менскіх судоў пачынаючы з 1704 г. Магчыма, у яго былі непаразуменні з суседзямі і да гэтага часу, але, на жаль, дакументы за ранейшы перыяд не захаваліся. Пётр Валадковіч меў надзвычай агрэсіўны характар і пастаянна знаходзіўся ў сварках з навакольнай шляхтай. Падчашы мельніцкі не абыходзіў увагай сялян навакольнай шляхты і неаднойчы выклікаўся ў суд за вываз чужых падданых, якіх упадабаў, у свае маёнткі. Гора было тым асобам, якія аказаліся ў суседстве з падчашым мельніцкім. Клопаты з падчашым мельніцкім мелі і яго браты. Неаднойчы браты даведваліся аб нападзе слуг і падданых, на чале з самім Пятром Валадковічам, на спрэчныя землі, якія знаходзіліся ў карыстанні старэйшых братоў. Не было ніводнага года, каб у судах Менскага ваяводства і ВКЛ не разглядаліся скаргі на ўчынкі Пятра Валадковіча. Акрамя гэтага, падчашы мельніцкі шмат пазычаў, але вяртаць пазычанае забываўся. Каб не дапусціць судовага пераследу за нявернутыя пазыкі і не пакінуць яго сям'ю ў цяжкім стане, браты вярталі крэдыторам Пятра Валадковіча пазыкі апошняга са сваіх асабістых сродкаў, не забываючыся пры гэтым выпісваць брату пазыковыя лісты. Незадоўга да сваёй смерці Дамінік Валадковіч, стольнік менскі, сплаціў рэшту пазык падчашага мельніцкага [37, арк. 1021–1027]. Пасля смерці Пятра Валадковіча стольнік менскі прад'явіў нашчадкам нябожчыка ўсе яго пазыковыя лісты. Амаль уся спадчына падчашага мельніцкага, размешчаная ў

межах Менскага павета, перайшла ў рукі асноўнага крэдытора, якім з'яўляўся яго родны брат. У лепшым стане аказаўся малодшы сын Пятра Валадковіча, народжаны ў шлюбе з Феліцыянай Пацаўнай, кашталянкай Полацкага ваяводства. Уладанні Пацаўны не былі захоплены Дамінікам Валадковічам. Памёр падчашы мельніцкі да 1729 г. [46, арк. 21, 339]. Сыны характарам пайшлі ў бацьку. У 1733 г. Ігнацы Валадковіч, падчашыч мельніцкі, падчас пахавання нябожчыка ў Койданаўскім касцёле разам са сваёй чэляддзю накідваўся на прысутных, «не рэспектуючы (не захоўваючы) шляхецкага гонару паводзіў сябе» [38, арк. 34].

Адзін з сыноў пісара земскага менскага, а менавіта Ян, нарадзіўся са слабым розумам. Пры падзеле ў 1704 г. бацькоўскай спадчыны браты вырашылі вылучыць хвораму, для забеспячэння яго прыстойнага існавання, частку Каверлан у Менскім павеце. Пакуль жыў Стэфан Валадковіч, які несумненна карыстаўся вялікай пашанай як у братоў, так і ў асяроддзі навакольнай шляхты, не было прычын для хвалявання за лёс хворага чалавека. Пры ім браты па чарзе займаліся апекай Яна Валадковіча, пісарэвіча земскага менскага. Пасля смерці Стэфана Валадковіча на маёмасць, якая знаходзілася ў карыстанні хворага брата, звярнуў увагу Пётр Казімір Валадковіч. Пасля непрацяглых угавораў падчашы мельніцкі атрымаў ад Яна запіс на ўсе зямельныя добры і грашовыя сумы, пакінутыя яму старэйшымі братамі. Даведаўшыся аб такім павароце справы, Валадковічы накіравалі ў Каверланы для навядзення парадку старэйшага сына Дамініка Яна Станіслава Валадковіча, крайчага менскага, з вялікай грамадой слуг і падданых. З канца 1730-х гадоў апека перайшла ў рукі пляменнікаў, якія таксама не дазвалялі нікому крыўдзіць свайго дзядзьку. Ян Валадковіч, пісарэвіч земскі менскі, уладальнік Каверлан, памёр да 10 мая 1748 г. [47, арк. 586] і пахаваны каля касцёла менскіх бернардынаў [1, s. 8].

Шлях служэння богу абралі дзве дачкі пісара земскага менскага Тэкля і Клара. На нашу думку, часцей за ўсё крок да гэтага рабілі не самі дзяўчаты, а іх бацькі. Не жадаючы драблення сваіх зямельных добраў і змяншэння грашовых набыткаў, яны выдзялялі невялікія сумы грошай для забеспячэння прыстойнага жыцця дзяўчат у кляштары, а асноўную частку сваіх маёнткаў і наяўных грашовых сум пакідалі сынам. Цікава, што грошы, абяцаныя яшчэ бацькам пры ўступленні ў кляштар, сёстры атрымалі толькі ў 1717 г., пасля смерці маці. Браты вырашылі, нарэшце, выплаціць «законніцам кляштару св. Базыля пасаговыя сумы памерам 5 000 злотых кожнай» [38, арк. 958–959]. Пані Клара правяла сваё жыццё простай законніцай Менскага жаночага кляштару св. Базыля пры царкве святой Тройцы. Сустракаюцца згадкі аб прадстаўленні Кларай Валадковічаўнай пазык са сваіх асабістых сродкаў некаторым асобам. Зусім іншае было наканавана лёсам Тэклі Валадковічаўне, пісараўне

земскай менскай. Ужо на 1710 г. яна ўпамінаецца ў дакументах як адна са старэйшых (кіраўніц) гэтага ж жаночага кляштару [48, арк. 10]. Як старэйшая гэтага ж кляштару пані Тэкля Валадковічаўна згадваецца ў дакументах Літоўскай метрыкі яшчэ на 28 студзеня 1740 г. [49, арк. 121–130].

У лютым 1701 г. Марцін Валадковіч, прадчуваючы набліжэнне смерці, з мэтай забеспячэння прыстойнага ладу жыцця жонкі «з волі сваёй памяці, будучы хворы», уносіць у менскія земскія актавыя акты тэстыманіяльны квіт Гелене з Кастравіцкіх. У рукі жонкі перадавалася «да яе жывата» (да часу смерці) Кулакоўшчына [50, арк. 465]. Зразумела, што гэта было не адзінае наданне пісара земскага. У рукі жонкі перайшлі мураваны дом у Менску і значныя грашовыя сумы. Ёй жа пакідалася з правам дажывотнага выкарыстання і маетнасць Новы Двор Менскага павета [51, арк. 1037].

Апошні дакумент, які сведчыў аб удзеле пісара земскага менскага ў вырашэнні судовых пытанняў, складзены 14 верасня 1701 г. [32, арк. 179]. Аднак яшчэ 2 мая гэтага года Марцін Казімір Валадковіч адчуваў сябе даволі добра. У гэты дзень у Менску адбывалася вялікая падзея. Антоні Кастравіцкі, падсудкавіч менскі, дзякуючы намаганням сваіх крэўных Лукомскіх, суддзяў земскіх Віцебскага ваяводства, атрымаў каралеўскі прывілей на вельмі «пажытачны» ўрад менскага войта. Для арганізацыі яго ўрачыстага ўзыходжання на пасаду было запрошана шмат шляхты. Сярод іх аказаліся суседзі Марціна Валадковіча з Пцічы Ежы Паморскі і Якуб Таргоня-Жыдовіч, добра вядомыя ўсёй навакольнай шляхце. Яны «згодна з суседствам і лістом Антонія з Кастравіц Кастравіцкага, войта менскага, асыставалі яму ў яго пераездзе» [36, арк. 884–886]. Зразумела, што пасля ўсіх клопатаў з урачыстым узыходжаннем новага войта на пасаду шляхцічаў запрасілі ў гасподу (наёмную кватэру) Кастравіцкага на вуліцы Юр’еўскай, якую той арэндаваў у менскага рэзніка Зусмановіча, дзе госці і засядзеліся да позняга вечара. Ад’езд шаноўнай шляхты з балявання аказаўся не такім ганаровым, як прыбыццё. У натоўпе, які сабраўся вакол дома, дзе кватараваў войт, аказалася шмат слуг і падданых Марціна Валадковіча. Не паспелі Паморскі і Таргоня-Жыдовіч трывала ўсесціся на коней, як у двор Зусмановіча ўварваліся слугі і чэлядзь пісара земскага менскага і пачалі збіваць не зусім цвярозых шляхцічаў. Жыццё Паморскага і Жыдовіча выратавалі слугі Антонія Тэадора Ваньковіча, стольніка і падстарасты судовага гродскага менскага. Аднак у Жыдовіча паспелі «адабраць шапку за тры бітых талера, а ў Паморскага каштоўную шаблю». Не прыйшоў на дапамогу сваім сябрам і сам Антоні Кастравіцкі, войт менскі. У гэты час ён знаходзіўся разам з пісарам земскім менскім на Койданаўскай вуліцы і чуў, як Валадковіч «ушчуваў сваю чэлядзь, што не забіла гэтых гультаёў і пьяніц да смерці». Пацярпелыя заўважылі, што ў натоўпе

«асабліва лютавала сама пані Гелена Валадковічавая, пісаравая земская менская» і яе сыны. Справа была ў тым, што Жыдовіч і Паморскі валодалі некаторай зямельнай уласнасцю ў Пцічы. Зусім верагодна, што Марцін Валадковіч меў некаторыя надзеі на атрыманне земляў у гэтай маетнасці, чаму супраціўляліся абодва шляхціцы. Дакладна вядома, што падданыя Валадковіча з Дзегцяроўкі, вёскі непадалёку ад Новага Двара, неаднаразова перапынялі саміх шляхціцаў і іх падданых з Пцічы пры падарожжы ў Менск і жорстка збівалі, адбіраючы ўсё, што толькі можна было знайсці.

У некаторых дакументах сустракаецца сцвярджэнне аб смерці пісара земскага менскага ў канцы 1701 г. Адзіны, вядомы нам дакумент, у якім паведамляецца аб смерці Марціна Казіміра Валадковіча ў верасні 1701 г., захоўваецца ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта. У канцы гэтага года сыны пісара земскага менскага: Стэфан, падсудак, Дамінік, падстолі, Францыск, гараднічы, Ян, пісарэвіч земскі, Якуб, езуіт, і Андрэй, канонік смаленскі, правялі падзел маёмасці, якая засталася пасля смерці бацькі [52, s. 77]. Ад часу смерці пісара земскага і да атрымання каралеўскага прывілея на пустуючую пасаду яго нашчадкам прайшло каля года. Акт пасведчання на ўрад пісарства земскага Менскага ваяводства Каралю Казіміру Уніхоўскаму падпісаны каралём 10 верасня 1702 г. і ўнесены для актыкацыі 16 кастрычніка таго ж года [32, арк. 169]. Гэта наўрад ці можа тлумачыцца зацятым спаборніцтвам паміж многімі кандыдатамі за гэтую надзвычай выгодную пасаду. Хутчэй за ўсё ў кіраўніцтва краіны, ахопленай грамадзянскай вайной, не хапала часу для выканання бягучых спраў.

Канчатковы падзел бацькоўскай спадчыны дзеці пісара земскага правялі толькі 13 сакавіка 1704 г. [38, арк. 958–961]. Марцін Казімір Валадковіч, як даводзяць яго дзеці, памёр, не пакінуўшы тэстаменту, таму падзел адбываўся згодна дамоўленасці, дасягнутай у выніку складаных перамоў, што вяліся на працягу значнага часу. Дзякуючы вялікаму аўтарытэту Стэфан Валадковіч змог дабіцца згоды малодшых братоў на вырашэнне гэтай складанай справы без вынясення рознагалоссяў, якія мелі месца на разгляд у судах княства.

Пасля смерці мужа прозвішча Гелены (у некаторых выпадках Галена) з Кастравіцкіх Марцінавай Казіміравай Валадковічавай, пісаравай земскай менскай, вельмі рэдка сустракаецца ў судовых дакументах. На нашу думку, усе справы за маці вырашалі яе сыны. Здаецца, што пра яе існаванне забыліся ўсе суседзі. За перыяд з 1701 г. і па 1717 г. у нашы рукі трапіла толькі тры дакументы, датычныя пані пісаравай земскай. 23 ліпеня 1704 г. Гелена Валадковічавая перадае сваю камяніцу (мураваны дом) у Менску менскім базыльянам з умовай малення за душы яе памерлых крэўных [53, арк. 479]. 6 кастрычніка 1708 г. яна

судзіцца з Фларыянам Зубовічам, які аднойчы, сустрэўшы на дарозе войта дзехцяроўскага Яцка Мацкевіча, да паўсмерці збіў і абрабаваў небараку [51, арк. 1037]. Гучны водгук у Менскім павеце мела справа, узбуджаная 27 чэрвеня 1710 г. яе дзецьмі супраць Галімскага, капітана войск літоўскіх. Аказваецца капітану Галімскаму даручылі правесці збор падаткаў з маёнткаў, належачых менскай павятовай шляхце. На чале вайскоўцаў ён завітаў у Каверланы, частка якіх належала і пані пісаравай земскай менскай. Агледзеўшы сяло вопытным вокам, капітан зразумеў, што ў гэтай вёсцы можна добра пажывіцца. У выніку, Галімскі «на многіх падводах, пад відам пабору, звёз у сваю маетнасць усё збожжа і рухомасць». Туды ж сваім ходам адправіліся каровы, коні, валы і свінні. Рэестр шкод, нанесеных пані Гелене з Кастравіцкіх, складзены яе сынамі, налічваў некалькі старонак [54, арк. 192].

Гелена з Кастравіцкіх Марцінавая Казіміравая Валадковічавая, скарбнікаўна мсціслаўская, пісаравая земская менская, памерла ў красавіку 1717 г. Стэфан, Дамінік, Францыск, Андрэй, Ян, Якуб і Пётр Казімір хутка ўрэгулявалі ўсе пытанні, звязаныя з пераразмеркаваннем зямельных добраў і грашовых сродкаў, што знаходзіліся ў карыстанні маці. Канчатковы дакумент, складзены 21 мая гэтага ж года, унесены Стэфанам Валадковічам у земскія менскія судовыя акты для актыкацыі толькі ў канцы 1724 г. [38, арк. 948–949].

## Крыніцы і літаратура

1. Wolodkowiczowie herbu Radwan. Studium genealogiczne / oprac. A. Wolodkowicz. — Ottawa, 1978.
2. Boniecki, Adam. Herbarz Polski. — T. X. — Warszawa, 1907.
3. НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 12.
4. LMAB. — F. 18 140. — K. 128; VUB. — F. 7. — KS ZUP 1633 34. — K. 578. Са збораў А. Рахубы.
5. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. — T. 1. Wojewodztwo wileńskie XIV–XVIII wiek / red. A. Rachuba. — Warszawa, 2004.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 2001. — Т. 6. — Ч. I.
7. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 99.
8. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 3.
9. Boniecki, Adam. Herbarz Polski. — T. IX. — Warszawa, 1906.
10. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 111.
11. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 113.
12. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 34.
13. АРХ 354, 202. Са збораў А. Рахубы.
14. НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 524–1.
15. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 131.

16. Paczobut Odlanicki Jan. Pametnik Jana Wladyslawa (1640–1684). — Warszawa, 1877.
17. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 349.
18. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 461.
19. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 458.
20. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 506.
21. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 505.
22. Deputaci Trybunalu Glownego Wielkiego księstwa Litewskiego (1582–1696). Spis / red. A. Rachuba ; oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. — Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2007.
23. АВАК. — Т. III.
24. НГАБ. — Ф 1727. — Воп. 1. — Спр. 35.
25. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 4.
26. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 459.
27. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 16.
28. НГАБ. — Ф. 694. — Воп. 7. — Спр. 807.
29. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 54.
30. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 509.
31. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 378.
32. НГАБ. — Ф. 1926. — Воп. 5. — Спр. 4.
33. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 36.
34. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 520.
35. НГАБ. — Ф. 1702. — Воп. 1. — Спр. 6.
36. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 50.
37. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1.. — Спр. 10.
38. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1.. — Спр. 8.
39. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 149.
40. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 155.
41. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 107.
42. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1.. — Спр. 53.
43. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1.. — Спр. 51.
44. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 156.
45. LWIA. — SA 4727. — K. 977. Са збораў А. Рахубы.
46. НГАБ. — Ф 1727. — Воп. 1. — Спр. 41.
47. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1.. — Спр. 11.
48. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 2.
49. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 405.
50. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 19.
51. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 37.
52. VUB. — F. 187–25. Са збораў А. Рахубы.
53. НГАБ. — Ф 1727. — Воп. 1. — Спр. 4.
54. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1.. — Спр. 7.

*Г. В. Шупляк*

# Из истории создания учреждений связи в Могилевской губернии (конец XVIII – начало XX в.)

Организации и устройству учреждений связи на Могилевщине начало было положено во времена Великого Княжества Литовского. В правление великого князя Жигимонта II Августа в 1558 г. были созданы первые почтовые учреждения. Тогда же началось строительство почтовых дорог и станций (через каждые 3–7 верст), при которых открывались корчмы [7, с. 461]. В 1667 г. по Андрусовскому перемирию между Россией и Речью Посполитой устанавливалась почтовая связь. Почтовый путь пролегал от Москвы через Смоленск до местечка Мигновичи, далее через границу ВКЛ до местечка Кудзин Мстиславского воеводства, далее через Могилев и Минск на Вильню. В декабре 1707 г. прошла первая почта по тракту Борисов – Быхов, в 1798 г. построены дороги Витебск – Копысь, Быхов – Чернигов (через Гомель) [7, с. 461].

С образованием Могилевской губернии (1772 г.) в ней стали создаваться почтовые учреждения по российскому образцу. В соответствии с высочайше утвержденным докладом белорусского губернатора графа З. Г. Чернышева «О почтовом учреждении в Псковской и Могилевской губерниях» от 23 ноября 1772 г. в Могилевской губернии стали открываться почтовые учреждения [16]. Порядок открытия состоял в следующем: в каждом месте, где полагалось иметь почтовых лошадей, строился по особому плану почтовый дом, который именовался почтовый двор, в губернских городах он назывался Почт-Амт (от нем. Postamt). Если почтовый дом учреждался на дорогах, то он именовался станцией. Почтовый дом должен был состоять из почтовой конторы и места «для жилья и гостеприимства проезжающих» [16]. Почтовая контора осуществляла прием, регистрацию, отправку почты и взимание платы. В губернских городах почтовую службу возглавлял губернский почтмейстер. В городах ему подчинялись почтмейстеры, на станциях — почткомиссары [16]. Функции почтмейстера заключались в обеспечении функционирования всех почтовых учреждений в губернии, строительстве и ремонте почтовых домов, наблюдении за исправным содержанием почтовых трактов, мостов и переправ, заключении договоров на содержание почтовых домов и перевозку почты, контроль за их своевременным выполнением. Делопроизводство в почтовых конторах вели подканцелярист и копиист.

Докладом от 23 ноября 1772 г. определялось и число почтальонов в зависимости от количества почтовых лошадей: при 22 лошадях полагалось 11 человек почтальонов, при 15 — 7 человек и при 12 лошадях — шесть почтальонов [16].

В «Почтовом путеводителе» за 1777 г. сообщалось о назначении в некоторых белорусских городах почтмейстеров: Л. Равшерта (Могилев), П. Фишера (Мстиславль), Я. Пашинского (Орша), А. Горошки (Гомель), А. Альберта (Рогачев) [8, с. 553].

С учреждением в 1796 г. Белорусской губернии почтовые учреждения продолжили работу под управлением Белорусской губернской почтовой конторы, которая открыла свои действия в мае 1797 г. Возглавлял ее губернский почтмейстер, находившийся в подчинении губернского правления. С 1797 по 1801 г. в Белорусское губернское правление поступали рапорты поветовых маршалов об открытии почтовых станций на территории Белорусской губернии [52]. Иерархическая подчиненность почтовых учреждений в этот период выглядела следующим образом: главными органами являлись почтамты, непосредственно им подчинялись губернские почтмейстеры, в подчинении губернских почтмейстеров находились уездные, низшую ступень местного почтового управления составляли почтовые станции, заменившие собой прежние ямы [1]. В 1781 г. было всего три почтамта: в Санкт-Петербурге, Москве и Риге [32, с. 800, 802]. Почтовые учреждения Белорусской губернии находились в ведении Санкт-Петербургского почтамта [54]. В 1801 г. для развития и улучшения почтового сообщения главный директор почт граф Ф. В. Ростопчин в своем докладе высшему руководству обосновал необходимость открытия в достаточном количестве почтовых домов и почтовых станций, в том числе и на территории Белорусской губернии [55, л. 39].

Устройство почтовых учреждений Белорусской губернии, их содержание, правила приемки, пересылки и выдачи почтовых отправлений в целом не изменились и остались такими же, как и для почтовых учреждений Полоцкого наместничества [50, л. 1040 об.; 51; 52; 53].

Все почтовые учреждения находились в подчинении центрального административного учреждения, созданного в 1782 г. — Главного правления почтовых дел. Согласно указу Павла I от 16 апреля 1799 г. оно было переименовано в Главное почтовое правление [3, с. 174].

В соответствии с указом от 16 апреля 1799 г. почтовые конторы и почтовые экспедиции учреждались на основании соглашения между Главным почтовым правлением и военными и гражданскими губернаторами. В зависимости от количества населения, интенсивности переписки, наличия почтовых дорог почтовое правление учреждало почтовую контору или почтовую экспедицию [16, с. 332]. Штатами 1799 г. предусматривался следующий состав почтовой конторы: почтмейстер

---

[1] Ям — на Руси в XIII–XVIII вв. селение на почтовом тракте, жители которого несли ямскую повинность. Слово «ям» происходит от татарского «дзяма», что значит «дорога» [33, с. 800, 802].

(глава конторы), его помощник, переводчик, бухгалтер, а также нижние канцелярские чины, унтер-офицеры, почтальоны [18, с. 330]. В состав почтовой экспедиции входили почтмейстер, его помощник, он же и переводчик, почтовый экспедитор, его помощник, канцелярист, почтальоны [18, с. 330].

Указом от 7 января 1782 г. на губернские правления было возложено создание благоприятных условий для деятельности почтовых контор и строгого контроля над ними [17].

В 1822 г. в Могилевской губернии действовала Могилевская губернская почтовая контора, штат которой состоял из губернского почтмейстера, его помощника, бухгалтера, канцелярских служащих, почтальонской команды из 12 почтальонов во главе с унтер-офицером, станционных смотрителей [39, лл. 1–7]. Систему почтовой связи губернии составляли Оршанская и Шкловская городовые почтовые конторы, Белицкая, Жлобинская, Рогачевская, Сенненская городовые почтовые экспедиции, Бабиновичская, Мстиславская, Старо-Быховская, Чаусская, Чериковская и Чечерская уездные почтовые экспедиции [39, лл. 7–22].

Развитие почтового сообщения в Могилевской губернии определялось с одной стороны дорожным строительством и учреждением новых станций, с другой — совершенствованием законодательства, относящегося к почтовому делу.

8 июля 1829 г. принимается высочайшее решение об учреждении большого почтового тракта от Могилева через Бобруйск в Волынскую губернию [19].

22 октября 1830 г. были изданы указы «О новом устройстве почтовой части» и «Положение об устройстве почтовой части» [20; 21]. В соответствии с ними почтовые учреждения разделили на округа во главе с почтинспекторами, на которых возлагался надзор за деятельностью почтовых учреждений губерний, и на классы (губернские — на три, уездные дворы и станции — на четыре). В зависимости от класса утверждались штаты.

Почтовая контора города Могилева была отнесена к 6 округу с пребыванием окружного почтинспектора в г. Чернигове, приписана к первому классу [20, с. 53] со штатом в 30 человек, в их числе губернский почтмейстер, его помощник, контролер и бухгалтер, экспедиторы, письмоводитель, старшие и младшие сортировщики, унтер-офицер, почтальоны и сторожа [20, с. 35–36]. Уездные почтовые конторы 1-го класса учреждались в Шклове и Орше, 2-го класса — в Рогачеве, 3-го класса — в Белице, Быхове, Чечерске, Бабиновичах, 4-го класса — в Сенно, Мстиславле, Копыси, Черикове, Чаусах, Климовичах [20, с. 53].

На губернские почтовые конторы в лице губернского почтмейстера «Положением…» от 22 октября 1830 г. возлагалось управление всеми

уездными конторами, предоставлялось право рассматривать все обращения из подведомственных учреждений, если они не вели к изменению или ослаблению установленных правил, а также жалобы на подведомственные места [21]. В их обязанность входило также решение всех дел об ошибках, отступлениях от правил, ослушании, халатности, наложении взысканий, временное отстранение чиновников от должности в случае злоупотреблений или причинении ими ущерба на сумму более 100 руб. С упразднением губернских почтамтов (кроме столичных) на основании указа от 22 октября 1830 г. на губернских почтмейстеров возлагалось руководство учреждаемыми губернскими почтовыми конторами и непосредственное участие в приеме и отправлении корреспонденции.

В 1831 г. в Могилевкой губернии действовала губернская почтовая контора, штат которой не претерпел изменений, а также почтовые конторы: Бабиновичская, Мстиславская, Новобыховская, Оршанская, Рогачевская, Сеннинская, Старобыховская, Шкловская [40].

В 1836 г. была учреждена почтовая контора в Гомеле [22].

Почтовые округа в первоначальном виде были упразднены 1 января 1853 г. в целях сокращения расходов, а также из-за «параллельности» их функций с губернскими почтовыми конторами, сохранявшими свою самостоятельность и непосредственную подчиненность Почтовому департаменту. В каждой губернии был образован самостоятельный почтовый округ, а функции окружных почтинспекторов перешли к губернским почтмейстерам [6, с. 358].

Центральные органы управления почтовой службой на территории Российского империи, в том числе почтовыми учреждениями Могилевской губернии, менялись с течением времени.

В соответствии с именным указом от 15 июня 1865 г. было учреждено Министерство почт и телеграфов, в составе которого имелись Почтовый и Телеграфный департаменты [5, с. 91]. Указом от 9 марта 1868 г. Министерство почт и телеграфов было упразднено с передачей департаментов в состав Министерства внутренних дел, а затем восстановлено 6 августа 1880 г. [5, с. 91]. Однако уже 16 марта 1881 г. снова было ликвидировано. Почтовый и Телеграфный департаменты были вновь присоединены к Министерству внутренних дел. В результате соединения Почтового и Телеграфного департаментов 22 мая 1884 г. было образовано Главное управление почт и телеграфов, в ведении которого стали значится 35 почтово-телеграфных округов. Управление находилось в подчинении Министерства внутренних дел [4, с. 191].

В 1842 г. между Могилевом и селом Рабовичи учреждаются две новые почтовые станции в селениях Амховая и Белица [23]. 23 января 1845 г. высочайше утверждено расписание станций по шоссе от

Могилева до Бобруйска и местечка Годиловичи с указанием разрядов устраиваемых почтовых домов [24, с. 79].

27 июня 1867 г. утверждено мнение Госсовета «О преобразовании почтового управления в губерниях и новых почтовых штатах» [25]. Этим указом губернским управляющим почтовой частью предоставлялись права и обязанности бывших почтинспекторов и губернских почтмейстеров. Могилевская губернская почтовая контора на основании утвержденного нового штатного расписания была отнесена ко второму классу.

В штат конторы входили: управляющий почтовой частью, его помощник, заведующий экспедицией специального почтового дела, старший и младший помощники экспедитора, старший и младший сортировщики, экспедитор по распорядительной части и его помощник, канцелярский служащий, бухгалтер, счетный чиновник, чиновник по особым поручениям, унтер-офицер, 21 почтальон, сторожа [25, с. 569]. Уездные почтовые конторы делились на четыре класса, утверждены были также штаты почтовых отделений и станций [25, с. 571–573].

В 1869 г. почтовые учреждения имелись в следующих уездных городах Могилевской губернии: Орше, Рогачеве, Гомеле, Шклове, Черикове, Горках, Мстиславле, Быхове, Чечерске, Бабиновичах, Сенно, Чаусах, Климовичах, местечке Пропойск [11, с. 286–290; 57; 58; 59]. Почтовые отделения функционировали в Кричевске, Довске, Дубровно, Копыси [11, с. 296–298]. Прием, раздача и почтовые отправления производились также почтовыми станциями Шумовская, Крупецкая, Толочинская, Ляднянская, Погребенская, Заольшанская, Локутянская, Горбовичская и еще 19 станциями [11, с. 298–301]. Губернская почтовая контора находилась в Могилеве.

Развитие средств связи в середине XIX в. привело к появлению новых форм для передачи информации на расстояние, таких, как телеграф и телефон. Что касается Могилевской губернии, то еще в феврале 1859 г. в циркуляре Минского гражданского губернатора минскому городскому голове сообщалось об устройстве в 1859 г. по высочайшему повелению телеграфного сообщения «от Динабурга через Полоцк, Витебск до Смоленска, от Витебска через Могилев до Довска и от Ковно через Вилькомир, Вильно, Минск, Бобруйск до Могилева» [37, л. 2–3 об.].

По мере распространения телеграфных линий в губерниях открывались телеграфные станции, руководство которыми требовало взаимодействия с почтовыми учреждениями, что создало предпосылки для проведения очередной реформы в области связи. В соответствии с высочайше утвержденным мнением Государственного совета «О преобразовании местных почтовых и телеграфных учреждений» от 28 мая 1885 г. для приема и передачи почтовой и телеграфной корреспонденции в городах

и других населенных пунктах учреждались почтово-телеграфные конторы, почтово-телеграфные отделения, почтовые и телеграфные отделения [29]. Все они входили во вновь образованные почтово-телеграфные округа первого и второго разрядов [29]. В каждом округе создавалось управление, состоящее из начальника округа, его помощников, других чиновников. На основании нового указа местные конторы и отделения почтово-телеграфной, почтовой и телеграфной связи Могилевской губернии подчинялись Могилевской губернской почтово-телеграфной конторе, последняя — управлению Минского почтово-телеграфного округа, расположенного в Минске [13, с. 50–51]. Управление находилось в ведомстве Главного управления почт и телеграфов Министерства внутренних дел, созданного в мае 1884 г. Минский почтово-телеграфный округ возглавлял начальник округа. Положением от 28 мая 1885 г. ему перешли права и обязанности, ранее принадлежавшие как начальникам телеграфных округов, так и губернским управляющим почтовой частью, за исключением управления губернской почтовой конторы, которое возлагалось на непосредственного начальника [29]. В компетенцию начальника управления почтово-телеграфного округа входили вопросы открытия, преобразования и закрытия почтово-телеграфных учреждений, аренды или строительства почтовых домов и телеграфных станций, утверждение штатных расписаний, ведение послужных списков чиновников и служащих почтовых учреждений, заключение контрактов на перевозку почты, проектирование и устройство новых телеграфных линий, проведение дознания и следствия о злоупотреблениях.

Развитие телеграфной связи оказало влияние на развитие такого важного информационного ресурса, как газетное дело. В 1838–1857 гг. в губерниях, в том числе в Могилевской, появились местные газеты, так называемые губернские ведомости. Для быстроты приема и распространения информации в редакциях газет были созданы свои телеграфные отделения, которые привели затем к созданию первого российского информационного телеграфного агенства [9, с. 11].

К 1890 г. в Могилевской губернии действовали следующие учреждения почтово-телеграфной связи: почтово-телеграфные конторы: Могилевская, Гомельская [45], Оршанская, Шкловская, Рогачевская, Горы-Горецкая [44], Чериковская [41], Мстиславская, Быховская, Сенненская, Дубровенская, Климовичская и Кричевская; почтово-телеграфные отделения: Чаусское, Пропойское, Ветковское, Копысское, Ляднянское, Хиславичское, Бобрское, Чечерское, Костюковичское, Краснопольское, Любавичское, Руднянское, Добрушское, Кохановское, Толочинское и Смольянское; почтовые отделения: Белыничское, Монастырщинское, Ряснянское, Петровичское, Шамовское и Кормянское, а также 29 почтовых станций и 9 почтовых ящиков в Могилеве [12, с. 192–193].

Почтово-телеграфные конторы и отделения, почтовые конторы и телеграфные станции Могилевской губернии осуществляли прием, пересылку, передачу и доставку по установленной таксе адресатам почтовой и телеграфной корреспонденции, ценностей [2]. В подчинении начальников, возглавлявших почтово-телеграфные конторы и отделения, состоял штат почтовых и телеграфных служащих: сортировщики корреспонденции, почтальоны, телеграфисты [29, с. 113]. Положение от 28 мая 1885 г. оговаривало допуск женщин к исполнению обязанностей телеграфистов [29]. Начальники почтово-телеграфных отделений подчинялись начальникам почтово-телеграфных контор, а последние управлению почтово-телеграфного округа.

Работу телеграфа как органа связи, его взаимоотношения с ведомствами и частными лицами, порядок назначения и обязанности должностных лиц регламентировал «Устав телеграфный» 1876 г. [35].

Телеграфные станции Могилевской губернии вошли в изданные в 1886 г. «Правила для руководства при пользовании правительственными проводами телеграфной сети империи с приложением расписания проводов и алфавитного списка телеграфных станций» [33, с. 117–118].

К 1916 г. почтово-телеграфная связь Могилевской губернии состояла из почтово-телеграфных контор, почтово-телеграфных отделений, почтовых отделений. Главная почтово-телеграфная контора находилась в Могилеве. Ее штат состоял из начальника, его помощника, почтово-телеграфных чиновников 1–4 разрядов, механиков. Она также включала телефонную сеть, которой заведовал старший механик [15, с. 28]. Могилевская почтово-телеграфная контора по-прежнему подчинялась Управлению Минского почтово-телеграфного округа. Штат управления состоял из начальника округа, его помощника, чиновника особых поручений, бухгалтера и делопроизводителя, их помощников, главного механика, механиков, врача, журналиста и архивариуса [15, с. 246]. Осуществляли почтово-телеграфную связь на территории губернии почтово-телеграфные конторы: Шкловская, Быховская, Пропойская, Гомельская, Ветковская, Горецкая, Копысская, Дубровинская, Климовичская, Костюковичская, Мстиславская, Хиславичская, Монастырщинская, Оршанская городская и вокзальная (в состав Оршанской почтово-телеграфной конторы входила телефонная сеть), Руднянская, Старотолочинская, Любавичская, Рогачевская, Жлобинская, Чечерская, Сенненская, Бобрская, Чаусская, Чериковская, Кричевская, Краснопольская, а также подчинявшиеся им почтово-телеграфные отделения и почтовые отделения [15, с. 63, 76–77, 91–92, 118, 135, 148, 165, 166, 182–183, 201, 217, 230].

---

[2] Ввиду большого количества фондов контор и отделений почтово-телеграфной связи Могилевской губернии в статье они не перечислены [37, с. 129–133].

Наряду с совершенствованием проволочного телеграфа в последней четверти XIX в. было изобретено еще одно новшество для передачи информации на расстояние — телефонная связь. В мировой практике этого времени устройство телефонных сетей, как правило, находилось в руках частных компаний. По этому пути начала развиваться организация телефонной связи и в Российской империи. Ее развитие требовало законодательного оформления. В феврале 1881 г. Комитет Министров заслушал записку министра почт и телеграфов Л. С. Макова об устройстве телефонных сообщений. По записке министра принимается решение в виде высочайше утвержденного положения Комитета Министров «Об устройстве телефонных сообщений» [26]. Ввиду новизны дела положением разрешалось осуществлять его в виде опыта на следующих основаниях. Устройство телефонных сообщений частными лицами и обществами, а также правительственными и общественными учреждениями стало возможным после принятия министром почт и телеграфов решения по проектам, утвержденным Телеграфным департаментом. На устройство телефонов в пределах одного здания особого разрешения не требовалось [26].

25 сентября 1881 г. утверждено новое положение «Об устройстве городских телефонных сообщений» [27]. В соответствии с ним право на устройство и содержание городских телефонных линий общего пользования предоставлялось исключительно частным предпринимателям по выбору министра внутренних дел и по контрактам, заключенным с Телеграфным департаментом. Работы по устройству сети производились на средства частной стороны и по проекту, утвержденному Телеграфным департаментом. Частная сторона имела право на эксплуатацию телефонной сети в течение 20 лет со дня заключения контракта и сохраняла это право в течение всего срока при условии полной исправности сети. Правительство имело возможность приобретения телефонной сети в собственность, но не ранее, как по истечении семи лет после ее эксплуатации. Оно также оставляло за собой право прекратить действие телефонов в некоторых населенных пунктах или во всей сети [27].

16 ноября 1884 г. принято положение «О производстве опыта устройства и эксплуатации городских телефонных сообщений распоряжением и на средства правительства» [28]. Положение устанавливало правила, в соответствии с которыми специальным распоряжением и на средства правительства производились устройство и эксплуатация городских телефонных сообщений. В соответствии с положением к устройству телефонной связи можно было приступать по мере ассигнования Главному управлению почт и телеграфов необходимых денежных средств, но не прежде как будут получены заявления о желании пользоваться телефонным сообщением в каждом городе не менее чем от 50 лиц или

учреждений, и внесении вперед пятидесятипроцентной платы, причитающейся за пользование телефоном [28].

21 мая 1900 г. утверждены «Основные правила на передачу права эксплуатации пяти телефонных сетей в городах: Санкт-Петербурге, Москве, Варшаве, Одессе и Риге частным предпринимателям» [30]. 11 мая 1901 г. принимается еще один документ — высочайше утвержденные «Основные условия на устройство и эксплуатацию телефонов частными предпринимателями» [31].

В городах Могилевской губернии начало развития телефонной связи относится к 80–90 гг. XIX в. и связано с инициативой частных лиц и органов местного городского управления.

В 1882 г. князь Паскевич, купец Леккерт и почтосодержатель Могилевской станции Андреев, проживавшие в Могилеве, ходатайствовали об устройстве телефонных линий в своем городе [10].

12 мая 1903 г. Могилевская городская дума принимает постановление об удовлетворении ходатайства городского общественного управления о разрешении устройства местной телефонной сети. Расходы по устройству и эксплуатации телефонной сети городские власти брали на себя [38, л. 50 об.].

К 1904 г. относится открытие телефонной сети в Могилеве [14, с. 38]. Телефонная связь работала круглосуточно. Организационно она подчинялась начальнику Могилевской губернской почтово-телеграфной конторы и находилась в ее здании. В марте 1912 г. в здании почты Могилева установили первый телефонный аппарат, которым мог воспользоваться «всякий желающий» (т. е. таксофон). Плата составляла 15 копеек за двухминутный разговор [10].

В 1899–1903 гг. проект и смета на устройство правительственной телефонной сети разрабатывались в г. Гомеле [49]. Сеть начала работу между 1903–1909 гг. Годовая плата за устройство и пользование телефоном в 1910 г. составляла в Гомеле 49 руб. 50 коп. В городе насчитывалось 295 абонентов. Длина телефонных линий составляла 303 версты [2, с. 14].

В 1913 г. действовала Оршанская правительственная телефонная сеть [43]. Список абонентов Оршанской телефонной сети на 1 января 1914 г. включал 308 номеров, составленных в алфавитном порядке наименований учреждений, предприятий, профессий и фамилий. В список входили также абоненты Кохановской частной телефонной компании в количестве 13 номеров, Смольянской частной телефонной компании — 6, Толочинской частной телефонной компании — 11, Станиславовской — 12 [42, л. 8, 10–19 об.].

При пользовании телефонной связью абоненты должны были соблюдать «Условия пользования городскими правительственными

телефонными сетями», утвержденные министром внутренних дел 30 июня 1912 г. [42, л. 20–25 об.]. В соответствии с условиями плата за пользование телефонным сообщением составляла 50 руб. в год за телефонный аппарат, установленный в районе двух верст от центральной телефонной станции в частной квартире для личного или семейного пользования, и 60 руб. в год за телефонный аппарат в том же районе, установленный в помещении правительственного учреждения, торговом или промышленном здании, в помещениях банков, ресторанов, гостиниц, вокзалов, лестниц домов и т. п., где пользование телефоном могло быть коллективным. За добавление к телефонному аппарату электрического звонка, установленного в другом помещении абонента, взималась плата 5 руб. в год, за добавление к телефонному аппарату второго слухового прибора (телефона) — 3 руб. в год [42, л. 23].

В 1914 г. телефонное обслуживание в Орше осуществляли одна центральная станция и два переговорных пункта с телефонами-автоматами. Личный состав Оршанской телефонной сети состоял из заведующего сетью (младшего механика), надсмотрщика (чиновника 5-го разряда), занятого на линиях, трех чиновников 6-го разряда, из которых двое работали по вольному найму, четырех телефонисток на станциях и сторожа [47, л. 164 об.]. Сеть обслуживали 2 коммутатора и 208 телефонных аппаратов [47, л. 164 об.]. Оршанская правительственная телефонная сеть находилась в ведении Минского почтово-телеграфного округа.

Летом 1914 г. обстоятельства военного времени обусловили необходимость срочного установления телефонной линии Сенно — Орша путем присоединения линии к Оршанской городской правительственной телефонной станции [46, л. 38–38 об.].

В 1915 г. по междугороднему телефону Орша была связана с узловыми станциями Сенненской земской телефонной сети: Сенно, Коковчином, Толочином, Рясно, Богушевском [48].

В 1916 г. телефонная часть входила в штатное расписание Могилевской губернской почтово-телеграфной конторы и Оршанской уездной почтово- телеграфной конторы [15, с. 28, 166].

Летом 1916 г. возникла необходимость срочно осуществить телефонную связь Петрограда со ставкой главнокомандующего западным фронтом, расположенной в Могилеве. При проведении связи был использован новый технический метод, который позволил установить соединение нормальной слышимости по проводам на расстоянии 750 км [1]. Этим было положено начало развитию в российском государстве междугородной телефонной связи на большие расстояния.

Телефонная связь находилась в ведении Главного управления почт и телеграфов, созданного в мае 1884 г. Оно в свою очередь подчинялось Министерству внутренних дел. Через управление шло ассигнование

государственных средств на развитие городских телефонных линий, оно же осуществляло контроль над развитием и совершенствованием телефонной связи [4, с. 191].

В 1912 г. в целях согласования действий различных ведомств по распространению и использованию в империи радиотелеграфных и радиотелефонных линий при Главном управлении почт и телеграфов был создан Межведомственный радиотелефонный комитет [4, с. 192].

Главное управление почт и телеграфов было ликвидировано постановлением Временного правительства от 5 мая 1917 г. и на его базе создано Министерство почт и телеграфов [34, с. 908], в ведение которого перешли учреждения почтово-телеграфной и телефонной связи.

## Источники и литература


1. Артоболевский, И. И. Очерки истории техники в России (1861–1917) : база данных [электронный ресурс] / И. И. Артоболевский, А. А. Благонравов. — Режим доступа: http://historic.ru/books/item/foo/soo/zooooo86/st052/shtml. — Дата доступа: 27.10.2010.
2. Жудро, Ф. А. Город Гомель (Могилевская губ.) : [географическо-статистический очерк] / Ф. А. Жудро, И. А. Сербов, Д. И. Довгялло — Вильна, 1911.
3. Иоффе, И. А. Главное почтовое правление // Государственность России : словарь-справочник. — Книга 1. — М., 1996.
4. Иоффе, И. А. Главное управление почт и телеграфов // Государственность России : словарь-справочник. — Книга 1. — М., 2001.
5. Иоффе, И. А. Министерство почт и телеграфов // Государственность России : словарь-справочник. — Книга 3. — М., 2001.
6. Иоффе, И. А. Почтовый округ // Государственность России : словарь-справочник. — Книга 3. — М., 2001.
7. Коласаў, Л. Пошта // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя. — Т. 2. — Мінск, 2006.
8. Коласаў, Л. Пошта // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999.
9. Міхальчанка, А. М. І верш, і эпас тэлеграфным радком… : з гісторыі інфармацыйнай службы Беларусі. — Мінск, 1993.
10. Могилевский филиал РУП «Белтелеком» : история : база данных [электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.mogilev.beltelecom.by/company/history/ — Дата доступа: 27.10.2010.
11. Памятная книжка Могилевской губернии на 1869 г. — Могилев, 1868.
12. Памятная книжка Могилевской губернии на 1890 г. — Могилев-на-Днепре, 1890.
13. Памятная книжка Могилевской губернии на 1895 г. — Могилев, 1895.
14. Памятная книжка Могилевской губернии на 1907 г. — Могилев, 1906.
15. Памятная книжка Могилевской губернии на 1916 г. — Могилев, 1916.

16. Первое собрание Полного сбора законов Российской империи (далее I ПСЗРИ). — Т. 19. — № 13911.
17. I ПСЗРИ. — Т. 21. — № 15317.
18. I ПСЗРИ. — Т. 44. Отделения III и IV. Часть вторая. Книга штатов. — № 18938.
19. II ПСЗРИ. — Т. 4. — № 2969.
20. II ПСЗРИ. — Т. 5.Отделение II. Приложения. Штаты и табели. — № 4019.
21. II ПСЗРИ. — Т. 5.Отделение II. Приложения. Штаты и табели. — № 4020.
22. II ПСЗРИ. — Т. 11. — № 8925.
23. II ПСЗРИ. — Т. 17. — № 15351.
24. II ПСЗРИ. — Т. 20. — № 18675.
25. II ПСЗРИ. — Т. 42. Отделение II. Приложения. Штаты и табели. — № 44773.
26. II ПСЗРИ. — Т. 55. — № 61921.
27. III ПСЗРИ. — Т. 1. — № 414.
28. III ПСЗРИ. — Т. 4. — № 2511.
29. III ПСЗРИ. — Т. 5. — № 2989.
30. III ПСЗРИ. — Т. 20. — № 18631.
31. III ПСЗРИ. — Т. 21. — № 20059.
32. (Автор не указан) Почта // Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. — Т. 24. — СПб., 1898. — С. 792–819.
33. Правила для руководства при пользовании правительственными проводами телеграфной сети с приложением расписания проводов и алфавитного списка телеграфных станций. — СПб., 1886.
34. Собрание узаконений и распоряжений правительства за 1917 г. — Ст. 574.
35. Устав телеграфный. — СПб., 1876.
36. Фонды Национального исторического архива Беларуси. — Мінск, 2006.
37. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). — Ф. 24 (Минская городская дума). — Оп. 1. — Д. 1116.
38. НИАБ. — Ф. 2001 (Канцелярия Могилевского гражданского губернатора). — Оп. 1. — Д. 1853.
39. НИАБ. — Ф. 2228 (Могилевская губернская почтовая контора). — Оп. 3. — Д. 1.
40. НИАБ. — Ф. 2228. — Оп. 3. — Д. 8.
41. НИАБ. — Ф. 2418 (Чериковская почтово-телеграфная контора).
42. НИАБ. — Ф. 2481 (Заведующий Оршанской телефонной сети). — Оп. 1. — Д. 1.
43. НИАБ. — Ф. 2481. — Оп. 1. — Д. 1–8.
44. НИАБ.– Ф. 2907 (Горецкая почтово-телеграфная контора).
45. НИАБ.– Ф. 2919 (Гомельская почтово-телеграфная контора).
46. НИАБ.– Ф. 2919. — Оп. 1. — Д. 3.
47. НИАБ.– Ф. 2919. — Д. 6.
48. НИАБ.– Ф. 2919. — Д. 8.

49. НИАБ.– Ф. 2919. — Д. 96.
50. НИАБ. — Ф. 3219 (Белорусское губернское правление). — Оп. 1. — Д. 2.
51. НИАБ. — Ф. 3219. — Оп. 1. — Д. 15.
52. НИАБ. — Ф. 3219. — Оп. 1. — Д. 32.
53. НИАБ. — Ф. 3219. — Оп. 1. — Д. 672.
54. НИАБ. — Ф. 3219. — Оп. 1. — Д. 683.
55. НИАБ. — Ф. 3219. — Оп. 1. — Д. 1645.
56. НИАБ. — Ф. 3262 (Быховская почтовая контора).
57. НИАБ. — Ф. 3345 (Шкловская почтовая контора).
58. НИАБ. — Ф. 3347 (Чериковская почтовая контора Минского почтово-телеграфного округа).

# Генеалогія і геральдыка

*А. І. Шаланда*

## Да пытання ўдзелу жамойтаў у бітве пад Грунвальдам 1410 г.: геральдычны аспект

Вядома, што так званае «жамойцкае пытанне» было адной з прычын Вялікай вайны 1409–1411 гг. паміж Польшчай і ВКЛ з аднаго боку і Тэўтонскім Ордэнам — з другога [3, с. 16; 4, с. 5]. Яно мае доўгую гісторыю, на якой мы не будзем падрабязна спыняцца. Заўважым толькі, што перамога пад Грунвальдам 15 ліпеня 1410 г. «жамойцкае пытанне» канчаткова не вырашыла, бо падпісаны ў Торуні ў лютым 1411 г. мірны дагавор паміж Польшчай, ВКЛ і Тэўтонскім Ордэнам перадаваў Жамойць пад уладу Вітаўту толькі на час яго жыцця. У сваім паведамленні мы спынімся толькі на пытанні ўдзелу жамойтаў у бітве пад Грунвальдам 15 ліпеня 1410 г.



Удзел жамойтаў у Грунвальдскай бітве ў даследчыкаў не выклікае сумнення. Вядома, што Вітаўт загадаў ім выставіць на вайну з Тэўтонскім Ордэнам па 300 чалавек з кожнага жамойцкага павета [14, s. 191]. Трэба думаць, што вітаўтаў староста ў Жамойці Румбольд Валімунтавіч, які з'явіўся там адразу пасля пачатку жамойцкага паўстання ў 1409 г., выканаў загад вялікага князя [14, s. 89]. Для падліку агульнай кольскасці жамойтаў, выстаўленых на вайну з Тэўтонскім Ордэнам, важным з'яўляецца адказ на пытанне: колькі было гэтых паветаў? Традыцыйна лічыцца, што іх было сем. Так, у дамове жамойтаў з Тэўтонскім Ордэнам ад 26 мая 1390 г. пералічваюцца 7 тэрытарыяльных адзінак «Жамойцкай зямлі»: Медніцкі, Кальтэніцкі, Кнетаўскі, Крожскі, Відукленскі, Расіенскі, Эйрагольскі [10, s. 282]. Польскі гісторык Стэфан Марыя Кучыньскі на гэтай падставе налічыў 2100 жамойтаў у войску ВКЛ [14, s. 191]. Але колькасць жамойцкіх

паветаў была большай, бо ў часы Вітаўта безумоўна існавалі, разам са згаданымі ў 1390 г., яшчэ тры: Бетыгольскі, Пернароўскі і Пастанігенскі [1, с. 120–121; 6, с. 202]. Усяго атрымоўваецца дзесяць.

У вядомым паведамленні Яна Длугаша пра раздачу вялікім князем літоўскім Вітаўтам 5 ліпеня 1410 г. пад Яжовым на рацэ Укра ў Мазавецкім княстве сцягоў «са знакамі» асобна вылучым адзін важны момант: харугвы з «Пагонямі» і «Калюмнамі» былі нададзены Вітаўтам новаўтвораным клінам і гуфам з канкрэтнай мэтай — ім загадвалася пільнаваць кожнаму свой знак і слухаць сваіх камандуючых: «…раздаў сорак знакаў, якія сцягамі называем, загадаўшы, каб кожная харугва і гуф свайго пільнавалі знаку і слухалі загады свайго камандуючага» [1]. З аднаго боку, гэта трэба разумець такім чынам, што раздадзеныя сцягі павінны былі выконваць у будучай бітве вайскова-распазнаўчую функцыю — вызначаць ў баі пункты збору, месца камандавання і пастою, а таксама накірункі руху атрадаў [13, s. 40; 15, s. 89]. З другога боку, Вітаўт фактычна падзяліў свае войска на дзве часткі (30 кліноў з «Пагонямі» і 10 — з «Калюмнамі»), кожная з якіх падчас бітвы павінна была выконваць сваю тактычную задачу, якая, у сваю чаргу, была вядома камандуючым кліноў і гуфаў. Гэта адвяргае думку Руслана Гагуа пра хаатычнасць дзейнасці харугваў падчас бою [5, с. 101]. Які ж быў тактычны план для войска Вітаўта? Выкажам свае меркаванні на гэты конт.

Тое, што тактычны план бітвы з крыжакамі ў Ягайлы і Вітаўта існаваў — няма ніякіх сумненняў. Інакш зусім незразумелыя мэты іх паходу на тэрыторыю Тэўтонскага Ордэна. План гэты адназначна быў наступальны, гэта значыць, што мяркуемую бітву павінна было распачаць войска саюзнікаў, прычым адначасова польская армія — на левым крыле, а армія Вітаўта — на правым. На практыцы ж палякі спазніліся, што ледзь не закончылася для саюзнікаў трагедыяй (гэты момант яскрава абыграў аўтар «Хронікі Быхаўца»). З наступальнай тактычнай схемы вынікаў і падзел Вітаўтам свайго войска на дзве часткі: 30 і 10 кліноў-харугваў. Як мы мяркуем, першая з'яўлялася ўдарнай групай, а другая — рэзервам. У этнічным плане першую складалі літоўцы, русіны і татары, пра што ёсць канкрэтныя згадкі: «Цягнуўся каля гадзіны бой, калі самыя славутыя загінулі з абодвух бакоў, літоўцы, рускія і татары, як жывёлы ў ахвяру прыносіліся» [5, с. 121]. Адсутнасць жамойтаў у гэтай рэляцыі прымушае думаць, што яны не прымалі ўдзелу ў першай фазе бою, бо складалі апошні рэзерв Вітаўта, гэта значыць, складалі тыя 10 рэзервовых кліноў-харугваў, якія стаялі пад сцягамі з «Калюмнамі».

---

[1] «…rozdał czterdzieści znaków, które proporcami (banderia) zowiemy, przykazawszy, aby każda chorągiew i hufiec swego pilnowały znaku i słuchały rozkazów swojego wodza» [17, s. 18–19].

Малюнак апошніх захаваўся ў гербоўніку з першай паловы XV ст. «Armorial Lyncenich»: на тарчы ў чырвоным полі залатыя калюмны [11]. Паўтораны ў іншым заходнім гербоўніку трохі пазнейшага часу — «Codex Bergshammar» [12]. Жамойты ў той час не мелі яшчэ свайго ўласнага зямельнага герба, а таму сцягі з уласным гербам іх гаспадара Вітаўта не павінны здзіўляць [9, с. 289]. Фактычна з Грунвальду бярэ свой пачатак асобны жамойцкі гуф у войску ВКЛ, добра вядомы па крыніцах XVI ст. [2, с. 386; 7, с. 112–113].

Дзе займалі свае пазіцыі жамойты ў агульнай пабудове правага крыла саюзнікаў — пытанне складанае. Даследчыкі вайсковай справы нават не вызначылі ў колькі ліній — дзве ці тры — было пашыхтавана войска Вітаўта [3, с. 18]. Зразумела толькі, што гэта не былі перадавыя пазіцыі. У задачу рэзерва ўваходзіла падтрымка атакі ўдарнай групы ці прыкрыццё магчымага адыходу наступаючых кліноў пры іх няўдачы. Акрамя гэтага, пры поспеху яны павінны былі замкнуць кола акружэння. Ёсць звесткі, што менавіта «паганцы» прымалі ўдзел у атачэнні рэштак войска Тэўтонскага Ордэна на заключнай стадыі бітвы [5, с. 134]. Як можна меркаваць, меліся на ўвазе літоўцы і жамойты, бо татараў звычайна ў заходніх крыніцах называлі «сарацынамі», а русінаў — «схізматыкамі». Магчыма, па ходу бітвы жамойтам прыйшлося выконваць абедзьве задачы — і закрываць прарыў крыжакоў, і атачаць рэшкі іх сіл. Відаць, пры гэтым яны панеслі значныя страты, бо параўнанне асабовага складу жамойтаў з 1390 г. з тымі, хто прымаў удзел у падпісанні Гарадзельскай уніі ў 1413 г., сведчыць, што толькі тры з іх — Гінет, Даўкша і Эвільд атрымалі польскія гербы [16, s. 102, 108, 135]. Праўда, праблема гэтая патрабуе больш глыбокага даследавання.

Такім чынам, жамойты ў Грунвальдскай бітве складалі асобны гуф з дзесяці харугваў, на сцягах якіх быў змешчаны асабісты герб Вітаўта — «Калюмны». Выкажам меркаванне, што гэта былі наступныя жамойцкія харугвы: медніцкая (варнянская), кальтэніцкая, кнетаўская, крожская, відукленская, расіенская, эйрагольская, бетыгольская, пернароўская і пастанігенская [2]. Камандаваў жамойтамі вядомы нам Румбольд Лямбэрт Валімунтавіч. Акрамя гэтага, жамойцкі гуф быў пад Грунвальдам адным з найвялікшых, бо складаўся не меней чым з 10 кліноў-харугваў агульнай колькасцю каля 3000 чалавек. У тактычным плане яны былі рэзервам вялікага князя літоўскага Вітаўта і вызначыліся ў Грунвальдскай бітве падчас атачэння крыжакоў і іх канчатковага разгрому ў фінальнай фазе пабоішча.

---

[2] Прысутнасць у войску ВКЛ медніцкай харугвы ў Віленскім гуфе, а таксама медніцкай ці варнянскай — у Жамойцкім ставіць кропку ў дыскусіі па праблеме паходжання гэтай вайсковай адзінкі [8].

## Крыніцы і літаратура


1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою коммисиею (АЗР). — Т.1 (1340–1506). — СПб., 1846. — № 103.
2. АЗР. — Т. 2–3 (1506–1544). — СПб., 1848. — № 221.
3. Бохан, Ю. Да пытання аб некаторых дыскусійных момантах Грунвальдскай бітвы 1410 года / Юрый Бохан // Беларускі гістарычны часопіс. — 2010. — № 7. — С. 15–22.
4. Гагуа, Р. Грунвальдская бітва 1410 г. / Руслан Гагуа // Беларускі гістарычны часопіс (БГЧ). — 2010. — № 7. — С. 3–14.
5. Гагуа, Р. Грюнвальд в источниках : «Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410». — Пинск, 2009.
6. Любавский, М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. — М., 1892.
7. Памятники истории Восточной Европы : источники XV–XVII вв. Радзивилловские акты из Собрания Российской национальной библиотеки : первая половина XVI в. / сост. М. М. Кром. — Т. VI. — Москва ; Варшава, 2002. — № 44.
8. Сагановіч, Г. Русіны пад Грунвальдам (Дуброўнай) у 1410 г.// Беларускі гістарычны агляд. — Т. 11. — Сш. 1–2(20–21). — С. 34–37.
9. Шаланда, А. Выява мядзьведзя ў зямельнай геральдыцы ВКЛ : ад гербу Смаленскай Русі да гербу Жамойці // Silva rerum nova : штудыі ў гонар 70-годдзя Георгія Я. Галенчанкі. — Вільня ; Мінск, 2009.
10. Daniłowicz, I. Skarbiec diplomatów papiezkich, cesarskich, krolewskich, książęcych.— Wilno, 1860. — T. I. — Nr. 583.
11. Heymowski, A. Herby polskie w brukselskim Armorial Gymnich, recte Lyncenich // Studia żródłoznawcze. — Warszawa ; Poznań, 1985. — S. 115. — Tabl. XV. — Nr. 82.
12. Heymowski, A. Herby polskie w Sztokholmskim Codex Bergshammar. — Warszawa, 1967. — S. 81. — Tabl. XII. — Nr. 8.
13. Kuczyński, S. K. Polskie herby ziemskie: geneza, treści, funkcje. — Warszawa, 1993.
14. Kuczyński, S. M. Wielka wojna z Zakonem Krzyżackim w latach 1409–1411. — Warszawa, 1955.
15. Nadolski, A. Grunwald. — Warszawa, 1993.
16. Semkowicz, W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413 // Lituano-Slavica Posnaniensia. — Poznań, 1989.
17. Jana Długosza Kanonika Krakowskiego Dzieła Wszystkie wydane staraniem A. Przezdzieckiego.— Kraków, 1869. — T. IV. Ks. XI.

*З. Л. Яцкевіч*

# Радавод Аляксандра Юношы-Гзоўскага герба «Юноша»

Біяграфія выдаўца і рэдактара газеты «Мінскі кур'ер» Аляксандра Іосіфавіча Юношы-Гзоўскага (1888 – пасля 1938) дагэтуль не знайшла шырокага асвятлення ў біяграфічных даведніках. Гэтаму шматбакова адоранаму журналісту, аўтару многіх п'ес і аповесцей, прысвечаны толькі некалькі артыкулаў пад аўтарствам В. У. Скалабана, якія пабачылі свет у 1998–2000 гг. [11; 12; 13; 14].

У дадзеным артыкуле мы звернемся да беларускага радавода Аляксандра Гзоўскага, ураджэнца Гомельскага павета Магілёўскай губерні, які традыцыйна лічыцца толькі «рускім і польскім пісьменнікам і журналістам» [11, с. 21].

Паводле звестак Адама Банецкага адзін род Гзоўскіх паходзіць з польскага паселішча Гзова (непадалёку ад Пултуска). Прадстаўнікі яго пасяліліся ў межах Гарадзенскага і Ваўкавыскага паветаў ВКЛ і карысталіся гербам «Даленга» [16, с. 66; 17].

Пры прызнанні роду Гзоўскіх герба «Юноша» ў дваранстве Расійскай імперыі ў Мінскім ДДС (11.10.1817) першым вядомым прадстаўніком называецца Станіслаў Юноша з Дзедзіч на Гзах і Лампічах Гзоўскі, які, як уладальнік маёнтка Ведзьма Наваградскага ваяводства, згадваецца падчас размежавання яго ўладання з дзяржаўным маёнтка Ляхавічы (01.07.1560). Другая звестка аб Гзоўскіх з Наваградчыны адносіцца да пачатку XVII ст., калі ў Трыбунале ВКЛ разглядалася справа адносна продажу Мікалаем Гзоўскім часткі бацькоўскага маёнтка Ведзьма што, верагодна, выклікала абурэнне ў яго роднага брата Януша з Дзедзіч Гзоўскага (16.10.1616). Аднак давесці сваё паходжанне ад гэтых асоб Гзоўскія не змаглі па прычыне знішчэння ў 1812 г. радавага архіва ў маёнтку Лесаполь Копыскага павета Магілёўскай губерні [4, арк. 22–22 адв.].

Згодна з захаванымі крыніцамі родапачынальнікам Юноша-Гзоўскіх з Менскага ваяводства выпадае лічыць Яна Гзоўскага, які ажаніўся з Магдаленай Тупальскай і на застаўным праве, атрыманым ад Пятра і Гелены з Чарняўскіх Тупальскіх, валодаў маёнткам Буралеўшчына або Гуды (29.03.1693 г.) [3, арк. 541; 4, арк. 22 адв.]. Дадзены маёнтак размяшчаўся недалёка ад Кіяўца і Падневіч, у межах сучаснага Валожынскага раёна Мінскай вобласці. З цягам часу ён перайшоў у спадчыну да сыноў Яна і Магдалены: Міхала, Антона Казіміра і Францішка [3, арк. 541]. Апошні ў шлюбе з Тэрэзай Багуфал меў двух сыноў Яна і Ігната [4, арк. 9]. У 1732 г. ён ужо не жыў і апекуном яго дзяцей і маёмасці быў брат, падчашы ваўкавыскі Антон Казімір. З гэтай нагоды на карысць

апошняга другі брат Міхал адрокся ад трэцяй часткі застаўных грошай па спадчынным маёнтку Буралеўшчына (17.06.1732) [3, арк 541 адв.]. Акрамя гэтага, Францішак, сын Яна, валодаў фальваркам Старынкі Стражоўскія, які пакінуў у спадчыну сваім сынам [3, арк. 543 адв.–544]. Ян, сын Францішка, у шлюбе з Ганнай Сушчынскай меў двух сыноў: Антона (*1765), харужага артылерыі, і Станіслава, таварыша брыгады кавалерыі Нарадовай войск Рэчы Паспалітай [3, арк. 543 адв.].

Антон Казімір, другі сын Яна, пакінуў сем сыноў: Тадэвуша, падчашага Менскага ваяводства; Францішка (пам. 1786), біскупа тэспенскага, суфрагана троцкага, каноніка смаленскага (1774), а затым віленскага (патэнт караля Станіслава Аўгуста ад 25.02.1777 г.), кавалера ордэна Св. Станіслава (патэнт караля Станіслава Аўгуста 17.10.1785 г.), які валодаў домам у Вільні; Юзафа, падчашага ваўкавыскага; Ануфрыя, каад'ютара-каноніка віленскага (прэзент караля Станіслава Аўгуста ад 01.06.1779 г.) і пробашча барысаўскага; Тэафіля, харужага гусарскага войска ВКЛ; Станіслава (пам. 1803), мастаўнічага старадубаўскага (прывілей караля Станіслава Аўгуста ад 30.06.1774 г.), гараднічага эйшышскага (21.11.1793 г. прывілей караля Станіслава Аўгуста); Тамаша (пам. 1792) [1], каморніка Менскага ваяводства, шамбяляна каралеўскага двара (прывілей караля Станіслава Аўгуста ад 7.05.1787 г.) [3, арк. 541–542, 544 адв.; 4, арк. 22 адв.; 17].

Гзоўскія прымалі актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны. Так, Тадэвуш і Юзаф з Менскага ваяводства былі на элекцыі караля Станіслава Аўгуста ў 1764 г. [17, s. 220].

Менскі каморнік Тамаш Гзоўскі набыў у Аляксандра Сапегі, канцлера ВКЛ за 96 000 злотых «у золаце галанскім» частку Чарэйскага староства ў Аршанскім павеце, а менавіта маёнткі Лясаполь ці Асінаўка (сучасны Крупскі раён Мінскай вобласці). Адбылося гэта праз генеральнага ўпаўнаважанага палкоўніка Гіяцынта Касцю 27.03.1779 г. [4, арк. 10]. У склад набытых уладанняў, якія разам атрымалі найменне маёнтка Лясаполь або Асінаўка ўваходзілі: мястэчка Прашыцы з млынамі, карчмой і інш., а таксама вёскі Ляды, Скарадзіца, Сцюдзёнка, Запуткі, Стральцы, Дубы і засценак Асінаўка [3, арк. 544; 5, арк. 28 адв.]. Паводле ўласнага тэстаменту ад 07.05.1792 г. Тамаш пакінуў іх дзецям сваіх братоў, у прыватнасці сынам Тадэвуша і Вікторыі з Глембоцкіх: Вікенцію Яну Атаназію, рэгенту, а затым падкаморыю Копыскага павета, і Станіславу, паручніку расейскіх войск [3, арк. 544 адв.–545].

---

[1] Аб Тамашы Гзоўскім падрабязней гл.: Чарняўскі, Ф. В.Ураднікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII стагоддзяў : біяграф. даведнік / Ф. В. Чарняўскі. — Вып. III : канюшыя, абозныя, крайчыя, мастаўнічыя і будаўнічыя. — Мінск, 2009. — С. 64–69.

Станіслаў, сын Тадэвуша, Гзоўскі пакінуў сыноў Казіміра Яна Адама, Станіслава Яна Мікалая, Баляслава Нічыпара. Апошні служыў у чыне калежскага рэгістратара ў Вільні і ў шлюбе з Ганнай Свянціцкай (узяты 16.05.1871) меў сына Казіміра (*24.06.1879) [3, арк. 85, 88, 131, 133]. Сур'ёзныя несупадзенні ўзроставых параметраў і адсутнасць у справе большасці выпісак з метрычных кніг ставяць пад сумнеў роднасныя сувязі паміж прадстаўнікамі дадзенай лініі. Аднак у Мінскім ДДС увага на лагічныя супярэчанні ў радаводзе, пры далучэнні да роду Казіміра Гзоўскага, звернута не была (20.02.1890) [3, арк. 133 адв.].

Асноўная спадчына Тамаша Гзоўскага перайшла да Вікенція Яна Атаназія, яго сына Францішка і ўнука Антона, які, пражыўшы жыццё ў паселішчы Ляды Копыскага павета, у шлюбе з Рэгінай Лявонавай Палашэўскай пакінуў сыноў Адама (*1811), ваеннага кантаніста Гілярыя (*1815), Клеменса-Рыгора (*1816) і Тамаша (*1816), хрышчаных у Бобрскім парафіяльным касцёле [4, арк. 38–39].

Лінія роду Юноша-Гзоўскіх, з якой паходзіць Аляксандр Гзоўскі, бярэ пачатак ад яго прадзеда Ігнацыя, земскага рэгента Віцебскага ваяводства. Падчас прызнання роду ў шляхецтве ў Мінскі ДДС бацькам Ігнацыя называецца Казімір (11.10.1827), але чыім сынам быў Казімір застаецца невядомым, што не дазваляе вызначыць месца сям'і журналіста ў радаводзе дадзенага шляхецкага роду. Выкажам асцярожную думку, што магчыма згаданы Казімір быў сынам Міхала Янавіча Гзоўскага, аднаго з трох сыноў родапачынальніка, нашчадкі якога ні ў вывадзе, ні ў радаводнай справе не згадваюцца. Сынамі Ігната былі Фартунат, Тадэвуш (Фадзей), Тодар (Фёдар) [2], Даніэль (Даніла) [4, арк. 33 адв.]. Апошні з іх у сваім шлюбным запісе называецца сынам Ігната і Барбары (з Ушакоўскіх) Гзоўскіх [6, арк. 1].

Амаль у той жа час 29.01.1828 г. Фартунат, Тадэвуш, Тодар, Даніэль Юноша-Гзоўскія гербу «Юноша» былі прызнаны ў дваранстве Магілёўскай губерні з аднясеннем да шостай часткі радаводнай кнігі. Дыплом аб гэтым быў выдадзены 21.03.1830 г. шляхцічу Клімавіцкага павета Юзафу Фартунату Гзоўскаму, пры гэтым адзначалася, што радавод змяшчае 20 чалавек у пяці каленах [9, арк. 136 адв.].

Пазней, калі Гзоўскія Мінскай губерні былі зацверджаны ўказам Сената ад 12.03.1840 г., іх сваякі з Магілёўскай губерні пачалі перапіску з Мінскім дваранскім дэпутацкім сходам з просьбай прадставіць і ім дакументы аб зацвярджэнні ў дваранстве. Сярод іх быў і Фартунат, які

---

[2] Аб Тодары Гзоўскім, дваюрадным дзеду Аляксандра Гзоўскага, падрабязней гл. публікацыю Ю. М. Снапкоўскага пад назвай «Прошение губернатору в стихах (1883 г.)» у раздзеле «Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў» цяперашняга выпуска «Архіварыуса». — *Рэд.*

падаў два прашэнні, датаваныя 11.09.1841 г. Цікава, што дзедам яны называлі ўжо не Казіміра, а Яна, сына Францішка, уладальніка фальварка Старынкі Стражоўскія [4, арк. 95–96]. На вялікі жаль, сёння бракуе дакументаў, каб даведацца, чым скончылася справа з вызначэннем паходжання Гзоўскіх, але вядома, што Юноша-Гзоўскія па Магілёўскай губерні былі зацверджаны Сенатам толькі з аднясеннем да трэцяй часткі радаводнай кнігі [1, с. 10]. Да гэтай часткі адносілі роды, якія атрымалі дваранства за дзяржаўную службу.

Паводле кніг Чэрыкаўскага касцёла 25-гадовы Даніла Ігнатавіч Гзоўскі ажаніўся з 23-гадовай Кацярынай Гарбатовіч 09.01.1841 г. [6, арк. 1]. У шлюбе яны мелі дачку Эмілію (*01.01.1842, г. Чэрыкаў), на хросце якой 06.01.1842 г. прысутнічаў яго брат Фартунат [7, арк. 1]. У 1860 г. Даніла згодна купчай крэпасці набыў маёнтак Арцёмаўка Клімавіцкага павета (цяпер вёска Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці) [10, с. 82–83]. Відавочна, што ён пераехаў туды разам з сям'ёй, таму што ў спісе прыхаджан Чэрыкаўскага касцёла за 1866 г. згадваецца толькі адна яго дачка 19-гадовая Адэлаіда [5, арк. 2 адв.]. Але праз нейкі час яна перабралася да бацькоў і была абвенчана ў мясцовым Лазовіцкім касцёле з капітанам Янам Крынскім, дваранінам Казялецкага павета Чарнігаўскай губерні (17.08.1869). Сведкам на шлюбе выступіў магчымы сваяк нявесты Уладзіслаў Гзоўскі, студэнт Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта [8, арк. 34 адв.], які ў 1864 г. скончыў Магілёўскую гімназію [2, с. 160].

У 1882 г. Даніла працягваў называцца ўладальнікам маёнтка Арцёмаўка Забялышынскай воласці Клімавіцкага павета (398 дзесяцін зямлі), які здаваў у арэнду. Акрамя гэтага, ён згадваецца як праваслаўны і ў чыне тытулярнага радцы [10, с. 82–83]. Д. І. Гзоўскі называецца гаспадаром азначанай уласнасці таксама ў 1908 г., але ўжо як каталік [15, с. 70]. Верагодна, што ў першым выпадку мела месца памылка.

Аляксандр Гзоўскі нарадзіўся 8(20) красавіка 1888 г. у Юзафа, сына Фартуната, і Людвікі (з Ланеўскіх-Воўкаў) Гзоўскіх. Адбылося гэта ў маёнтку Борхаў Гомельскага павета Магілёўскай губерні (сучасны Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці), дзе на той час, верагодна, працаваў бацька [11, с. 21]. На гэта ўскосна можа ўказваць той факт, што ў алфавітным спісе землеўладальнікаў Магілёўскай губерні за 1882 г. згаданы маёнтак значыцца як уласнасць жонкі сапраўднага стацкага радцы Антаніны Антонавай Крушэўскай. Кіраваў згаданай маёмасцю ўпраўляючы [10, с. 64–65]. У той жа час прагляд архіўных крыніц па Гомельскаму касцёлу за 1860–1890-я гг. і Рэчыцкаму касцёлу за 1880-я гг., да ліку парафіян якіх, магчыма, належалі жыхары паселішча Борхаў, не даў жаданага выніку — Гзоўскіх там няма. Верагодна, яны заставаліся парафіянамі іншага касцёлу.

Вось такім чынам выглядае на сённяшні дзень радавод Аляксандра Юношы-Гзоўскага, які пакідае пэўную колькасць загадак, што чакаюць свайго далейшага вырашэння. Аднак з праведзенага даследавання вынікае, што род Юношаў-Гзоўскіх з XVI ст. пражываў на беларускіх землях, а значыць, і беларусы маюць поўнае права лічыць Аляксандра Юношу-Гзоўскага сваім пісьменнікам і публіцыстам.

## Крыніцы і літаратура


1. Алфавитный список дворянских родов, внесенных в родословные дворянские книги. — Могилев, 1908.
2. Историческая записка Могилевской мужской гимназии : за столетний период ее существования, 1809–1909 / сост. преп. М. Созонов. — Могилев, 1909.
3. НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). — Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). — Воп. 1. — Спр. 140.
4. НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 700.
5. НГАБ. — Ф. 1781 (Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя). — Воп. 26. — Спр. 1172.
6. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 30. — Спр. 208.
7. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 30. — Спр. 210.
8. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 42. — Спр. 2.
9. НГАБ. — Ф. 2066 (Магілёўскі дваранскі дэпутацкі сход). — Воп. 1. — Спр. 4.
10. Опыт описания Могилевской губернии / под ред. А. С. Дембовецкого. — Кн. 3. — Могилев-на-Днепре, 1884.
11. Скалабан, В. Гзоўскі Аляксандр Іосіфавіч // Кантакты і дыялогі. — Мінск, 1998. — № 5. — С. 21–22.
12. Скалабан, В. Повесть Александра Гзовского «В государстве красных людоедов» как исторический источник для изучения политических репрессий в Смоленске в 1918 году // Сталинизм в российской провинции : смоленские архивные документы в прочтении зарубежных и российских историков. — Смоленск, 1999. — С. 79–83.
13. Скалабан, В. Гзоўскі Аляксандр // Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету : энцыкл. давед. — Ч. 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах. — Мінск, 2000. — С. 161.
14. Скалабан, В. В. Из Рославля — в Петербург : автобиография Александра Гзовского // Культура. Филология. Методика : сб. трудов в честь 60-летия проф. Г. С. Меркина. — Смоленск, 2000. — С. 73–79.
15. Список населенных мест Могилевской губернии за 1908 г. / издание Могилевского губернского статистического комитета; под ред. Г. П. Пожарова. — Могилев, 1910.

16. Чарняўскі, Ф. В.Ураднікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII стагоддзяў : біяграф. даведнік / Ф. В. Чарняўскі. — Вып. III : канюшыя, абозныя, крайчыя, мастаўнічыя і будаўнічыя. — Мінск, 2009.
17. Herbarz Polski. — Część I. Wiadomości historyczno-genealogiczne o rodach szlacheckich / ułożył i wydał A. Boniecki. — T. VII. — Warszawa, 1904. — S. 220–221.

# Постацi архівістаў

*А. М. Латушкін*

## Архівісты Нясвіжскага архіва Радзівілаў XVII – першай паловы XIX ст. (частка IV, літары М–Р)

**Маліноўскі Мікалай** (10.11.1799 г., в. Махнуўка Брацлаўскага пав. на Падоллі – 29.06.1865 г., г. Вільня, пахаваны на могілках па вуліцы Роса), гісторык, філолаг, архівіст. Скончыў Вінніцкую гімназію, Віленскі ўніверсітэт (паступіў у 1821 г.). Быў сябрам Таварыства філарэтаў, за што адбываў зняволенне ў турме (лістапад 1823 – красавік 1824 г.). Працаваў над дапаўненнем польскай бібліяграфіі з мэтай дапрацоўкі няскончанай работы «Гісторыя польскай літаратуры», дапамагаў К. Кантрыму, удзельнічаў у выданні часопіса «Гісторыя дабрачыннасці» («Dzieje dobroczynności») (Вільня, 1820–1824). З 1826 па 1829 г. жыў у Пецярбургу, дзе займаўся гістарычнымі і літаратурнымі даследаваннямі.

М. Маліноўскага, як таленавітага і працавітага даследчыка, знаўцу старажытнасцей адзначыў граф Л. П. Вітгенштэйн і прапанаваў яму пасаду генеральнага архівіста Пракураторыі Радзівілаўскай масы. М. Маліноўскі быў прызначаны на яе 1 лістапада 1828 г. з заробкам 600 срэбных руб. у год.

Архівіст звярнуў увагу Камісіі і Пракураторыі на небяспечны стан захавання Генеральнага архіва Пракураторыі ў Вільні (аснову яго складаў Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў, перавезены сюды ў 1818 г., які размяшчаўся ў палацы Кардыналія). Папярэднія архівісты надавалі мала ўвагі ўпарадкаванню і апісанню архіва, бо асноўнай іх задачай было забеспячэнне дакументамі бягучых патрэб Пракураторыі ў яе судовых і маёмасных справах. З-за адсутнасці строгага парадку карыстання архівам велізарная колькасць каштоўных матэрыялаў была пазычана розным асобам і не вернута. Мноства іх знікла беззваротна. Ініцыятыва пошуку і вяртання дакументаў, расследаванне асобных

спраў, звязаных з крадзяжом матэрыялаў радзівілаўскіх збораў, — заслуга М. Маліноўскага.

Падрыхтаваныя ў 1829 г. па ініцыятыве М. Маліноўскага інструкцыі аб працэдуры перадачы архіва пры змене загадчыка, правілах выдачы дакументаў, упарадкаванні і апісанні архіва мелі сур'ёзны станоўчы вынік. У працэсе рэалізацыі дадзеных метадычных нормаў удалося прадухіліць далейшыя страты, шмат дакументаў было вернута.

Намаганнямі М. Маліноўскага архіў быў упарадкаваны, падзелены на аддзелы і апісаны. Згодна з яго справаздачай, на 1 ліпеня 1830 г. цалкам было завершана фарміраванне і ўкладанне чатырох буйных аддзелаў, складзены рэестры да іх: 1) публічныя справы; 2) справы роду; 3) справы ўласнасці; 4) справы па рахунках. У памяшканні архіва быў праведзены рамонт.

Важным мерапрыемствам, закліканым забяспечыць захаванне найбольш каштоўных дакументаў альбо тых, якія найчасцей выкарыстоўваліся, быў выраб іх копій. Гэты від работ пазней замацаваўся ў архіўнай практыцы. Маса дакументаў на канец 1820-х гг. знаходзілася ў стане, блізкім да знішчэння. У сувязі з гэтым мерапрыемствы па капіяванні, што праводзіліся архівістам, набывалі найвялікшае значэнне, сталі адзінай магчымасцю іх захавання. Вялася таксама праца па рэстаўрацыі пашкоджаных актаў. Найбольшыя яе аб'ёмы выконваліся ў адносінах да аддзела № 2, які мацней пацярпеў падчас вайны 1812 г. Асноўным пашкоджаннем было знішчэнне пячатак.

Заслугай М. Маліноўскага з'яўляецца і ўдасканаленне сродкаў і форм захоўвання дакументаў. У папярэдні час матэрыялы захоўваліся ў форме звязак — «фасцыкулаў». Яны звычайна складаліся на адкрытых паліцах, дзе іх немагчыма было засцерагчы ад уздзеяння вільгаці, пылу і іншых неспрыяльных умоў. Па ўзоры лепшых еўрапейскіх архіваў М. Маліноўскі замяніў т. зв. старапольскую, фасцыкулярную сістэму захоўвання на «тэкі» — папкі, скрынкі. Паперы ў тэках, пасля іх належнага выраўноўвання пад прэсам, складаліся ў першапачатковым фармаце. Тэкі, з якіх кожная ахоплівала цэлы пададдзел, на сваіх вокладках змяшчалі спіс актаў. Захоўваліся яны ў невялікіх драўляных скрынках. Такім чынам, быў грунтоўна палепшаны пошук дакументаў, гарантавана іх захаванасць, забяспечана аператыўнасць пры эвакуацыі архіва ў выпадку пажару. Размяшчэнне яго на новым месцы патрабавала значна меншых намаганняў і часу. Як адзначае польскі даследчык гісторыі архіва, архівіст Галоўнага архіва Старажытных актаў у Варшаве Р. Янкоўскі, сляды праведзенай М. Маліноўскім маштабнай працы захаваліся і да нашых дзён у варшаўскай частцы нясвіжскага збору, аб чым сведчаць справы з тэкамі і вокладкамі XIX ст. у складзе фонду «Архіў Радзівілаў» Галоўнага архіва Старажытных актаў у Варшаве

(Dz. X, XII, XIV–XVI, XXIII). Маліноўскі здолеў прывіць апісаную вышэй методыку сваім паслядоўнікам. Уведзеная ім форма захоўвання дакументаў падтрымлівалася і пашыралася надалей. Гэты спосаб стаў прымяняцца не толькі ў Нясвіжскім архіве князёў Радзівілаў: архівіст архіва клецкага ардыната Льва Радзівіла ў Радзівілімонтах Ігнацій Лаўрыновіч у пачатку 1840-х гг. таксама выкарыстоўваў тэкі пры ўкладанні свайго архіва.

Архівіст Р. Сымановіч у 1853 г. называў час дзейнасці М. Маліноўскага «самай удалай парой для архіва». Ён, аднак, заўважыў, што перыяд знаходжання М. Маліноўскага на пасадзе быў занадта кароткі і недастатковы для грунтоўнага ўладкавання дакуметальнага збору. Праз пэўны час М. Маліноўскага прызначылі на пасаду сакратара Пракураторыі, а ў пачатку 1834 г. — яе пракуратарам, пакінуўшы, аднак, за ім і «вярхоўны нагляд» за архівам.

За плённую дзейнасць у адзначанай установе ад сям'і Вітгенштэйнаў, як адных са спадкаемцаў уладанняў Радзівілаў, Маліноўскі атрымаў у пажыццёвае валоданне фальварак.

М. Маліноўскага можна назваць гістарыёграфам Радзівілаў. Яго пяру належыць шэраг прац па гісторыі роду. Так, непасрэдным навуковым вынікам прац з матэрыяламі Нясвіжскага архіва Радзівілаў сталі даследаванні: «Лёс маёмасці Радзівілаў» («Losy fortuny Radziwiłłowskiej», выдадзена толькі часткова, яго матэрыял ва ўласным артыкуле выкарыстаў Я. Івашкевіч); даследаванне аб Янушу Радзівілу, якое, аднак, так і не ўбачыла свет. Уласны збор рукапісаў М. Маліноўскага ўтрымліваў некаторыя арыгінальныя матэрыялы і іх копіі, запазычаныя з Нясвіжскага архіва Радзівілаў (цяпер — Бібліятэка ПАН у Курніку, Польшча).

Пасля прыпынення дзейнасці Камісіі і Пракураторыі М. Маліноўскі пэўны час займаў пасаду паўнамоцнага прадстаўніка Л. П. Вітгенштэйна, пражываў у Вільні. Ён быў актыўным супрацоўнікам археалагічнай камісіі. Друкаваўся ў часопісах і газетах: «Віленскі кур'ер» («Kurier wileński»), «Віленскі веснік» («Dziennik wileński»), «Пецярбургскі штотыднёвік» («Tygodnik petersburgski»), «Варшаўская бібліятэка» («Biblioteka warszawska») і інш. Завяршыў складанне тлумачэнняў і каментарыяў, унясенне паправак да працы «Запіскі аб стаpажытнай Польшчы» («Pamiętników o dawnej Polsce», Вільня, 1847–1851 гг., у 2 т.). Падобныя дадаткі зрабіў да «Біяграфій гнезненскіх арцыбіскупаў» («Żywoty arcybiskupów gnieźnieńskich», Вільня, 1852–1860 гг.), да «Хронікі» Мацея Стрыйкоўскага (Варшава, 1846 г.), дзе напісаў змястоўную біяграфію храніста. Асобна выдаў «Крыніцы па гісторыі Польшчы» («Źródła do dziejów Polski», Вільня, 1843–1844 гг. у 2 т.). Акрамя актаў там знаходзілася шмат каментарыяў,

прадмова, два біяграфічныя паведамленні аб Гжымултоўскім і Філоне Кміце-Чарнабыльскім. М. Маліноўскім былі выбарачна патлумачаны і дапоўнены важнымі заўвагамі «Гісторыя Польскага Каралеўства і Вялікага княства Літоўскага» («Dzieje Korony Polskiej i Wielkiego księstwa Litewskiego», Вільня, 1846–1849 гг., у 3 т.), «Навуковыя і дыпламатычныя працы Станіслава Ласкага, з дадаткам справаў Яна Тарноўскага» («Stanisława Łaskiego prace naukowe i dyplomatyczne, z dodaniem dzieł Jana Tarnowskiego», Вільня, 1864 г.). Апошняе выданне выйшла з аб'ёмнай інфарматыўнай прадмовай і біяграфіяй С. Ласкага пад аўтарствам М. Маліноўскага. Адной з важнейшых арыгінальных прац пасля 1840 г. лічыцца «Гісторыя Ягелонаў у Венгрыі ў 1439–1526 гг.» («Dzieje Jagiełłonów na Węgrzech 1439–1526 гг.»), якая ўсё ж не была апублікавана. Мяркуецца, што рукапіс загінуў.

Напружаная навукова-даследчыцкая дзейнасць М. Маліноўскага адмоўна адбілася на яго здароўі. Пад канец жыцця ён амаль згубіў зрок. Вось як аб ім пісала «Усеагульная энцыклапедыя» ў 1864 г.: «Маліноўскі грунтоўны вучоны, здольны, дасканала валодаючы польскай мовай, браў удзел у кожным навуковым прадпрыемстве, якое датычылася гісторыі. Абапіраючыся на багатую крыніцазнаўчую базу, добрую памяць, надзвычай шырокія веды і любоў да працы, не адзіным ужо высока ацэненым творам узбагаціў ён айчыннае пісьменства і здабыў сабе ганаровае месца ў нашай літаратуры».

З жонкай Ганнай з Гутаў меў дачку Гелену.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 694. — Воп. 1. — Спр. 411. Інструкцыя архівістам аб вядзенні і ўпарадкаванні архіва; справаздачы архівістаў і перапіска з імі. Вопісы архіўных дакументаў, 1736–1892 гг. — арк. 3 адв., 11–16, 19–20 адв., 25–34 адв., 59–59 адв; Там жа. — Спр. 412. Вопіс архіўных дакументаў і спісы польскіх, замежных газет і часопісаў, перададзеных з Нясвіжскага архіва ў Берлін. Інвентарны вопіс Нябораўскага архіва. Частка дакладной запіскі архівістаў Шылановіча і Форстэра аб стане архіва, 1745–1904 гг., 8; 11, с.18–18 адв.; Там жа. — Спр. 438. Справаздачы аб стане Нясвіжскага архіва і аб рабоце ў ім даследчыкаў з Пецярбурга і Вільні (са звесткамі па гісторыі архіва). Справаздача аб працы бібліятэкі архіва, 1853–1886 гг. — арк. 6; Спр. 439. Дакументы аб перадачы манускрыптаў з фонду Радзівілаў у Варшаўскі архіў, 1853 г. — арк. 10–10 адв.; Спр. 7710. Свержань, маёнтак, мястэчка Мінскага пав. Інвентар маёнтку, млына, хут. Перцы, бірчак чыншу, арэндныя дамовы, інструкцыі па арэндзе, справаздачы, рапарты аб прыходзе-расходзе грашовых сум па касе парцэлянавай фабрыкі, ведамасці прыходу зерня па сельскай ссыпной краме і інш. дакументы па маёнтку і мястэчку (польск., руск. м.), 1569–1903 гг. — арк. 17.; AGAD. — AR — Dz. XXVII. — Sygn. 96. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z lat 1837–1845 гг. — S. 11–12; Там жа. — Sygn. 97. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z lat 1846–1850 гг. — S. 37–38; Archiwum Polskiej Akademii Nauk w Warszawie. — Sygn. 6, Mikołaj

Malinowski: Losy fortuny Radziwiłłowskiej, połowa XIX w.; там жа, Sygn III-83. Mianowski. List Onacewicza, XIX w.; BK. — Sygnatury 1283–1352 (Materiały M. Malinowskiego XVII–XIX w.); BN. — Rękopis 9067, część 2. Tuhan-Tauroginski B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969 r. — S. 85; Латушкін, А. М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у перыяд дзейнасці Вышэйшай радзівілаўскай камісіі (1814–1838 гг.) : гісторыя і арганізацыя архіўнай справы, стан дакументаў / А. М. Латушкін // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. — Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. — 2004. — № 2. — С. 3–9; Латушкін, А. М. Архіварыусы Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX ст. / А. М. Латушкін // Асоба ў гісторыі : гераічнае і трагічнае : матэрыялы Другой міжнар. навук.-прак. канф., прысв. памяці праф. У. У. Мелішкевіча, Брэст, 12–13 лістапада 2004 г. / Брэст. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна; рэд. А. М. Вабішэвіч [і інш.]. — Брэст, 2006. — С. 106–112; Латушкін, А. М. Маліноўскі Мікалай / А. М. Латушкін // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / склад. С. У. Жумар, М. Ф. Шумейка; навук. рэд. У. І. Адамушка, В. У. Бірукова. — Мінск, 2006. — С. 27–29; Энциклопедический словарь Брокгауза, Ефрона : в 41 т. / ред. Н. К. Арсеньев, Ф. Ф. Петрушевский. — СПб. : «Изд. общ. Ф. А. Брокгауза – И. А. Ефрона», 1890–1907. — Т. 18. — М., 1896. — С. 472; Chwalewik, E. Zbiory polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory: w 2 t. / E. Chwalewik. — Warszawa : Wyd. J. Mortkowicza, Tow. wyd., 1926–1927. — T. 2: N–Ż. — S. 9; Encyklopedyja powszechna: 18 t. — Warszawa: S. Orgelbrand, 1850–1865. — T. 17: Libelt-Marek. — 1864. — S. 867–868; Mikołaj Malinowski (Nekrolog) / M. Malinowski // Gazeta polska. — 1865. — 24 czerw. — S. 6; Encyklopedja powszechna z iliustracjami i mapami: w 20 t. — Warszawa: Wyd. MN, 1899–1903. — T. 9. — 1901. — S. 572–573; Iwaszkiewicz, J. Z dziejów wielkiej fortuny / J. Iwaszkiewicz // Biblioteka Warszawska. — 1911. — T. 4. — S. 479–501; Jankowski, R. Burzliwe losy Archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od XV w. do 1838 r. / J. Jankowski // Miscellanea historico-archivistica. — 2000. — T. 11. — S. 35–68 (S. 65–66); Malinowski, M. Losy fortuny Radziwiłłowskiej (ustęp od r. 1764 do 1804) / M. Malinowski // Kółko domowe. — 1866. — T. 6. — S. 19–23; Radziszewski, F. Wiadomość historyko-statystyczna o znakomitszych bibliotekach i archiwach publicznych i prywatnych / F. Radziszewski. — Kraków : Druk. Wł. L. Anczyca i Sp., 1875. — S. 52; Młodecki, S. Malinowski Mikołaj h. Pobóg (1799–1865) / S. Młodecki // Pol. słow. biograf. / Polska Akad. Nauk. — Kraków, 1974. — T. 19. — S. 357–358; Stolzman, M. Nigdy od ciebie miasto… Dzieje kultury wileńskiej lat międzypowstaniowych (1832–1863) / M. Stolzman. — Olsztyn : Wyd. Pojezierze Olsztyn, 1987. — S. 47–49.

**Малішэўскі Ігнат**, памочнік архівіста *Р. Сымановіча* ў 1855 г. падчас працэсу падзелу Нясвіжскага архіва паміж Радзівіламі і Вітгенштэйнамі (паводле дадзеных Р. Янкоўскага — памочнік у 1855–1856 гг.). Прадстаўляў бок ардынацыі, павінен быў капіяваць дакументы, удзельнічаў у інвентарызацыі збору. Заробак планаваўся 200 руб. срэбрам у год, аднак пры архіве прабыў, верагодна, нядоўга.

Крыніцы: НГАБ. — Спр. 438. Справаздачы аб стане Нясвіжскага архіва і аб рабоце ў ім даследчыкаў з Пецярбурга і Вільні (са звесткамі па гісторыі архіва). Справаздача аб працы бібліятэкі архіва, 1853–1886 гг. — арк. 19–20; AGAD. — Dz. XXVII. — Sygn. 98. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z lat 1851–1855 rr. — S. 79, 81; там жа, Sygn. 99. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z lat 1856–1860 rr. — S. 2–4; BN — Rękopis 9067, część 2. Tuhan-Tauroginski B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969. — S. 36; Jankowski, R. Archiwiści i instrukcje archiwalne napisane dla nich w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu / R. Jankowski // Archiwista Polski. — 2000. — № 2(18). — S. 34–40(S. 37).

**Наваселецкі**, памочнік архівіста *Я. Вэсэля* ў 1740-я гг. (згадваецца ў 1743, 1749 гг.).

*Крыніцы:* AGAD. — AR — Dz. V. — Sygn. 17177. Wessel Józef, podstarości ks. nieświeskiego i archiwarjusz archiwu nieświeżskiego, 1739–1782 rr. — S. 63–64, 86–89, 91–92, 94–96, 255–256.

**Наркевіч Ян**, у 1886–1887 гг. пры архівісце *Б. Завадскім* капіяваў дакументы для Румынскай Акадэміі навук у Бухарэсце па замове Г. Біану, прафесара і бібліятэкара той жа акадэміі.

*Крыніцы:* AGAD. — AR — Dz. XXVII. — Sygn. 102. «Gławnoje uprawlenije dziełami Jego Sijatelstwa Kniazia Antona [Wilgelma] Radziwiłła (1833–1904). Dzieło otnosiaszczejesia k wydannym iz Nieswiżskogo Archiwa kopii raznych G[ru]nu Bijanu dla Rumunskoj Akademii», 19.09.1886–24.11.1887. — S. 77, 81.

**Наркевіч-Ёдка Людвік** (1860-я – не раней 1939 гг.). Бацькі — Томаш і Тэафіла. Паходзіў з Нясвіжа. Веравызнанне — каталіцкае. Займаў пасаду захавальніка архіўных і бібліятэчных збораў Нясвіжскага замка ў 1933–1939 гг.

*Крыніцы:* AGAD. — AR — Dz. XXVII. — Sygn. 105. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z 1933 r. — S. 38–39; Sygn. 106. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z 1934–1935 rr. — S. 36–37; Sygn. 107. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z 1936 r. — S. 69; Lietuvos valstybinio istorijos archyvas (LVIA). Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (ДГАЛ). — Ф. 1280. — Оп. 1. — Д. 290. Книга прописки (домовая) Несвижского замка князя Леона Радзивилла 1936–1939 гг. — С. 1.

**Пілінскі**, у 1886–1887 гг. пры архівісце *Б. Завадскім* капіяваў дакументы для Румынскай Акадэміі навук ў Бухарэсце па замове Г. Біану, прафесара і бібліятэкара той жа акадэміі.

*Крыніцы:* AGAD. — AR — Dz. XXVII. — Sygn. 102. «Gławnoje uprawlenije dziełami Jego Sijatelstwa Kniazia Antona [Wilgelma] Radziwiłła (1833–1904). Dzieło otnosiaszczejesia k wydannym iz Nieswiżskogo Archiwa kopii raznych

G[ru]nu Bijanu dla Rumunskoj Akademii», 19.09.1886–24.11.1887. — S. 65–66, 80.

**Піражынскі,** памочнік архівіста *Я. Вэсэля* ў 1740-я – пачатку 1750-х гг. (не пазней 1750 г.?), працаваў таксама ў адноўленай Нясвіжскай друкарні.

*Крыніцы:* AGAD. — AR — Dz. V. — Sygn. 17177. Wessel Józef, podstarości ks. nieświeskiego i archiwarjusz archiwu nieświeżskiego, 1739–1782 гг. — S. 86–89, 91–92, 94–96, 255–256.

**Попель А.**, памочнік архівіста *Ф. Асіповіча* пры частцы Нясвіжскага архіва ў Варшаве, перавезенай туды падчас апякунства князёў Мацея і Міхала Гераніма Радзівілаў (1790–1804). На 11 студзеня 1794 г. архіў, размешчаны ў палацы Радзівілаў па вуліцы Кракаўскае Прадмесце, выступае ў крыніцах як ужо ўпарадкаваны, раскладзены па шафах і падрыхтаваны да апісання. Складанне інвентароў было скончана да пачатку 1795 г. Згодна з уласнай заўвагай А. Попеля, большы аб’ём працы быў выкананы ім аднаасобна.

Меў непаразуменні з загадчыкам архіва *Ф. Асіповічам*. Пры апекуну Міхалу Гераніму патрапіў у апалу, выплата заробку была спынена ў другой палове 1794 г. Па ўласных сведчаннях А. Попеля, прычынай з’явіўся яго ўдзел у паўстанні 1794 г. і праца ў рэдакцыі варшаўскай газеты, якая крытыкавала князя Міхала, што падтрымліваў прарасійскую партыю. Адыгралі сваю ролю таксама несправядлівыя скаргі на яго князю з боку *Ф. Асіповіча*. Сваю віну адмаўляў, спрабаваў апраўдацца тым, што пераканаў Мацея не вывозіць архіў з Варшавы (г. зн. дзейнічаў у інтарэсах Міхала Гераніма). Уласныя заслугі па апрацоўцы архіва характарызаваў як непамерна большыя, чым яго загадчыка: «… [Я] траціў здароўе на ўпарадкаванне гэтай махіны [архіва], я, на якога ніхто перад В(ашай) К(няскай) М(ілас)цю нічога дрэннага сказаць не можа … быў несправядліва абылганы»; «…ён [*Ф. Асіповіч*] павінен будзе прызнаць, што разбор і ўпарадкаванне архіва амаль цалкам мая заслуга, бо ўбачыць сам, В(аша) К(няская) М(ілас)ць, Дабрадзей, якія вялікія паліцы завалены дакументамі і ўпарадкаваны, а архіўныя паметкі на тых з іх, якія раней не былі апісаныя, нанесеныя маёй рукой… Бо не шмат напіша той, хто толькі ходзіць па архіву…». Верагодна дабіцца жаданага А. Попелю не ўдалося, пазнейшыя звесткі аб ім як аб архівісце адсутнічаюць.

*Крыніцы:* AGAD. — Dz. V. — Sygn. 12169. Popiel A., 1795–1798 гг. S. 1–8.

**Пул’яноўскі Багдан Іванавіч**, архівіст з 1896 г. па 15 ліпеня 1908 г. З перыядам яго дзейнасці звязаны буйныя папаўненні Нясвіжскага архіва Радзівілаў каштоўнымі матэрыяламі. Так, напрыклад, пасля рас-

продажу ў канцы XIX ст. спадчыны Л. П. Вітгенштэйна, мужа Стэфаніі Радзівіл, была вернута значная частка архіва Вітгенштэйнаў, выдзеленая з Нясвіжскага архіва ў 1860–1870-я гг. Дзякуючы намаганням познаньскага архівіста Я. Пачкоўскага (1861–1933), удзельніка ліквідацыі ў 1900 г. спадчынных уладанняў Пятра Вітгенштэйна. З архіваў апошняга ў Верках і Слуцку ў Нясвіж вярнулася больш за тысячу рукапісаў XVI–XVIII стст., сярод іх матэрыялы т. зв. «нойбургскіх» уладанняў, вялікі збор карэспандэнцыі Радзівілаў, а таксама частка архіва саміх Вітгенштэйнаў.

У 1902 г. да асноўнага архіва была далучана тая яго частка, што была вывезена з Нясвіжа ў Нябораў у канцы XVIII ст. апекуном Дамініка Геранімa Радзівіла Міхалам Геранімам Радзівілам. Князь Антоні Радзівіл выкупіў дакументы ў тагачаснага ўладальніка Няборава Пятра Міхала Радзівіла (1833–1904) за 200 000 руб. Акты ў асноўным уяўлялі дакументы з архіва Вялікага княства Літоўскага (земскія прывілеі, акты ўній ВКЛ і Каралеўства Польскага), а таксама лісты манархаў да Радзівілаў, лісты Радзівілаў, лісты чужых родаў, каралеўскія прывілеі, наданні і да т. п.

Такім чынам, перад архівістам стаяла складаная задача па сістэматызацыі новых матэрыялаў, тады як і папярэдні склад архіва быў упарадкаваны далёка не цалкам. Пул'яноўскі часткова прывёў да ладу і інвентарызаваў матэрыялы з Няборава. Гэтую частку ён спрабаваў размеркаваць паміж ужо існуючымі аддзеламі архіва, такімі, як «Пергаменты», «Лісты Радзівілаў і чужых родаў», «Прывілеі і каралеўскія наданні», якія ўжо мелі інвентары *Р. Сымановіча* і *М. Богуша-Шышкі*. Астатняя частка матэрыялаў была ўпарадкавана недастаткова ці засталася неўпарадкаванай увогуле. Яго аўтарству належаць інвентар скарбаў і рухомай маёмасці і каталог 1902 г.

Акрамя таго, з імем Б. Пул'яноўскага звязана вяртанне Радзівілам з Эрмітажу часткі іх родавых каштоўнасцей, якія засталіся ад рабаванняў Нясвіжскага замка расійскімі войскамі ў кастрычніку–снежні 1812 г. (агульнай колькасцю каля 700 прадметаў).

*Крыніцы:* AR — Dz. XXVII. — Sygn. 65. Katalog. 1902. B. Pułjanowski, bez daty, początek XX w.; BN. — Rękopis 9067, część 2. Tuhan-Taurogiński, B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969. — S. 85; Foelkersam, A. Über das fürstlich Radziwillische Familienarchiv zu Schloss Nieswiez / A. Foelkersam // Arbeiten des Ersten Baltischen Historikertages zu Riga 1908. — Riga : Kommissionsverlag von G. Löffler, 1909. — S. 315–319; Jankowski, R. Archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od 1838 R. do XX w. / J. Jankowski // Miscellanea historico-archivistica. — 2001. — T. 13. — S. 138; Zielińska, T. Archiwa Radziwiłłów i ich twórcy / T. Zielińska // Archeion. — 1978. — T. 66. — S. 119; Zielińska, T. Dziewiętnastowieczny

epilog sprawy dóbr neuburskich, niegdyś fortuny Radziwiłłów birżańskich / T. Zielińska // Krakowski Rocznik Archiwalny. — 1999. — T. 5. — S. 94–96.

**Рачынскі Антоні**, згадваецца ў літаратуры як архівіст Нясвіжскага архіва ў перыяд з 1 снежня 1895 г. да 1896 г. Іншыя звесткі аб ім адсутнічаюць.

*Крыніцы:* BN. — Rękopis 9067, część 2. Tuhan-Taurogiński, B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. — Warszawa, 1969. — S. 85.

**Рашкоўскі Ю.** (Рышкоўскі?), у 1886–1887 гг. пры архівісце *Б. Завадскім* капіяваў дакументы для Румынскай Акадэміі навук у Бухарэсце па замове Г. Біану, прафесара і бібліятэкара той жа акадэміі.

*Крыніцы:* AGAD. AR — Dz. XXVII. — Sygn. 102. «Gławnoje uprawlenije dziełami Jego Sijatelstwa Kniazia Antona [Wilgelma] Radziwiłła (1833–1904). Dzieło otnosiaszczejesia k wydannym iz Nieswiżskogo Archiwa kopii raznych G[ru]nu Bijanu dla Rumunskoj Akademii», 19.09.1886–24.11.1887. — S. 62–64, 77.

**Ромульт** (Рамульт?) **Эдвард**, памочнік архівіста з 1 лютага 1857 г. (разам з памочнікам *Бельскім*) падчас працэсу падзелу Нясвіжскага архіва паміж Радзівіламі і Вітгенштэйнамі. Заробак — 20 руб. у месяц. Згодна са звесткамі *Б. Таўрагінскага* — памочнік *Р. Сымановіча*, павінен быў капіяваць дакументы, удзельнічаць у інвентарызацыі збору.

*Крыніцы:* AGAD. — AR — AR — Dz. XXVII. — Sygn. 99. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z lat 1856–1860. — S. 4–6, 16; BN. — Rękopis 9067, część 2. Tuhan-Taurogiński B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. — Warszawa, 1969. — S. 36; Jankowski, R. Archiwiści i instrukcje archiwalne napisane dla nich w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu / R. Jankowski // Archiwista Polski. — 2000. — № 2(18). — S. 37.

**Рымашэўскі**, у 1886–1887 гг. пры архівісце *Б. Завадскім* капіяваў дакументы для Румынскай Акадэміі навук у Бухарэсце па замове Г. Біану, прафесара і бібліятэкара той жа акадэміі.

*Крыніцы:* AGAD. — AR — Dz. XXVII. — Sygn. 102. «Gławnoje uprawlenije dziełami Jego Sijatelstwa Kniazia Antona [Wilgelma] Radziwiłła (1833–1904). Dzieło otnosiaszczejesia k wydannym iz Nieswiżskogo Archiwa kopii raznych G[ru]nu Bijanu dla Rumunskoj Akademii», 19.09.1886–24.11.1887. — S. 79.

*У. В. Ляхоўскі*

## Памяці Аляксандры Гесь

17 сакавіка гэтага года не стала вядомай беларускай архівісткі і гісторыка Аляксандры Гесь. У апошні час Аляксандра Мікалаеўна цяжка хварэла, з лістапада мінулага года жыла ў родных Гусаках. Так сталася, што, акрамя сваякоў, на пахаванне здолелі прыехаць усяго толькі некалькі яе даўніх знаёмых і сяброў.

Вестка пра смерць Аляксандры Мікалаеўны застала мяне ў навуковай камандзіроўцы ў Познані. Са смерцю блізкага чалавека губляеш частку самога сябе, і ад такой страты горка і балюча. Але адначасова з душэўным смуткам успамінаецца ўсё тое незабыўна светлае, што звязвала нас на працягу амаль 17 гадоў сяброўства і творчага супрацоўніцтва. Разам з нейкімі яркімі асабістымі ўражаннямі-ўспамінамі пра гэтага прыгожага і высакароднага чалавека хацелася б у першую чаргу адзначыць заслугі даследчыцы ў галіне беларусістыкі, дзе яна валодала энцыклапедычнымі ведамі, падсумаваць яе ўнёсак ў айчынную гістарычную навуку.

Нарадзілася Аляксандра Мікалаеўна Гесь у лютым 1940 г. у вёсцы Гусакі Нясвіжскага раёна, у сялянскай сям'і. Бацька, Мікалай Аляксандравіч Гесь (1912–1945), мабілізаваны ў 1944 г. у савецкае войска, загінуў увесну 1945 г. на тэрыторыі Польшчы, таму ўвесь цяжар па вядзенні гаспадаркі і выхаванні трох непаўнагадовых дзяцей лёг на плечы маці, Дар'і Пятроўны.

Пачатковую адукацыю Аляксандра Мікалаеўна атрымала ў Казлоўскай сямігодцы. Далейшае навучанне праходзіла спачатку ў Нясвіжскай, а затым у Пінскай педагагічных вучэльнях, пасля заканчэння апошняй атрымала дыплом настаўніцы і была накіравана на працу ў адну са школ тагачаснага Давыд-Гарадоцкага раёна. Варта адзначыць, што сярод першых вучняў А. Гесь быў будучы вядомы даследчык ваеннай гісторыі Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксей Літвін.

Адчуваючы патрэбу працягу адукацыі, Аляксандра Гесь у 1962 г. паступае на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яна шмат распавядала мне пра свае студэнцкія гады, даючы характарыстыку сваім выкладчыкам, якая часцяком адрознівалася ад традыцыйнай. Так, курсавыя і дыпломную працы яна пісала пад кіраўніцтвам сумнавядомага прафесара Лаўрэнція Абэцэдарскага, і яе ацэнка гэтага чалавека не зусім супадала з выказваннямі многіх іншых гадаванцаў гістфака БДУ і сучасных даследчыкаў-гістарыёграфаў. Агульнавядома, што прафесар Абэцэдарскі спецыялізаваўся на вывучэнні беларуска-

расійскіх узаемаадносін XVI–XVIII стст., вельмі адыёзна і аднабакова асвятляючы гісторыю Беларусі. Ён нярэдка свядома фальсіфікаваў гістарычныя факты, адмаўляў нацыянальны пачатак у гісторыі беларускага народа, лічыў апошнюю неадлучнай часткай гісторыі Расіі. На думку А. Гесь, Лаўрэнцій Абэцэдарскі быў прадуктам свайго часу, які «бездакорна» выконваў загады кампартыі па ідэйнай накіраванасці беларускай гістарычнай навукі, але яго «масквафільства» было зусім не шчырым. Калі тэмай для сваёй дыпломнай працы Гесь хацела ўзяць антысавецкую дзейнасць генерала Станіслава Булак-Балаховіча, то Абэцэдарскі яе адгаварыў ад гэтага кроку, парэкамендаваўшы ўзяць іншую «больш простую тэму», сказаўшы ў прыватнай размове: «Не ўсё так проста з гэтым белым Чапаевым».

Скончыўшы БДУ ў 1967 г., Аляксандра Мікалаеўна працавала настаўніцай гісторыі, а пасля — дырэктарам у школах Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў. У 1975 г. яна пераехала ў Мінск і пачала працаваць ў Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ на пасадзе навуковага супрацоўніка. Займацца навуковымі даследаваннямі ёй давялося ў адным калектыве з вядомымі гісторыкамі — Іларыёнам Ігнаценкам, Міхаілам Касцюком, Якавам Паўлавым, Уладзімірам Міхнюком, Мікалаем Сташкевічам, Аляксеем Літвіным, Міхаілам Шумейкам, Аляксеем Каралём і інш.

Працуючы ў «гістпарце», Аляксандра Гесь актыўна ўдзельнічала ў падрыхтоўцы розных дакументальных выданняў: «Хроника важнейших событий истории КПБ» (ч. 3, Минск, 1980), «Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК» (т. 1–3, Минск, 1983–1985), «Па волі народа: З гісторыі арганізацыі БССР і стварэння КПБ» (Мінск, 1988), «К. Калиновский: из печатного и рукописного наследия» (Минск, 1988), «Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии» (ч. 1, Минск, 1990). Мала хто нават з вядомых гісторыкаў «гістпартаўскай школы» згадае сёння пра тое, што выяўленне і збор дакументаў, датычных Кастуся Каліноўскага, у тагачасным Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР у Вільні рабіла менавіта Аляксандра Мікалаеўна. Фотакопіі гэтых дакументаў дагэтуль захоўваюцца ў яе асабістым архіве. А пасля збору і выяўлення на яе плечы лягла таксама не менш сур'ёзная праца па падрыхтоўцы самой кнігі да друку.

Збіраючы для партыйных выданняў матэрыялы па гісторыі КПБ, Аляксандра Гесь захапілася тэмай беларусізацыі 1920-х гг. З 1970-х гг. яна пачала шукаць у партыйным архіве дакументы, па зацікавіўшай яе праблематыцы. Увогуле ж свядомай прыхільніцай беларушчыны Аляксандра Мікалаеўна стала яшчэ падчас навучання ў Нясвіжскай педагагічнай вучэльні, і беларуская мова заўсёды была для яе мовай

штодзённага ўжытку, хоць у сценах «гістпарта» яна і мусіла карыстацца, як і ўсе астатнія, расійскай. Насуперак рэкамендацыям «гістпартаўскага» кіраўніцтва, Гесь намагалася адмыслова ўставіць у папярэднія «балванкі» рыхтаваных дакументальных зборнікаў па гісторыі КПБ дакументы, у якіх згадвалася палітыка беларусізацыі і закраналіся пытанні аб пашырэнні ўжывання беларускай мовы ў грамадстве. Праўда, паводле яе ўспамінаў, дырэктар «гістпарта» Расціслаў Платонаў звычайна своечасова выяўляў «крамолу» і праводзіў «прафілактычную працу» з празмерна ініцыятыўнай супрацоўніцай.

Яна так і не абараніла кандыдацкай дысертацыі, без якой тады немагчыма было прабіцца ў навуковы свет. На Кірава, 45 (месца знаходжання сядзібы Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ у Мінску) панаваў «навуковы патрыярхат» — жанчыне з заходнебеларускай вёскі без падтрымкі «зверху» зрабіць у названай установе навуковую кар'еру было надзвычай цяжка. Тым больш, што паралельна даводзілася адной выхоўваць сына і даглядаць хворую маці. Аляксандра Мікалаеўна рэдагавала і вычытвала чужыя дысертацыі і манаграфіі, калі падпарадкоўваючыся вуснаму загаду начальства, а калі і па прыроднай дабрыні, саступаючы просьбам «таварышаў-калегаў», для многіх з якіх звароты ў падобных справах да яе ўваходзілі ў звычку. Навуковую ж вартасць многіх гэтых «опусаў» яна ведала не з чужых слоў.

Пасля 1991 г. адкрыліся «спецхраны» ў бібліятэках і архівах, на некаторы час знікла цэнзура і з'явілася магчымасць друкавацца. Для Аляксандры Гесь як для навукоўца гэта быў самы плённы перыяд у яе жыцці. З восені 1991 г., пасля скону Савецкага Саюза і забароны КПСС, яна перайшла на працу ў Беларускі навукова-даследчы цэнтр дакументазнаўства і рэтраінфармацыі (сучасны БелНДІДАС), які ўзнік на абломках «гістпарта», а ў 1995 г. перавялася ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ) на пасаду вядучага навуковага супрацоўніка аддзела публікацый. У гэты час яна працягвае займацца грунтоўным вывучэннем нацыянальна-культурнага жыцця Беларусі ў 1920–30-я гг., збірае і сістэматызуе дакументальныя крыніцы па гісторыі беларусізацыі 1920-х гадоў, даследуе лёсы «нацдэмаў» і нацыянал-камуністаў, рэпрэсіраваных у сталінскі час, удзельнічае ў падрыхтоўцы дакументальных зборнікаў, што выходзяць пад грыфам БелНДІДАС і НАРБ. І самае галоўнае — пачынае актыўна друкавацца сама, асвятляючы ў сваіх артыкулах дзейнасць дзеячаў беларускага Адраджэння першай паловы XX ст.

Добра памятаю першую самастойную публікацыю А. Гесь, пасля выхаду якой мы і пазнаёміліся. Тагачасны начальнік Гесь, прафесар Уладзімір Міхнюк, літаральна прымусіў яе нарэшце нешта з напрацаванага апублікаваць у перыядычным друку. У выніку ў «Настаўніцкай

газеце» 24 верасня 1994 г. з'явілася яе публікацыя пад гучнай назвай «Беларускі універсітэт павінен быць беларускім». Разам з грунтоўнай прадмовай у ёй была змешчана дакладная запіска першага і апошняга ў савецкі час беспартыйнага рэктара Белдзяржуніверсітэта Уладзіміра Пічэты на імя інспектара вышэйшых навучальных устаноў БССР Лысава, датаваная лістападам 1928 г. Гэты дакумент выразна адлюстроўваў увесь напал супрацьстаяння Пічэты і яго прыхільнікаў з камуністычнай фракцыяй універсітэта на чале з прарэктарам Самуілам Слонімам у пытанні беларусізацыі БДУ. Бальшавіцкі асяродак ва ўніверсітэце імкнуўся тады пазбавіць Пічэту пасады рэктара і згарнуць усю працу свядомых беларусаў па замацаванні выкладання ў гэтай вышэйшай школе беларусазнаўчых дысцыплін і пераводу ўсяго навучання на беларускую мову.

У 1997 г. разам з Уладзімірам Міхнюком і Мікалаем Клімовічам Аляксандра Гесь падрыхтавала кнігу «Антон Луцкевич: Материалы следственного дела НКВД БССР» (Минск, 1997). Яна была выдадзена вельмі малым тыражом, мела, аднак, вялікі рэзанас у грамадскіх колах. Згадаем і яшчэ некалькі толькі найбольш важных выданняў, ва ўкладанні якіх прыняла ўдзел Аляксандра Мікалаеўна:

- Заложники вермахта (Озаричи лагерь смерти) : документы и материалы / Die Geiseln der Wehrmacht (Osaritschi — das Todeslager) : dokumente und Belege. — Минск, 1999;
- Шкялёнак, Мікалай. Беларусь і суседзі : гістарычныя нарысы. — Беласток, 2003;
- Лёсік, Язэп. 1921–1930 : збор твораў. — Мінск, 2003;
- 1 января 1919 года : Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: документы и материалы. — Минск, 2005;
- Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах. — Мінск, 2001; 2-е выд. : Мінск, 2006.

Варта сказаць некалькі слоў пра апошнюю згаданую тут кнігу, якую мы рабілі з Аляксандрай Мікалаеўнай разам. Гэты зборнік не быў вынікам выканання нейкага планавага задання, проста галоўны рэдактар часопіса «Беларускі гістарычны агляд» Генадзь Сагановіч у свой час прапанаваў аўтару дадзенага матэрыялу сабраць часовы творчы калектыў і за некалькі месяцаў падрыхтаваць «на голым энтузіязме» дакументальны зборнік, прысвечаны Слуцкаму паўстанню 1920 г. Працаваць са мной на такіх умовах пагадзілася толькі Аляксандра Мікалаеўна. Прафесар Уладзімір Міхнюк да самага канца не верыў, што з гэтага можа атрымацца хоць штосьці грунтоўнае. Маючы на руках дакументы з архіва КДБ Беларусі, якія тычыліся ўдзельнікаў слуцкіх падзей 1920 г., знайсці новае і важнае ў іншых крыніцах ён не

спадзяваўся. Калі ж мы з А. Гесь праз пэўны час прынеслі яму больш за 150 старонак ужо набранага тэксту — арыгінальныя дакументы з беларускіх і польскіх архіваў і бібліятэк, матэрыялы з перыядычных выданняў, а таксама рэдкія ілюстрацыі і фатаграфіі, узрушаны Уладзімір Мікалаевіч адразу аддаў нам усё, што ў яго было сабрана па гэтай тэме. У выніку творчага супрацоўніцтва трох даследчыкаў і архівістаў дакументальны зборнік па гісторыі Слуцкага збройнага чыну 1920 г. убачыў свет, і кніга вытрымала ўжо два выданні. Шмат сілы было затрачана на падрыхтоўку навуковага апарату да зборніка: заўваг, каментарыяў да змешчаных дакументаў, удакладненняў біяграфічных даных па некалькіх дзясятках малавядомых дзеячаў. Усё гэта ніколі не было б зроблена на такім узроўні, каб не ахвярная і напружаная праца Аляксандры Гесь.

Было і яшчэ некалькі важных навуковых праектаў, якія мы рэалізоўвалі разам з А. Гесь. Так, нельга не ўспомніць пра нашу сумесную працу над навуковым каталогам сумеснай беларуска-расійскай музейнай выставы «Ёсць на карце месца… Грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі, 1921–1938 гг.» (Мінск, 2002). Выстава мела вялікі поспех як у Мінску (праходзіла з 27 мая па 3 ліпеня 2002 г.), так і ў Маскве (24 студзеня – 14 лютага 2003 г.), анатацыя выяўленых пры яе падрыхтоўцы раней невядомых архіўных і музейных дакументаў з беларускіх і расійскіх архіваў, музеяў і бібліятэк была цалкам пададзена ў вышэй згаданым каталогу. Для даследчыкаў антысавецкай эміграцыі міжваеннага часу выданне стала добрым павадыром для больш глыбокага даследавання ўзнятай праблемы.

Немагчыма абмінуць і той ўнёсак, які зрабіла Аляксандра Гесь для вывучэння творчай спадчыны Янкі Купалы. Менавіта яна рыхтавала тэксты ды каментарыі да апошняга, 9-га тома поўнага збору твораў класіка нацыянальнай літаратуры.

Варта распавесці пра археаграфічныя даследаванні А. Гесь апошніх гадоў, якія тычыліся выяўлення і апісання новых дакументаў з беларускіх архіваў, пра жыццё і дзейнасць Міхася Мялешкі і Палуты Бадуновай [1]. Апошняе падрыхтаванае Аляксандрай Гесь археаграфічнае даследаванне тычылася апісання і выбарачнай публікацыі дакументаў з зусім яшчэ не апрацаванага фонду Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у якім захоўваюцца матэрыялы эсэраўскага Беларускага рабочага клуба, які дзейнічаў у Мінску ў 1920–1923 гг. [2].

Акрамя ўсяго іншага, Аляксандра Гесь была таленавітым папулярызатарам нашай найноўшай гісторыі. Можна прывесці шмат падрыхтаваных ёю навукова-публіцыстычных артыкулаў, надрукаваных у розных выданнях, часцей за ўсё на старонках часопіса «Спадчына». Па сваёй тэматыцы гэта былі матэрыялы, якія асвятлялі пытанні правядзення

беларусізацыі ў БССР у 1920-я гг., а таксама праблемы «ўзбуйнення» тэрыторыі рэспублікі за кошт вяртання ёй раней адабраных Расіяй беларускіх этнічных тэрыторый на ўсходзе [3]. Адна з публікацый была прысвечана лёсу дарэвалюцыйных ашчадных грашовых укладаў беларусаў, рэквізаваных савецкай уладай. Тут жа распавядаецца гісторыя былога эмігранта з Беларусі Алеся Кутаса, у якога ў 1921 г. на мяжы савецкія мытнікі экспрапрыявалі 1,5 тысячы амерыканскіх долараў, якія наш суайчыннік крывёй і потам зарабіў за некалькі гадоў працы ў ЗША [4].

Вельмі арыгінальнай і вясёлай (праўда, як кажуць, «са слязьмі на вачах») аказалася падрыхтаваная А. Гесь серыйная падборка «перлаў» з архіўных збораў і ўспамінаў пра савецкую рэчаіснасць 1920–30-х гг., аб'яднаных рубрыкай «Быў час, была эпоха…», якія друкаваліся на старонках «Спадчыны» пачынаючы з № 2 за 2003 г. Чытачу прапаноўваліся падборкі арыгінальных матэрыялаў, якія дазвалялі паглядзець на нядаўняе савецкае мінулае крыху нетрадыцыйна: з іроніяй, сарказмам і гумарам. Гэтыя зацемкі і дакументы, «вырваныя» з архіўных спраў і друкаваных выданняў, наўрад ці мелі самадастатковую каштоўнасць, а вось у «калекцыі» яны ззялі, як вясёлка.

Напісанае застаецца, і зробленае Аляксандрай Мікалаеўнай Гесь надалей працуе на будучыню Беларусі. Хоць самой яе не стала, але навукова-даследчая праца, распачатая ёю, не спынілася. Яшчэ пабачаць свет тыя выданні, у падрыхтоўцы якіх яна прымала чынны ўдзел. Неўзабаве выйдзе ў серыі «Нашы славутыя землякі» яе кніжка «Беларускі лірнік», прысвечаная жыццю і творчасці выдатнага беларускага кампазітара і хармайстра Уладзіміра Тэраўскага. Абавязкова выйдзе і асобны том архіўных дакументаў, успамінаў і іншых матэрыялаў, прысвечаных іншаму слыннаму беларускаму кампазітару і музыканту Мікалаю Равенскаму. Мы будзем помніць Вас, Аляксандра Мікалаеўна, і будзем згадваць пра тое, што вы здзейснілі ў імя беларускай культуры і навукі нашай Радзімы. Верым, як і Вы, што Беларусь будзе жыць!

## Крыніцы і літаратура

1. Бібліятэка Міхася Мялешкі : зводны каталог / склад. В. У. Скалабан і інш. ; навук. і бібліяграф. рэд. Т. І. Рошчына. — Мінск, 1998; Гесь, А. М. Міхась Мялешка вяртаецца на Беларусь// Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 5. — Мінск : БелНДІДАС, 2007. — С. 46–51; Гесь, А. М. Як трапілі ў архіў дакументы Палуты Бадуновай / А. М. Гесь, Н. Я. Калеснік // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 5. — Мінск, 2007.
2. Гесь, А. М. Беларускі рабочы клуб // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 6. — Мінск, 2008.

3. Гесь, А. Як адстойвалі ўсходнія землі // Спадчына. — 1995. — № 6; Гесь, А. Калінінская акруга: хроніка беларускага культурнага жыцця 1920-х гг. // Спадчына. 2001. — № 3. — С. 3–49.
4. Ляхоўскі, У. Без права на ўласнасьць / У. Ляхоўскі, А. Гесь // Спадчына. — 2000. — № 5–6.

*О. М. Никитенко*

## Иосиф Денисов – архивариус Могилевского окружного суда

**Иосиф Денисович Денисов**, архивариус Могилевского окружного суда, родился 10 марта 1861 г. Воспитывался в православной мещанской семье, где получил домашнее образование. Согласно своему прошению приказом председателя Могилевского окружного суда статского советника И. М. Лебедева от 1 ноября 1886 г. определен в штат окружного суда канцелярским служителем третьего разряда. Исполнял обязанности архивариуса объединенного архива судебных дел Могилевской губернии на время замены людей, находившихся в отпусках с 1889 по 1915 г., в том числе в 1913 г. надворного советника архивариуса И. А. Галиновского.

Приказом исполняющего обязанности председателя Могилевского окружного суда тайного советника В. Ф. Соловьева от 8 июля 1915 г. был назначен временно исполняющим обязанности архивариуса объединенного архива судебных дел Могилевской губернии и Могилевского окружного суда, а приказом от 6 апреля 1917 г. назначен на должность архивариуса.

Во исполнение приказа помощника командира Польского корпуса по гражданским делам от 11 мая 1918 г. о введении на оккупированной территории Общих судов и распоряжения начальника судебно-юридического отдела гражданского управления о введении новых штатов чинов канцелярии Окружного суда и приказом председателя Окружного суда от 20 мая 1918 г. был назначен архивариусом Могилевского окружного суда. Приказом комиссара председателя Могилевского отдела Минского окружного суда от 8 августа 1918 г. назначен архивариусом судебных дел.

Имел светло-бронзовую медаль для ношения на груди в память 300-летия царствования дома Романовых. С 1913 г. по службе в Могилевском пожарном обществе был высочайше награжден званием личного почетного гражданина. При данном обществе являлся личным помощником охотного начальника и цейхмейстером.

Был женат на Евгении Андреевне, с которой имел детей: Марию (*6.06. 1885), Евгению (*20.02.1888), Анастасию (*10.10.1890), Агафию (*27.12.1895), Илью (*19.07.1897), Екатерину (*20.11.1899), Антонину (*23.09.1905). На момент 1918 г. проживал в г. Могилев, в собственном доме по улице Жандармской.

По данным Всероссийской городской переписи 1923 г. числился служащим, находящимся на канцелярской работе. Вместе с семьей из семи человек проживал по ул. Езерская (бывшая Жандармская), д. 17, кв. 1 [1].

*Источники:* НАРБ. — Ф. 30 (Центральное статистическое управление БССР). — Оп. 1. — Д. 4008. — Л. 101–101 об.; Там же. — Ф. 2131 (Могилевский окружной суд). — Оп. 2. — Д. 18; Памятные книжки Могилевской губернии за 1913, 1916 гг.

*В. В. Урублеўскі*

## Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка II, літары Г–З)

Дадзеным артыкулам працягваецца публікацыя біяграм службоўцаў канцылярыі Мінскага ДДС, якія акрамя сваіх непасрэдных справаводчых абавязкаў ажыццяўлялі ўлік і забеспячэнне захаванасці архіўных дакументаў. На гэты раз публікуюцца звесткі аб канцылярыстах, чые прозвішчы пачынаюцца на літары Г–З [2] (15 асоб). У дадатак да пасад, патлумачаных у папярэднім артыкуле, неабходна дадаць сакратара канцылярыі Мінскага ДДС, які кіраваў яе дзейнасцю, а таксама экзэкутара — чыноўніка, які ведаў гаспадарчымі справамі ўстановы, назіраў за парадкам у канцылярыі. Архіварыусамі (асобамі, непасрэдна занятымі пытаннямі архіўнай справы), біяграмы якіх змешчаны ў артыкуле, з’яўляюцца Вікенцій Фаміч Дулевіч (знаходзіўся на пасадзе: 30.09.1850 – каля 1870) і Міхаіл Рыгоравіч Дунаеўскі (знаходзіўся на пасадзе: 01.08.1813 – пасля 1843).

Найбольшая ўвага ў біяграмах акцэнтавана на дакументы НГАБ, асабліва на фармулярныя спісы і вывадовыя справы з фонду Мінскага ДДС (Ф. 319).

---

[1] Аўтар выказвае ўдзячнасць Ю. М. Снапкоўскаму за прадстаўленую звестку. — *Рэд.*

[2] Падрабязней гл.: Урублеўскі, В. В. Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу : ч. I, літары А–В // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 8. — Мінск : НГАБ, 2010. — С. 289-294. — *Рэд.*

Умоўныя скарачэнні:

арк. — аркуш
адв. — адваротны
в. — вёска
вол. — воласць
воп. — вопіс
вул. — вуліца
г. — год
гор. — горад
губ. — губерня
ДДС — Дваранскі дэпутацкі сход
дзес. — дзесяціна
кап. — капейка
маёнт. — маёнтак
муж. — колькасць прыгонных мужчын
НГАБ — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
пав. — павет
руб. — рубель
с. — старонка
св. — святы
спр. — справа
т. — том
тыс. — тысяча
ф. — фонд
фальв. — фальварк
чал. — агульная колькасць прыгонных
* — дата нараджэння
+ — дата смерці

**Гаўсман Людвіг Караль Антонавіч** (*16.10.1816). Са шляхты Мінскай губ., з роду фон Даманьскіх-Гаўсманаў герба «Ларыса», зацверджанага ў дваранстве Сенатам (18.09.1843). Каталік, сын Антонія Яна Гаўсмана і Марыяны з Навіцкіх, родны брат М. А. Гаўсмана. Па сканчэнні курса навук у Мазырскай павятовай вучэльні-гімназіі паступіў на службу канцылярыстамляснога аддзялення Мінскай казённай палаты (09.09.1836), адкуль быў пераведзены на вакансію пісара ў канцылярыю Мінскага ДДС (08.12.1837). Загадам Мінскага губернскага праўлення звольнены са службы па ўласнаму хадатайству (31.03.1842). Па звальненні пражываў у Санкт-Пецярбурзе з жонкай Тэрэзіяй. Брат Міхаіл Гаўсман (*гл. ніжэй*) 27 лістапада 1842 г. звярнуўся з прашэннем да губернскага маршалка шляхты Мінскай губ. Л. Ф. Ашторпа, маючы за мэту атрымаць ад яго пасведчанне аб добранадзейнасці Л. Гаўсмана, яго няўдзеле ў паўстанні 1830–1831 гг. і непрыналежнасці да таемных незаконных арганізацый. Напрыканцы 1842 г. пасведчанне было выдадзена. Пасля зацвярджэння ў дваранстве роду Гаўсманаў (18.09.1843) афіцыйна ўзнагароджаны чынам калежскага рэгістратара з правам старшынства, які набыў яшчэ 9 верасня 1838 г., але не мог ім карыстацца за адсутнасцю статуса двараніна. Пазней згадваецца ў судовай справе брата Міхаіла (*гл. ніжэй*), які абвінавачваўся ў падробку пасведчанняў рыма-каталіцкай кансісторыі на імя Аляксандра і Івана Петрашкевічаў (13.04.1877).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 662. — Арк. 4; Воп. 3. — Спр. 128. — Арк. 15–16, 24–25, 30–31, 35–38 адв.; Спр. 130. — Арк. 15–16 адв.

**Гаўсман Міхаіл Леапольд Антонавіч** (*15.11.1817, в. Ясені Брагінскай вол. Рэчыцкага пав. Мінскай губ. +кастрычнік 1889, г. Мінск). Са шляхты Мінскай губ., з роду фон Даманьскіх-Гаўсманаў герба «Ларыса», зацверджанага ў дваранстве Сенатам (18.09.1843). Каталік, сын Антонія-Яна Гаўсмана і Марыяны з Навіцкіх, родны брат Л. А. Гаўсмана. Па сканчэнні курса навук у Мазырскай павятовай вучэльні-гімназіі паступіў на службу канцылярыстам Мінскага ДДС (27.03.1841). Па рэзалюцыі Мінскага ДДС прызначаны да часовага выканання абавязкаў сакратара замест нябожчыка Барускага (01.09.1850), затым прызначаны на пастаянную пасаду сакратара губернатарам (29.03.1851) і зацверджаны на ёй імператарскім загадам па грамадзянскім ведамству (20.05(01.06).1851). Службу на дадзенай пасадзе ажыццяўляў бесперапынна да сваёй высылкі з Мінска ў Вільню (19.06.1863), калі быў арыштаваны па загаду генерал-губернатара М. М. Мураўёва і абвінавачаны ў арганізацыі ў Мінскай губ. «рэвалюцыйнага жонду», а затым у падробцы «дваранскіх грамат і прывілеяў». Замест яго выконваючым абавязкі сакратара быў прызначаны экзэкутар ДДС тытулярны райца Нестар Буш. Сылку Гаўсман адбываў у гор. Тацьма Валагодскай губ. (1864–1867). На падставе царскага загаду запісаны ў лік пастаянных жыхароў гор. Варшавы (18.05.1868). Рашэннем Сената быў апраўданы (09.10.1876), аб чым было паведамлена ў Мінскую аб'яднаную палату крымінальнага і грамадзянскага суда (02.02.1877) і Гаўсману асабіста (13.04.1877). Пасля апраўдання пражываў у Мінску і напісаў два прашэнні на імя Аляксандра II аб вяртанні яму пасады сакратара Мінскага ДДС і выплаце заробку, што не выдаваўся з моманту адпраўкі ў Вільню (14.04. і 20.04.1877). Пастановай Мінскага ДДС у гэтым яму было адмоўлена (29.04.1877), у той жа дзень выдадзены атэстат аб службе. Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (27.03.1843), губернскага сакратара (27.03.1847), калежскага сакратара (27.03.1851). Узнагароджаны цёмна-бронзавым медалём у памяць крымскай вайны 1853–1856 гг. (26.08.1856), ордэнам Св. Роўнаапостальнага князя Уладзіміра 4-й ступені (22.09.1860), знакам адметнасці за 15-гадовую беззаганную службу (22.08.1860). На момант 1863 г. заробку атрымліваў 640 руб. у год. У Мінску меў нерухомую маёмасць: тры драўляныя і адзін мураваны дамы (на рагу Навамесцкай плошчы і Кашарнай вуліцы), ферму. З'яўляўся гісторыкам, краязнаўцам, археолагам, калекцыянерам. Падчас следства ў яго былі знойдзены арыгіналы табліц з пячаткамі, медалямі і тытуламі польскіх каралёў, што з'яўляліся дадаткам да працы Э. К. Чапскага па нумізматыцы. Аўтар «Гістарычнага нарысу мястэчка Турава, былой сталіцы ўдзельнага Тураўскага княства» (1877), рукапісу пад назвай «Гістарычнае апісанне губернскага горада Мінска і губерні» (паміж 1875 і 1879).

Жонка Юлія Мікалаеўна Тусэн, евангеліцкага веравызнання, дзеці: Міхаіл Напалеон (*08.12.1842), Міхаліна (*04.10.1846), Эмерык Браніслаў (*09.07.1849) (*гл. ніжэй*), Аттон Ігнацi Оскар (*08.02.1851), Артур (*16.07.1852), Цэзарына (*08.04.1855), каталіцкага веравызнання. З іх ліку Міхаіл Напалеон на момант 1863 г. з'яўляўся студэнтам Маскоўскага ўніверсітэта.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 662; Воп. 3. — Спр. 130. — Арк. 8–23; Спр. 131. — Арк. 22 адв.–23; Дзянісаў, У. Мінскі гісторык і краязнавец XIX стагоддзя Міхаіл Гаўсман / У. Дзянісаў // Знакамітыя мінчане : матэрыялы Беларуска-Польскай навук. канф., Мінск, 9 ліст. 2004 г. — Мінск, 2005. — С. 72–80.

**Гаўсман Эмерык Браніслаў Міхайлавіч** (*09.07.1849 +1882). Са шляхты Мінскай губ., з роду фон Даманьскіх-Гаўсманаў герба «Ларыса», зацверджанага ў дваранстве Сенатам (18.09.1843). Каталік, сын М. А. Гаўсмана (*гл. вышэй*). Атрымаўшы хатнюю адукацыю паступіў на службу канцылярыстам Мінскага ДДС (20.09.1866). У 1867–1868 гг. двойчы браў адпачынак (першы раз — па сямейных абставінах, другі — па прычыне хваробы вачэй). На момант 09.01.1868 г. пражываў у г. Мінску (вул. Шпітальная, дом № 1355). Пераведзены з штату Мінскага ДДС у Варшаўскае губернскае праўленне (26.06.1868). Заробку атрымліваў 90 руб. у год.

Жонка Аляксандра Сяргееўна (дзявочае прозвішча невядома), праваслаўнага веравызнання, дзеці: Марыя (*1871), Міхаіл (*10.08.1877). На момант 28.11.1890 г. пражывалі ў Мінску (вул. Скобелеўская, дом Мінькоўскага).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 662. — Арк. 186, 207 адв.; Воп. 3. — Спр. 131. — Арк. 2, 4, 6, 14, 19, 22–23, 25.

**Грасман Вільгельм Эдуард Альфрэд Оскар Віктаравіч** (*14.03.1870). З патомных дваран Ліфляндскай губ. Лютэранін-евангеліст, сын Віктара Адальберта Гвіда Хрысціяна Грасмана. Выхоўваўся ў Рыжскай гарадской вучэльні. Далейшую адукацыю атрымаў у Тарандскай лясной акадэміі (Саксонія), па сканчэнні якой займаўся развядзеннем леса ў лясных дачах дзяржаўнай эканоміі ў Харкаўскай губ. Пастановай Мінскага ДДС прызначаны канцылярскім служачым (11.01.1900). Праз два гады падаў прашэнне ў Міністэрства земляробства і дзяржаўных маёмасцяў аб пераводзе на службу ў корпус ляснічых (02.06.1902), якое было ў хуткім часе задаволена (13.12.1902). Па прычыне немагчымасці ўладкавацца на службу па лясным ведамстве атрымаў пасаду зборшчыка грошаў з казённых вінных лавак ва Упраўленні акцызнымі зборамі Смаленскай губ. (27.06.1903). Падчас праходжання службы быў узведзены ў чын калежскага рэгістратара (22.05.1902). На момант 1899–1901 гг.

за сталае месца жыхарства меў маёнт. Гараднiца Навагградвалынскага пав. Валынскай губ., на момант 23.12.1902 — г. Шлок Лiфляндскай губ. (Мельнічная вул., дом № 6).

Жонка Ганна Мацвееўна Кожына, праваслаўнага веравызнання, дзецi: Валерый (*15.11.1899), Анатоль (*03.06.1901), праваслаўнага веравызнання.

*Крыніца:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 138. — Арк. 3–4, 8–9, 11–11 адв., 16–17 адв.

**Дамброўскi Мiкалай Iгнатавiч** (*каля 1847). Каталiк, з сям'i оберафiцэра. Атрымаў хатнюю адукацыю, пасля чаго накiраваны на службу ў Мiнскi ДДС пiсарам (29.09.1866). Мiнскiм губернскiм маршалкам шляхты накiраваны ў Мiнскую губернскую па земскiх справах прысутнасць для складання каштарысу земскiх павiннасцей на трохгоддзе з 1869 г. (18.10.1867). Заробку атрымлiваў 90 руб. у год.

*Крыніца:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 150.

**Дулевiч Вiкенцiй Фамiч** (*1802). Са шляхецкага роду Цёлкаў-Дулевiчаў герба «Цёлак» з Мiнскай губ., зацверджанага ў дваранстве Сенатам (31.03.1836). Каталiк, сын Тамаша Бенедыктава Дулевiча i Канстанцыi з Паўловiчаў. Хрышчаны ў Мiнскiм кафедральным касцёле (26.10.1802). Сумесна з братам Iванам валодаў фальв. Дулева Iгуменскага пав. (318 дзес. зямлi). Прайшоў няпоўны курс навук у павятовай вучэльнi мяст. Ляды Iгуменскага пав., пасля чаго паступiў на службу ў Мiнскi ДДС, дзе знаходзiўся па-за штатам (01.06.1832). Зацверджаны ў штаце Мiнскага ДДС загадам губернскага праўлення (09.10.1833), прызначаны на штатную вакансiю канцылярыста (12.12.1834), затым століначальнiка (13.08.1836), экспедытара (10.09.1846), архiварыуса (30.09.1850). Абавязкi архiварыуса выконваў i на момант 1870 г. Па распараджэннi Мiнскага ДДС камандзiраваны ў Вiльню для перавозу ў Вiленскую цэнтральную рэвiзiйную камiсiю архiва згаданай установы, што выканаў з неабходнай дакладнасцю, аб чым прадставiў квiтанцыю (04.08.1845). Падчас праходжання службы быў узведзены ў чыны: калежскага рэгiстратара (31.12.1836), губернскага сакратара (31.12.1840), калежскага сакратара (31.12.1844), тытулярнага райцы (31.12.1848). Узнагароджаны падзякамi за выдатную i старанную службу (13.08.1836, 13.10.1838), знакам адметнасцi за 15-гадовую беззаганную службу (22.08.1853), бронзавым медалём у памяць вайны 1853–1856 гг. (26.08.1856). Заробку атрымлiваў 214 руб. 26 кап. у год.

Жонка Лаўранцiна Восiпаўна Бяляцкая, дваранка, каталiцкага веравызнання, дзецi: Фiлiпiна Магдалена (*23.06.1838), Зянон Iосiф (*09.07.1840), Iосiф Напалеон (*23.01.1843), Вiльгельмiна (*10.01.1853),

каталіцкага веравызнання. На момант 1857 г. сыны навучаліся ў Мінскай губернскай гімназіі, а дочкі знаходзіліся пры бацьках.

*Крыніца:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 1010. — Арк. 142; Воп. 3. — Спр. 153, 154; Памятная книжка Минской губернии на 1870 г. — Минск, 1870. — С. 46.

**Дунаеўскі Міхаіл Рыгоравіч** (*каля 1785). Са шляхецкага роду Мінскай губ. Каталік. Службу пачаў канцылярыстам Мінскага ДДС (05.02.1809), затым прызначаны на пасаду архіварыуса (01.08.1813), на якой знаходзіўся і на момант 1843 г. Падчас праходжання службы быў узведены ў чыны: калежскага рэгістратара (31.12.1814), губернскага сакратара (31.12.1817), калежскага сакратара (31.12.1820), тытулярнага райцы (31.12.1823). Узнагароджаны знакам адметнасці за 15-гадовую беззаганную службу (22.08.1830), знакам адметнасці за 20-гадовую беззаганную службу (22.08.1835), знакам адметнасці за 25-гадовую беззаганную службу (22.08.1840).

Жонка Марыя Пякарская, дваранка, каталіцкага веравызнання, дзеці: Феліцыян (*каля 1810), Сафія (*каля 1812), Сыгізмунд (*каля 1814), Алаізія (*каля 1817), каталіцкага веравызнання. На момант 1843 г. Феліцыян служыў паручыкам у Грузінскім грэнадзёрскім палку, Сыгізмунд — прапаршчыкам у Велікалуцкім егерскім палку, Сафія знаходзілася ў шлюбе з канцылярыстам Мінскай грамадзянскай палаты Яноўскім, Алаізія — з афіцэрам Ніжагародскага драгунскага палка Янішэўскім.

*Крыніца:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 155.

**Духноўскі Казімір Вікенцьевіч** (*каля 1791 +15/16.03.1868, г. Мінск). Са шляхецкага роду. Каталік. Атрымаў хатнюю адукацыю. Службу пачаў канцылярыстам Мінскага ДДС (03.10.1809), затым прызначаны пратакалістам (15.11.1823), на гэтай пасадзе знаходзіўся да моманту сваёй смерці. З'яўляўся членам Мінскага губернскага камітэта для нагляду за правільным продажам алкагольных напояў (02.10.1844–01.01.1854). Падчас праходжання службы быў узведзены ў чыны: калежскага рэгістратара (31.12.1814), губернскага сакратара (31.12.1817), калежскага сакратара (31.12.1820), тытулярнага райцы (31.12.1823), калежскага асэсара (29.11.1844). Узнагароджаны знакам адметнасці за 15-гадовую беззаганную службу (22.08.1831), знакам адметнасці за 20-гадовую беззаганную службу (22.08.1835), грашовай прэміяй у памеры гадавога аклада (1 200 руб. асігнацыямі) за рэўнасную службу, знакам адметнасці за 25-гадовую беззаганную службу (22.08.1841), знакам адметнасці за 30-гадовую беззаганную службу (22.08.1846), ордэнам Св. Роўнаапостальнага князя Уладзіміра 4-й ступені (22.09.1850), знакам адметнасці за 35-гадовую беззаганную службу (22.08.1854).

Заробку атрымліваў 300 руб. срэбрам у год. Пахаваны разам з жонкай на Кальварыйскіх могілках.

Жонка Ізабэла Ігнацьеўна Касінская (+15.02.1872), каталіцкага веравызнання, дзеці: Леанард (*06.11.1845), Конрад (*19.02.1850), Ванда Іаанна (*24.05.1852), Франц Карл (*29.01.1856), каталіцкага веравызнання, Елісавета (*04.07.1861). З іх, на момант 20 сакавіка 1868, Леапольд знаходзіўся на прыватнай службе, Конрад — у Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце, Франц Карл — у Мінскай губернскай гімназіі, Ванда Іаанна і Елісавета — у Мінску. У1896 г. Ванда Іаанна, якая пражывала ў доме Цехановіча на Захар'еўскай вуліцы г. Мінска, падала прашэнне ў Мінскі ДДС аб выдачы копіі фармулярнага спіса свайго бацькі (04.07.1896), што і было зроблена (05.07.1896).

*Крыніцы*: НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 158, 159; Cmentarze na dawnych Kresach Wschodnich Rzeczypospolitej. — Tom 1 : rzymsko-katolicki cmentarz kalwaryjski w Mińsku na Białorusi. — Warszawa, 1996. — S. 100.

**Жаба Павел Іосіфавіч** (*15.01.1870, г. Масква). Мешчанін г. Масквы. Паходзіў са шляхты Віленскай губ, зацверджанай у дваранстве Сенатам (26.11.1846). Як і яго бацькі, Іосіф Якаўлеў і Еўдакія Навумава Жабы, дакументальна далучаным да роду не быў. Праваслаўны. Адукацыю атрымаў у Набілкаўскай гарадской вучэльні, дзе скончыў поўны курс навук, аб чым выдадзена адпаведнае пасведчанне (31.05.1888). З'яўляўся ганаровым старшынёй Марыінскага дзіцячага прытулка ў Маскве (30.12.1892–19.02.1895), служачым Упраўлення Лібава-Роменскай чыгункі (22.01.1893). Па пастанове Мінскага ДДС залічаны ў штат канцылярыстаў згаданай установы (01.02.1896). Падчас праходжання службы быў узведзены ў чын калежскага рэгістратара (01.02.1902). Загадам па грамадзянскім ведамстве прызначаны ганаровым членам Мінскага павятовага папячыцельства дзіцячых прытулкаў (12.03.1904), у сувязі з чым па ўласным хадатайстве выключаны з ліку служачых Мінскага ДДС (20.05.1904). На момант 4 снежня 1895 г. жыў у г. Мінску, на вул. Скобелеўская, у доме графа Чапскага.

Жонка (з 22.01.1893) Флора Вольга Медэм (*17.02.1868), дачка стацкага райцы, дывізійнага лекара 30-й пяхотнай дывізіі, Давіда Мікалая Медэма і Разаліі Шаршэўскай, евангеліцка-лютэранскага веравызнання; сын Сяргей (*21.02.1894), праваслаўнага веравызнання.

*Крыніца*: НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 163. — Арк. 1–1 адв., 5–5 адв., 12, 17–18, 22–25, 40–41.

**Жаброўскі Паўлін Рамуальд Вікенцьевіч** (*22.06.1818 +06.11.1899, г. Мінск). Са шляхецкага роду герба «Ляліва» з Мінскай губ., зацверджанага ў дваранстве Сенатам (10.10.1835). Каталік. Уладальнік спадчыннага маёнт. Тупальшчына Мінскага пав. (32 муж.). Па сканчэнні курса навук

у Мінскай губернскай гімназіі паступіў на службу ў Мінскі губернскі межавы суд, у якім прызначаны на вакансію капііста ў канцылярыі Мінскага ДДС (23.02.1838), затым павытчыка або столаначальніка (03.03.1839). Знаходзіўся на службе ў Мінскім губернскім межавым судзе да моманту яго скасавання (09.09.1840), затым прызначаны на вакансію канцылярыста Мінскага ДДС (08.05.1846), экзэкутара Мінскага ДДС (03.09.1854). Па выніках выбараў дваранства Мінскага пав. абраны дэпутатам для разгляду справаздачнай дакументацыі па земскаму збору 1852–1855 гг. (15.06.1856–19.09.1856). На губернскім сходзе дваранства абраны кандыдатам на пасаду прысяжнага Мінскага павятовага суда (27.09.1856), на якой зацверджаны губернатарам (04.10.1856); тады ж абраны кандыдатам на пасаду прысяжнага Мінскай палаты крымінальнага суда (02.10.1856), на якой зацверджаны губернатарам (05.10.1856). Пастановай Мінскага ДДС прызначаны столаначальнікам (16.10.1857). На гэтай пасадзе знаходзіўся і на момант 1858 г. Падчас праходжання службы быў узведзены ў чыны: калежскага рэгістратара (23.02.1840), губернскага сакратара (22.10.1849), калежскага сакратара (22.10.1853), тытулярнага райцы (09.12.1856). Узнагароджаны бронзавым медалём у памяць вайны 1853–1856 гг. (26.08.1856). На момант 1858 г. заробку атрымліваў 171 руб. 42 кап. Пахаваны разам з жонкай на Кальварыйскіх могілках.

Жонка Эмілія Юр’еўна Набароўская (*01.12.1824 +09.10.1910), дваранка, каталіцкага веравызнання, дзеці: Віктар Нікадзім (*15.09.1854), Канстанцыя Марыя (*15.03.1856), каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 1069; Воп. 3. — Спр. 166; Cmentarze na dawnych Kresach Wschodnich Rzeczypospolitej. — Tom 1 : rzymsko-katolicki cmentarz kalwaryjski w Mińsku na Białorusi. — Warszawa, 1996. — S. 182.

**Жураўскі Гаўрыла Іванавіч** (*каля 1836). Са шляхецкага роду Мінскай губ. герба «Ляліва», зацверджанага ў дваранстве Сенатам (31.12.1833). Каталік, сын Івана (Яна) Казіміравa Жураўскага, шляхціча Слуцкага пав. Атрымаўшы адукацыю ў прыватнай навучальнай установе па вольным найме, паступіў на службу ў Мінскі ДДС, дзе працаваў шэсць гадоў, пачынаючы з 1865 г. Па пастанове Мінскага ДДС прызначаны ў штат канцылярыі згаданай установы на пасаду канцылярскага служачага (19.10.1871). Падчас руска-турэцкай вайны 1876–1877 гг. загадваў рэчавым складам, створаным для вайсковых патрэб, вёў разнастайную дакументацыю і перапіску (25.04.1877–02.08.1877), уладкоўваў шпіталі для раненых воінаў і выконваў розныя «транспартныя даручэнні» для патрэб арганізацыі Чырвонага Крыжа (01.08.1877–25.12.1877). Прызначаны на пасаду экспедытара — чыноўніка, адказнага за адпраўку і рассылку карэспандэнцыі (28.10.1877). Тройчы камандзіраваны для нагляду за работамі над пабудовай, а затым рамонтам і перабудовай дома

для рэальнай вучэльні (21.08.1880–25.09.1880; 22.02.1882–01.11.1882; 08.05.1887–15.07.1887). Выконваў абавязкі наглядчыка за рамонтам дваранскага дома, уладкаваннем каменнай лесвіцы і ўпрыгажэннем залы для абеда перад прыездам вялікага князя Уладзіміра Аляксандравіча і вялікай княгіні Марыі Паўлаўны (15.07.1887–26.07.1888). Па пастанове Мінскага ДДС пераведзены на пасаду перакладчыка (08.07.1884), затым пратакаліста з захаваннем пасады перакладчыка (04.12.1888). Выконваў абавязкі сакратара Мінскага ДДС (01.10.1891–04.12.1891; 15.04.1892–08.03.1897). Падчас праходжання службы быў узведзены ў чын калежскага рэгістратара (01.01.1894). Узнагароджаны знакам Чырвонага Крыжа (26.10.1879), срэбраным медалём у памяць царавання імператара Аляксандра III (28.02.1897). На момант 04.01.1897 г. заробку атрымліваў 600 руб. на год. На момант 24.10.1900 г. пражываў з сям'ёй у Мінску (вул. Магазінная, дом Гадачэўскага).

Жонка Апалонія Ананьеўна Радзевіч, каталіцкага веравызнання, дзеці: Марыя-Ганна (*29.05.1883), Ядзвіга (*11.05.1885), Эдмунд (*18.07.1895), каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 1113. — Арк. 89–90, 114–119 адв.; Воп. 3. — Спр. 167. — Арк. 30–37.

**Заленскі Фелікс Антонавіч** (*1832, Мазырскі пав. Мінскай губ.). Са шляхецкага роду Мінскай губ., зацверджанага ў дваранстве Сенатам (20.02.1857). Каталік, сын Антона Карла Гервазьева Заленскага, шляхціча Мазырскага пав. Пасля атрымання хатняй адукацыі паступіў на службу ў Мінскі гарадавы магістрат канцылярскім служачым (17.12.1847), адкуль перамешчаны на вакансію пісара другога разрада ў Мінскае павятовае казначэйства (17.02.1849). Пераведзены на пасаду пісара ў штат канцылярыі Мінскага ДДС (05.09.1851), затым выконваў абавязкі столаначальніка згаданай установы. Падчас праходжання службы быў узведзены ў чыны: калежскага рэгістратара (1857), губернскага сакратара (11.10.1858), калежскага сакратара, тытулярнага райцы (20.05.1864). На момант 25.05.1851 г. заробку атрымліваў 110 руб.

Жонка (з 1854) Стафанія Іванаўна Сцяпура, дваранка.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 1160. — Арк. 151; Воп. 3. — Спр. 176. — Арк. 12–13, 16–18 адв., 30.

**Залюбоўскі Аляксандр Іванавіч** (*01.12.1867). Праваслаўны, сын калежскага асэсара. Па сканчэнні поўнага курса навук у Санкт-Пецярбургскім практычным тэхналагічным інстытуце атрымаў званне тэхнолага, аб чым яму выдадзены дыплом (18.06.1891). Пастановай Мінскага губернскага праўлення прызначаны на службу канцылярскім служачым другога разрада Мінскага ДДС (11.02.1900).

*Крыніца:* НГАБ. Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 179. — Арк. 3–4.

**Залюбоўскі Іван Аляксандравіч** (*каля 1876). Праваслаўны, сын калежскага асэсара. Бацька валодаў у Кабяляцкім павеце Палтаўскай губ. 25 дзес. зямлі і домам з пабудовамі ў гор. Кабяляксі. Выхаванне атрымаў у Кабялякскай Аляксандраўскай трохкласнай гарадской вучэльні, дзе і скончыў поўны курс навук. Прызначаны канцылярскім служачым Кабяляцкага павятовага паліцэйскага праўлення (29.06.1895), затым столаначальнік (01.03.–13.03.1898; 17.11.–31.12.1898; 25.04.1900–01.05.1901), рэгістратар згаданага праўлення (13.03.1898), паліцэйскі наглядчык (22.05.–01.06.1901). Знаходзіўся на пасадзе рэгістратара Мінскага ДДС (11.10.1901–13.03.1903). За пераходам на службу ў штат канцылярыі Мінскай духоўнай праваслаўнай кансісторыі выключаны з ліку служачых Міністэрства унутраных спраў (13.03.1903). Падчас праходжання службы быў узведзны ў чын калежскага рэгістратара (29.06.1899).

*Крыніца:* НГАБ. Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 180. — Арк. 4–9.

**Змаровіч Леанід Уладзіміравіч** (*17.01.1877, г. Гродна). З дваранскага роду Мінскай губ., праваслаўны. Сын памочніка прыстава калежскага сакратара Уладзіміра Мікалаевіча Змаровіча і яго жонкі Стэфаніі Антонавай. Атрымаў хатнюю адукацыю. Пастановай Мінскага ДДС прызначаны пратакалістам дадзенай установы (09.10.1897). Паспяхова вытрымаў экзамен на набыццё чына першага класа, аб чым яму было выдадзена пасведчанне педагагічнай рады Мінскай рэальнай вучэльні (11.11.1900). Падчас праходжання службы быў узведззены ў чын калежскага рэгістратара (09.06.1901).

*Крыніца:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 183. — Арк. 9–12.

# Хроніка і бібліяграфія

*А. К. Голубович*

## История рода Стецкевичей-Чебогановых — познание истории народа

Возросший в обществе интерес к своему прошлому, прошлому многих поколений людей, тонкими нитями связанных с днем сегодняшним, направлен к познанию разрушенных историческими катаклизмами XX в. семейных и родственных связей, поиску утраченного культурного достояния. Сегодня этим занимаются не только специалисты-архивисты, но и просто энтузиасты, желающие познать свое «Я». К таким относится и Анатолий Васильевич Стецкевич-Чебоганов, который уже на протяжении многих лет сотрудничает с Национальным историческим архивом Беларуси. Анатолий Васильевич занимается не только историей своего рода, но и породненных с ним семей. Кроме того, он оказывает помощь в восстановлении разрушенных храмов и монастырей, является также одним из устроителей памятника Святой Софии, княгини Слуцкой в г. Слуцке. За свою альтруистическую деятельность Анатолий Васильевич награжден православной церковью орденом Святого Равноапостольного князя Владимира III степени и медалью Святителя Кирилла Туровского.

Благодаря исследованиям, проводимым не только в нашем архиве, но и в архивах других стран, Анатолий Васильевич смог изучить более 40 дворянских родов Беларуси — своих прямых предков. Потомок шляхетского рода Стецкевичей по материнской линии родился в бывшем родовом имении Засмужье Любанского района Минской области, до 1917 года принадлежавшем его деду Михаилу Стецкевичу и его родным.

Одной из причин, приведших Анатолия Васильевича на путь изучения материалов происхождения своего рода, стала трагическая судьба семьи, которую в 1930 году раскулачили и выслали за пределы Беларуси, а деда, Михаила Ивановича Стецкевича, вместе с некоторыми другими родственниками расстреляли.

Стецкевичи, Караффа-Корбуты, Рудзинские, Тычины, Ждановичи-Гуриновичи, Сыцько, Липские, Забелло, Татуры, Некрашевичи, Глинские-Лиходиевские, Реутты, Дашкевичи-Корибуты, Керножицкие, Моствилловичи, Гетолты, Тышкевичи-Коленицкие и другие — вот его родовод. Вызывают интерес исследования по роду Казановичей, представитель которого генерал царской армии Борис Ильич Казанович — участник белогвардейского движения в период гражданской войны. Анатолию Васильевичу удалось найти личные дневники дочери генерала Елены, вернувшейся в 60-х годах XX в. из эмиграции. Содержание дневников представляет большой интерес для исследователей отечественной истории.

Изучая корни первого вице-президента Академии наук Беларуси Степана Михайловича Некрашевича, он установил, что три его пра… бабушки Матрёна Григорьевна, Агафья Фёдоровна и Арина Даниловна, урожденные Некрашевич, являются близкими родственницами и Степану Михайловичу. Кроме того, Анатолий Васильевич выяснил, что у Степана Михайловича имеются родственные связи и с родом Караффа-Корбутов: прабабушка его отца, Агата Васильевна, являлась родной сестрой Ивана Васильевича Караффа-Корбута, деда Натальи Васильевны — прабабушки Стецкевича-Чебоганова [5].

Известно, что многие представители рода Некрашевичей связаны родственными узами с белорусской интеллигенцией. Так, дочь Елены Григорьевны Некрашевич — Елена Михайловна была женой народного поэта БССР Петруся Бровки. Зарина Владимировна Кулевская, троюродная племянница Степана Михайловича, жена сына Якуба Коласа Данилы Мицкевича. Изучая свой родовод, Анатолий Васильевич сделал открытие: они с писателем Владимиром Липским родня. Прапра… бабушка Стецкевича-Чебоганова Катерина Липская приходилась двоюродной сестрой Ивану Липскому — прапрадеду писателя. Их отцы Иосиф и Иван в 4-м колене родные братья [4], а в 3-м — у них общий предок шляхтич Иван Липский, родившийся в 1744 году.

На сегодняшний день про известного белорусского археолога Генриха Татура, который является внучатым племянником прапра… бабушки Анатолия Васильевича Анны Татур написано много. Долгое время дата рождения историка, краеведа, коллекционера и автора археологической карты Минской губернии оставалась неизвестной. В процессе изучения документов удалось установить, что Татур родился 17 сентября 1846 года в Слониме. Отец Генриха Татура — Хризастом Лаврентий Доминик был предводителем Слонимского поветового дворянства [7]. Связан род Стецкевичей и с родом Глинских-Лиходиевских. Из духовного завещания прапра… бабушки Анатолия Васильевича, Евы Адамовны Стецкевич, урожденной Глебко-Забелло, от 29 августа 1693 года, известно, что ее мать Марианна — из княжеского рода Глинских-Лиходиевских [6].

Также много сведений было им найдено по истории родов Керножицких и Моствилловичей. Основатель рода Керножицких — Ленарт Иванович, полковник, которому в соответствии с привилеем короля Жигимонта III от 6 мая 1591 года за военные подвиги «пожалован двор Керножицы с 50 дворами селян в Новогрудском воеводстве» [8]. Жена Ленарта Керножицкого — Раина Яновна из дворянского рода Моствилловичей герба «Доленга». В числе родственников Анатолия Васильевича Стецкевича-Чебоганова есть и Борколаб Иванович Корсак, сын Марии, дочери Гетолта Калениковича, основатель местечка Борколабово. Возможно, именно по его поручению священником Филиппом была начата Борколабовская летопись — памятник древней белорусской письменности [9]. Мария Гетолт — родная тетя прапра… бабушки Анатолия Васильевича, Соломониды Томковны Гетолт. Они происходили, как и Тышкевичи, от Каленика Мишковича. Дед Соломониды, Гетолт Каленикович, являлся родным братом Тишке Калениковичу, от которого пошел род Тышкевичей. Племянник Гетолта Ефимий, сын Акушки Калениковича, был архиепископом полоцким [2]. Еще один брат Гетолта Дзебра Каленикович погиб в битве с татарами в 1509 году, а его жена Анастасия стала игуменьей полоцкой [3].

Вторая дочь Гетолта, Доминитра, в первом браке была замужем за Михаилом Гарабурдой, писарем ВКЛ второй половины XVI в. и дипломатом, который в 1559 году был отправлен послом к крымскому хану, а в 1561–1584 гг. неоднократно направлялся послом в Москву.

Из рода Каленика Мишковича во второй половине XV в. и в начале XVI в. происходит несколько первоиерархов православной церкви: Григорий (Павлович) — митрополит Киевский и Всея Руси, Иван (Каленикович) — архимандрит Киево-Печерского монастыря [10].

Продолжается работа по изучению семейно-родственных связей рода Дашкевичей-Корибутов, также связанных с родом Стецкевичей. Анатолий Васильевич на примере генеалогических росписей прямых и сопричастных родов устанавливает родственные связи между ними. Свои исследования он начал публиковать в журналах «Роднае слова» и «Полымя», которые стали основой для написания книги «Я — сын Ваш». На издание этой книги получено благословение Митрополита Минского и Слуцкого Патриаршего Экзарха всей Беларуси Филарета: «Мы приветствуем благочестивые намерения, воплотить которые взял на себя труд Анатолий Васильевич в данном исследовании, и надеемся, что о научных достоинствах проделанного им труда, а также о фактологической его точности сделают свои благожелательные и объективные отзывы и суждения представители научного сообщества — специалисты в этой области.

Желаю автору помощи Божией на избранном им, по зову его благочестивых предков, поприще» [1].

Исследования, проводимые Анатолием Васильевичем Стецкевичем-Чебогановым, показывают, что на примере того или иного шляхетского рода можно качественно исследовать историю той территории, на которой проходила его жизнедеятельность. Установление родственных связей между представителями многих белорусских шляхетских родов содействует более глубокому осмыслению прошлого общественно-политической элиты нашей страны.

Источники и литература


1. Благословение Митрополита Минского и Слуцкого Патриаршего Экзарха всей Беларуси Филарета от 30.03.2011 г. № 303.
2. Метрика ВКЛ. Книга судных дел 221 (1506–1523). — СПб., 1903. — Док. 216.
3. Метрика ВКЛ. Книга записи 12 (1522–1529). — Вильнюс, 2001. — Док. 228. — С. 245.
4. НИАБ (Национальный исторический архив Беларуси). — Ф. 76. — Оп. 2. — Д. 448.
5. НИАБ. — Ф. 136. — Оп. 13. — Д. 556. — Л. 204.
6. НИАБ. — Ф. 319. — Оп. 2. — Д. 1186. — Л. 11–12, 17–18.
7. НИАБ. — Ф. 319. — Оп. 2. — Д. 3207. — Т. 1. — Л. 347 об.
8. НИАБ. — КМФ 18. — Оп. 1. — Д. 48. — Л. 186 об.–188.
9. Полное собрание русских летописей. — М., 1975. — Т. 2. — С. 174–192.
10. Яковенко, Н. Украинская шляхта, конец XIV в. – сер. XVII в. — Киев, 2008. — С. 188.


*А. М. Літвін*

## Чорны сакавік: памяці першай настаўніцы — А. М. Гесь

Наступленне каляндарнай вясны і сакавік 2011 г. застанецца ў памяці як самы жалобны месяц для беларускіх гісторыкаў. 01.03.2011 г. пайшоў з жыцця адзін з першых даследчыкаў гісторыі Заходняй Беларусі міжваеннага часу доктар гістарычных навук Уладзімір Аляксандравіч Палуян, а 03.03.2011 г. выбітны даследчык старажытнага Заслаўя археолаг Юрый Афанасьевіч Заяц, з якім мы ў пачатку студзеня адзначылі ў адзін дзень свае юбілеі. З абодвума гісторыкамі я шмат гадоў працаваў, добра ведаў іх і паважаў. Першага — за цвёрдую і непахісную веру ў ідэалы, другога — за інтэлігентнасць, грунтоўныя і разнастайныя веды, у тым ліку ў пытаннях ваеннай гісторыі.

Не паспелі падсохнуць кветкі на магілах вышэйназваных гісторыкаў, як новая сумная навіна — 9 сакавіка не стала доктара гістарычных навук, прафесара Аляксея Мітрафанавіча Малашкі. З ім мне не давялося разам працаваць, але мы былі знаёмыя са студэнцкіх гадоў, калі і ўсталяваліся добрыя сяброўскія адносіны, якія працягваліся, напаўняючыся новым зместам да апошніх дзён. Аляксей Мітрафанавіч, дацэнт БДУ, выкладаў нам — студэнтам гістфака — гісторыю КПСС. Ён быў кіраўніком маёй дыпломнай працы «Дзейнасць камуністаў ва ўрадзе народнага адзінства С. Альендэ ў Чылі». У многім дзякуючы яму я абраў сваім лёсам навуковую працу.

У мінулым годзе ён зайшоў да мяне на працу. Мы шмат аб чым пагаварылі. Развітваючыся, ён сказаў, што бачымся ў апошні раз. Гледзячы на яго статную фігуру, густыя сівыя валасы, цвёрды левітанаўскі голас, у гэта ніяк не верылася, і сваю ўпэўненасць я ўсяляк імкнуўся перадаць яму. 17 сакавіка я збіраўся да яго на 80 гадовы юбілей, замест свята прыйшлося адзначыць 9 дзён…

Памінальная свечка нічога не падказала яшчэ аб адной непаўторнай страце, якая адбылася ў гэты дзень. **Не стала Аляксандры Мікалаеўны Гесь.** Цяжкая навіна праз два дні выбухам бомбы ўварвалася ў свядомасць. За ім шчымлівае, балючае пачуццё беззваротнай страты чалавека, з якім звязаны самыя светлыя пачуцці дзяцінства: гонар і павага за сваю настаўніцу, за сваю калегу па працы, гонар і павага за сціплую, прыгожую, высакародную беларускую жанчыну, даследчыцу малавядомых старонак беларускай гісторыі, уклад якой у скарбонку нашых ведаў яшчэ чакае свайго доследу.

Горыч і крыўда за тое, што пасля 8 сакавіка збіраўся наведаць і не паспеў. Сказанае вышэй — гэта толькі малая толіка ў сваё апраўданне…

Не хочацца і не магу паверыць, што Аляксандры Мікалаеўны Гесь больш няма сярод нас. У памяці імкліва пракручваюцца эпізоды, звязаныя з цудоўнай жанчынай.

Мне пашчасціла быць сярод яе першых вучняў. Відаць, кожны з нас памятае сваіх першых настаўнікаў. Кожны, у залежнасці ад таго, які след яны пакінулі ў яго жыцці, памятае яе ці яго па-свойму. Мне прыходзілася гутарыць з людзьмі, якія не памяталі сваёй першай настаўніцы. Не ведаю чаму, але зразумець гэтага я не магу. Магчыма таму, што сваю першую настаўніцу я прыгадваю літаральна па днях з першага па чацвёрты клас. Менавіта са школьных уражанняў аб Аляксандры Мікалаеўне хацелася б пачаць свой аповед.

У Семігосціцкую школу яна прыехала пасля заканчэння педагагічнага вучылішча разам са сваёй сяброўкай Кацярынай Мікалаеўнай Невяроўскай у жніўні 1958 г. Узгадваю, як нас першакласнікаў размяркоўвалі па класах. Я трапіў у 1«Б» клас да Аляксандры Мікалаўны.

У класах тады было па 30 і болей вучняў. Нашы класы пастаянна спаборнічалі паміж сабой па розных паказчыках: вучобе, грамадскіх справах, мастацкай самадзейнасці і г. д. Кацярына Мікалаеўна добра валодала музычнымі інструментамі, і ў мастацкай самадзейнасці яе клас быў крыху наперадзе.

Некалькі гадоў назад, успамінаючы аб тых часах, Аляксандра Мікалаеўна ўразіла мяне прызнаннем: «Мы з Кацярынай тады эксперыментавалі па новых методыках. Нас вельмі падтрымліваў у гэтай справе дырэктар школы Сяргей Данілавіч Ключнікаў…».

Гэты эксперымент, як зараз я яго ўспрымаю, быў у тым, што дзяўчаты многае рабілі не так, як гэта было да іх, не па накатанай гадамі школьнай методыцы, а як падказвала маладое, няўрымслівае сэрца, словам сказаць — літаральна «гарэлі» на працы. Толькі сёння я разумею, чаму кожны дзень мы вярталіся са школы на паўгадзіны ці болей пазней. Нам амаль што індывідуальна стараліся прывіваць навыкі і любоў да працы на зямлі, на дзялянках у школьным агародзе, дзе вырошчвалі квадратна-гнездавым спосабам бульбу і кукурузу і дзе ў выніку назіранняў рабілі свае першыя адкрыцці як вучоныя-земляробы. Збіралі па вёсцы попел, металалом і макулатуру, і заўседы нашы класы былі першымі — лёталі на ракеце, мала на самалёце і ніколі на трактарах. Стэнд з перадавікамі з'явіўся з іх прыездам. Сяброўкі стварылі школьны хор, мастацкую самадзейнасць, у якой іх класы бралі ўдзел амаль у поўным складзе.

Яшчэ адным яе «эксперыментам» была амаль поўная прысутнасць у жыцці вучняў. Пасля заняткаў яна чытала нам казкі народаў свету, прыгодніцкія гісторыі, прымушала пераказваць перад класам і асабіста прачытанае ў кнігах. Наведванне хворых вучняў настаўніцай у любую пару года было няпісаным правілам для таго часу. Яна ведала, дзе і як жыве кожны вучань, ведала іх бацькоў, сваякоў. Шчырасць, цеплыню, а таксама строгасць і правільнасць настаўніцы адчувалі не толькі вучні, але і іх бацькі. І таму яе памятаюць і сёння, праз паўвека.

З другога класа вучыла пісаць сачыненні. Спецыяльна купляла для гэтага сшыткі. Памятаю, што рэдка калі мне ўдавалася ўкласці свае думкі ў школьны сшытак. Не ведаў я, што мае сачыненні потым зачытваліся ў настаўніцкай. Іншым разам яна давала мне заданне ўважліва перапісаць у новы сшытак сачыненне, звяртаючы ўвагу на знакі прыпынку. Гэта была цяжкая справа. Я чырванеў ад сораму за «праглынутыя» часткі слоў, за адсутнасць косак і працяжнікаў і, не ведаючы куды схаваць вочы, зноў аддаваў сшытак. На другі дзень атрымліваў сшытак з выпраўленымі чырвоным алоўкам памылкамі і звычайнай адзнакай — 5/4.

Шмат можна сказаць пра тыя гады. У час веснавой паводкі ў школу трэба было плысці на лодках.

Маладыя настаўніцы, якія да гэтага ніколі не трымалі ў руках вёслаў, выдатна асвоілі новую для іх справу.

Чытанне прыгодніцкіх апавяданняў прывяло да таго, што мы пачалі будаваць ранняй вясной 1962 г. плот з бярвенняў старога мосту, на якім планавалі з прыходам веснавой паводкі здзейсніць падарожжа па Прыпяці ў Днепр, а затым у Чорнае мора і далей у краіну «райскай» птушкі. Цягаючы па вадзе бярвенні, уся наша група з шасці чалавек папрастуджвалася, і калі прыйшла вада, мы ўжо ляжалі хворымі. Як адзін з арганізатараў, я захварэў больш за іншых і больш месяца праляжаў ў бальніцы, бо не мог хадзіць. Аляксандра Мікалаеўна перад ад'ездам на вучобу ва щніверсітэт наведала мяне ў бальніцы. Абліваючыся слязьмі, я паведаміў ёй аб словах доктара Сыса, які сказаў, што лётчыкам і тым больш касманаўтам мне ўжо не быць. Не ведаю, што гаварыла яна пасля гэтага доктару, але праз некалькі дзён ён прынёс і падарыў мне кніжку ўспамінаў Дзмітрыя Мядзведзева [1].

Падчас вучобы ў Мінску Аляксандра Мікалаеўна падтрымлівала са мной перапіску. Яе пісьмы я акуратна складваў і захоўваў усе школьныя гады. Яны дзесьці знаходзяцца і зараз. Не ведаю, ці захаваліся мае паштоўкі да Аляксандры Мікалаеўны. Калі мы заканчвалі дзесяцігодку, А. М. Гесь прыехала паглядзець на свой клас. Больш чым з 60-ці вучняў 1«А» і 1«Б» завяршылі вучобу толькі 16.

Яшчэ раз Аляксандра Мікалаеўна прыязджала ў вёску ў 80-я гады, калі мы з ёй працавалі ў Гістпарце.

Аб гэтым перыядзе ў яе жыцці хацелася б сказаць колькі слоў.

На пасаду малодшых навуковых супрацоўнікаў мы трапілі ў адзін год. У жніўні 1975 г. пасля звальнення з вайсковай службы акадэмік І. М. Ігнаценка запрасіў мяне на працу ў аддзел ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Праз месяц у інстытут была залічана і Аляксандра Мікалаеўна. На той час яна ўжо шмат гадоў узначальвала школы Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў на пасадзе дырэктара. Навуковая дзейнасць у Гістпарце — асаблівы перыяд у жыцці кожнага, хто там працаваў. З аднаго боку, Гістпарт даваў магчымасць знаёміцца з шырокім колам крыніц, якія былі недаступны іншым даследчыкам, з другога боку — выключная адказнасць, вернасць лініі партыі, патрабавальнасць да ўсіх матэрыялаў, якія выходзілі з рук яго супрацоўнікаў.

У той час у Гістпарце працавала шмат высокаадукаваных спецыялістаў, у значна горшым стане сярод якіх знаходзіліся тыя, хто не меў дыплома кандыдата навук, бо працавалі яны, як усе, а атрымлівалі

[1] Мядзведзеў Дзмітрый Аляксандравіч (21.09.1918–26.11.1992) — знакаміты ваенны лётчык, узнагароджаны званнем Героя Савецкага Саюза (1946). — *Рэд.*

зарплату значна меншую. Асабліва гэта тычылася спецыялістаў жанчын. Дастаткова назваць прозвішчы Людмілы Аржаевай, Зоі Бялугі, Ніны Прахаровіч, Алы Маркавай, Яўгеніі Фалей, Аляўціны Вячоркі, Аляксандры Гесь… Кожная з іх па ўзроўню падрыхтоўкі, па глыбіні і дасведчанасці, па сваіх публікацыях давала фору многім «спечаным» у аспірантурах кандыдатам. Аднак у Гістпарце абароны сваіх супрацоўнікаў былі выключнай справай. І таму Аляксандра Мікалаеўна, гледзячы на такія адносіны, працу над кандыдацкай дысертацыяй не лічыла прыярытэтнай. Ды па сутнасці, улічваючы нагрузку па асноўнай працы, і не мела магчымасці.

Аднак пропуск у навуковы свет даюць не толькі дыпломы аб навуковых ступенях. І сваёй руплівай дзейнасцю А. М. Гесь пацвердзіла гэта. Зробленае ёю працуе на будучыню Беларусі. Памяць аб ёй жыве ў свядомасці тых, хто яе ведаў, як і будзе жыць усё тое, што яна зрабіла ў імя беларускай культуры і навукі.

Вяртаючыся да школьных часоў, хочацца адзначыць, што ўсяго чатыры гады А. М. Гесь выкладала ў Семігосціцкай школе, але нават зараз кожны, хто жыў у той час, памятае і добрым словам успамінае аб ёй. Я часта задумваўся, у чым прычына гэтага?

Адказ напрошваецца сам. Прычына ў тым, што яна была і застаецца ў свядомасці людзей, якія яе ведалі — Асобай.

Дзевяностадвухгадовая Ксенія Васільеўна Флар'яновіч, на кватэры якой жылі дзяўчаты, да сёняшняга часу лічыць іх за сваіх дачок.

Перадай Шуры, — так па-мацярынску называе яна Аляксандру Мікалаеўну, — мае найлепшыя пажаданні і маю крыўду, чаму яна перастала мне тэлефанаваць… Я кожны дзень аб ёй успамінаю.

Сказаць цяжкахворай жанчыне, якая пахавала ўжо мужа і траіх сыноў, што яе апошняй дачкі Аляксандры Мікалаеўны ўжо няма ў жывых, у мяне не хапіла моцы.

Няхай яна застаецца ў памяці старой, як дарэчы і ў маёй, жывой і чалавечнай!

Вечная памяць, дарагая Аляксандра Мікалаеўна!

*В. В. Урублеўскі, З. Л. Яцкевіч*

## Матэрыялы да біяграфіі і бібліяграфіі прац А. М. Гесь

Начатак 90-х гг. XX ст. можа лічыцца часам найбольш пільнага звароту ўвагі беларускіх даследчыкаў да пытанняў беларусістыкі і агульнанацыянальнай культурнай спадчыны 1920–1930-х гг. Адным з найбольш значных даследчыкаў гэтага перыяду выступае гісторык і архівіст Аляксандра Мікалаеўна Гесь (01.02.1940–17.03.2011). Разам з паплечнікамі-беларусістамі (М. М. Клімовічам, У. В. Ляхоўскім, У. М. Міхнюком і іншымі) яна вярнула з невядомасці імёны многіх рэпрэсіраваных грамадскіх і культурніцкіх дзеячаў даваеннага часу, а менавіта Язэпа Мамонькі, Макара Краўцова, Уладзіміра Сядуры, Уладзіміра Тэраўскага, Міхася Мялешкі, Вінцэнта Гадлеўскага і многіх іншых. Аляксандра Мікалаеўна займалася даследаваннем дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў, напрыклад Беларускага рабочага клуба, краязнаўчых і настаўніцкіх з'ездаў.

Вынікам яе працы ў Інстытуце гісторыі партыі (1975–1991), БелНДІДАС (1991–1995), НАРБ (1995–2007), НГАБ (2007–2009) сталі шматлікія публікацыі дакументаў, навуковыя і навукова-папулярныя артыкулы. Аляксандра Мікалаеўна з'яўляецца ўкладальнікам больш за дваццаці і рэдактарам некалькіх дзясяткаў зборнікаў дакументаў і артыкулаў, матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый, аўтарскіх распрацовак.

Ніжэй падаюцца матэрыялы да біяграфіі і бібліяграфія прац А. М. Гесь. Артыкулы і выданні змяшчаюцца ў спісе па храналагічнаму прынцыпу. Дадзены спіс з'яўляецца толькі першай спробай стварэння зводнага спіса апублікаваных работ А. М. Гесь. Яшчэ мусяць пабачыць свет многія выданні, над якімі яна працавала.

### Матэрыялы да біяграфіі

1. Пасляваеннае дзяцінства : з успамінаў А. М. Гесь з в. Гусакі Нясвіжскага р-на // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Нясвіжскага раёна. — Мінск, 2001. — С. 419–420.
2. (Без аўтара). Гесь Аляксандра Мікалаеўна (н. 1940) // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Кн. 2. — Мінск, 2003. — С. 366.
3. Шумейка, М. Ф. Гесь Аляксандра Мікалаеўна (н. 1940) // Архівісты Беларусі : біябібліяграфічны даведнік. — Мінск, 2006. — С. 89.
4. Шумейка, М. Ф. Гесь Аляксандра Мікалаеўна (н. 1940) // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі — скарбніца дакументальнай спадчыны. — Мінск, 2008. — С. 137–139.
5. Скалабан, В. Любіла вёску, бацькоўскі дом… // Літаратура і мастацтва. — 2011. — № 17. — С. 15.

Бібліяграфія

**1. Навуковыя і публіцыстычныя артыкулы А. М. Гесь**

1. Так начиналась национальная трагедия: Наблюдения и замечания из области национальной политики : из доклада председателя Комиссии ЦКК ВКП(б) В. П. Затонского на заседании Бюро ЦК КП(б)Б в июне 1929 года // Нёман. — 1992. — № 9. — С. 122–149 (совместно с Р. П. Платоновым, Н. С. Сташкевичем).
2. Праблемы беларусізацыі (20–30-я гг.) у дакументах НАРБ // Тэзісы навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Архівазнаўства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія Беларусі: стан і перспектывы» (Мінск, 1–2 снежня 1993 г.). — Ч. 2. — Мінск, 1993. — С. 36–41.
3. «Ударить более сильно…», или Как искали «врагов народа» : (из стенограммы обсуждения в бюро ЦК КП(б)Б 27 июня 1929 г. доклада председателя комиссии ЦКК ВКП(б) В. П. Затонского по итогам обследования практики проведения национальной политики в БССР) // Неман. — 1993. — № 12. — С. 117–129 (совместно с Р. П. Платоновым, Н. С. Сташкевичем).
4. Беларускі універсітэт павінен быць беларускім // Настаўніцкая газета. — 1994. — 24 вер.
5. Апостол национального возрождения : (публикация показаний А. Луцкевича) // Неман. — 1995. — № 1. — С. 127–166 (совместно с Н. М. Климовичем, В. Н. Михнюком).
6. Мамонька Язэп Аляксеевіч // Беларусь : энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 1995. — С. 461–462 (сумесна з М. М. Клімовічам, У. М. Міхнюком).
7. Ці мае беларускі народ сваю мову і культуру? : з дыскусіі вакол беларускай мовы // Звязда. — 1995. — 13 мая.
8. Як адстойвалі ўсходнія землі // Спадчына. — 1995. — № 6. — С. 37–40.
9. «Арышт Лёсіка лічу вялікай памылкай…» // Народная воля. — 1996. — Кастр. № 97. — С. 3; Тое ж: Наша слова. — № 46. — 14–20 ліст. — С. 4.
10. «Вір», які так і не завіраваў // Літаратура і мастацтва. — 1996. — 27 снеж. — С. 5, 14–15.
11. Жаночы камітэт пры Радзе беларускай калоніі ў Коўне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 1996. — Т. 3. — С. 364.
12. Жаночыя аддзелы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 1996. — Т. 3. — С. 365–366.
13. «Каб строіць будучае, — трэба ведаць мінулае» // Падарожнік. — 1996. — № 2. — С. 2–3; Тое ж: Наш край. — № 2(63).
14. «Калі песня жыве беларуса, будзе жыць беларускі народ!»: Жыццёвы і творчы шлях У. Тэраўскага // Мастацтва. — 1996. — № 12. — С. 67–74 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).

15. Краўцоў, М. Разгон : (успамін) ; 20 гадоў назад : (успамін пра Усебеларускі зьезд 1917 г.) // Спадчына. — 1996. — № 1. — С. 181–194.
16. Ліст да Усевалада Ігнатоўскага : (на Радзіму не вярнуліся) // Голас Радзімы. — 1996. — 24 кастр.
17. Глыбінны, У. (Сядура, У.) З гісторыі беларускага тэатру : «тэатральная дыскусія» : 1928–1929 гг. // Спадчына. — 1997. — № 3. — С. 182–191.
18. Жыцьцяпіс беларускага публіцыстага У. Глыбіннага // Спадчына. — 1997. –№ 3. — С. 160–181.
19. Каліноўскі Уладзімір Сямёнавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 1997. — Т. 4. — С. 33 (сумесна з А. Ліс).
20. Калі песня жыве беларуса — будзе жыць беларускі народ… // Голас Радзімы. — 1997. — 20 лют. (№ 8). — С. 1, 6; 27 лют. (№ 9). — С. 6; 6 сак. (№ 10). — С. 6; 13 сак. (№ 11). — С. 6; 20 сак. (№ 12). — С. 6; 27 сак. (№ 13). — С. 6 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
21. Камлюк Васіль Радзівонавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 1997. — Т. 4. — С. 52–53 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
22. Краўцоў Макар // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 1997. — Т. 4. — С. 254.
23. Са студэнцкай біяграфіі Мікалая Улашчыка // М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі : да 90-х угодкаў вучонага : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 14–15 лютага 1996 г.). — Мінск, 1997. — С. 81–88.
24. Учора і сёння : ці мае беларускі народ сваю мову і сваю культуру // Скарыніч. — Мінск, 1997. — Вып. 3. — С. 182–200.
25. «Іменем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі…» // Форум. — 1997–1998. — № 6–7. — С. 58–62.
26. «Выслаць за межы Беларусі…» // Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі : матэрыялы навук.-практ. канферэнцыі (27–28 лютага 1998 г.). — Мінск, 1998. — С. 23–31.
27. Дакументы Нацыянальнага архіва пра дзейнасць У. І. Пічэты // Гістарычныя крыніцы : праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канферэнцыі, прысвеч. 120-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Пічэты. — Мінск, 1998. — С. 111–112.
28. Краўцоў, Макар. Рада Беларускае Народнае Рэспублікі // Спадчына. — 1998. — № 1. — С. 75–126.
29. «Спыніць работы па выданню энцыклапедыі …» // Народная воля. — 1998. — 6 сак.
30. Яшчэ адзін след беларускага загранічнага архіва ў Празе // Замежная архіўная беларусіка : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 25–26 красавіка 1996 г.). — Мінск, 1998. — С. 27–35 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
31. «Ідзіце шляхам мядзведзічан, дамагайцеся сваёй роднай беларускай школы…» // Наша слова. — 1999. — 24 лют. (№ 8). — С. 7.
32. Краўцоў Макар, дзеяч бел. нац. — вызвал. руху, публіцыст, перакладчык // Беларуская энцыклапедыя. — Т. 8. — Мінск, 1999. — С. 467.

33. Мамонька Язэп Аляксеевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999. — С. 64 (сумесна з М. М. Клімовічам, У. М. Міхнюком).
34. Мінскае навуковае педагагічнае таварыства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999. — С. 165 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
35. Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасці // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999. — С. 169–170 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
36. Першая Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999. — С. 477.
37. Першы з’езд педагогаў беларускіх сярэдніх школ Заходняй Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999. — С. 481–482.
38. Першы Усебеларускі краязнаўчы з’езд // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999. — С. 484.
39. Платун Антон Мартынавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 5. — Мінск, 1999. — С. 512.
40. Поляк Іпаліт Паўлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 1999. — Т. 5. — С. 548 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
41. Эпісталярыя пісьменнікаў — «узвышэнцаў» // Скарыніч. — Мінск, 1999. — Вып. 4. — С. 58–111 (сумесна з А. Бабарэкам, Я. Кісялёвай).
42. Беларускі нацыянальна-вызвольны рух на Случчыне падчас польскай акупацыі // Спадчына. — 2000. — № 3. — С. 3–90 (сумесна з У. В. Ляхоўскім, У. М. Міхнюком).
43. Бяз права на ўласнасць // Спадчына. — 2000. — № 5–6. — С. 59–75.
44. Гартны, Ц. «На кніжцы трымаецца культура…» // Полымя. — 2000. — № 10. — С. 115–137.
45. Да 80-х угодкаў Слуцкага збройнага чыну // Спадчына. — 2000. — № 3. — С. 3–90.
46. Жаночы камітэт пры беларускай калоніі // Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету : энцыкл. давед. ; ч. 1 : беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах. — Мінск, 2000. — С. 194–195.
47. Каспяровіч на Случчыне // Чырвоная змена. — 2000. — 16 сак. — С. 5.
48. Каспяровіч на Случчыне // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Слуцкага раёна і г. Слуцка : у 2 кн. — Мінск, 2000. — Кн. 1. — С. 210–211.
49. Мамонька Язэп Аляксеевіч // Беларуская энцыклапедыя. — Т. 10. — Мінск, 2000. — С. 55 (сумесна з М. М. Клімовічам, У. М. Міхнюком).
50. Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасці // Беларуская энцыклапедыя. — Мінск, 2000. — Т. 11. — С. 416 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
51. «На кніжцы трымаецца культура…» : (публікацыя лістоў Ц. Гартнага да М. Мароза) // Полымя. — 2000. — № 10. — С. 137–156.
52. Слуцкі вузел – 1920 // Наша ніва. — 2000. — 27 лістап. (сумесна з У. В. Ляхоўскім, У. М. Міхнюком).
53. Усевалад Ігнатоўскі і Гомельшчына // Голас Радзімы. — 2000. — 12 ліп. (№ 28). — С. 5; 19 ліп. (№ 29). — С. 4; 26 ліп. (№ 30). — С. 4–5; 9 жн. (№ 32). — С. 5.

54. «Усякі іншы шлях лічу памылковым і шкодным» : беларусізацыя сельгасакадэміі, год 1925-ы // Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы. — Мінск, 2000. — С. 285–290.
55. Хмарка. Забытая паэтка 20-х гг. Н. Панамарова // Літаратура і мастацтва. — 2000. — 3 сак. (№ 9). — С. 14.
56. Хмарка. Пралеска : апавяданне // Бярозка. — 2000. — № 3. — С. 9–11.
57. Ядвігін Ш. Думкі кутніка // Полымя. — 2000. — № 9. — С. 115–137 (сумесна з В. У. Скалабанам).
58. Яна працавала з Янкам Купалам // Бярозка. — 2000. — № 3. — С. 8–11.
59. Бурвель Янка Восіпавіч // Памяць : Гісторыка-дакументальная хроніка Нясвіжскага раёна. — Мінск, 2001. — С. 142.
60. Вініцкі Алесь // Там жа. — С. 142–143.
61. Дакументы сведчаць // Там жа. — С. 126–140.
62. Калінінская акруга : хроніка беларускага культурнага жыцця 1920-х гг. // Спадчына. — 2001. — № 3. — С. 3–49.
63. Малойла Ганна // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Нясвіжскага раёна. — Мінск, 2001. — С. 143–144.
64. «Нельга кіравацца адным этнаграфічным матэрыялам…» // ARCHE. — 2001. — № 5. — С. 419–426.
65. Нясвіжчына ў 1917–20-я гады // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Нясвіжскага раёна. — Мінск, 2001. — С. 118–126.
66. Рак Рыгор Пракопавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Кн. 1. — Мінск, 2001. — С. 86.
67. Сядура Уладзімір Ільіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Кн. 1. — Мінск, 2001. — С. 462 (сумесна з У. Кушніравым).
68. Трэці Усебеларускі з’езд Саветаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Кн. 1. — Мінск, 2001. — С. 535 (сумесна з С. Самуэль).
69. Тэраўскі (Цераўскі) Уладзімір Васільевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Кн. 1. — Мінск, 2001. — С. 558 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
70. Хмарка // Матэрыялы канферэнцыі да 130-годдзя маці Максіма Багдановіча, Марыі Апанасаўны Багдановіч. — Мінск, 2001.
71. Шнаркевіч Язэп Канстанцінавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Нясвіжскага раёна. — Мінск, 2001. — С. 145.
72. Беларускай школьнай радзе Меншчыны : інфармацыя-атчот інструктара Ігуменскага павету Залужскага // Скарыніч. — Мінск, 2002. — Вып. 5. — С. 80–81.
73. Вольны (Каспяровіч, М.). Родная мова // Скарыніч. — Мінск, 2002. — Вып. 5. — С. 77–78.
74. Вольны (Каспяровіч, М.). Родная мова і школа // Скарыніч. — Мінск, 2002. — Вып. 5. — С. 78–80.
75. «Загадчык бібліятэкі Іван Луцэвіч…» // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі. — Вып. 5. — Мінск, 2002. — С. 144–152 (сумесна з В. У. Скалабанам).

76. З інфармацыі інструктара В. Залужскага ў БНК Меншчыны // Скарыніч. — Мінск, 2002. — Вып. 5. — С. 81–82.
77. Ці знаем, што трэба рабіць? : (пра песню «Ад веку мы спалі») // Мастацтва. –2002. — № 2. — С. 31–35.
78. «Быў час, была эпоха…» : «пэрлы» з архіўных збораў і ўспамінаў пра савецкую рэчаіснасць [1919–1926] // Спадчына. — 2003. — № 2–3. — С. 116–120.
79. Купаліяна ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь // Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс : матэрыялы навук. канф. — Мінск, 2003. — С. 40–45.
80. Максім Гарэцкі і савецка-літоўскія дачыненні (1920 г.) : ліст Максіма Гарэцкага да М. С. Міцкевіча-Капсукаса // Гарэцкія чытанні : матэрыялы навук. канф. — Мінск, 2004. — С. 70–76.
81. Вернутае з небыцця імя : Успенскі Яўген Канстанцінавіч // Университет профессорский. — Гомель, 2005. — С. 327–329.
82. «Быў час, была эпоха…» : «пэрліны» з архіўных збораў і ўспамінаў пра савецкую рэчаіснасьць ; вып. 2 [1919–1928 гг.] // Спадчына. — 2006. — № 1. — С. 95–101.
83. З жыцця і дзейнасці кс. В. Гадлеўскага // Спадчына. — 2006. — № 1. — С. 36–47 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
84. Міхась Мялешка вяртаецца на Беларусь // Архіварыус. — Вып. 5. — Мінск : БелНДІДАС, 2007. — С. 46–51.
85. Памяці прафесара Уладзіміра Міхнюка // Беларускі археаграфічны штогоднік. — Вып. 8. — Мінск : БелНДІДАС, 2007. — С. 244–246 (сумесна з У. В. Ляхоўскім).
86. Як трапілі ў архіў дакументы Палуты Бадуновай // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 5. — Мінск : БелНДІДАС, 2007. — С. 14–20 (сумесна з Н. Я. Калеснік).
87. Беларускі рабочы клуб // Архіварыус. — Вып. 6. — Мінск : БелНДІДАС, 2008. — С. 45–58.
88. Мае ўспаміны пра Уладзіміра Мікалаевіча Міхнюка // Праблемы гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі ў Беларусі : матэрыялы «круглага стала», прысвеч. 60-годдзю з дня нараджэння праф. У. М. Міхнюка (Мінск, 28 верасня 2007 г.). — Мінск : БелНДІДАС, 2008. — С. 27–29.

**2. Навуковыя выданні**

**2.1. Рэдактура — А. М. Гесь**

1. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944). — Мінск, 1995. — 416 с.

2. М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага): Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 14–15 лютага 1996 г.). — Мінск, 1997. — 362 с.
3. Цітоў, А. К. Метадычныя парады па апісанню помнікаў сфрагістыкі для архіваў і музеяў. — Мінск, 1997. — 44 с.
4. Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі : матэрыялы навук.-практ. канф. (27–28 лютага 1998 г.). — Мінск, 1998. — 278 с.
5. Лёсік, Я. 1921–1930 : збор твораў. — Мінск, 2003. — 395 с.
6. Фонды Национального исторического архива Беларуси : справочник. — Минск : БелНИИДАД, 2006. — 304 с.
7. Гербоўнік беларускай шляхты. — Т. 2.Б. — Мінск : НАРБ, 2007. — 670 с.
8. Архіварыус : Зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 5. — Мінск : БелНДІДАС, 2007. — 262 с.
9. Архіварыус : Зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 6. — Мінск : БелНДІДАС, 2008. — 328 с.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы юбілейнай навук.-практ. канферэнцыі, прысвеч. 70-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 8 ліпеня 2008 г.). — Мінск : НАРБ, 2008. — 251 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі — скарбніца дакументальнай спадчыны : 1938–2008. — Мінск : НАРБ, 2008. — 267 с.
12. Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 7. — Мінск : БелНДІДАС, 2009. — 344 с.

**2.2. Укладанне — А. М. Гесь**

1. Хроника важнейших событий истории КПБ. Ч. 3. — Мінск, 1980. — 470 с.
2. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. — Мінск, 1983. — 526 с.; Т.2. — Мінск, 1984. — 510 с.; Т. 3. — Мінск, 1986. — 550 с.
3. По воле народа: из истории организации БССР и создания КПБ. — Мінск, 1988. — 254 с.
4. К. Калиновский: из печатного и рукописного наследия. — Мінск, 1988. — 208 с.
5. Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии. Ч. 1. — Мінск, 1990. — 358 с.
6. Архіўная справа на Беларусі ў дакументах і матэрыялах (1921–1995 гг.). — Мінск, 1996. — 180 с.
7. Антон Луцкевич : материалы следственного дела НКВД БССР. — Минск, 1997. — 203 с.
8. Озаричи — лагерь смерти : документы и материалы. — Минск, 1997. — 130 с.
9. М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага) : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 14–15 лютага 1996 г.). — Мінск, 1997. — 362 с.

10. Бібліятэка Міхася Мялешкі : звод. каталог. — Мінск, 1998. — 60 с.
11. Заложники вермахта : (Озаричи — лагерь смерти) : документы и материалы. — Минск, 1999. — 313 с.
12. Узники Озаричских лагерей вспоминают. — Минск, 1999. — 160 с.
13. Бібліятэчная справа на Беларусі : дакументы і матэрыялы, 1959–1975. — Мінск, 2000. — 532 с.
14. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах. — Мінск, 2001. [1-е выд.] — 372 с.
15. Ёсць на карце месца… : грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі, 1921–1938 : каталог : выстава ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі з 27 мая па 3 ліпеня 2002 г. — Мінск, 2002. — 87 с.
16. Купала, Я. Поўны збор твораў: У 9 т. — Т. 9. — Кн. 1. Пераклады; Эпісталярная спадчына; Дарчыя надпісы; «Расейска-беларускі слоўнік»; Калектыўнае; Службовыя і асабістыя дакументы; Дадатак. — Мінск, 2003. — 685 с.
17. Купала, Я. Поўны збор твораў: У 9 т. — Т. 9. Кн. 2. Дапаўненні да папярэдніх тамоў; Летапіс жыцця і творчасці; Дадатак. — Мінск, 2003. — 413 с.
18. Лёсік, Я. 1921–1930 : збор твораў. — Мінск, 2003. — 395 с.
19. Шкялёнак, М. Беларусь і суседзі : гістарычныя нарысы. — Беласток, 2003. — 297 с.
20. 1 января 1919 года : Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии : документы и материалы. — Мінск, 2005. — 302 с.
21. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах. — Мінск, 2006. [2-е выд.] — 399 с.

***Рабинович, Э.** Фамилии, основы родословных евреев Минской губернии в XVIII – начале XX века. Книга 1. — Минск, 2010. — 281 с.*

Беларуская гістарыяграфія ў галіне генеалогіі час ад часу папаўняецца даволі сур'ёзнымі даследаваннямі, якія заснаваны на шырокім коле выкарыстаных крыніц. Адной з апошніх прац па генеалогіі такога плану з'яўляецца выданне «Прозвішчы, асновы радаслоўных яўрэеў Мінскай губерніі ў XVIII – пачатку XX века», што пабачыла свет намаганнямі аматара-генеалога Эдуарда Яўсеевіча Рабіновіча ў 2010 г.

Праца выдадзена на правах рукапісу тыражом у 20 экзэмпляраў за рэцэнзіяй доктара гістарычных навук, прафесара Э. Р. Іофэ і ўяўляе сабой першую частку шырокага даследавання па генеалогіі і антрапаніміцы яўрэйскіх сем'яў гарадоў і мястэчак Мінскай губерні. Першая кніга прысвечана яўрэям Барысаўскага, Ігуменскага, Мінскага паветаў. Другую кнігу аўтар мяркуе прысвяціць яўрэйскім сем'ям Бабруйскага, Слуцкага і Наваградскага паветаў, трэцюю — згаданым сем'ям у межах Пінскага, Мазырскага і Рэчыцкага паветаў.

Выданне складаецца з прадмовы, пяці частак і дадатку. Першая частка носіць аналітычны характар. У ёй пададзены кароткі нарыс гісторыі яўрэяў на тэрыторыі Беларусі са старажытнасці да 1917 г., асвятляюцца асаблівасці фарміравання яўрэйскіх прозвішчаў у краінах Еўропы. Даследуюцца асновы заканадаўства Расійскай імперыі на гэты конт, а таксама матэрыялы перапісаў беларускіх яўрэяў у канцы XVIII – пачатку XX ст.

Аўтарам прапаноўваецца новы падыход у класіфікацыі яўрэйскіх прозвішчаў, які адказвае на пытанне, ці існуе сувязь паміж сем'ямі, што маюць агульнае прозвішча. Дадзены падыход называецца аўтарам класіфікацыяй на генетычнай аснове. Прозвішчы падзяляюцца на монасямейныя (прадстаўнікі — кроўныя родзічы) і полісямейныя (прадстаўнікі — аднафамільцы). У адпаведнасці з класіфікацыяй прозвішчаў па паходжанні яны падзяляюцца на патранімічныя, прафесійныя, тапанімічныя, мянушкі-прозвішчы, прозвішчы, паходжанне якіх звязана з рэлігійнай службай.

Немалая ўвага ў працы надаецца методыцы даследавання. Вызначаецца галоўная мэта — дапамога ўсім зацікаўленым у распрацоўцы яўрэйскіх радаслоўных. У адпаведнасці з мэтай вырашаюцца тры задачы: 1) на падставе архіўных матэрыялаў скласці агульны спіс яўрэяў, якія пражывалі ў Мінскай губерні ў канцы XVIII – пачатку XX ст.; 2) правесці класіфікацыю прозвішчаў з падзелам іх на монасямейныя і полісямейныя; 3) даследаваць міграцыю яўрэйскіх сем'яў па тэрыторыі Беларусі на працягу XIX ст.

Для даследавання абраны перыяд знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Крайнія даты вызначаны правядзеннем пятай гене-

ральнай рэвізіі 1795 г., якую аўтар памылкова называе шостай і датуе 1796 г., і Лютаўскай рэвалюцыяй 1917 г. Тэрыторыяй, у межах якой адбываецца даследаванне, абрана Мінская губерня па стану на 1811 г., за выключэннем Вілейскага і Дзісненскага паветаў, якія ў 1842 г. увайшлі ў склад Віленскай губерні. У другой кнізе, як згадана вышэй, будзе закранута таксама тэрыторыя Наваградскага павета, які ўвайшоў у склад Мінскай губерні ў тым жа 1842 г.

Усе яўрэйскія прозвішчы аўтар падзяляе на асноўныя (прыналежныя неменш чым тром сем'ям) і рэдкія (прыналежныя не больш чым двум сем'ям). У апошнюю групу таксама ўключаюцца варыянты прозвішчаў. Праведзены т. зв. «частотны аналіз» прозвішчаў у кожным населеным пункце з мэтай вызначэння сярод іх монасямейных або полісямейных.

Пры даследаванні антрапанімікі яўрэйскага насельніцтва аўтар выкарыстоўвае матэрыялы асноўных і дадатковых рэвізскіх сказак канца XVIII – сярэдзіны XIX ст., пасямейныя спісы другой паловы XIX – пачатку XX ст., рэкруцкія спісы, спісы плацельшчыкаў падатку і выбаршчыкаў у Дзяржаўную Думу і інш. Акцэнт пры гэтым зроблены на матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ). Акрамя гэтага, выкарыстаны звесткі, апублікаваныя ў Мінскіх, Маскоўскіх, Санкт-Пецярбургскіх, Кіеўскіх губернскіх ведамасцях. Дадатковыя крыніцы, якія не адпавядаюць храналагічнаму адрэзку, акрэсленаму аўтарам, але выкарыстаны ў першай кнізе, зберагаюцца ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці (ДАМВ) і Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ).

Тры наступныя часткі закранаюць Мінскі, Барысаўскі і Ігуменскі паветы. Напачатку кожнай даецца агульная характарыстыка гісторыі тэрытарыяльнай адзінкі, паказчыкаў яўрэйскага народанасельніцтва. У пачатку другой часткі па Мінскім павеце таксама пададзена характарыстыка адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Мінскай губерні ў XIX ст. Асноўнае месца ў кожнай з трох частак займаюць табліцы. Калі дзве першыя табліцы акцэнтаваны на падлік колькасці яўрэйскага насельніцтва па ўсёй Мінскай губерні ў канцы XIX ст. і вызначэнне саслоўнай прыналежнасці яўрэяў-менчукоў на момант 1834 г., то астатнія змяшчаюць сістэматызаваныя матэрыялы рэвізскіх сказак і пасямейных спісаў XIX ст. Прозвішчы змешчаны ў алфавітным парадку з пазначэннем колькасці двароў, замацаваных за кожным з іх. Акрамя агульных спісаў прозвішчаў у шэрагу выпадкаў аўтарам прыводзіліся: спіс найбольш ранніх («старэйшых») прадстаўнікоў яўрэйскіх родаў, якія вядомы па матэрыялах рэвізій; спіс найбольш і найменш распаўсюджаных прозвішчаў, складзены на падставе рэвізій першай паловы XIX ст.; варыятыўны рад прозвішчаў на прыкладзе асобных мястэчак (напрыклад, Лагойск); спіс зніклых прозвішчаў (напрыклад, Плешчаніцы).

Сярод населеных пунктаў Мінскага павета, кампактна заселеных яўрэямі ў XIX ст., прадстаўлены Мінск, Гарадок [1], Заслаўе, Івянец, Койданава, Камень, Новы Свержань, Ракаў, Рубяжэвічы, Самахвалавічы, Стоўбцы. У Барысаўскім павеце такімі паселішчамі з'яўляліся Барысаў, Докшыцы, Зембін, Красналукі, Лагойск, Аколава, Плешчаніцы, Смалявічы, Халопенічы. У Ігуменскім павеце — Ігумен, Бярэзіна, Багушэвічы, Дукора, Клічаў, Лапічы, Лошыца [2], Магільна, Пагост, Пухавічы, Смілавічы, Узда, Вузляны, Халуй [3], Шацк.

Аналітычнае даследаванне багатага эмпірычнага матэрыялу здзяйсняецца на прыкладзе прозвішчаў Ігуменскага павета. Прыводзіцца геаграфія распаўсюджання яўрэйскіх прозвішчаў па тэрыторыі Ігуменскага павета, на падставе перапісаў вызначаецца іх дынаміка на працягу XIX ст., праводзіцца параўнанне з прозвішчамі Мінскага павета, на падставе чаго вылучаюцца «сумесныя» (полісямейныя) прозвішчы. Акрамя гэтага, аўтарам раскрываецца паходжанне і сэнсавае значэнне асобных фамільных утварэнняў.

У якасці заўвагі да згаданых трох частак кнігі можна вылучыць адсутнасць спасылак на крыніцы да кожнай з табліц, якія змяшчаюць матэрыялы асобнага перапісу па вызначаным мястэчку. Нягледзячы на тое што ўсе крыніцы пералічаны напрыканцы працы, пазнака аб іх месцы захоўвання ў тэксце магла б паспрыяць больш спрошчанаму пошуку яўрэйскай генеалогіі для кожнага жадаючага.

Нягледзячы на тое што верхняй крайняй датай у сваім даследаванні аўтар вызначае 1795 г., час правядзення першай для Мінскай губерні рэвізіі, звесткі па ёй у даследаванні не выкарыстоўваюцца.

Частка пятая прысвечана практычным пытанням даследавання радаслоўных яўрэйскіх сем'яў. У якасці такіх узяты радаслоўныя продкаў аўтара па лініі бацькі Яўсея Лейбавіча Рабіновіча (1900–1974) да восьмага пакалення і маці Браніславы Эльеўны Кабаковай (1900–1974) да сёмага пакалення. Акрамя гэтага, аўтарам уздымаюцца некаторыя праблемы, якія тычацца складання радаслоўных і адзначаны ім на падставе ўласнага досведу. Першым перапісам, які засведчыў стварэнне яўрэйскіх прозвішчаў, называецца рэвізская сказка 1811 г. Асобнай даволі цікавай, але мала зразумелай спробай з'яўляецца пабудова аўтарам «асноў радаслоўных шэрагу фамільных сямействаў XIX века», дзе пададзены імёны абраных прадстаўнікоў асобных яўрэйскіх родаў, народжаных каля 1895 г. Акрамя гэтага змешчаны імёны іх бацькоў і родных братоў. Не зусім зразумела, якім прынцыпам карыстаўся аўтар

[1] Цяпер — в. Астрашыцкі Гарадок Мінскага р-на Мінскай вобл.

[2] Верагодна, маецца на ўвазе Лоша (цяпер — Уздзенскі р-н Мінскай вобл.).

[3] Цяпер — в. Ліпень Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

для адбору тых ці іншых асоб. Недахопам з’яўляецца і тая акалічнасць, што месца пражывання азначаных яўрэйскіх сем’яў аўтар не падае. Тэрмін «фамільнае сямейства» ўводзіць у навуковы дыскурс трэба грунтоўна патлумачыўшы сутнасць.

У заключэнні змешчаны спіс архіўных крыніц і літаратуры. Аднак і тут нельга абысціся без заўваг: некаторыя крыніцы ў спісе паўтараюцца па некалькі разоў і не па парадкавым нумары фондаў, прозвішчы аўтараў у спісе літаратуры пададзены не па алфавіце і не перад ініцыяламі або імёнамі, а пасля іх.

У дадатку змешчаны асабовы паказальнік (называецца «паказальнікам прозвішчаў»), дадатковы спіс прозвішчаў, геаграфічны паказальнік («паказальнік населеных пунктаў»). Напрыканцы пададзена каляровая карта Мінскай губерні.

Дадзенае даследаванне можна лічыць праведзеным на дастаткова сур’ёзным узроўні, што з’яўляецца безумоўнай заслугай паважанага аўтара. Аднак падвядзенне канчатковых вынікаў працы можа адбыцца толькі пасля апублікавання дзвюх наступных кніг, прысвечаных яўрэйскай антрапаніміцы і генеалогіі іншых паветаў Мінскай губерні.

Асобныя пытанні выклікаюць тэрміналогія і стыль, над якімі павінна надалей праводзіцца сур’ёзная рэдактарская праўка.

Увогуле выданне ўяўляе сабой комплекснае даследаванне, якое прадстаўляе ўвазе чытача шырокае кола багатага эмпірычнага матэрыялу, карыснага пры правядзенні генеалагічнага і антрапанімічнага пошуку. Можам пажадаць шаноўнаму аўтару ў далейшым больш шырокім тыражом з улікам выказаных заўваг публікаваць свае даволі патрэбныя і змястоўныя напрацоўкі.

Даследаванне будзе цікава і карысна архівістам НГАБ (для працы над генеалагічнымі запытамі), навукоўцам, краязнаўцам, аматарам, усім, хто цікавіцца праблемамі гісторыі, генеалогіі і антрапанімікі яўрэйскага насельніцтва Мінскай губерні.

*В. В. Урублеўскі*

*Русская Православная Церковь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. : сборник документов / сост. : О. Ю. Васильева, И. И. Кудрявцев, Л. А. Лыкова. — М. : Изд-во Крутицкого патриаршего подворья, 2009. — 765 с.*

Вясной 2009 г. пабачыў свет зборнік дакументаў, які адлюстроўвае гісторыю Рускай праваслаўнай царквы ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Зборнік апублікаваны ў рамках серыі «Матэрыялы па гісторыі царквы» выдавецтвам Круціцкага падворка і Таварыствам аматараў царкоўнай гісторыі (кніга з'яўляецца 43-м томам серыі) у колькасці 30 тыс. экзэмпляраў. Выданне зборніка — працяг публікацыі дакументаў па гісторыі Рускай праваслаўнай царквы (далей — РПЦ) у 1941–1945 гг.

У складанні зборніка прымаў удзел шэраг дзяржаўных архіваў Расіі, Украіны і Беларусі. Дакументы для публікацыі былі выяўлены ў федэральных і дзяржаўных архівах Масквы і Санкт-Пецярбурга, у Курскім і Пскоўскім абласных архівах, Цэнтральным Архіве ФСБ Расіі і Архіве Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, Цэнтральным дзяржаўным архіве вышэйшых органаў улады і кіравання Украіны, Цэнтральным дзяржаўным архіве грамадскіх аб'яднанняў Украіны, Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва Украіны, Дзяржаўным архіве Сумскай вобласці, Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Магілёўскім, Віцебскім і Мінскім дзяржаўных архівах. Акрамя таго, выкарыстаны матэрыялы, раней апублікаваныя ў зборніках дакументаў, якія асвятляюць царкоўна-дзяржаўныя адносіны ў СССР і становішча РПЦ у 1941–1945 гг. У зборнік уключаны 221 дакумент, з якіх 197 публікуюцца ўпершыню. Таксама ў кнізе прыведзены фотаздымкі з Расійскага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Архіва Прэзідэнта РФ, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва гісторыка-палітычных дакументаў Санкт-Пецярбурга і Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў.

У зборніку публікуюцца, галоўным чынам, дакументы абагульняючага характару, большасць з іх цалкам, за выключэннем тых матэрыялаў, дзе да тэмы зборніка мае адносіны толькі частка тэксту. Пры паўторнай публікацыі дакументаў удакладнены загалоўкі, датаванне, легенды, ліквідаваны недахопы ў перадачы іх тэксту. Археаграфічнае афармленне дакумента ўключае загаловак, дату, месца складання і архіўную легенду, а таксама змяшчаецца архіўны шыфр, пазнака аб сапраўднасці і папярэдняя публікацыя. Акрамя таго, даюцца спасылкі на ўсе знойдзеныя асобнікі дакумента, якія захоўваюцца ў розных архівах.

Зборнік складаецца з гістарычнай і археаграфічнай прадмоў, трох раздзелаў, заўваг па змесце і тэксце дакументаў, імяннога паказальніка, кароткіх біяграфічных даведак.

Першы раздзел адлюстроўвае дзейнасць Маскоўскай патрыярхіі, яе духавенства ў гады вайны. У раздзеле прадстаўлены пасланні Маскоўскага патрыярха, перапіска, справаздачы, даведкі і іншыя дакументы царкоўных органаў кіравання і іерархаў, якія сведчаць аб патрыятычнай дзейнасці духавенства.

Другі раздзел асвятляе палітыку Савецкай улады ў дачыненні да РПЦ у гады вайны. Дадзены раздзел прадстаўлены пастановамі СНК па пытаннях царквы, дакументамі Савета па справах РПЦ, дакладнымі запіскамі, справаздачамі і даведкамі розных органаў улады як у цэнтры, так і на месцах.

Трэці раздзел адлюстроўвае палітыку германскіх улад адносна прадстаўнікоў рэлігійнага культу на акупіраванай тэрыторыі. Змешчаны аператыўныя загады і данясенні, справаздачы аператыўных груп аб становішчы царквы на акупіраваных тэрыторыях, матэрыялы Пскоўскай праваслаўнай місіі, артыкулы на царкоўную тэматыку з падкантрольных немцам органаў друку, даклады розных асоб аб становішчы царквы ва Украіне і Беларусі з прапановамі па арганізацыі рэлігійнай палітыкі Рэйха на гэтай тэрыторыі.

Зборнік уключае 15 дакументаў з беларускіх архіваў. Гэта матэрыялы Беларускага штаба партызанскага руху (ф. 3500), Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання ў працы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні і высвятленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўліку прынесенай імі шкоды па БССР (1943–1946) (ф. 845), Упаўнаважанага Савета па справах РПЦ пры СМ СССР па БССР (1944–1965) (ф. 951) з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь; Мінскай абласной камісіі садзейнічання ў працы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні і высвятленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўліку прынесенай імі шкоды па БССР (ф. 1) з Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці; Магілёўскага аддзела Беларускай народнай самадапамогі (1942–1944) (ф. 274), Магілёўскай гарадской управы (1941–1944) (ф. 260), Асіповіцкай раённай управы (1941–1944) (ф. 845) з Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці; Браслаўскай раённай управы (1941–1944) (ф. 2848), Глыбокскага акруговага камісарыята (1941–1944) (ф. 2829) з Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

Прыведзеныя дакументы сведчаць аб удзеле духавенства ў падпольным і партызанскім руху, характарызуюць становішча царквы на акупіраванай і вызваленай у 1943–1945 гг. тэрыторыі. З цікавых для даследчыкаў дакументаў можна вылучыць рэзалюцыю аўтаномнай праваслаўнай Беларускай царквы аб разарванні кананічнай сувязі з Маскоўскай патрыярхіяй (Мінск, 1944 г.), спецпаведамленне ў Мінскі абкам ВКП «Аб дзейнасці царкоўна-сектанцкага элемента ў перыяд

нямецкай акупацыі Мінскай вобласці». Акрамя таго, таксама неабходна згадаць апублікаваныя дакументы Расійскага дзяржаўнага ваеннагістарычнага архіва, якія змяшчаюць звесткі аб стане хрысціянскіх канфесій (і асобна праваслаўнай царквы) у Беларусі ў 1941–1942 гг.

Кніга асвятляе новы курс рэлігійнай палітыкі Савецкай улады ў дачыненні да праваслаўнай царквы ў 1941–1945 гг., дзейнасць рэлігійных устаноў на акупіраванай тэрыторыі. На падставе ўпершыню надрукаваных крыніц у зборніку прыводзяцца абставіны забойства мітрапаліта Сергія Васкрасенскага ў Прыбалтыцы ў 1943 г., ліквідацыі уніяцкай царквы ў Заходняй Украіне, праводзімай нацыстамі палітыкі ў адносінах да праваслаўнай царквы ва Украіне.

Разам з тым, нельга не адзначыць і недахопы зборніка. Адсутнічае пералік апублікаваных дакументаў. У прадмове згадваюцца не ўсе выкарыстаныя ў кнізе архіўныя фонды (не адзначаны фонды беларускіх і ўкраінскіх архіваў). Адсутнічае бібліяграфічны спіс. У прадмове даецца толькі агульная характарыстыка гістарыяграфічнай базы, не звяртаецца ўвага на артыкулы перыядычнага друку. Адсутнічаюць геаграфічны паказальнік і спіс скарачэнняў.

Зборнік дакументаў «Руская Праваслаўная Царква ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1945 гг.» з'яўляецца першым зборам дакументаў архіваў Расіі, Украіны і Беларусі па адзначанай тэматыцы. Кніга мае несумненную цікавасць для даследчыкаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй РПЦ і Вялікай Айчыннай вайны.

*І. А. Вішнеўскі*

***Nagielski, M.*** *The Decline of the Traditional Polish Warfare in the Period of the Great Northern War. — Warszawa : Akme. Studia Historica, 2010. — 55 s.*

Англоязычное издание профессора Исторического института Варшавского университета Мирослава Нагельского, известного специалиста по военной истории, посвящено состоянию армии Речи Посполитой в период Северной войны. Сама работа по объему небольшая, но факт ее появления свидетельствует об определенном интересе к данной тематике в англоязычных научных кругах.

Работа М. Нагельского состоит из основного текста, который не имеет делений на разделы, и библиографического дополнения. Вначале автор делает историографический обзор, касающийся данной темы, начиная с работ, изданных еще в XIX в., и заканчивая исследованиями последних лет. Следует подчеркнуть, что все внимание уделено только польской историографии. Помимо этого, автор использовал материалы

и документы архивов Радзивиллов и Замойских из Главного архива древних актов (AGAD), материалы Центрального государственного исторического архива Украины (г. Львов), манускрипты Библиотеки князей Чарторыйских.

В данной работе автор ограничил рамки своего исследования вопросами, связанными с организацией армии, особенностями социальной и национальной структуры и тактики, используемой в период Северной войны.

Структура армии Речи Посполитой рассматривается на основе количественного сравнения с армиями таких европейских стран, как Франция, Голландия, Россия, Швеция, Империя Габсбургов. Указанное сравнение основано на количественных данных, которые создают яркую картину малочисленности армии Речи Посполитой в масштабах Европы. Однако Нагельский уделяет внимание не просто количественному составу войск, но и соотносит данные величины с количеством населения, проживавшего в упоминаемых в работе европейских государствах. Пожалуй, единственным недостатком данного анализа является то, что он основан на результатах, приведенных в других исторических работах, польской, немецкой, шведской и американской историографии, а не на данных архивных документов. Важным также является сравнение бюджетов, которые расходовались Францией и Речью Посполитой на содержание армий, что еще больше подчеркивает военную слабость последней.

Меньше внимания уделено национальному составу армии Речи Посполитой. Подчеркивается только, что она состояла в большинстве своем из уроженцев Речи Посполитой. Иностранцев, которые в основном являлись представителями офицерского состава, было крайне мало.

Важным в работе является рассмотрение количественного состава отдельных родов войск, в частности кавалерии и пехоты, и его изменения на протяжении второй половины XVII в. Главным показателем при этом является определение количества лошадей, которые были задействованы в военных кампаниях второй половины XVII – начале XVIII в. и формировали легкую кавалерию в составе гусар и «товарищей панцерных». Автор уделяет не так много внимания количественному составу пехоты, но особый интерес представляет его исследование национального состава данного рода войск. Стоит отметить, что основой этого анализа является работа Яна Виммера «Польское войско и военное искусство в период Северной войны», в которой уже приведены все необходимые количественные данные.

Одной из причин кризиса в армии Речи Посполитой автор называет недостаточное материальное обеспечение, что отрицательно сказывалось на мотивации солдат и войск. Также отрицательным фактором

являлась боязнь за имущественную собственность, которая подвергалась постоянным грабежам как со стороны своих же войск, так и с противоборствующей стороны. Изредка приводятся примеры, взятые из архивных источников, иллюстрирующие конфликты, возникавшие в связи с взиманием денег на военные нужды. После рассмотрения вопроса о плохом материальном обеспечении армии основной причиной упадка военного искусства автор называет все-таки не плохое финансирование, а крах дисциплины и боевого духа в среде воинов.

Причинами упадка военной силы Речи Посполитой, по мнению Нагельского, являлись также недостатки в тактическом планировании и отсутствие адекватной координации между различными частями. Последнее, например, стало причиной провала военной кампании весной 1709 г. Отмечается, что воины иностранных частей были по всем параметрам лучше образованы и натренированы, чем воины — уроженцы Речи Посполитой. Кроме этого, само командование отличалось недостаточным профессионализмом, не осознавало специфику военной ситуации начала XVIII в. и поэтому не всегда действовало по ситуации. Однако автор не исследует причины возникновения этих недостатков в обучении и тренировке воинов. Отмечается, что кризис затронул в большей степени национальные части армии, иностранные военные единицы были подвержены этому значительно меньше.

В конце Нагельский систематизирует все сказанное, тезисно выделяя основные причины упадка армии Речи Посполитой, что значительно облегчает осознание всего материала, в связи с тем, что не все причины были раскрыты в работе до этого. Автор справедливо отмечает, что кризис армии был вызван, в основном, неэффективной системой управления армии на государственном уровне, но этот момент в самой работе никак не оговаривается. Однако в качестве основной причины им выделяется упадок дисциплины и боевого духа среди солдат, при этом игнорируются недостатки существовавшей системы управления армии.

В целом данная работа является хорошим анализом польской историографии по вопросам, касающимся состояния армии Речи Посполитой во второй половине XVII – начале XVIII в., и будет интересна тем, кто занимается военной историей, историей Речи Посполитой и Беларуси в частности.

*А. Н. Можейко*

# Рэзюмэ

**Вішнеўскі Ілля Аляксеевіч,**
магістрант Інстытута тэалогіі імя св. Кірыла і Мяфодзія (БДУ).

*«Архівы абнаўленчых устаноў Беларусі (1922–1935 гг.)».*

На падставе дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) і Дзяржаўнага архіва Аўтаномнай Рэспублікі Крым упершыню даследуюцца асаблівасці гісторыі і арганізацыі архіўнай справы ва ўстановах абнаўленчай царквы Беларусі (гісторыя архіваў, віды дакументацыі, дакументазварот, прынцыпы фарміравання архіўных спраў). Даецца ацэнка ступені захаванасці беларускіх абнаўленчых архіваў.

***Яго ж*** *інфармацыя аб: «Русская Православная Церковь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. : сборник документов / сост.: О. Ю. Васильева, И. И. Кудрявцев, Л. А. Лыкова. — М. : Изд-во Крутицкого патриаршего подворья, 2009. — 765 с.».*

Рэцэнзуецца зборнік дакументаў, якія асвятляюць гісторыю Рускай праваслаўнай царквы ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Адзначаюцца станоўчыя бакі выдання і яго недахопы. Значная ўвага надаецца дакументам з беларускіх архіваў. Вызначаецца іх навуковы патэнцыял пры даследаванні пытанняў стану і дзейнасці праваслаўнай царквы на Беларусі ў 1941–1945 гг.

**Галубовіч Ала Купрыянаўна,**
дырэктар Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ).

*«Гісторыя рода Стацкевічаў-Чабаганавых — пазнанне гісторыі народа».*

Разглядаюцца вынікі генеалагічнага даследавання генеалога-аматара Анатоля Васільевіча Стацкевіча-Чабаганава, прысвечанага ўласнаму радаводу. Адзначаецца значэнне праведзенай працы для генеалагічнай і гістарычнай навукі.

**Гарматны Віталь Пятровіч,** магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта БДУ.

*«Матэрыялы фонду Палескай акруговай зямельнай управы па правядзенні камасацыі на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1921–1933 гг. (па дакументах ДАБВ)».*

Аб'ектам даследавання ў артыкуле абраны фонд Палескай акруговай зямельнай управы з Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Аўтар вызначае асаблівасці стварэння і функцыянавання дадзенай установы, якая ажыццяўляла нагляд за правядзеннем польскімі ўладамі ў Палескім ваяводстве ў 1921–1933 гг. аграрнай рэформы, у т. л. камасацыі (хутарызацыі). Адзначаецца крыніцазнаўчая вартасць фонду і прыводзяцца звесткі з яго гісторыі.

**Грыб Антон Валер'евіч,** архівіст аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм НГАБ.

*«Самакіраванне Дзісны пасля адмены магдэбургскага права ў 1776 г.».*

Упершыню публікуюцца чатыры дакументы з фонду НГАБ «Дзісненскі магістрат», якія сведчаць пра асаблівасці самакіравання Дзісны ў другой палове XVIII ст. Дакументы, актыкаваныя ў 1776, 1786 (два), 1788 гг., вызначаюць асноўныя механізмы дзейнасці гарадскіх улад пасля адмены магдэбургскага права ў горадзе.

**Грывянёў Аляксандр Леанідавіч,** вядучы навуковы супрацоўнік аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм НГАБ.

*«Архіў Віцебскага Траецкага Маркава манастыра».*

Прыводзяцца пералік і кароткая характарыстыка зместу тых дакументаў, якія знаходзіліся ў архіве Віцебскага Траецкага Маркава манастыра на момант 1875 г., а цяпер захоўваюцца ў фондах НГАБ і прадстаўляюць асаблівую цікавасць для рэканструкцыі гісторыі манастыра ў XVII–XVIII стст.

***Яго ж**: «Цэрквы Віцебскага Траецкага Маркава манастыра».*

На падставе дакументаў НГАБ прыводзяцца важныя звесткі з гісторыі чатырох цэркваў Віцебскага Траецкага Маркава манастыра (ад моманту заснавання да пачатку XX ст.).

**Жумар Сяргей Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы.

*«Пераплёт архіўных спраў як аб'ект апісання, уліку і даследавання».*

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ўвага звяртаецца на аўтэнтычны пераплёт архіўных спраў з дакументамі XVI–XIX стст., які варты лічыцца самастойнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Адзначаецца перспектыўнасць працы над апісаннем і ўлікам пераплётаў, якая можа спрыяць фарміраванню сістэмы новых гістарычных ведаў.

**Латушкін Андрэй Мікалаевіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*«Архівісты Нясвіжскага архіва Радзівілаў XVII – першай паловы XIX ст.» (частка IV, літары М–Р).*

Змешчаны біяграмы 13 архівістаў Нясвіжскага архіва XVII – першай паловы XIX ст., сярод якіх найбольшая ўвага нададзена Мікалаю Маліноўскаму.

**Лашкевіч Аляксандр Аляксандравіч,** кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў НГАБ.

*«Некаторыя старонкі дзейнасці вайсковай контрразведкі Віленскай ваеннай акругі напярэдадні і ў час Першай сусветнай вайны (па дакументах НГАБ)».*

На падставе спраў архіўнага фонду НГАБ «Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне» ўпершыню робіцца спроба вызначыць некаторыя накірункі дзейнасці ваеннай контрразведкі Віленскай ваеннай акругі. У дадатку публікуецца зводка агентурных звестак па контрразведцы за 1912 г.

***Яго ж:*** *«Чыгуначная жандармерыя ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (па дакументах НГАБ)».*

Выкарыстоўваючы матэрыялы чатырох архіўных фондаў НГАБ за 1868–1915 гг., аўтар паспрабаваў вылучыць асноўныя накірункі і задачы дзейнасці чыгуначнай жандармерыі на тэрыторыі Беларусі, яе сувязь з іншымі паліцэйскімі структурамі. Публікуюцца тры дакументы за 1886, 1899, 1902 гг., якія характарызуюць яе дзейнасць. Асаблівую цікавасць уяўляе складзенае ў 1899 г. апісанне знешнасці Ф. Э. Дзяржынскага.

**Літвін Аляксей Міхайлавіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык аддзела ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

*«Чорны сакавік: Памяці першай настаўніцы — А. М. Гесь».*

Успаміны аўтара аб педагагічнай дзейнасці гісторыка і архівіста Аляксандры Мікалаеўны Гесь (1940–2011) у Семігосціцкай сярэдняй школе (1958–1962 гг.).

**Ляхоўскі Уладзімір Віктаравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт факультэта міжнародных адносін БДУ.

*«Памяці Аляксандры Гесь».*

Асвятляюцца факты з навуковай дзейнасці гісторыка і архівіста А. М. Гесь, даследчыка ў галіне беларусістыкі, рэдактара і ўкладальніка шматлікіх навуковых зборнікаў у т. л. «Архіварыуса».

**Мажэйка Ганна Мікалаеўна,** магістр гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Архіўная справа ў Вялікабрытаніі: гісторыя і сучаснасць».*

Праводзіцца агляд гісторыі развіцця архіўнай сістэмы Вялікабрытаніі. Вызначаюцца асноўныя накірункі дзейнасці архіваў на сучасным этапе. Асвятляецца значэнне архіваў і прафесіі архівіста ў грамадскай думцы краіны.

***Яе ж:*** *«Ян дэ Крайна Краінскі, Карл II і англійская дапамога пратэстантам ВКЛ».*

У артыкуле даследуюцца два англамоўных выданні, якія пабачылі свет у Лондане ў 1661 г., — брашура Яна Краінскага, прысвечаная стану пратэстанцкай царквы ў ВКЛ у сярэдзіне XVII ст., і каралеўскі патэнт, выдадзены яму Карлам II. На прыкладзе згаданых гістарычных крыніц разглядаюцца малавядомыя факты рэлігійных ўзаемасувязей паміж Вялікім княствам Літоўскім і Англіяй.

***Яе ж інфармацыя*** *аб: Nagielski, M. The Decline of the Traditional Polish Warfare in the Period of the Great Northern War. / M. Nagielski. — Warszawa : Akme. Studia Historica, 2010. — 55 s.*

Разглядаецца англамоўнае выданне доктара гістарычных навук, прафесара гістарычнага інстытута Варшаўскага універсітэта М. Нагельскага аб стане войска Рэчы Паспалітай у перыяд Паўночнай вайны, даследаваным на падставе дакументаў фондаў Галоўнага архіва старажытных актаў (Варшава), Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны (Львоў), бібліятэкі князёў Чартарыйскіх. Адзначаюцца ўнёсак аўтара ў тэму даследавання і недахопы працы.

**Несцяровіч Юрый Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археаграфіі БелНДІДАС.

*«Паняцце тэхнатроннага дакумента, тэхнатроннай гістарычнай крыніцы, тэхнатроннага архіўнага дакумента».*

Сфармуляваны вызначэнні тэрмінаў «тэхнатронны дакумент», «тэхнатронная гістарычная крыніца» і «тэхнатронны архіўны дакумент», тлумачацца адрозненні паміж імі, а таксама разглядаецца праблема іх прымянення.

***Яго ж:*** *«Логіка-семантычны падыход да вызначэння колькасці семантычнай інфармацыі прымяняльна да археаграфічнай публікацыі».*

У артыкуле зроблена спроба абгрунтаваць перавагу выкарыстання логіка-семантычнага падыходу ў выяўленні колькасці семантычнай інфармацыі ў археаграфічнай публікацыі. Разглядаюцца розныя падыходы да выяўлення колькасці інфармацыі, вызначаюцца асноўныя недахопы кожнага з іх у параўнанні з логіка-семантычным падыходам.

**Нікіценка Вольга Міхайлаўна,** архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Іосіф Дзянісаў — архіварыус Магілёўскага акруговага суда».*

На падставе фармулярнага спіса складзена біяграма канцылярскага службоўцы І. Дз. Дзянісава, які ў 1913, 1915–1918 гг. выконваў абавязкі архіварыуса Магілёўскага акружнога суда.

**Палтаржыцкая Надзея Мікалаеўна,** магістр гістарычных навук, аспірантка Інстытута гісторыі НАН Беларусі, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў НГАБ.

*«Да пытання аб лёсе актавых кніг Менскага магістрата XVII ст.».*

Апісваюцца тры актавыя кнігі з фонду Менскага магістрата НГАБ, даследуецца пытанне захаванасці дакументаў, створаных у канцылярыі згаданай установы ў XVII ст.

**Савіцкі Марыюш ,** доктар гісторыі Апольскага ўніверсітэта (г. Аполе, Польшча).

*«Артылерыя і смаленскі цэйхгаўз (1654 г.)».*

На падставе дакументаў, якія захоўваюцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ў Вільнюсе, упершыню аналізуецца склад арсенала, што знаходзіўся ў смаленскім замку ў пачатку вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай (1654 г.).

**Снапкоўскі Юрый Мікалаевіч,** галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Магілёўская губернская турма перыяда нямецкай акупацыі Магілёва (1918 г.) у дакументах НГАБ».*

Публікуюцца восем дакументаў перыяду нямецкай акупацыі Магілёва (1918 г.), у якіх адлюстраваны стан Магілёўскай губернскай турмы, а таксама прасочваюцца механізмы ўзаемадзеяння нямецкага камандавання з гарадской управай у вобласці турэмнай палітыкі. Уводная частка артыкула змяшчае гістарычную даведку аб Магілёўскай турме, біяграфічныя звесткі аб яе апошнім начальніку перыяда імперыі М. Г. Палумба, характарыстыку пенітэнцыярнай сістэмы 1917–1918 гг. і ўмоў узнікнення публікуемых дакументаў.

***Яго ж:*** *«Прашэнне да губернатара ў вершах (1883 г.)».*

Прыводзіцца тэкст прашэння наглядчыка Быхаўскай гарадской турмы Ф. І. Юношы-Гзоўскага ад 25 сакавіка 1883 г., пададзенага на імя магілёўскага губернатара А. С. Дэмбавецкага ў вершаванай форме, неардынарнай для афіцыйнага справаводства. Вызначаюцца крыніцазнаўчая вартасць дакумента і абставіны яго з’яўлення.

**Урублеўскі Вадзім Валер'евіч,** аспірант кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Інвентар маёнтка Святы Двор Наваградскага ваяводства за 1756 г.».*

Разглядаецца адзін з інвентароў радзівілаўскага ўладання Святы Двор. Тры ўставы жыхарам маёнтка, якія рэгламентавалі асаблівасці гаспадарчай дзейнасці местачкоўцаў, сялян і зямян, прыведзены ў арыгінале на польскай мове з перакладам аўтара на беларускую мову.

***Яго ж:*** *«Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка II, літары Г–З)».*

Прыведзена 15 біяграм чыноўнікаў канцылярыі Мінскага ДДС на літары Г–З, складзеных паводле фармулярных спісаў з фондаў НГАБ і дадатковых крыніц. Публікуюцца новыя звесткі з біяграфіі вядомага мінскага калекцыянера, археолага і краязнаўца, сакратара канцылярыі Мінскага ДДС Міхаіла Гаўсмана.

***Яго ж інфармацыя*** *аб: Рабинович, Э. Фамилии, основы родословных евреев Минской губернии в XVIII – начале XX века. Книга 1. — Минск, 2010. — 281 с.*

Разглядаецца першая кніга выдання, прысвечаная генеалогіі і антрапаніміцы яўрэйскіх сем'яў гарадоў і мястэчак Мінскай губерні. Аналізуюцца метады даследавання, выкарыстаныя аўтарам, класіфікацыя яўрэйскіх прозвішчаў і першакрыніцы, на падставе якіх была падрыхтавана праца.

***У сааўтарстве*** *з Яцкевічам З. Л. (гл. ніжэй). «Матэрыялы да біяграфіі і бібліяграфіі прац А. М. Гесь».*

Прыводзяцца матэрыялы да біяграфіі А. М. Гесь і бібліяграфіі яе прац. Прадстаўлены пералік яе навуковых і публіцыстычных артыкулаў і выданняў, падрыхтаваных у сааўтарстве і ў якасці рэдактара.

**Цітоў Анатоль Кірылавіч,** гісторык, сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі.

*«Магілёўскія цэхі ў XVI–XVIII стст.».*

Артыкул прысвечаны гісторыі дзевятнаццаці вядомых на сённяшні дзень прафесійных цэхавых аб'яднанняў (брацтваў), якія існавалі ў Магілёве ў XVI–XVIII стст. На падставе «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў», а таксама калекцыі мікрафільмаў (НГАБ) раскрываецца працэс стварэння і зацвярджэння магілёўскіх цэхаў пастановамі магістрата і каралеўскімі прывілеямі.

**Чарняўскі Фёдар Віктаравіч,** гісторык.

*«Да жыццяпісу Марціна Казіміра Валадковіча, пісара земскага менскага ў 1689–1701 гг.».*

Даследуюцца факты біяграфіі, сямейна-роднасныя сувязі і маёмаснае становішча грамадска-палітычнага дзеяча, пісара земскага менскага Марціна Казіміра Валадковіча. На прыкладзе яго жыццядзейнасці асвятляюцца працэсы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай XVII ст.

**Шаланда Аляксей Іванавіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык сектара геральдыкі і нумізматыкі аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін і інфармацыйна-аналітычнай работы НАН Беларусі.

*«Да пытання ўдзелу жамойтаў у бітве пад Грунвальдам 1410 г.: геральдычны аспект».*

Аўтар з улікам геральдычных атрыбутаў спрабуе вызначыць размяшчэнне і ролю жамойцкіх палкоў у Грунвальдскай бітве.

**Шупляк Галіна Уладзіміраўна,** галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«З гісторыі стварэння ўстаноў сувязі ў Магілёўскай губерні (канец XVIII – пачатак XX ст..)».*

На падставе разнастайных матэрыялаў і дакументаў (у т. л. НГАБ) прасочваецца працэс станаўлення і развіцця ўстаноў сувязі ў Магілёўскай губерні (1772–1917 гг.).

**Яцкевіч Зміцер Лявонцьевіч,** загадчык аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Радавод Аляксандра Юношы-Гзоўскага герба «Юноша».*

На падставе дакументаў фонду Мінскага ДДС (НГАБ), іншых крыніц і літаратуры даследуецца радавод пісьменніка, журналіста, выдаўца Аляксандра Юношы-Гзоўскага, ураджэнца маёнтка Борхаў Гомельскага павета Магілёўскай губерні.

# Резюме

**Вишневский Илья Алексеевич,** магистрант Института теологии имени св. Кирилла и Мефодия (БГУ).

*«Архивы обновленческих учреждений Беларуси (1922–1935 гг.)».*

На основании документов Национального исторического архива Беларуси (НИАБ) и Государственного архива Автономной Республики Крым впервые исследуются особенности истории и организации архивного дела в учреждениях обновленческой церкви Беларуси (история архивов, виды документации, документооборот, принципы формирования архивных дел). Дается оценка степени сохранности белорусских обновленческих архивов.

***Его же информация*** *об: «Русская Православная Церковь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. : сборник документов / сост.: О. Ю. Васильева, И. И. Кудрявцев, Л. А. Лыкова. М. : Изд-во Крутицкого патриаршего подворья, 2009. — 765 с.».*

Рецензируется сборник документов, освещающих историю Русской православной церкви в период Великой Отечественной войны. Отмечаются положительные стороны издания и его недостатки. Значительное внимание уделяется документам из белорусских архивов. Определяется их научный потенциал при исследовании вопросов состояния и деятельности православной церкви в Беларуси в 1941–1945 гг.

**Голубович Алла Куприяновна,** директор Национального исторического архива Беларуси (НИАБ).

*«История рода Стецкевичей-Чебогановых — познание истории народа».*

Рассматриваются результаты генеалогического исследования генеалога-любителя Анатолия Васильевича Стецкевича-Чебоганова, посвященного собственной родословной. Отмечается значение проведенной работы для генеалогической и исторической науки.

**Гарматный Виталий Петрович,** магистр исторических наук, аспирант кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета БГУ.

*«Материалы фонда Полесской окружной земельной управы по проведению комасации на территории Полесского воеводства в 1921–1933 гг. (по документам ГАБО)».*

Объектом исследования в статье избран фонд Полесской окружной земельной управы из Государственного архива Брестской области (ГАБО). Автор

определяет особенности создания и функционирования данного учреждения, осуществлявшего надзор за проведением польскими властями в Полесском воеводстве в 1921–1933 гг. аграрной реформы, в т. ч. комасации (хуторизации). Отмечается источниковедческая ценность фонда, приводятся сведения из его истории.

**Гриб Антон Валерьевич,** архивист отдела информационно-поисковых систем НИАБ.

*«Самоуправление Дисны после отмены магдебургского права в 1776 г.».*

